ARCHE Зьмест № 1'04

1. Зьмест / Уводзіны
2. Прадмова. ARCHE 1 (30) 2004.
3. Вузкія месцы дыяспары. Валер Булгакаў. ARCHE 1 (30) 2004.
4. Страшны сон расейскамоўных лібэралаў. Віталь Сіліцкі. ARCHE 1 (30) 2004.
5. Пуцінская пастка. Робэрт Котрэл. ARCHE 1 (30) 2004.
6. Дух і літара. Анатоль Сідарэвіч. ARCHE 1 (30) 2004.
7. Гульні з качаргою: усур'ёз і па-ўкраінску. Яраслаў Грыцак. ARCHE 1 (30) 2004.
8. Ці ёсьць у Беларусі нацыянальныя інтарэсы? Аляксандар Батура. ARCHE 1 (30) 2004.
9. У лабірынце з постмадэрністам. Даніла Жукоўскі. ARCHE 1 (30) 2004.
10. Іран і Тэгеран. Сяргей Прытыцкі. ARCHE 1 (30) 2004.
11. Амэрыканскія занатоўкі: правілы гульні. Алеся Сёмуха. ARCHE 1 (30) 2004.
12. Дзіўная краіна Фінляндыя. Аліна Бельская. ARCHE 1 (30) 2004.
13. Партрэт у Гарадышчанскім касцёле. Мікола Нікалаеў. ARCHE 1 (30) 2004.
14. Зьнікненьне аўтара: беларуская сеціратура. Аліса Бізяева. ARCHE 1 (30) 2004.
15. Як тварылася Міжрэгіянальнае аб'яднаньне беларусаў Расеі. Генадзь Лех. ARCHE 1 (30) 2004.
16. Доўгія языкі й свабода. Ганіф Курэйшы. ARCHE 1 (30) 2004.
17. Пачатак і канец раману. Міларад Павіч. ARCHE 1 (30) 2004.
18. З вышыні. Альгерд Бахарэвіч. ARCHE 1 (30) 2004.
19. Хмарка-дурніца. Раман на адну ноч у дванаццаці частках і слухаўках на адно вуха. Вольга Гурская. ARCHE 1 (30) 2004.
20. Партрэт невядомай. Марыя Вайцяшонак. ARCHE 1 (30) 2004.

21. Двое. Сцэнар відэафільму./Горад прыгожых і таленавітых. Чытанка для дзяцей. Аляксей Бацюкоў. ARCHE 1 (30) 2004.
22. Кропелькі. Тацяна Барысік. ARCHE 1 (30) 2004.
23. Хоку. Андрэй Захаранка. ARCHE 1 (30) 2004.
24. Жыць духам. Роза Аўсьлендэр. ARCHE 1 (30) 2004.
25. Вечнае змаганне за містыфікацыі. Віктар Корбут. ARCHE 1 (30) 2004.
26. Нялішняя кніга. Анатоль Трафімчык. ARCHE 1 (30) 2004.

[image]
ARCHE **Пачатак** **№ 1 (30) – 2004**
[image]

[image]

[image]
1[image]–[image]2004
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі
[image] [image] [image]
[image]

Зьмест

АЛЯКСАНДАР БАТУРА
Ці ёсьць у Беларусі нацыянальныя інтарэсы?
ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ У лябірынце з постмадэрністам
СЯРГЕЙ ПРЫТЫЦКІ
Іран і Тэгеран
АЛЕСЯ СЁМУХА
Амэрыканскія занатоўкі: правілы гульні
АЛІНА БЕЛЬСКАЯ
Дзіўная краіна Фінляндыя
МІКОЛА НІКАЛАЕЎ
Партрэт у Гарадышчанскім касьцёле
АЛІСА БІЗЯЕВА
Зьнікненьне аўтара: беларуская сеціратура
ГЕНАДЗЬ ЛЕХ Як

тварылася Міжрэгіянальнае аб'яднаньне беларусаў Расеі
ГАНІФ КУРЭЙШЫ Доўгія языкі й свабода
МІЛАРАД ПАВІЧ Пачатак і канец раману
АЛЬГЕРД БАХАРЭВІЧ З вышыні
ВОЛЬГА ГУРСКАЯ Хмарка-дурніца
МАРЫЯ ВАЙЦЯШОНАК Партрэт невядомай
АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ Аповеды
ТАЦЯНА БАРЫСІК Кропелькі
АНДРЭЙ ЗАХАРАНКА Хоку
РОЗА АЎСЬЛЕНДЭР Жыць духам

ПРАДМОВА
КРЫТЫКА
ВАЛЕР БУЛГАКАЎ Вузкія месцы дыяспары
ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ Страшны сон расейскамоўных лібэралаў
РОБЭРТ КОТРЭЛ Пуцінская пастка
АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ Дух і літара
ЯРАСЛАЎ ГРЫЦАК Гульні з качаргою: усур'ёз і па-ўкраінску
АНАЛІТЫКА
ЭСЭІСТЫКА
ЛІТАРАТУРА
КАРОТКІЯ РЭЦЭНЗІІ
ВІКТАР КОРБУТ Вечнае змаганьне за містыфікацыі
АНАТОЛЬ ТРАФІМЧЫК Нялішняя кніга

[image]
[image]

№ 1 (30) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (30) - 2004**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

1[image]-[image]2004

"аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Прадмова

Сёлета «ARCHE» пачынае шосты год свайго жыцьця. Увесь свой век ён шукаў уласнае «Я», сумяшчаў несумяшчальнае для эўрапейскіх выданьняў: айчынную і замежную літаратуру, філязофію і эсэістыку, культурныя, палітычныя і эканамічныя аналізы, рэцэнзіі на кніжныя навінкі і многае іншае. Аб'ём нумароў вагаўся ад сотні да пяці з палавінай соцень старонак, рубрыкі пастаянна зьмяняліся, фармат залежаў ад прыхамаці друкароў. Нязьменным застаўся толькі дызайн, які быў распрацаваны ўжо ў далёкім 1998-м.

Сёлета мы вырашылі зьмяніць вонкавае аблічча «ARCHE». Мы спадзяёмся, што гэта падкрэсьліць яго ўнутраную эвалюцыю ў кірунку грамадзка-палітычнага выданьня, нацэленага на прадукаваньне ідэй. Таксама мы спрасьцілі яго ўнутраную будову. Цяпер усе матэрыялы групуюцца ў чатыры падставовыя рубрыкі: «крытыка», «аналітыка», «эсэістыка» і «літаратура».

У астатнім «ARCHE» застаецца верным беларускай культуры і чуйным да патрэбаў, якія яна дыктуе: не абмяжоўваць беларускае слова абсягам мастацкай літаратуры, выяўляць і абмяркоўваць ключавыя для аздараўленьня інтэлектуальнага жыцьця праблемы, гуртаваць інтэлектуалаў, якія бачаць Беларусь культурна і эканамічна разьвітай нацыянальнай дзяржавай.

Мы жывём у грамадзтве, дзе культура была, ёсьць і, напэўна,

будзе аб'ектам палітызацыі. У такім грамадстве культурныя ініцыятывы могуць лічыцца палітычна небясьпечнымі, а палітычных лідэраў крытыкуюць за іх разбуральную для культуры дзейнасьць. Для выданьняў накшталт нашага гэта дае новыя шанцы. Мяркуем, што абнаўленьне дызайну і ўнутранай структуры «ARCHE» дапаможа іх выкарыстаць лепей. Таксама ў нашых плянах - увядзеньне падпіскі і правядзеньне рэклямных кампаній. Адным словам, рыхтуйцеся.

[image]
[image]

Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (30) - 2004**
[image]

Валер Булгакаў
Вузкія месцы дыяспары

ВАЛЕР БУЛГАКАЎ
рэдактар часопісу «ARCHE». Жыве і працуе ў Менску. Летась уклаў і выдаў гістарычныя творы Яна Станкевіча ды зборнік аналітыкі «Мясцовыя выбары ў найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі».

Выданьні, якія разглядаюцца ў гэтым артыкуле:
Галіна Сяргеева. Беларуская дыяспара ў нацыянальнай гістарыяграфіі XX стагодзьдзя (кароткі агляд) // Запісы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва. 2001. № 25.
Мікола Панькоў. Хроніка беларускага жыцьця на чужыне (1945-1984). - Менск: Бібліятэка часопісу «Беларускі Гістарычны Агляд», 2001.

Лявон Юрэвіч. Літаратурны рух на эміграцыі. - Менск: Бібліятэка часопісу «Беларускі Гістарычны Агляд», 2002.

Алесь Пашкевіч. Зваротныя дарогі. Проза беларускай эміграцыі XX стагоддзя. - Беласток: Беларускае літаратурнае аб'яднанне,

2001.

Лідзія Савік. Пакліканыя. Літаратура беларускага замежжа. - Менск: Тэхналогія, 2001.
Arnold McMillin. Belarusian Literature of the Diaspora. - The University of Birmingham Central Printing, 2002.
Гэты аналіз прысьвечаны беларускай эміграцыі і эміграцыйнай літаратуры XX стагодзьдзя як праблеме гуманітарнай веды. У ім я імкнуся паказаць, чаму паняцьцёвыя апараты і навуковыя інструмэнтары гуманітарнікаў розных пакаленьняў не працуюць на яе раскрыцьцё.

Я таксама намагаюся давесьці, што дасьледаваньне гэтых дзьвюх зьяваў мае аб'ектыўны характар і залежыць ад канкрэтнай гуманітарнай традыцыі, да якой належаць дасьледнікі. Таму сапраўдны аб'ект крытыкі тут не іх асобы, а вельмі праблемная ў беларускім выпадку традыцыя гуманітарнага мысьленьня. Адданыя ёй літаратуразнаўцы і гісторыкі мала розьняцца паміжсобку, паколькі выконваюць адны і тыя ж прыёмы.

1

Канец камуністычнай ідэалёгіі і пашырэньне нацыяналістычных ідэяў выклікалі ў грамадзтве ўсплёск зацікаўленьня да эміграцыі, якая робіцца прыкладам ідэйна чыстага нацыяналізму. Яе пачынаюць вывучаць навукоўцы-гуманітарнікі - літаратуразнаўцы, гісторыкі і дасьледнікі міжнародных дачыненьняў. Дзяржаўныя і недзяржаўныя выдавецтвы выдаюць творы эміграцыйных аўтараў, і нават прыход Лукашэнкі да ўлады мала што зьмяняе ў гэтай справе. Бібліяграфічнае апісаньне гэтых і мноства іншых публікацый даецца ў аглядзе Галіны Сяргеевай. Адным ён запомніцца багацьцем крыніц, другім - шаблённым да іх падыходам. Гісторыя дыяспары («беларускай прысутнасьці ў сьвеце») тут налічвае ўсяго 100 гадоў (час першай масавай міграцыі зь Беларусі - злом XIX і XX стагодзьдзяў), само ж паняцьце вызначаецца як «сталае ці часовае жыцьцё народу (беларускай этнічнай супольнасьці) за межамі дзяржавы (па-за гістарычнай

тэрыторыяй свайго пражываньня)». Фармулёўка гэтая няўдалая. Яна дазваляе думаць, што беларусы зусім нядаўна зьявіліся ў Латгаліі ці Беласточчыне. Апрача таго, паняцьце народу ня зводзіцца да паняцьця этнічнай групы, а паняцьце дзяржавы ня тоеснае зь яго гістарычнай тэрыторыяй пражываньня. Атаесамленьне народу і дзяржавы таксама ігнаруе досьвед нацыятварэньня XIX стагодзьдзя на ўсходзе Эўропы, дзе ўзьнікаючыя нацыі часта былі разарваныя паміж некалькімі дзяржавамі.

Як піша Сяргеева, яе дасьледаваньне абмяжоўваецца аглядам стогадовай гісторыі беларускай эміграцыі «на бацькаўшчыне й беларускімі дасьледнікамі ў замежжы». Тым самым яна ставіць знак роўнасьці паміж навуковым дасьледаваньнем і аглядам крыніцаў, а само паняцьце нацыянальнай гістарыяграфіі атаесамляе з апісаньнем тэмы «дасьледнікамі». У артыкуле да яе залічаецца літаратура і прэса на любой мове, любога жанру і любой ідэалягічнай скіраванасьці.

Але нават калі перафармуляваць тэму артыкулу, напрыклад, так: «Беларуская дыяспара ў айчынных і замежных крыніцах XX стагодзьдзя па нацыянальнай гісторыі», - яго зьмест усё роўна ня будзе адпавядаць назьве. Праблемным застаецца сам тэрмін «беларуская дыяспара». У публікацыі ім пазначаюцца працоўныя мігранты-беларусы, якія на зломе XIX і XX стагодзьдзяў у пошуках працы і зямлі мігравалі ўглыбкі Расейскай імпэрыі, эканамічныя перасяленцы зь Беларусі ў ЗША першых двух дзесяцігодзьдзяў XX стагодзьдзя, беларусы - аўтахтонныя насельнікі сумежных зь цяперашняй Рэспублікай Беларусяй рэгіёнаў (Беласточчына, Латгалія; Сакрат Яновіч тут - эміграцыйны гісторык дыяспары, г. зн. таго, што знаходзіцца па-за «гістарычнай тэрыторыяй пражываньня беларускай этнічнай супольнасьці») і, нарэшце, дзьве хвалі эміграцыі, выкліканыя першай і другой сусьветнымі войнамі.

Пра тое, што перад намі разнародныя фэномэны, гаворыць эканамічны, палітычны й культурны лёс кожнай з гэтых групаў, які склаўся асаблівым чынам. Некаторыя зь іх даўно і поўнічай былі асымільваныя сваім новым нацыянальным асяродзьдзем, вядомыя цяпер толькі па навуковых публікацыях і дзеля гэтага

годзяцца ў рубрыку «беларускай адсутнасьці ў сьвеце».

У строгім сэнсе, разгледжаны артыкул мусіў мець назву «Агляд айчынных і замежных крыніц да гісторыі міграцый беларускага насельніцтва ў XX стагодзьдзі». Але нават з гэтым удакладненьнем ён тоіць шмат неразгаданых загадак.

2

Кніга Міколы Панькова апісвае побыт паваеннай палітычнай эміграцыі на Захадзе, якая, як мы хутка даведаемся, стасуецца з паняцьцем дыяспары як прыватнае й цэлае. Толькі зрэдзьчасу ў асноўную канву ўкліньваюцца беларусы з БССР, напрыклад, Ларыса Александроўская і яе канцэрт 18 сьнежня 1945 году ў Парыжы, пісьменьнік Усевалад Краўчанка і ягонае самагубства 27 жніўня 1961 году або паэт Анатоль Вярцінскі і ягоны літаратурны вечар 7 сьнежня 1978 году ў амэрыканскім Квінс Каледжы. Як і Г. Сяргеева, Мікола Панькоў падае свой матэрыял згодна з храналягічным прынцыпам - ён вядзе памесячную рэгістрацыю культурных, палітычных і грамадзкіх падзеяў. Іх адлік пачынаецца з студзеня 1945 году (між іншага, 24 студзеня прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады Радаслаў Астроўскі выдаў інтрыгоўную адозву «Да зброі»), абрываецца нарацыя на лістападзе 1984 году. Месца дзеяньня - Нямеччына, Амэрыка, іншыя краіны Захаду, узятага ў геапалітычным сэнсе. Найбольш асьвятляюцца палітычныя акцыі і грамадзкія мерапрыемствы, менш - рэлігійнае й культурнае жыцьцё. Пададзеная вайсковая хроніка сёньня ўспрымаецца як кур'ёз.

Паваенная палітычная эміграцыя паўстае супольнасьцю, якая выдае калі-нікалі кніжкі, чытае даклады, займаецца спортам і мастацкай самадзейнасьцю, адпачывае ў цэнтрах адпачынку, зьбіраецца на фэрмах для адмеркаваньня бягучых справаў, піша пэтыцыі і адозвы, канфліктуе з нацыянальнымі ворагамі, праводзіць у апошні шлях сваіх герояў. Але, бадай, улюбёнай формай актыўнасьці паваенных эмігрантаў было прыдумляньне ўсякіх мудрагелістых назоваў для ўласных «цэнтраляў» і «хаўрусаў», якія рэдка калі мелі рэальныя ўплывы на жыцьцё.

Цяпер цяжка сказаць, чым кіраваліся эмігранты, даючы сваім суполкам гучныя найменьні. Мабыць, яны спадзяваліся на тое, што іх заўважаць і падтрымаюць палітычныя істэблішмэнты

сваіх новых радзімаў. Часткова гэты намер спраўджваўся: заходнія харытатыўныя фонды праяўлялі пэўны інтарэс да праектаў сваіх новых суграмадзянаў. Ёсьць, напрыклад, зьвесткі, што выданьню нью-ёрскага часапісу «Веда» спрыяла «The Ford Foundation».

Хутчэй, аднак, у гэтых патэтычных найменьнях трэба бачыць індыкатар хваравітых палітычных амбіцыяў грамадзка актыўнай часткі эміграцыі, а таксама яе паталягічную няздольнасьць знаходзіць паміжсобку паразуменьне і выступаць адзіным фронтам для адстойваньня нацыянальных інтарэсаў. Магчыма, гэтая страсьць да дактрынёрства і канструяваньня моўных утопіяў была перанятая ў савецкай ці нямецкай прапаганды, але непасрэдным узорам, бадай, было грамадзка-палітычнае жыцьцё ўкраінскай эміграцыі.

Як вынікае з Паньковай «Хронікі», эміграцыя выявіла фэнамэнальную няздольнасьць да рэгулярных і доўгатрывалых культурных і кнігавыдавецкіх праектаў - акурат той «нятленкі», якая павялічвае культурны капітал нацыі і можа быць запатрабаваная наступнымі пакаленьнямі. Існавала маса газэтак, бюлетэньчыкаў і часопісікаў, якія зьнікалі пасьля аднаго-двух нумароў. Сёньня эміграцыйныя часопісы і кніжкі ўсё часьцей выдаюцца ў Менску. Пра «Хроніку» бэссэнсоўна гаварыць як пра ўнівэрсальную крыніцу для вывучэньня паваеннай эміграцыі ў краіны Захаду. Мы маем справу зь вельмі суб'ектыўным дзёньнікам, нашпігаваным фактычнымі памылкамі і тэрміналягічнымі неахайнасьцямі, якія выдаўцы паленаваліся выправіць.

Алесь Салавей на эміграцыі стаў не Альфрэдам Кадняком, а Альбэртам; часопіс «Веда» ніколі ня быў «навукова-гістарычным». Масей Гітлін быў не «ініцыятарам поўнага перакладу на беларускую мову і друку Бібліі пад рэдакцыяй д-ра Янкі Станкевіча», а суперакладчыкам Бібліі. (Ініцыятарам быў пратэстанцкі пастар Тарас Сайка.) Родны брат Язэпа Пушчы Ізыдар Плашчынскі карыстаўся псэўданімам «Алесь Беразьняк», а не «Язэп Беразьняк». Вячаслаў Сэлях-Качанскі ніколі ня быў «знаным кампазытарам». Калі некрытычна прыняць на веру паведамленьне, што 31 жніўня 1969 году «з

малебнам за беларускі народ і рэфэратам Вітаўта Кіпеля» амэрыканскія беларусы адзначылі 35-я ўгодкі Другога Ўсебеларускага Кангрэсу, то выходзіць, што гэты кангрэс адбыўся ў 1934 годзе. На той жа старонцы Юліяна Дубейкаўская характарызуецца як «ахвярная працаўніца беларускага руху ў часы «Нашай Нівы», хоць яна зацікавілася беларускім нацыянальным рухам толькі ўлетку 1915 году, г. зн. калі віленская «Наша Ніва» спыніла сваё існаваньне. Адольф Клімовіч памёр у вёсцы Клюшчані, што на Астравеччыне, а не ў падбеластоцкіх Кляшчэлях. Зямны шлях архімандрыта Лява Гарошкі скончыўся ня ў Лёндане, а ў Парыжы.

Кнізе бракуе разгорнутых камэнтароў, безь якіх не зразумець, чаму хіратанізаваны ў 1961 годзе ў біскупы для беларусаў-каталікоў Уладзіслаў Рыжы-Рыскі ў другой палове 70-х гадоў XX стагодзьдзя зрабіўся «прапагатарам беларускай кальвінскай субожні». Легендарнае адценьне кнізе надаюць некаторыя гіпэрдакладныя паведамленьні: адзінай вартай занатаваньня падзеяй з нацыянальнага жыцьця ў красавіку 1945 году ў вэрсіі Панькова было зьнішчэньне савецкай авіяцыяй паблізу Кёнігсбэргу параплава, на якім знаходзілася 295 «юначак-беларусак». Але нягледзячы на свае пахібкі, выданьне ўсё ж дазваляе зразумець пэўныя заканамернасьці эміграцыйнага жыцьця. Да таго ж яно высьвечвае зусім у новай якасьці добра вядомыя постаці: Францішак Кушаль выяўляецца знаўцам беларуска-расейскіх дачыненьняў Новага часу, Юрка Станкевіч - спэцыялістам па атамнай энэргіі, а Янка Запруднік - гісторыкам расейскай філязофіі.

3

Манаграфія супрацоўніка Нью-Ёрскай публічнай бібліятэкі Лявона Юрэвіча прысьвечана літаратурнаму руху паваеннай палітычнай эміграцыі. Яе адкрывае англамоўная прадмова лёнданскага прафэсара Арнольда Макміліна, які зьвязвае пачаткі беларускай эміграцыі з Францішкам Скарынам.

Кніжка мае нестандартную структуру - яна адначасова зьяўляецца і крытыкай, і хрэстаматыяй. У яе першай частцы падрабязна, з выкарыстаньнем унікальных архіўных дакумэнтаў, асьвятляюцца цёмныя старонкі эміграцыйнай

літаратуры. Кожны, хто цікавіцца ёй, зьверне ўвагу на бібліяграфію яе кніжных выданьняў пачынаючы з 1946 году. У другой частцы замест аўтара гавораць унікальныя дакумэнты - прыватныя лісты, калектыўныя звароты, факсымільныя адбіткі вершаў. Калі за падставу для ацэнкі ўзяць аб'ём інфармацыйнай нагрузкі на старонку тэксту, кніга ня будзе мець сабе роўных у гэтым аглядзе.

Сам жа аўтар не да канца вызначыўся, з кім канкрэтна зьвязаць узьнікненьне эміграцыйнай літаратуры: ці то ўсьлед за Арнольдам Макмілінам - з Скарынам, ці то ўсьлед за бэрлінскай газэтай «Раніца» - зь Вінцэсем Каратынскім. Адна з асноўных яе ідэяў гучыць так: эміграцыйная літаратура была ня толькі мастацкай практыкай, але спосабам выяўленьня ўласнай грамадзянскай пазыцыі, інструмэнтам абуджэньня нацыянальнай сьвядомасьці, сродкам барацьбы за нацыянальныя ідэалы й перадачы нацыянальнай традыцыі наступнікам.

Неад'емны элемэнт дыскурсу эміграцыйнай літаратуры тут - творчасьць беларускіх пісьменьнікаў у Нямеччыне ў гады другой сусьветнай вайны. Тут жа прапануецца яе апісаньне паводле храналягічнага прынцыпу з разьбіўкай на пяць рубрык (проза, паэзія, драматургія, мэмуары, пераклады). Зь яго вынікае, што эміграцыйныя пісьменьнікі займаліся паэзіяй ды прозай і куды менш ахвотна перакладалі, пісалі мэмуары і п'есы. Выданьні драматургіі можна пералічыць на пальцах: у 1955-1959 гадах выходзяць друкам п'есы Натальлі Арсеньневай, Даната Баяна і Вацлава Пануцэвіча, у 1962, 1964, 1967 гадах - Алеся Змагара, Міхася Міцкевіча ды Міхася Кавыля і, пасьля доўгай пярэрвы, у 1996-м - «Драматычныя начыркі» Янкі Юхнаўца.

Вузкім месцам эміграцыйнай літаратуры былі таксама пераклады - гэтым разам ня толькі дзеля іх малалікасьці, але й дзеля іх нізкай якасьці. З 1946 і да 1997 году асобнымі выданьнямі выйшлі ўрыўкі твораў Р. Кіплінга, О. Уайльда, Д. Дэфо, Р. Стывэнсана, Дж. Сьвіфта, Яра Славутыча, раман Г. Сянкевіча «Quo vadis», «Роздумы» Марка Аўрэлія, «сярэдневяковая легенда» Парсіваль, каля дзясятка дыялёгаў

Плятона і першы поўны пераклад Бібліі на беларускую мову, які зь няясных прычынаў у кнізе ня згадваецца. Апрача былога супрацоўніка бэрлінскага выдавецтва «Вінэта» Яна Пятроўскага ніхто на эміграцыі перакладамі рэгулярна не займаўся.

У кнізе паняцьці «эміграцыя», «выгнаньне», «дыяспара» выкарыстоўваюцца як сынонімы, ад чаго раз-пораз парушаюцца лягічныя сувязі, напрыклад, паэзія Ўладзімера Жылкі залічаецца да эміграцыйнай літаратуры. Здаецца, ува Ўкраіне ці Польшчы яшчэ нікому не прыйшло да галавы называць Тараса Шаўчэнку або Адама Міцкевіча эміграцыйнымі пісьменьнікамі на той падставе, што і першы, і другі шмат гадоў правялі на чужыне. Распрацоўка навуковага клясыфікатара, каго і на якой падставе адносіць да літаратуры дыяспары, застаецца для беларускага літаратуразнаўства надзённым пытаньнем.

Эміграцыйная літаратура з гледзішча сваёй мастацкай стылістыкі прэзэнтуецца ў кнізе як пераважна літаратура рэалізму з дамешкамі рамантызму Ўладзімера Случанскага, «міталягічнай прозы» Сяргея Хмары і «экзыстэнцыяльнай паэзіі» Ўладзімера Дудзіцкага. Ідэі аб яе мастацкай спэцыфіцы выказваюцца спантанна, безь лягічнага разгортваньня і пазначэньня эмпірычнай базы, ад якой адштурхоўваецца аўтар. Таму гэтая кніга не пра эстэтычную прыроду і жанравую адметнасьць эміграцыйнага пісьменства, а хутчэй пра яго літаратурную інфраструктуру і нацыянальны калярыт.

Паўнавартаснай інфраструктуры літаратурнага працэсу на эміграцыі не паўстала. Не было створана выдавецтваў, якія б рэгулярна выпускалі творы эміграцыйных пісьменьнікаў, і кнігарняў, якія б прадавалі іх. Прайгравалі ад гэтага больш бэлетрысты, драматургі і публіцысты; паэты з сваімі малааб'ёмнымі творамі мелі большыя магчымасьці для публікацыі ў газэтах і часопісах. У выніку, па-першае, бэлетрысты й публіцысты пераважна друкавалі свае творы за свой жа кошт, і, па-другое, «друкаваная прадукцыя» прадавалася дзясяткі гадоў. Спробу Ўладзімера Пелясы ў 1953-1954 гадах паставіць на ногі камэрцыйнае выдавецтва напаткаў правал: яно зачынілася, выдаўшы тры паэтычныя

зборнічкі. Значна больш пасьпяховымі былі выдавецкія праекты мюнхенскай «Бацькаўшчыны» (1952-1962) і Беларускага інстытуту навукі й мастацтва ў Нью-Ёрку.

Дзеля адсутнасьці «ўнутрыэміграцыйнага» літаратурнага рынку было немагчыма зарабляць сабе на жыцьцё пісьменьніцкай працай. Бэлетрыст Юрка Віцьбіч працаваў упакоўшчыкам на ткацкай фабрыцы, лірыкі Алесь Салавей і Міхась Кавыль - электразваршчыкам і, адпаведна, прыбіральшчыкам на фабрыцы мэдыкамэнтаў. Празаікі Мікола Цэлеш уладкаваўся грузчыкам на лесапільні, а Іна Рытар - засольшчыцай агуркоў. На заводах і фабрыках (бо ніхто ня ведаў толкам ангельскай мовы і ня меў адпаведнай кваліфікацыі) давялося папрацаваць Масею Сяднёву і нават Натальлі Арсеньневай. За рэдкім выняткам, усім ім даводзілася зарабляць ня толькі сабе на жыцьцё, але й на выданьне сваіх твораў. Гэта прымусіла гісторыка Аўгена Калубовіча апублікаваць бальшыню сваіх твораў пасьля выхаду на пэнсію, а пісьменьніка Масея Сяднёва - надрукаваць свае раманы «І той дзень надышоў», «Раман Корзюк», папрацаваўшы дырэктарам беларускай службы радыё «Свабода». Шмат якія творы тых аўтараў, хто ня змог або не схацеў даць грошай на іх выданьне, у тым ліку Антона Адамовіча, Аўгена Кавалеўскага, Міхася Міцкевіча, Уладзімера Сядуры, Янкі Юхнаўца, Юркі Віцьбіча, дагэтуль ня выдадзеныя і расьцярушаныя ў архівах. Слабым месцам літаратурнага руху на эміграцыі была і літаратурная крытыка.

Нягледзячы на свой больш як сьціплы мастацкі набытак, паваенная эміграцыя была перакананая ў сваёй надзвычайнай місіі. На добры лад, гэтая мэгаляманія і стварае яе нацыянальны калярыт. Хай наша літаратура жанрава і стылёва бедная, але яна прасякнутая нацыянальнай ідэяй і любовяй да бацькаўшчыны, - прыкладна так разважалі эмігранты. Падобна разважае і Лявон Юрэвіч, які разумее літаратуру вельмі па-беларуску: не як вытворчасьць мастацкіх вартасьцяў, патэнцыйна цікавых ня толькі ў межах дадзенага нацыянальнага грамадзтва, але і за яго межамі, а як частку нацыянальнага праекту, пакліканага будзіць нацыянальную сьвядомасьць.

Рацыянальна гэты комплекс нацыянальнай звышпаўнавартасьці (у духу псыхааналізу яго можна інтэрпрэтаваць як вонкавую, публічную праекцыю прыхаванага комплексу непаўнавартасьці) абгрунтаваць немагчыма, таму ў гульню ўваходзіць міт. У яго аснове ляжыць створанае эміграцыяй уяўленьне пра саму сябе як пра адзіную захавальніцу нацыянальнай тоеснасьці і ўцёках нацыянальнай ідэі зь Беларусі за акіян: «Сфармуляваная ў «Нашай Ніве», найбольш яскрава выявіўшы сябе ва «Ўзвышшы», адроджаная ў «Беларускай (Менскай) Газэце», нацыянальная ідэя не засталася ў Беларусі», - піша Лявон Юрэвіч. Аднак нацыянальная ідэя не была ўпершыню сфармуляваная газэтай «Наша Ніва» - ідэалягічная дактрына мадэрнага беларускага нацыяналізму ўзьнікае на дзясятак гадоў раней. Пра тэарэтычнае ўзбагачэньне нацыянальнай ідэі літаратурна-мастацкім аб'яднаньнем «Узвышша» можа гаварыць толькі той, хто разумее нацыянальную літаратуру амаль па-гегельянску, як форму выяўленьня нацыянальнай ідэі. Яшчэ больш гіпатэтычны ўнёсак у яе «Беларускай (Менскай) Газэты». І нарэшце, выраз «нацыянальная ідэя не засталася ў Беларусі» сьведчыць, што фізычны адрыў ад бацькаўшчыны абарочваецца яе дэманізацыяй. Рэспубліка Беларусь уяўляецца тэрыторыяй нацыянальнай паразы і ганьбы. Нацыянальная ідэя перастае быць ідэяй, г. зн. духовай сутнасьцю, і набывае чалавечую плоць. Яе пэрсаніфікуюць пажылыя заакіянскія апосталы.

Аднак, ствараючы адной рукой гераічны міт пра эміграцыю, Лявон Юрэвіч сам жа другой рукой яго разбурае. На фоне рыторыкі пра эміграцыю як адзіную захавальніцу «любові да радзімы» і «вернасьці роднай мове» выяўляецца, што эміграцыйным можа быць пісьменьнік, які ня можа пахваліцца ні веданьнем беларускай мовы, ні якімісь іншымі адзнакамі нацыянальнай сьвядомасьці. Гаворка ідзе пра Андрэя Клёнава, якому ў кніжцы прысьвечаны асобны разьдзельчык побач з Алесем Салаўём і Янкам Юхнаўцом.

У асобе Лявона Юрэвіча мы маем самага дасьведчанага знаўцу нашай эміграцыйнай літаратуры, які пачынаючы з 1993 году выдаў і пракамэнтаваў сотні раней недаступных твораў. Іх значэньне было б большае, калі б аўтар раз і назаўсёды парваў з тым, што збліжае яго з сучасным беларускім

літаратуразнаўствам як зьявай.

4

Было б лягічна, каб аўтар кнігі аб прозе беларускай эміграцыі прысьвяціў яе вывучэньню прозы беларускай эміграцыі. Аднак замест гэтага ён вырашыў «канцэптуальна цэласна» і «ў агульнаславянскім кантэксце» прааналізаваць увесь эміграцыйны літаратурна-грамадзкі рух. Скажам адразу, дасягнуць гэтай цэласнасьці Алесю Пашкевічу не ўдалося.

Кніга важная тым, што адлюстроўвае характар навуковага сьветапогляду маладога пакаленьня беларускіх літаратуразнаўцаў. Пасьля лёсавызначальных для Беларусі падзеяў апошніх 15 гадоў ён застаецца пераходным і расколатым. Ужо сама спасылка на «агульнаславянскі кантэкст» паказвае, што аўтар кнігі, як і вядомыя беларускія палітыкі, існуе ў спэцыфічным «агульнаславянскім сьвеце» і зь нейкіх прычын баіцца выйсьці за яго межы. Да таго ж, яго разуменьне вельмі неглыбокае й вычэрпваецца расейскім, украінскім, польскім, баўгарскім «кантэкстамі» ды літаральна двума словамі пра славацкі.

Гэтаму сьветапогляду таксама ўласьціва вялікая ступень карпаратыўнай зьвязанасьці. Кола навуковых аўтарытэтаў яго носьбіта вычэрпваецца творамі ўсім добра вядомых пэрсанажаў беларускага літаратуразнаўства. Апрача гэтага, ён існуе ў ізаляцыі ад сучаснага літаратуразнаўства і не чытае кніжак на заходніх мовах. Нарэшце, гэты сьветапогляд эклектычны. У ягонага носьбіта ўжо пачалася, але яшчэ ня скончылася пераацэнка ідэйных установак традыцыйнага бээсэсэраўскага літаратуразнаўства. Як вынік, нацыяналістычная рыторыка і антыкамуністычны энтузіязм тут спалучаюцца з прынцыпова дадатным стаўленьнем да бээсэсэраўскага літаратурнага афіцыёзу. Згодна з Пашкевічам, раманы Шамякіна закладалі асновы нацыянальнага сьветапогляду.

А. Пашкевіч вылучае ў ХХ стагодзьдзі дзьве хвалі эміграцыі. Першая (Вацлаў Ластоўскі, Францішак Аляхновіч, Віктар Вальтэр і інш.) накацілася пасьля няўдалага досьведу беларускай дзяржаўнасьці на зломе 10-х і 20-х гадоў ХХ

стагодзьдзя, другая - пасьля падзеяў другой сусьветнай вайны. Першая разьвівала і ўзбагачала пераважна мадэрнісцкімі элемэнтамі традыцыю «Нашай Нівы», другая пераймала традыцыі «ўзвышэнства». Асяродкамі першай хвалі былі Вільня («якая пасля імперскіх палітычных падзелаў перастала лічыцца і беларускім горадам»), гарады і мястэчкі Літвы, Латвіі, Чэхіі і, нарэшце, Нямеччыны, другой - т. зв. «вольны сьвет». Пісьменьнікі другой хвалі (1) «дапраходжвалі асноўныя «ўзвышаўскія» эстэтычна-мастацкія знакі-дамінанты: аквітызм, арфізм, красу, дэміургавасць, культурны гістарызм і інш.», (2) працягвалі літаратурныя традыцыі Савецкай Беларусі, перарваныя ў канцы 30-х - пачатку 40-х гадоў, (3) «асвойвалі найбольш значныя дасягненні і нямецкай, французскай, амерыканскай і расійскай эміграцкай прозы».

Гэтая канструкцыя не вытрымлівае крытыкі. Залічэньне Францішка Аляхновіча або Віктара Вальтэра ў разрад пісьменьнікаў-эмігрантаў, як і сарамяжлівыя прызнаньні, што Ігнат Абдзіраловіч «напісаў сваё эсэ «Адвечным шляхам» за межамі Беларусі», не патлумачыць інакш, як капрызам агістарычнай сьвядомасьці, якая ўспрымае геапалітычныя рэаліі пачатку ХХ стагодзьдзя з пункту гледжаньня пазьнейшых на сто гадоў адміністрацыйна-тэрытарыяльных падзелаў. Гэтыя пісьменьнікі ні ў якую эміграцыю не падаваліся і жылі і памерлі там, дзе прыйшлі на гэты сьвет: Аляхновіч і Абдзіраловіч - у Вільні, а Вальтэр - у Дзьвінску. Тэзы пра мадэрнізм як мастацкі стыль позьняга Ластоўскага або дамінаваньне «аквітызму, арфізму, красы, дэміургавасці, культурнага гістарызму» ў эміграцыйнай літаратуры, роўна як і пра яе ўплыў на літаратуру мэтраполіі, не падмацаваныя тэксталягічным аналізам і дзеля гэтага выглядаюць як асабістыя фантазіі іх аўтара (пагатоў ён ня даў азначэньня гэтых часам загадкавых тэрмінаў).

Ідэі аб перайманьні літаратурнай традыцыі Савецкай Беларусі, якая перарываецца ў канцы 30-х - пачатку 40-х гадоў, і асваеньні здабыткаў заходняй ды расейскай эміграцыйнай прозы маглі быць народжаныя толькі ненавуковай сьвядомасьцю, што настойвае на стварэньні свайго паралельнага сьвету, у якім ня дзейнічаюць звычайныя

прычынна-выніковыя сувязі. Першая зь іх грунтуецца на прынятай «па замоўчваньні» сучасным беларускім літаратуразнаўствам устаноўцы, згодна зь якой у 30-я гады ў нашай літаратуры працягваецца росквіт, зьяўляюцца шэдэўры накшталт «ляўкоўскага цыклу» Янкі Купалы, і толькі парушэньні законнасьці пры канцы дзесяцігодзьдзя ставяць на гэтым прагрэсе крыж. Аднак насамрэч разрыў гэтай шмат у чым вельмі ўмоўнай традыцыі адбываецца амаль дзесяць гадоў раней, на мяжы 20-х і 30-х. Можна вызначыць яго фізычна асязальныя індыкатары: з аднаго боку, масавы перасьлед пісьменьнікаў, распачаты камуністычнай уладай у 1930-м, з другога - пасьпешлівае асваеньне рэштай, якая засталася на волі, новай мастацкай стылістыкі і пісьменьніцкай этыкі, дзеля чаго і адбываецца гэты разрыў.

Па-другое, эміграцыйныя пісьменьнікі фактычна не былі інтэграваныя ў заходнюю літаратурную супольнасьць. У Міжнародны ПЭН-клюб уваходзіў толькі Рыгор Крушына. Пад словамі Янкі Золка, які прызнаваўся, што яго амэрыканства заканчваецца амэрыканскім грамадзянствам, бо за час свайго побыту ён не засвоіў ні мовы, ні літаратуры, ні традыцыяў гэтай краіны, падпісаўся б не адзін Янка Станкевіч. Згодна з Макмілінам, у творчасьці эміграцыйных пісьменьнікаў, што апынуліся ў Амэрыцы, адсутнічае (за адным выняткам - прозы Сядуры) апісаньне гэтай краіны, а таксама яе насельнікаў. Ня будзем тлумачыць чаму.

Не было таксама перакладаў эміграцыйных пісьменьнікаў на заходнія мовы, як і, за выняткам пары падборак, іх перакладаў з сучаснае заходняе і расейскае літаратуры. Спроба Кастуся Акулы напісаньнем раману на ангельскай мове «Tomorrow is Yesterday» прарвацца на заходні літаратурны рынак прынесла толькі расчараваньні і фінансавыя страты. За рэдкім выняткам, эміграцыйныя пісьменьнікі былі ня прагнымі да культурных кантактаў інтэлектуаламі, а заклапочанымі будзённымі клопатамі адраджэнцамі, чый інтэлектуальны профіль, улучна з слабым валоданьнем заходнімі мовамі, сфармаваўся яшчэ да эміграцыі. Пальцаў адной рукі хопіць, каб пералічыць тых, хто зрабіў кар'еру ў заходніх унівэрсытэтах.

Гэтыя ідэі, аднак, добра характарызуюць мысьленьне Алеся Пашкевіча. Па сваёй прыродзе ён ня крытык літаратуры, а яе апалягетык. Калі, думае Пашкевіч, эміграцыйная літаратура - зьява выдатная й велічная, яна ня можа існаваць у адрыве ад сусьветнага кантэксту. (Упершыню антынавуковую ідэю, што, калі да беларускай літаратуры мэтраполіі дакінуць літаратуру эміграцыі, у нас выйдзе адна з найбагацейшых у Эўропе літаратур, гадоў дзесяць таму выказаў прафэсар Алег Лойка.)

Апалягетычнае мысьленьне грунтуецца на іншых перадумовах, чымся рацыянальнае. Для апалягетыка важная пачуцьцёвая экзальтацыя, сьцьвярджальны патас, рамантычны аплёмб. Халодныя вымогі навуковага ratio для яго не існуюць. Ня варта зьдзіўляцца, што ў кніжцы шмат памылак. Тут ставіцца пад сумнеў нават храналёгія сусьветнай гісторыі - намёкам на тое, што Аўстра-Венгерская імпэрыя распалася на 50 год раней за «расейскую царскую дзяржаву» («Расійская царская дзяржава ... распалася пазней Аўстрыйскай, а таму яе народы ... паўставалі да нацыянальнага жыцця і ўласнага дзяржавабудавання амаль на паўстагоддзя пазней»). Шмат недакладнасьцяў маюць пытаньні з абсягу «літаратурнай гістарыяграфіі»: аўтарства кнігі «Вяртання маўклівая споведзь: Постаці творцаў беларускай гісторыі ў кантэксце часу» прыпісваецца яе рэдактару Юрасю Гарбінскаму, тым часам як гэта была калектыўная манаграфія, у якой свае артыкулы апублікавалі амаль 20 аўтараў. Драматург Аўген Кавалеўскі памёр не ў 1965 годзе і не ў Парыжы, а 1963 годзе ў Руане. Паведамленьне з спасылкай на Масея Сяднёва пра тое, што Юрка Віцьбіч жыў у Рэгенсбургу ў адным доме зь Ю. Верашчакам, - дзіўная фантазія. Ю. Верашчака - адзін з псэўданімаў Вацлава Ластоўскага, чый зямны шлях на той момант ужо завяршыўся ўдалечыні ад Нямеччыны. Мэмуары Яна Пятроўскага былі выдадзеныя ня ў двух, а ў трох тамах. Гісторык Язэп Найдзюк ня быў «найбольш вядомым гісторыкам беларускага эміграцкага руху». Яўхім Кіпель упершыню апублікаваў «Тэстамэнт» Уладзімера Жылкі не на эміграцыі, а ў ваенным Менску. Нарыс Уладзімера Сядуры «Смаленшчына - адвечная беларуская зямля» быў выдрукаваны не ў 1963 годзе ў Амэрыцы, а ў 1944 годзе ў Бэрліне, а яго правільны назоў «Смаленшчына - адвечная зямля беларускага народу». Часопіс

«Узвышша» меліся аднавіць «не ў другой палове 40-х», а ў першай: выйшлі нават сыгнальныя асобнікі першага «адноўленага» нумару, але аддрукаваць увесь наклад выдаўцам перашкодзіў прыход Чырвонай Арміі.

Самае ж прыкрае ў кнізе - не фактычныя недакладнасьці, а павярхоўнае знаёмства з тымі тэкстамі, аналізу якіх яна нібыта прысьвечаная. Возьмем, напрыклад, аналіз раману «Драбы» Ўладзімера Случанскага. Для апалягетыка гэты раман - ня толькі непераўзыдзены ўзор гістарычнай прозы, але важнае дасягненьне культурнага разьвіцьця ўсёй нацыі, якое дало штуршок і нацыянальнай літаратуры, і нацыянальнай гістарыяграфіі:

Сваім раманам «Драбы» У. Случанскі ўпершыню ў беларускай літаратуры пазначыў галоўныя высновы беларускай гістарычнай навукі XX стагоддзя: сэрца летапіснай Літвы - Наваградак, яно знаходзіцца ў цэнтры сённяшняй Беларусі. А таму можна ўпэўнена сцвярджаць, што навуковая канцэпцыя М. Ермаловіча пра месцазнаходжанне летапіснай Літвы і яе мастацкая ілюстрацыя ў беларускай прозе ў рамане Г. Далідовіча «Кліч роднага звона» мелі ў «Драбах» свой першапачатак.

Па ўсёй кніжцы раскідана многа ацэнак «Драбам» («адметны як у зместавым, так і ў фармальным планах твор», у якім «у гістарычнай перспектыве змадэляваны сімвал духоўнага і дзяржаўнага быцця-ўладкавання Літвы-Беларусі»). Ім папярэднічае катэгарычнае: «На эміграцыі ж твор У. Случанскага меў толькі ўхвальныя водгукі».

Гэта не зусім так. У выдаваным у ЗША «Летапісе беларускай эміграцыі» (№ 29 за 1985 год) на яго была зьмешчаная крытычная рэцэнзія Часлава Будзькі, у якой ён скрупулёзна аналізуецца з пункту гледжаньня адпаведнасьці гістарычным рэаліям. І тут выяўляецца, што аўтар «Драбаў» быў вялікі блытаньнік. Ён зблытаў хана Залатой Арды часоў бітвы на Ворскле Цімура Кутлука зь яго сучасьнікам, военачальнікам Цімурам Кульгавым, які незадоўга да гэтай бітвы зрабіў зьнішчальны рэйд углыб залатаардынскай тэрыторыі, адкрыўшы тым самым шлях для літоўскай экспансіі. (Цімур Кульгавы ў «Драбах» - хан Залатой Арды.) Ня ўсё добра і зь

іншым гістарычным пэрсанажам - «удзельным князем слуцкім, з слаўнага роду Алелькавічаў - у недалёкім мінулым вялікім рубакам і нястомным наезьнікам, а зараз ужо старым і аслабеўшым, сівым як лунь». Дынастыя Алелькавічаў была запачаткаваная Альгердавым унукам Алелькам. У 1399 годзе - у якім адбываецца дзеяньне - пра ніякіх Алелькавічаў гаварыць яшчэ не выпадала, бо сам заснавальнік дынастыі ня выйшаў зь дзяцінага веку. Маскоўскі агент і па сумяшчальніцтве праваслаўны мітрапаліт Фоцій тытулюецца «мітрапалітам маскоўскім і наваградзкім», дарма што ў той час існавала толькі тытулятура «кіеўскага мітрапаліта». Не была вядомая пісьменьніку Случанскаму розьніца паміж Крыжацкім Ордэнам у Прусіі і Ордэнам Мечаношаў у Лівоніі, як і прыкладная дата паўстаньня гусіцкага руху ў Чэхіі.

Ня будзем спыняцца на ўсіх дэталях крытыкі - зь яе вынікае, што гістарычныя веды Случанскага былі фрагмэнтарныя, а лёгіка нарацыі падпарадкаваная вульгарна зразуметым нацыянальным інтарэсам (таму цела аповесьці населена падступнымі палякамі і маскоўцамі). Выснова Часлава Будзькі адназначная: «Дыскусія можа быць толькі, ці Случанскі напісаў благую гістарычную аповесьць, ці папросту - шкодную макулятуру».

І гісторыя з «Драбамі», і паняцьцёвая блытаніна, і фактычныя няўвязкі сьведчаць, што літаратурнага апалягетыка мала займае элемэнтарна карэктны аналіз літаратурнага твору або пэўнай літаратурнай фармацыі. Не яму ён прысьвячае свае кнігі, а самому сабе і сваім амбіцыям.

Тое, што сучаснае беларускае літаратуразнаўства знаходзіцца ў крызысе, ня раз канстатавалася ў незалежным друку. Прынамсі па дзьвюх пазыцыях - характары навуковага сьветапогляду і ўжываных мэтадалёгіяў (на месца ідэалягічных усё часьцей прыходзяць мэтадалягічныя абмежаваньні) - гэты крызыс далёкі ад пераадоленьня. Маладая зьмена гніламёдавых і навуменак па-ранейшаму ня ўмее рабіць вольных ад візіянэрства высноваў і абагульненьняў. І піша кнігі, якія ня менш эфэктыўна за сваіх папярэдніц фальсыфікуюць літаратурную рэальнасьць.

Насуперак сваёй назьве, кніга Лідзіі Савік прысьвечана вылучна эміграцыйным паэтам - Натальлі Арсеньневай, Уладзімеру Дудзіцкаму, Хведару Ільляшэвічу, Янку Золку, Міхасю Кавылю, Уладзімеру Клішэвічу, Рыгору Крушыну, Алесю Салаўю і Масею Сяднёву. З спасылкай на Аўгена Калубовіча, які зьвязваў першую хвалю эміграцыі з разгромам паўстаньня Касьцюшкі, Савік называе паваенную эміграцыю восьмай па ліку ў нацыянальнай гісторыі.

Ідэя ў кнізе фактычна адна, толькі выражаецца дзясяткамі схалястычных спосабаў: працягваючы традыцыі нашаніўства, эміграцыйная літаратура была формай захаваньня і прапаганды беларускай нацыянальнай сьвядомасьці. У згадцы пра «нашаніўскую традыцыю» (якая, між іншага, нарадзіла мастацкі сьвет Масея Сяднёва) няма і ценю палемікі з Алесем Пашкевічам. Гэтая традыцыя папросту сымбалізуе для аўтаркі пачаткі ўсёй новай беларускай літаратуры. Лідзія Савік шмат дзе была і многа што бачыла, таму ў яе тоўстай кнізе параскідана багата цікавых зьвестак і цытатаў з рэдкіх крыніцаў. Ад кніжкі Алеся Пашкевіча яе таксама адрозьнівае простая кампазыцыя. Гэтым, аднак, сур'ёзныя адрозьненьні паміж гэтымі дзьвюма кніжкамі і абмяжоўваюцца. Усьлед за Пашкевічам Савік залічае ў эмігранты Вацлава Ластоўскага, Браніслава Тарашкевіча і Францішка Аляхновіча, «зьнішчанага ў часы сталіншчыны» (?). Збліжае іх і падмена аналізу літаратурных твораў суб'ектыўнымі імпрэсіямі зь іх нагоды, схільнасьць да ірацыянальнага, фрагмэнтарнае веданьне дасьледаванай тэмы і паталягічная боязь распачаць сур'ёзную дыскусію пра самую казытлівую старонку жыцьцяпісу эміграцыі - пэрыяд другой сусьветнай вайны.

Пад схільнасьцю да ірацыянальнага тут разумеецца вылучэньне і навязваньне ідэяў, якія супярэчаць навуковаму сьветапогляду. Нярэдка яны проста алягічныя («амаль усе пісьменнікі-эмігранты былі сучаснікамі старэйшага пакалення беларускай творчай інтэлігенцыі»), але часьцей навеяны тым, што ў нас прынята называць «нацыянальнай гордасьцю».

У вэрсіі Савік усе пісьменьнікі-эмігранты валодаюць асноўнымі

эўрапейскімі мовамі, але пішуць толькі на роднай (гэтая думка фармулюецца двойчы). На шчасьце, гэта не адпавядае сапраўднасьці. Кастусь Акула, Уладзімер Сядура і Антон Адамовіч пісалі па-ангельску, Юрка Віцьбіч, Міхась Кавыль і Мікола Цэлеш - па-расейску. Увогуле, жыцьці й кар'еры эміграцыйных пісьменьнікаў ува ўлоньні іншых культур складаюць асобны інтэлектуальны сюжэт. Уладзімер Сядура ў Амэрыцы перарадзіўся ў дасьледніка творчасьці Дастаеўскага, якому прысьвяціў пару выдадзеных па-ангельску кніжак, Масей Сяднёў і Ўладзімер Клішэвіч нейкі час выкладалі расейскую мову ў амэрыканскіх каледжах, а Ўладзімер Дудзіцкі ў Вэнэсуэле - навуку аграноміі. Англамоўным пісьменьнікам давялося пабыць нават аднаму з палітычных лідэраў эміграцыі Міколу Абрамчыку, які ў 1950 годзе выпусьціў у Канадзе кніжку «I Accuse the Kremlin of Genocide of my Nation».

Іншы сантымэнт зьвязвае Савік зь Вільняй, у якой, на яе думку, на пачатку ХХ стагодзьдзя «скрозь гучала беларуская мова». Каб зразумець, што гэта ня так, досыць прыгадаць віленскія прыгоды лірычных герояў Францішка Багушэвіча або Якуба Коласа. Як і цяпер, сто гадоў таму горад быў тэрыторыяй, у якой панавалі мовы нацыянальных культур, а не этнічных супольнасьцяў. У тагачаснай Вільні беларуская мова была мовай вузкіх інтэлігенцкіх асяродзьдзяў (якія і колькасьцю ўдзельнікаў, і прадукцыйнасьцю культурнай працы сур'ёзна прайгравалі нават літоўскай інтэлігенцыі, ня кажучы ўжо пра іншых) і, часткова, гарадзкіх нізоў. У гэтым сэнсе за сто гадоў мала што зьмянілася.

Савік памыляецца часта і ў дачыненьні да шырокага кола пытаньняў. Блытаніна ў яе пачынаецца ўжо зь першых радкоў прадмовы, згодна зь якой, але насуперак відавочнасьці Рыгор Крушына пачаў друкаваць свае творы ў 30-40-х, а Кастусь Акула - толькі на эміграцыі. Спынімся толькі на прынцыповых момантах: на эміграцыі ў Юркі Віцьбіча выйшаў не адзін, а два зборнікі нарысаў - «Плыве з-пад сьвятое гары Нёман» (Мюнхен, 1956) і «Мы дойдзем» (Нью-Ёрк, 1974). Раман Генрыка Сянкевіча «Quo Vadis» на беларускую мову пераклаў не Ўладзімер Дудзіцкі, а Пятро Татарыновіч. Кнігі Аркадзя Смоліча і Ўсевалада Ігнатоўскага ніколі не перавыдаваліся на

эміграцыі. Антон Адамовіч «пачаў» не ў 30-х, а ў 20-х гадах. Віленскі часопіс «Калосьсе» стаў выходзіць не ў 1932, а ў 1935 годзе. Нямецкая акупацыя Менску доўжылася не 4, а 3 гады. Падчас другой сусьветнай вайны ў Слоніме выдавалася не «Слонімская газета», а «Слонімскі кур'ер» (лацінкай). Янка Золак, прыехаўшы ў Беларусь у 1994 годзе, ня мог быць удзельнікам Першага зьезду беларусаў сьвету, які адбыўся ў 1993 годзе. Слова «Крыўя» было ўведзена ўва ўжытак ня Ўсеваладам Ігнатоўскім, а Янкам Станкевічам (у такой форме). У Аўстраліі Алесь Салавей стаў не Альфрэдам, а Альбэртам Кадняком, і гэтае прозьвішча не было дзявочым прозьвішчам яго жонкі.

Пра такія пісаньні звычайна гавораць, што з сваім выхадам яны спазьніліся на пяць, дзесяць ці колькі там яшчэ гадоў. Нават калі гэта так, «Пакліканыя» зьяўляюцца вельмі сучаснай ілюстрацыяй да таго, як піша, наколькі глыбока думае і што ведае сучаснае беларускае літаратуразнаўства. Бо адказнасьць за такія выданьні нясуць ня толькі іх аўтары, але і ўстановы, якія рэкамэндуюць іх да друку і практычнага выкарыстаньня, - у гэтым выпадку Вучоная рада Інстытуту літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі.

6

«Беларуская літаратура дыяспары» - трэцяя па ліку кніга Арнольда Макміліна, прысьвечаная нашаму краснаму пісьменству. Раней былі працы «A History of Byelorussian Literature: From its Origins to the Present Day» (1977, выклікала ідэалягічна вытрыманыя рэцэнзіі ў тагачасным беларускім друку) і «Belarusian Literature in the 1950s and 1960s. Release and Renewal» (1999, перавыдадзеная праз два гады па-беларуску).

У прадмове да кнігі Макмілін гаворыць пра гісторыю яе стварэньня. Ён адзначае, што першапачаткова меркаваў напісаць гісторыю беларускай літаратуры, пачынаючы з 1970 году і да сёньняшняга часу, улучыўшы ў яе разьдзел пра эміграцыйных аўтараў. Але хутка зразумеў, што пра саму «дыяспарную» літаратуру можна лёгка напісаць цэлую кніжку, што й было зроблена.

Кампазыцыйна «Беларуская літаратура дыяспары» істотна розьніцца ад падобных твораў беларускіх аўтараў, якія схільныя атаесамляць паняцьці «эміграцыя», «выгнаньне» і «дыяспара». Яна распадаецца на тры няроўныя часткі: эміграцыйная літаратура, беларуская літаратура ў сучаснай усходняй Эўропе і беларуская літаратура Польшчы. Памер першай і трэцяй частак прыкладна аднолькавы, другая ж амаль на парадак меншая (такім чынам, структура кнігі навязвае думку аб раўназначнасьці эміграцыйнай літаратуры і літаратуры беларускай меншыні Польшчы).

Ува «Ўводзінах» гаворыцца, што кожная «дыяспарная» («expatriate») літаратура абавязкова мае дзьве асноўныя формы. Першая, якую можна назваць чыста дыяспарнай, прадстаўлена творамі, напісанымі за палітычнымі межамі краіны пісьменьнікамі, якія зьвязаны зь ёй сваім этнічным паходжаньнем і, часткова, сваёй мовай. Другая, уласна эміграцыйная, - творчасьцю тых, хто быў змушаны падацца ў эміграцыю з сваёй бацькаўшчыны. Згодна з гэтым у масіве агульнай дыяспарнай літаратуры вылучаюцца тры падтэмы: літаратура эміграцыі, творчасьць беларускіх пісьменьнікаў Расеі, Латвіі, Украіны і беларускай меншыні Польшчы. Нарэшце, апошняя важная заўвага датычыць правапісу кірылічных цытатаў (у кнізе цытаты з паэзіі даюцца сьпярша на мове арыгіналу, пасьля - у падрадковым ангельскім перакладзе) - аўтар сьцьвярджае, што беларуская артаграфія тут «нармалізаваная шляхам пазначэньня мяккіх зычных», г. зн. адпавядае таму, што ў нас называецца тарашкевіцай. На жаль, правапіс цытат - найслабейшае месца гэтай у цэлым зьмястоўнай кнігі. Выявіўшы ў іх пад сотню памылак, мы спынілі падлікі.

Кніга знаёміць англамоўнага чытача зь Петрукамі, Нінкамі, Алікамі і іншымі пэрсанажамі літаратуры дыяспары. Пра яе макра- і мікралітаратурныя аналізы трэба пагаварыць асобна. Нягледзячы на агульную культуру дасьледаваньня, макралітаратурны аналіз часам вызначаецца павярхоўнасьцю і супярэчнасьцямі, а мікралітаратурны грашыць анахранізмамі, мадэрнізацыямі, геаграфічнымі і біяграфічнымі неадпаведнасьцямі, моўнымі скажэньнямі і іншымі

недакладнасьцямі.

Макмілін падтрымлівае тэзу, згодна зь якой эміграцыйныя пісьменьнікі пісалі на тэмы, якія былі забароненыя ў БССР, г. зн. заклікалі ратаваць родную мову і адстойвалі права нацыі на нацыянальную незалежнасьць, пры гэтым, з пункту гледжаньня мастацкай прыроды сваіх твораў, рэдка калі адыходзячы ад эстэтыкі «Нашай Нівы». Усе паэты, якім пашчасьціла вырвацца з гравітацыйнага поля «нашаніўства», перажылі ўплывы Максіма Багдановіча (ён абвяшчаецца паэтам, які вырас з традыцыі «Нашай Нівы» і, усьведамляючы патрэбу паляпшэньня слоўніка, рымаў і рытмікі, пераўзышоў яе, прышчапіўшы сваім літаратурным наступнікам, у тым ліку некаторым эміграцыйным паэтам, любоў да кананічных формаў), празаікі - Вацлава Ластоўскага. У адрозьненьне ад Алеся Пашкевіча, Макмілін не залічвае Ластоўскага і да яго падобных у катэгорыю эміграцыйных літаратараў, а таксама ня схільны акцэнтаваць уплыў «Узвышша» на літаратуру беларускай эміграцыі, дарма што прынагодна зазначае, што на фармаваньне творчай індывідуальнасьці Алеся Салаўя ўплывала паэзія Жылкі і Дубоўкі. Асобныя разьдзелы прысьвечаны творчасьці Янкі Юхнаўца (з прычыны яе экспэрымэнтальнасьці і максымальнай аддаленасьці ад традыцыі «Нашай Нівы»), Ларысы Геніюш (заслугоўвае адмысловага месца ў сэрцах беларусаў дзякуючы свайму пакутніцкаму лёсу), Натальлі Арсеньневай і Масея Сяднёва.

Кожны мікрааналіз тут заканчваецца ацэнкамі. Алесь Салавей выяўляецца адным з найлепшых майстроў санэту ў беларускай літаратуры, рупным і часам бліскучым вэрсыфікатарам. Янка Золак тым часам - безумоўна малазначны паэт, чые найлепшыя творы былі створаны ў гады апошняй вайны. Янка Юхнавец паўстае адзіным паэтам свайго пакаленьня, якога з поўным правам можна назваць авангардыстам, дзякуючы здольнасьці спалучаць філязофскія падтэксты зь сьмелымі лінгвістычнымі экспэрымэнтамі. Рыгор Крушына характарызуецца як кансэрватыўны творца, схільны да нараканьняў на жыцьцё ўдалечыні ад бацькаўшчыны. Моцны бок паэзіі Ўладзімера Дудзіцкага ў яе мове - вялікім слоўнікавым запасе і частых сынтаксычных інвэрсіях. Паэзія Міхася Кавыля вылучаецца

тым, што на 90 працэнтаў была створана на эміграцыі. Пасьля Багдановіча толькі Арсеньнева далёка адышла ад запачаткаванай Багушэвічам традыцыі зацыкленасьці на сацыяльных пытаньнях.

Для Макміліна літаратурная крытыка цесна зьвязана з вызначэньнем літаратурнай гіерархіі. Ён прызнае вядучым паэтам эміграцыі Масея Сяднёва, які надзвычайна ўзбагаціўся дзякуючы сваім кантактам зь вялікай нямецкай культурай. Гэтыя кантакты выклікалі значныя зьмены ў фармальных аспэктах яго паэзіі, асабліва ў мэтрыцы і жанравай прыродзе. Сяднёў пачаў ужываць модны белы верш, пісаць вялікія паэмы і нават рытмізаваную прозу, а яго паэзія пачала напаўняцца вялікай колькасьцю літаратурных і іншых рэмінісцэнцыяў, у тым ліку ліку на творы Пушкіна. Усё гэта прымусіла Макміліна лічыць Сяднёва найважнейшым беларускім паэтам XX стагодзьдзя, а яго творчасьць - вяршыняй дасягненьняў эміграцыйнай паэзіі.

На думку Макміліна, эміграцыйная проза прайграе паэзіі па сваім літаратурным значэньні, што, аднак, не прыніжае яе важнасьці. Як і Пашкевіч, ён бачыць яе перш-наперш у славянскім кантэксьце (ад якога неадрыўная нават творчасьць Кастуся Акулы). Аднак - ужо ў адрозьненьне ад Пашкевіча, чыя градацыя грунтуецца на адвольным залічэньні да эміграцыйнай прозы твораў, напісаных Антонам Адамовічам і Лявонам Савёнкам яшчэ да эміграцыі зь Беларусі, - Макмілін не вылучае сатырычнай прозы як яе трэцяга «асноўнага тыпу», абмяжоўваючыся гістарычнай і мэмуарнай. Сярод гэтых дзьвюх разнавіднасьцяў дамінуе гістарычная або квазігістарычная проза, якая распадаецца на фальклёрна-гістарычную і кніжна-гераічную. У аўтарах гістарычнай прозы апынаюцца стваральнік «прымітыўных ваенных апавяданьняў» Алесь Змагар, Уладзімер Сядура, Пётра Сыч, Антон Адамовіч і інш. Мастацкая проза Ўладзімера Сядуры - аднаго з найбольш плённых эміграцыйных пісьменьнікаў, калі меркаваць па памеры напісанага, - характарызуецца як вельмі пасрэдная. Макмілін вітае Сядураву спробу апісаць Новы сьвет, але лічыць яе вынік вельмі няўдалым. Канчаецца гэты разьдзел простай і па-свойму ўнівэрсальнай высновай: у краіне, гісторыя якой

адмаўляецца, фальсыфікуецца і перакручваецца, гістарычная проза мае трансьлітаратурнае значэньне.

Згодна з Макмілінам, родапачынальнікамі мэмуарнай традыцыі эміграцыйнай прозы выступаюць Казімер Сваяк, Вінцук Адважны і Аўген Калубовіч, а найбольшым здабыткам зьяўляецца раманістыка Масея Сяднёва і, у меншай ступені, Кастуся Акулы. У вэрсіі Макміліна Сяднёў пераўзышоў сваіх калег стылёвым багацьцем і моўнай вышуканасьцю сваіх раманаў «І той дзень надышоў» ды «Раман Корзюк», якія «будуць жыць разам з найлепшымі творамі пісьменьнікаў нашкталт Янкі Брыля, Васіля Быкава і Івана Пташнікава».

Гэтым, здавалася б, абгрунтаваным высновам і ацэнкам уласьцівыя, аднак, унутраныя супярэчнасьці. Пачнём з паэзіі. Паводле Макміліна, яна фактычна спалучае неспалучальнае: з аднаго боку, адрозьніваецца «багацьцем і разнастайнасьцю», з другога - зьяўляецца ультракансэрватыўнай, а вэрсыфікацыйныя здольнасьці бальшыні яе ствараьнікаў - надзвычай нізкімі. (Гэтаксама і з эміграцыйнай прозай: сьпярша будзе падкрэсьлена яе важнасьць, а пасьля сьцьверджана, што яна выклікацьме адно гістарычны інтарэс.)

Па-другое, Макмілін хінецца да абсалютызацыі ролі Максіма Багдановіча, які вырастае ў адзінага трэгера заходнеэўрапейскіх і клясычных вершаваных памераў (санэт, актава, канцона, трыялет) у беларускую паэзію і ад узьдзеяньня якога ня могуць вызваліцца нават найбольш кансэрватыўныя паэты, верныя сыляба-тоніцы. Насамрэч калі Багдановіч сапраўды папулярызаваў у нашай паэзіі трыялет і санэт (хаця санэты пісалі ягоныя сучасьнікі Янка Купала, Зьмітрок Бядуля, Паўлюк Трус, Уладзімер Дубоўка і інш.), то актаву ў беларускую літаратуру ўвёў Янка Купала, а Багдановіч па сутнасьці не карыстаўся гэтым вершаваным памерам, як і не карыстаўся канцонай, факты ўжываньня якой у беларускай літаратуры застаюцца адзінкавымі. Зьвядзеньне заходнеэўрапейскіх і, шырэй, мадэрнісцкіх уплываў на эміграцыйную паэзію да асобы Максіма Багдановіча мае суб'ектыўны характар яшчэ й таму, што запярэчвае інсьпірацыі іншых эўрапейскіх літаратур, хай сабе з такога мілага

Макміліну славянскага сьвету.

Адпаведнік Багдановіча ў абсягу гістарычнай прозы - Вацлаў Ластоўскі. Імпульс, дадзены ім гістарычнай прозе, быў нагэтулькі моцны, што не запыніўся на эміграцыйных пісьменьніках і даляцеў да Ўладзімера Караткевіча з Уладзімерам Арловым, «найбольш выдатных беларускіх раманістаў».

Між тым цьверджаньні накшталт «Віцьбіч пісаў сваю прозу ў духу Вацлава Ластоўскага» або «Случанскі насьледаваў інсьпірацыям Вацлава Ластоўскага» яшчэ больш галаслоўныя, чымся ў выпадку Багдановіча. Проза Ластоўскага не магла мець шырокага ўзьдзеяньня прынамсі з прычыны свайго вельмі вузкага абарачэньня: упершыню асобным выданьнем яна выйшла ў Мюнхене ў 1956 годзе (укладальнік мюнхенскага выданьня ў сваёй прадмове называе Ластоўскага «мала ведамым пісьменьнікам»). Апрача гэтага, Макмілін разумее гістарычную прозу Ластоўскага надзвычай тэндэнцыйна, як увасабленьне тыпова нацыяналістычнага сьветапогляду, разглядаючы тым самым яе аўтара не як пісьменьніка, а як настроенага на прадукаваньне нацыяналістычнай міталёгіі ідэоляга, які між іншага стварыў фікцыю залатога веку беларусаў. Лішне гаварыць, што гэтая «фікцыя» была створаная на пару дзясяткаў гадоў раней за Ластоўскага паводле ўнівэрсальных эўрапейскіх законаў пабудовы нацыянальнага міту.

Макмілін, як сьведчыць яго аналіз, таксама не пайшоў далей за першае павярхоўнае знаёмства з «Драбамі» Случанскага. Гэты твор, на ягоную думку, багаты дэталямі, гістарычнымі характарамі і падзеямі, улучна з «выдатнымі карцінамі аднастайных краявідаў Беларусі, у лясох якой вядуцца мядзьведзі і іншыя дзікія зьвяры», а ягоны аўтар сур'ёзна рыхтаваўся да яго напісаньня.

Думаецца, існуюць дзьве асноўныя прычыны гэтай павярхоўнасьці - непераадолены моўны бар'ер і праблемная праца з крыніцамі. Абедзьве яны, як у фокусе, сышліся пры аналізе прозы Антона Адамовіча, якая чамусьці аднесена да «гістарычнай». Зь вялікага і надзвычай цікавага празаічнага

даробку Адамовіча Макмілін ведае і аналізуе толькі адно апавяданьне «Афрадыта-Ост». Яго дзеяньне адбываецца ў Нямеччыне незадоўга да яе капітуляцыі. Галоўны герой апавяданьня едзе ў цягніку толькі ў аднаму яму вядомым кірунку. Зь нейкіх прычынаў ён пабойваецца сустрэчы зь нямецкай крымінальнай паліцыяй. Асабліва не прыцягваючы да сябе ўвагі, ён раптам натыкаецца на вельмі сымпатычную дзяўчыну, пра якую сьпярша думае, што яна немка й гімназістка. Паміж маладымі людзьмі завязваецца ажыўленая размова на нямецкай мове (хоць наратар прызнаецца, што ведае нямецкую вельмі пасрэдна і што яго зьдзіўляе гэтая легчыня, зь якой даецца размова па-нямецку). Хлопец і дзяўчына адчуваюць узаемны поцяг, хлопец чытае дзяўчыне вершы Багдановіча на мове арыгіналу. Разьвязка апавяданьня нечаканая: высадзіўшы сваю спадарожніцу на пэроне чыгуначнай станцыі, наратар праз расхрыстаны плашч неспадзеўкі бачыць на ёй нашыўку «Ost», знак паходжаньня з усходу тагачаснага нямецкага райху. Апошнія сумневы разьвейвае запіска з адрасам, якую крадком пакінула дзяўчына перад сваім выхадам: яна была напісаная каліграфічнай кірыліцай і па-беларуску.

Тым часам у Макміліна ўсё выглядае інакш:

Прыкладам мастацкай прозы Адамовіча зьяўляецца «Афрадыта-Ост», апавяданьне аб сустрэчы ў цягніку падчас вайны маладога хлопца, найхутчэй остарбайтэра, з маладой і загадкавай немкай ці, магчыма, жыдоўкай. Іх знаёмства канчаецца, калі яна выходзіць зь цягніка. Паміж імі ціха ідзе рамантычная і таямнічая размова. Атмасфэра даволі добра перадаецца без залішняй дэталізацыі. Ён спрабуе зразумець нямецкі характар і, каб стварыць адпаведную атмасфэру, ужывае шматлікія нямецкія словы, напісаныя кірылічнымі літарамі. Атмасфэра цягніка адлюстравана часткова, без падрабязнай дэталізацыі… Дзяўчына выходзіць зь цягніка, пакідаючы героя ў рамантычным расчараваньні, хаця гэтая прыгода надае яму больш вытрымкі перад абліччам немінучага арышту.

Давяршаецца гэты пераказ няправільным, абумоўленым неразуменьнем беларускага арыгіналу перакладам назвы

апавяданьня на ангельскую мову - «Aphrodite Eastern Style». Воля літаратурнага крытыка канчаткова зьнішчае вобраз роўнай сваім хараством грэцкай багіні каханьня беларускі, вымушанай насіць нашыўку «Ost».

Вельмі павярхоўнае знаёмства Макміліна і з творчасьцю шэрагу іншых пісьменьнікаў. Прачытаўшы зь дзесяць старонак прозы Пётры Сыча ў анталёгіі «Ля чужых берагоў» (Мюнхен, 1955), ён здавальняецца цалкам кур'ёзнай высновай: «Гэтых фрагмэнтаў недастаткова, каб стварыць выразнае ўяўленьне аб патэнцыйным таленце Сыча як пісьменьніка». Ясна, што недастаткова, бо для разгорнутых ацэнак і эмпірычна падмацаваных высноваў трэ было разгледзець кнігу лірычнай прозы Сыча «Сьмерць і салаўі» (Мюнхен, 1965), пра якую Макмілін нічога ня ведае. Вельмі туманнае ўяўленьне ён мае і пра творчасьць аўтара раману «Роджаныя пад Сатурнам» і шэрагу меншых твораў Віктара Вальтэра (Бальтара, у аўтарскім напісаньні). Ад таго, што Макмілін цытуе прозу Юхнаўца зь літаратуразнаўчых артыкулаў Юрэвіча, а апавяданьні Віцьбіча - з ужо памянёнага зборніка «Вяртаньня маўклівая споведзь», праблема крыніцаў толькі завастраецца.

На фоне гэтага няпоўнага або нават перакручанага ўяўленьня пра эміграцыйную прозу надзвычай няпэўнымі і адвольнымі аказваюцца адразу абедзьве Макмілінавы высновы ў яе дачыненьні: па-першае, што яна прайграе па літаратурнай вартасьці эміграцыйнай паэзіі, а па-другое, вызначэньне Масея Сяднёва як яе карыфэя. Дарэчы, на думку некаторых крытыкаў, найбольшым дасягненьнем эміграцыйнай прозы зьяўляецца творчасьць Антона Адамовіча: Аўген Калубовіч меркаваў, што яна вартая ўганараваньня Нобэлеўскай прэміяй.

І яшчэ колькі заўвагаў наконт фактычных недакладнасьцяў. Пасьля выезду зь Нямеччыны Ўладзімер Дудзіцкі жыў не ў Італіі, Гішпаніі і ЗША, а ў Вэнэсуэле. Першы верш Міхася Кавыля ня мог быць апублікаваны ў 1929 годзе ў «Беларускай газэце» таму, што газэты з такой назвай тады не існавала. Алесь Салавей паступіў у Менскі пэдагагічны тэхнікум не ў 1937-м, а ў 1938 годзе. Яго першы друкаваны верш «На сенажаці» пабачыў сьвет не ў 1933-м, а ў 1937 годзе. Янка

Золак нарадзіўся 1 лістапада 1912, а не 1910 году. Вячаслаў Адамчык ня быў савецкім паэтам, як і Віленская Марыінская гімназія, у якой вучылася Натальля Арсеньнева, не была Віленскай вучэльняй айцоў-марыянаў. Гэтая паэтка надрукавала свой першы верш у 1920 годзе ў віленскай «Нашай Ніве», а ня ў «Нашай долі», і яе сын Яраслаў загінуў не ў баі, а на сцэне Менскага гарадзкога тэатру ад выбуху бомбы, падкладзенай партызанамі. Нарэшце, пісьменьніца Іна Рытар абрала сабе псэўданім Аляксандра, а ня Іра Саковіч, Уладзімер Клішэвіч нарадзіўся ў вёсцы Краснадворцы, а не Чырнадворцы, Ян Станкевіч выдаваў часопіс «Веда», а ня «Веды», Крынкі - гэта ня вёска, а мястэчка, і г. д.

Канчаецца тэматычны блёк, прысьвечаны эміграцыйнай літаратуры, нарысам пра драматургію. Хаця ў ім няма рэвэляцыйных думак, сама яго прысутнасьць робіць дасьледаваньне прынамсі фармальна завершаным. З усіх памянёных у гэтым аглядзе кніжак драматургія разглядаецца толькі тут, беларускія аўтары проста ня бачаць яе самастойным прадметам дасьледаваньня.

Разьдзельчык пра творчасьць трох беларускіх паэтаў з Усходняй Эўропы (Эдуарда Вайвадзіша з Латвіі, Анатоля Кірвеля з Расеі, Іны Снарскай з Украіны) таксама зьявіўся, бадай, для стварэньня эфэкту паўнаты, а не з аналітычных меркаваньняў. Запомніцца ён можа хіба адной дэтальлю: што найбольш таленавітая з гэтых трох, Снарская, нарадзілася ў Полацку ў арыстакратычнай (sic!) сям'і. Дарэчы, застаецца загадкай, чаму Макмілін адабраў для агляду толькі гэтую тройцу і пакінуў па-за ўвагай творчасьць, напрыклад, Тацяны Сапач, Хведара Нюнькі або Станіслава Валодзькі.

Разьдзел пра беларускую літаратуру Польшчы структурна і канцэптуальна мала чым адрозьніваецца ад папярэдніх. Яе лідэрамі абвяшчаюцца Ян Чыквін і празаік Сакрат Яновіч. Паэтаў тут крытыкуюць за старамоднасьць. Віктару Шведу дастаецца за творчае рэнэгацтва, Алесю Барскаму - за надзвычай простую прасодыю. Зосю Сачко губіць страсьць да разбурэньня літаратурнай мовы за кошт выкарыстаньня дыялектнай мовы ў сваіх вершах. Іншымі словамі, каб ня

вершы Міраславы Лукшы («паэткі вялікага прыроджанага дару і шырокіх тэматычных інтарэсаў»), імпрэсіяніста Яшы Бурша, які ўплываў сваёй творчасьцю на маладзейшых калег, і, натуральна, Яна Чыквіна (чыя творчасьць «увабрала ў сябе лепшае з польскай і беларускай паэзіі, праўда, без захапленьня авангарднымі фармальнымі экспэрымэнтамі»), паэзію беларускай дыяспары Польшчы можна было б з поўным правам назваць тэматычна і сюжэтна беднай, дый да таго ж напісанай пры дапамозе анахранічных наратыўных тэхнік.

І ўсё ж, як і ў выпадку зь літаратурай беларускай эміграцыі, акурат яна застаецца найбольшым мастацкім дасягненьнем беларусаў Польшчы. Проза і тым больш драматургія моцна прайграюць ёй у літаратурнай вартасьці. Зноў жа, як і ў выпадку эміграцыйнай літаратуры, проза тут у асноўным прадукавалася ў жанры мэмуараў, успамінаў і гістарычнага раману. Менш значнымі празаічнымі жанрамі называюцца лірычныя і элегічныя апавяданьні вельмі рознай даўжыні, нарысы, жарты і анэкдоты, а таксама этнаграфічныя замалёўкі. Усьлед за Янам Чыквіным Макмілін найбольшым празаічным здабыткам называе раман Сакрата Яновіча «Самасей», напісаны ў сярэдзіне 70-х, а яго адметнасьцю - сьцьвярджэньне маральнай і іншай перавагі вёскі над горадам. Падобна да вершаў Багушэвіча, горад адзін паўстае ў ім як варожы, матэрыялістычны, бяздушны, вульгарны Бабілён, які зьнішчае спрадвечную маральнасьць.

З разьдзелу пра драматургію вынікае, што польскія беларусы пасьля другой сусьветнай вайны напісалі дзевяць п'есаў. Самай рэалістычнай зь іх Макмілін уважае п'есу Яна Чыквіна «Калі хто чужы» (1967), а таксама бачыць уплыў паэзіі Аляксандра Блока на драматургію Сакрата Яновіча (раней ён дагледзеў у драматургіі Янкі Юхнаўца уплываў Пушкіна і Чэхава, а ў прозе Міры Лукшы - сьляды «квазічэхаўскай рэалістычнай манеры»). На фоне гэтага стракаценьня сьлядоў расейскіх клясыкаў асабліва відавочнай робіцца няздольнасьць Макміліна ўбачыць узьдзеяньні іншых літаратур на літаратуру дыяспары.

Як бы там ні было, Арнольд Макмілін застаецца нацыянальным здабыткам Беларусі, бо ён адзіны заходні дасьледнік, які

прысьвяціў сябе вывучэньню беларускай літаратуры. На жаль, за гэты статус яму давялося заплаціць адсутнасьцю крытычнага абмеркаваньня сваіх беларусазнаўчых працаў. Інакш не патлумачыць, чаму ягоная апошняя кніжка выйшла не адрэдагаваная як сьлед.

7

Колькасьць публікацый, прысьвечаных беларускай дыяспары, пакуль слаба адбіваецца на іх якасьці. Усе яны ў той ці іншай форме культывуюць пра яе фантастычныя ўяўленьні, прычым асаблівую міталягізацыю зьведвае эмігрыйная літаратура (як адзінае прытулішча нацыянальнай сьвядомасьці і г. д.). У ніводнай зь іх не знайсьці адказу на пытаньне, чаму беларуская эміграцыя аказалася ня ў стане працягнуць на бацькаўшчыне свае палітычныя (у адрозьненьне ад Прыбалтыкі, у кожнай з трох краін якой у 90-х прэзыдэнцкія пасады займалі людзі з паваеннай хвалі эміграцыі) або гуманітарныя праекты (самае ўплывовае інтэлектуальнае выданьне Ўкраіны, часопіс «Критика», рэдагуе «прадстаўнік украінскай дыяспары ў Амэрыцы» - гарвардзкі прафэсар Рыгор Грабовіч). Не ўваходзячы ў шырокую дыскусію, заўважым, што беларускі нацыяналізм канца XIX - пачатку XX стагодзьдзяў адрозьніваўся ад украінскага значна горшымі адукацыйнымі перадумовамі. Змагаючыся з польскім нацыяналізмам на беларускіх землях, расейскі царызм дашчэнту вынішчыў тут сыстэму вышэйшай адукацыі. Тыя вышэйшыя вучэльні, якія стварыліся на хвалі Кастрычніцкай рэвалюцыі, былі ня ў стане, з прычыны нізкага ўзроўню выкладаньня ў іх гуманітарных дысцыплін, у прыватнасьці замежных моваў, рыхтаваць інтэлектуалаў, здольных да працы ў заходніх унівэрсытэтах.

Вядома, эміграцыя перадала пэўныя элемэнты сваёй традыцыі на бацькаўшчыну. Аднак не заўсёды яны былі вартыя перайманьня, як, напрыклад, практыка бескарэктурных выданьняў, якая расьцьвіла ўжо ў незалежнай Беларусі, або нізкая прадукцыйнасьць інтэлектуальнай працы («Запісы Беларускага інстытуту навукі й мастацтва», самае пэрыядычнае навуковае выданьне эміграцыі, выходзіла прыкладна раз на два гады і, за выняткам аднаго нумару, на беларускай мове, тым

часам як іх літоўскі аналяг, «Lituanus. Lithuanian Quarterly Journal of Arts and Sciences», быў англамоўным квартальнікам).

Што да літаратуры беларускай дыяспары і, вузей, эміграцыі, то яна дагэтуль застаецца неспасьцігнутым да канца фэномэнам, - прывычныя мэтадалёгіі, якія не працуюць без замоўчваньняў, штампаў, перакручваньняў і фальсыфікацый, дазваляюць яго толькі апісаць, а не зразумець. А гэта азначае, што зьвязаныя карпаратыўнай этыкай беларускія навукоўцы па-ранейшаму ня хочуць ці ня могуць называць рэчы сваімі імёнамі. У гэтым сэнсе моцна выйграе ня ўцягнуты ў тутэйшыя акадэмічныя мафіі і літаратурныя кланы Арнольд Макмілін, здольны спакойна сказаць, што Барыс Сачанка - гэта малазначны раманіст.

Каб не падацца дэпрэсіўным пэсымістам, выкажу пад канец свой маленечкі спадзеў: сьвет зьмяняецца, жыцьцё зьмяняецца, і гуманітарная навука таксама не стаіць на месцы. Гадоў зь пятнаццаць таму мала хто мог уявіць, што неўзабаве зьявіцца гэтулькі працаў аб нашай дыяспары. Назапашана багата матэрыялу, і, каб закрыць тэму, нашым гуманітарнікам трэба адмовіцца ад сэрвільнасьці і стаць больш сучаснымі. Загляне сонца і ў наша аконца.

[image]
[image]

Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ
палітэканом, доктар паліталёгіі Ратгерскага ўніверсытэту (ЗША).
Апошняя публікацыя ў «ARCHE»
«Адкладзеная свабода: посткамуністычны аўтарытарызм у Сэрбіі і Беларусі».

Віталь Сіліцкі Страшны сон расейскамоўных лібэралаў

Леонид Злотников. В петле популизма: идеология, политика и экономика в независимой Беларуси. Минск: Энциклопедикс, 2002.

Кнігі, падобныя да гэтай, чытаюцца як падручнік найноўшай гісторыі, аўтарскае ўспрыманьне якой змушае прыгадаць стары дысыдэнцкі тэзыс, што гісторыя ў СССР (дадам, што і на постсавецкай прасторы таксама, успомніце хіба апошнія перапісваньні падручнікаў у Расеі) - гэта навука зь непрадказальным мінулым. Зборнікі раней апублікаваных артыкулаў, своеасаблівая рэтраспэктыва мысьленьня асобна ўзятага інтэлектуала альбо палітыка, - гэты кніжны жанр цягам апошніх часоў укараніўся і ў Беларусі. Незалежна ад таго, ці падзяляе чытач палітычныя і іншыя погляды спадара Злотнікава, яго аналітычны багаж, назапашаны за апошнія амаль што паўтара дзесяцігодзьдзя, - яскравае сьведчаньне эвалюцыі мысьленьня, праява надзеяў і фобій, спадзяваньняў і расчараваньняў пэўнай і, заўважым, даволі значнай часткі беларускага інтэлектуальнага поля, якую прыкладна можна азначыць як расейскамоўную лібэральную інтэлігенцыю.

Інтэлектуальны пошук Злотнікава - гэта пошук шляхоў рэалізацыі лібэральных ідэяў у беларускай рэчаіснасьці, пошук альтэрнатывы нацыянальнай дзяржаве і савецкай мінуўшчыне адначасова. Сама назва кнігі нясе ў сабе значна большую сэнсавую нагрузку, чым можа падацца. Пятля папулізму - гэта ня толькі пра Лукашэнку ды кансэрватыўную намэнклятуру. Гэта яшчэ літаральна пра ўсіх астатніх, уключаючы БНФ, дэмакратычную апазыцыю ўвогуле, эканамічную эліту ды сам народ, само грамадзтва. Але ці не аказваецца ўрэшце сам аўтар у своеасаблівай пятлі, наколькі рэалістычныя і жыцьцяздольныя яго ўласныя рэцэпты беларускага шчасьця (ці шчасьця наогул, не зважаючы на тое, для беларусаў яно ці для кагосьці іншага)? Як бачна, рэцэнзія на гэткую кнігу ня можа не пазьбегчы фармату палемікі. Іншае наўрад ці магчыма, бо інакш давядзецца пераказваць зьмест амаль сотні артыкулаў, зь якіх кніга складаецца. Таму застаецца папросту падыскутаваць на найбольш вострыя тэмы, яшчэ раз завастрыць увагу на тым, аб чым беларускай інтэлектуальнай эліце давялося спрачацца апошнія паўтара дзесяцігодзьдзя. У рэшце рэшт, верце таму, хто шукае ісьціну, а не таму, хто яе ўжо знайшоў.

Філёзаф Уладзімер Мацкевіч неяк сфармуляваў тэзу пра Беларусь як «філязофскую і мэтадалягічную праблему», акцэнтуючы несумяшчальнасьць Беларусі эмпірычнай (рэальна існай у выглядзе сучаснай дзяржавы пад назвай Рэспубліка Беларусь) ды Беларусі ідэальнай, існай у сьвядомасьці, марах альбо нават ілюзіях: «Рэспубліка Беларусь - няшчасьце, нежаданы вынік, пройгрыш у сьвядомасьці шмат якіх беларусаў».

Па распадзе СССР Беларусь сапраўды паўстала для многіх як праблема. Для кагосьці незалежнасьць азначала страту савецкага ладу жыцьця і дабрабыту, для другіх - распад сыстэмы, якая забясьпечвала прывілеяванае становішча ў грамадзтве, для трэціх яна перарэзала пупавіну, што зьвязвала Беларусь з саюзным цэнтрам, і зьнішчыла шанцы на спакойнае існаваньне ў межах імпэрскае пэрыфэрыі. Для значнай часткі лібэральнай расейскамоўнай інтэлігенцыі Беларусь несла пагрозу паўстаньня нацыянальнае дзяржавы і спаўзаньня да «нацыяналістычнае дыктатуры». Сам тэрмін «Беларусь» стаў

для іх сынонімам правінцыйнага кансэрватызму і рэакцыі, выспай безнадзейнасьці, на якую вятры пераменаў могуць дзьмуць толькі з усходу.
Прычына першая - прынцыповая несумяшчальнасьць нацыяналізму зь лібэралізмам увогуле, неадольныя супярэчнасьці паміж нацыянал-калектывізмам ды ідэалёгіяй рынкавага індывідуалізму, якія толькі падкрэсьліваюцца духоўнай блізкасьцю нацыяналізму ды сацыялізму ў яго разнастайных праявах.

Прычына другая - уяўленьне аб небясьпечнасьці беларускага нацыяналізму (больш дакладна, палітычнага праекту нацыянальнага адраджэньня) ува ўмовах шматкультурнага, поліэтнічнага і шматмоўнага грамадзтва, пагроза выбуху моўных і этнічных канфліктаў, якія нясе яго рэалізацыя.

Прычына трэцяя - залішні рамантызм протаганістаў нацыянальнага адраджэньня, іх спроба падмяніць рэчаіснасьць ідэалягічнымі канструкцыямі ды культурнымі мітамі і як вынік - поўная дэзарыентацыя ў рэальным, перш за ўсё палітычным жыцьці, а адсюль - і палітычная нежыцьцяздольнасьць нацыянальнае праграмы.

Шмат у чым з Злотнікавым можна пагадзіцца, калі ён гаворыць аб жыцьцяздольнасьці ў беларускіх варунках этнічнага нацыяналізму як палітычнай плятформы. Яго высновы, што беларусы як нацыя не «адраджаюцца», а толькі фармуюцца, можа падзяляць, хіба што зь неахвотай, і частка адраджэнскай інтэлігенцыі, здольная пераасэнсаваць уласны палітычны досьвед. А разважаньнямі пра палітычную нежыцьцяздольнасьць этнічнага нацыяналізму ў Беларусі ў рафінаванай форме ды імавернасьць таго, што беларускай нацыі наканавана ўсталявацца найперш на палітычных, а не на моўна-этнічных прынцыпах, цяпер мала каго зьдзівіш.

У той жа час інтэрпрэтацыя этнічнага нацыяналізму як загадзя аўтарытарнага і несумяшчальнага з нацыяналізмам дзяржаўным (альбо грамадзянскім) не вытрымлівае крытыкі хаця б дзеля наяўнасьці вялікай колькасьці монаэтнічных нацыянальных дзяржаваў, якія зьяўляюцца дэмакратыямі. Нават калі монаэтнізм істотна размыты, такія інструмэнты, як

канстытуцыйныя гарантыі правоў этнічных меншасьцяў, культурная аўтаномія, рэгіяналізацыя, інстытуты кансацыяцыі і г. д. дазваляюць прымірыць «дэ мас нацыі» і «дэмас дзяржавы» ў межах адной дэмакратычнай супольнасьці. Пераважная большасьць сучасных эўрапейскіх нацыяў зьяўляюцца этнічнымі і палітычнымі ў той жа час. Інтэрпрэтацыя Злотнікава хутчэй адлюстроўвае палітычную пазыцыю аўтара, якая абумоўлівае выбар прыкладаў дзеля таго, каб пацьвердзіць пэўныя тэзы (напрыклад, у якасьці ўзору этнічнага нацыяналізму выстаўляецца сэрбскі досьвед, а не, скажам, польскі ці нарвэскі). Некаторыя дэфініцыі аўтара, такія, як «пляменны нацыяналізм» (якім ён вызначае тып самасьвядомасьці дахрысьціянскіх часоў), выклікаюць толькі іранічную ўсьмешку. Ня менш камічнымі выглядаюць і яго перасьцярогі аб небясьпечнасьці этнічных войнаў у Беларусі ў выпадку перамогі БНФ. Беларусь, у адрозьненьне ад таго, як гэта ўяўляецца Злотнікаву, не зьяўляецца поліэтнічнай дзяржавай, а большасьць культурных падзелаў і супярэчнасьцяў пралягаюць не паміж тытульнай нацыяй і меншасьцямі, а ў самой тытульнай нацыі, у якой адсутнічае адзіная сыстэма самаўспрыманьня ды самаразуменьня. Да таго ж, Злотнікаў наўрад ці зможа прыгадаць хоць адзін выпадак варожасьці беларускіх нацыяналістаў да этнічных меншасьцяў у найноўшай палітычнай гісторыі краіны.

Зьвернемся да аднаго істотнага парадоксу ў мысьленьні Злотнікава. Адмаўляючы і крытыкуючы нацыянальную ўтопію, ці не падмяняе ён яе ўтопіяй іншай, лібэральнай, ня менш нежыцьцяздольнай? (Такое пытаньне варта задаць таму, што аўтару кнігі даводзілася бываць ня проста мысьліцелем, але і дзейным палітыкам.) Пераход да лібэральнага ўтапізму можна заўважыць, па-першае, у апалягетыцы пэўнага ідэальнага, на погляд аўтара, «пазанацыянальнага» стану грамадзтва (паводле слоў французскага філёзафа Гі Сармана, якога цытуе Злотнікаў, «ідэалізацыі індывідуалістычнай супольнасьці»), што павінен стварыць альтэрнатыву «сацыялістычнай» нацыянальнай арганізацыі грамадзтва. Тут, аднак, лібэральная ўтопія супярэчыць самім пастулятам лібэралізму. Паводле Фрыдрыха Хаека, лібэралізм зыходзіць з таго, што сьвет падпарадкоўваецца законам, якія нам не падуладныя. Але ці не

ігнаруе лібэральны ўтапізм той факт, што «інтуіцыйнае імкненьне людзей да чагосьці, што зьяўляецца па-за індывідуумам» (паводле азначэньня Злотнікава, псыхалягічны выток нацыяналізму), ёсьць такой жа аб'ектыўнай праявай чалавечае натуры, як і яе рынкавыя інстынкты, а гэта значыць, адмаўленьне нацыяналізму - рэч такая ж кепская, як і змаганьне з прыватнай ініцыятывай? (Тут, заўважым, мы наўмысна не закранаем пытаньне пра зьмест ці паходжаньне таго ці іншага нацыяналізму.) Калі гэта так, то альтэрнатывай нацыяналізму ў рэальным жыцьці зьяўляецца не індывідуалістычная форма грамадзтва, а іншы нацыяналізм, які можа быць напоўнены нашмат болей агрэсіўным і антылібэральным, скажам, чым беларускі нацыяналізм, культурным і ідэалягічным зьместам.

Сутыкнуўшыся з супярэчнасьцю паміж утопіяй індывідуалістычнага грамадзтва і рэчаіснасьцю паўсядзённага жыцьця, лібэральны палітык вымушаны зрабіць выбар на карысьць культурнай схемы, якая ў большай ступені легітымізуе яго палітычны, эканамічны ці сацыяльны праект. Заўважым, што менавіта тэза пра гістарычную прыналежнасьць нацыяў да эўрапейскай цывілізацыі выконвала падобную легітымізавальную ролю дзеля рынкавых рэформаў у многіх краінах Цэнтральнай ды Ўсходняй Эўропы (менавіта лібэральныя эліты насаджалі тэзу пра тое, што шлях да вяртаньня ў «сваю» цывілізацыю будзе адчынены толькі праз рэформы). Што цікава, нават нягледзячы на жорсткую крытыку эканамічных праграмаў БНФ за іх схільнасьць да сацыялізму, Злотнікаў усё ж прызнае, што ў беларускім кантэксьце яны былі адны з самых рынкавых. Магчыма, такую ролю мог бы выканаць і беларускі нацыяналізм, калі б ён займеў уласны палітычны шанец. Гэтага шанцу па мноства прычынаў у яго сапраўды не было. Але вера ў тое, што лібэралізм можа стаць жыцьцяздольнай палітычнай альтэрнатывай нацыяналізму, таксама аказалася ўтопіяй. Беларусь далёка не адзіная краіна ў сьвеце, дзе рафінаваны лібэралізм зьяўляецца маргінальнай ідэалягічнай плыньню, - нават у большасьці заходніх дэмакратыяў лібэральныя партыі працягваюць жыцьцё выключна ў выглядзе малых партыяў, што маюць шанец прыйсьці да ўлады толькі як малодшыя партнэры.

Яшчэ больш утапічным зьяўляецца атаясамленьне лібэральнае ўтопіі з рэчаіснасьцю расейскіх рэформаў. Да «апалягетаў Расеі», аднак, Злотнікава аднесьці цяжка. Дэкляруючы непрыманьне беларускага этнічнага нацыяналізму, аўтар, як і значная частка расейскамоўнай беларускай інтэлігенцыі, прыходзіць да высновы аб несумяшчальнасьці расейскай культурнай і палітычнай спадчыны з прынцыпамі лібэралізму і дэмакратыі. Вынік гэтага - пераасэнсаваньне стаўленьня да дзяржаўнай незалежнасьці краіны (але толькі да яе, а не да беларушчыны ўвогуле). Крытыцы расейскай «бізантыйшчыны» і «азіятчыны», аналізу несумяшчальнасьці праваслаўя і дэмакратыі ў артыкулах Злотнікава адведзена надзвычай шмат месца. Тут можна знайсьці шмат тэзаў, за якія расейцы залічылі б Злотнікава ў русафобы (пра «неўтаймоўнасьць» нацыянальнага расейскага характару, пра апантанасьць расейцаў мэсіянствам, пра «спадчыну стэпу» і ксэнафобію, а перадусім - пра таталітарную сутнасьць праваслаўнага хрысьціянства). Ня менш жорстка Злотнікаў адгукаецца і пра праекты беларуска-расейскай эканамічнай інтэграцыі (у гэтым пытаньні яго погляды амаль не разыходзяцца з пазыцыяй крытыкаванага ім БНФ).

Аднак да самой Расеі стаўленьне ў Злотнікава, як, бадай, ува ўсёй расейскамоўнай беларускай інтэлігенцыі, вельмі спэцыфічнае. Аўтар увесь час праходзіць праз колы надзеяў і расчараваньняў. Надзея на тое, што свабода і лібэралізм прыйдуць у Беларусь з Усходу, то ўзьнікае (спачатку пры Гайдару, потым з прыходам Пуціна), то затухае і зьмяняецца расчараваньнем. Нарэшце аўтар вымушаны паўтарыць вядомую сэнтэнцыю Пушкіна пра тое, што эўрапейцам у Расеі можа быць толькі дзяржава, а ніяк не народ. Тым ня менш менавіта на гэтую дзяржаву спадар Злотнікаў і ўскладае свае лібэральныя надзеі, паўтараючы ў інтэлектуальных пошуках той жа самы круг, празь які ў рэальным палітычным жыцьці прайшлі расейскія лібэралы. Пасьля няспыннай крытыкі Расеі падчас жнівеньскага крызысу, у 2002 годзе ён фактычна вяртаецца да ўтопіі першай паловы 1990-х гадоў: «Лібэралы ня супраць інтэграцыі Расеі і Беларусі, калі гэта будзе садзейнічаць росту свабоды, дабрабыту і бясьпекі (так у тэксьце. - **Аўт.**) нашых грамадзянаў. ...Наша інтэграцыя з Расеяй можа адбыцца з

адначасовай інтэграцыяй у цывілізацыю Захаду».

Пасьля апошніх палітычных падзеяў у Расеі, якія спрычынілі чарговы выбух расчараваньня ў тых, хто шчыра верыў у лёзунг «Разам з Расеяй у Эўропу», трэба зноў чакаць чарговых апісаньняў «расейскае бізантыйшчыны». Аднак, нягледзячы на ўсе разважаньні аб «індывідуалістычным грамадзтве», паратунак для цяперашняй Беларусі Злотнікаў увесь час час бачыць ня ў ім, а ў Расеі. Прырода, як бачым, пустэчы сапраўды ня церпіць.

Да Беларусі Злотнікаў усё ж прыходзіць. У сваіх парэфэрэндумных артыкулах ён прызнае, што «стварэньне новай інтэгравальнай ідэалёгіі, новага полюсу грамадзкага жыцьця ператвараецца ў надзённую неабходнасьць грамадзтва». Аднак гэтая ідэалёгія павінна мацавацца на ідэях дзяржаўнага, альбо тэрытарыяльнага, нацыяналізму (у якім нацыя - гэта перш за ўсё палітычная, шматкультурная і шматмоўная супольнасьць), а не нацыяналізму этнічнага. Каб стаць дэмакратычнай і эўрапейскай дзяржавай, Беларусь не павінна быць Расеяй у палітычным і ідэалягічным сэнсе, што зусім не адмаўляе, скажам, моўнай русіфікацыі, больш за тое, апошняя зьяўляецца гарантыяй ад распаўсюджваньня беларускага «нацыянал-сацыялізму».

Ці ажыцьцявіўся на практыцы гэты праект, які прапагандуе Злотнікаў? Ці магчымае палітычнае адасабленьне ад Расеі без адасабленьня культурнага? І калі дэмакратычная і незалежная Беларусь ня мусіць быць ані Расеяй, ані Беларусьсю, то чым яна мусіць стаць? «Дзяржаўны нацыяналізм», здавалася б, дае адказ на пытаньне, але гэтым тэрмінам у нашым палітычным дыскурсе часьцяком злоўжываюць, скідваючы ў адну кучу як нацыяналізм амэрыканскі ці, напрыклад, аўстралійскі (якія маюць пад сабой адзіны культурны падмурак), так і ідэалёгію якога-небудзь афрыканскага бантустану (які насамрэч грунтуецца на выключна тэрытарыяльнай прыналежнасьці ў рамках традыцыйнага грамадзтва) і нават новую лукашэнкаўскую дзяржаўную ідэалёгію (у якую ён таксама закладвае тэрытарыяльны прынцып самасьвядомасьці, успомнім хіба яго патрыятызм «гэтага лесу»).

Я наўмысна не даю адказаў на гэтыя пытаньні. Простых адказаў на беларускія пытаньні няма, і хутчэй за ўсё спрэчкі аб тым, чым ёсьць і чым мусіць быць Беларусь, працягнуцца яшчэ не адзін год ці дзесяцігодзьдзе. Цікава, аднак, што яны ўцягваюць у сябе ўсё большыя грамадзкія колы, тых, для каго, здавалася б, Беларусь сама па сабе - гэта бясконцая крыніца яе ўласных праблемаў.

Эканамічныя погляды Злотнікава шырэй вядомыя чытачу, калі ён цягам апошняга дзесяцігодзьдзя сачыў за незалежнай прэсай. Злотнікаў як эканамічны публіцыст і аглядальнік паўстае адразу ў некалькіх ролях. Ягоныя артыкулы - гэта і своеасаблівы лікбез па пытаньнях рынкавай эканомікі і досьведу рэфармаваньня ў розных краінах і за рознымі часамі (напрыклад, я вельмі моцна параіў бы ўсім, хто цікавіцца, перачытаць яго разважаньні аб досьведзе сельскагаспадарчых рэформаў, прычынах ды наступствах «кітайскага цуду»). Гэта і востры аналіз стану ды злабадзённых праблемаў беларускай эканомікі і эканомік краінаў-суседак, найперш Расеі. Гэта цікавы погляд на рэаліі беларуска-расейскай эканамічнай інтэграцыі, які, заўважым ізноў, слаба стасуецца зь бясконцымі чаканьнямі «лібэральнага прышэсьця» з усходу. Гэта і бескампрамісная палеміка з палітычнай і эканамічнай элітай, прычым ня толькі зь яе бюракратычным сэгмэнтам. Гэта, нарэшце, і шматлікія праграмы рэфармаваньня беларускай эканомікі, пачынаючы ад праектаў пачатку 1990-х і сканчаючы сьвежымі, такімі, як «Альтэрнатыва-XXI».

Злотнікаўскі аналіз, крытыка і палеміка сапраўды прымушаюць пра многае задумацца. Ці можна растлумачыць сёньняшні стан беларускай эканомікі, яе працяглае існаваньне «ў пятлі папулізму» выключна мэнтальнасьцю намэнклятуры і палітыкай лукашэнкаўскага рэжыму? Узгадваючы шматлікія прапановы прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў па «ўдасканаленьні» кіраваньня эканомікай за часамі Кебіча, такія, напрыклад, як стварэньне «народных прадпрыемстваў», а таксама крытычна пераасэнсоўваючы праграмы асноўных палітычных партыяў, бачна, што кансэнсус наконт неабходнасьці пераходу да рынкавай эканомікі ў Беларусі не існаваў нават сярод тых сілаў, якія прынята лічыць

протаганістамі рэформаў (г. зн. сярод прадпрымальнікаў і палітычнай апазыцыі). Злотнікаў часам (збольшага ў першай палове 1990-х гадоў) выступае ў ролі лібэральнага ўтапіста, жорстка крытыкуючы любы адыход ад прававерных рынкавых мадэляў, прычым час ад часу складваецца ўражаньне, што аўтар сам ня ведае, чаго ён хоча ад беларускай эканомікі. Рэзкай крытыцы паддаецца тэза перадвыбарнай праграмы Зянона Пазьняка 1994 году пра тое, што дзяржаўная ўласнасьць застанецца дамінантнай формай уласнасьці на найбліжэйшыя гады, і ў той жа час ушчэнт ганьбяцца прапановы пра хуткую «народную» ваўчарную прыватызацыю. Досьвед пасьпяховых рынкавых рэформаў засьведчыў, што прыватызацыя з удзелам інвэстараў - працэс сапраўды доўгі і спадзявацца на іх імклівы наплыў адразу па абвяшчэньні прыватызацыйнае кампаніі - гэта чыстае вады ўтопія.

Заўважым яшчэ дзьве рэчы, якія даюць падставу паспрачацца. Першая - гэта крытыка (заўважым, у большасьці выпадкаў слушная) сацыялістычнасьці і папулізму праграмаў дэмакратычных партыяў, такіх, як БНФ альбо БСДГ. Другая - гэта таксама слушны аналіз сацыяльных вытокаў антырынкавага папулізму, прызнаньне таго факту, што «беларуская эканамічная мадэль» створаная ў адпаведнасьці з уяўленьнямі масаў аб эканоміцы. Рэзонна ўзьнікае пытаньне: дзе ў такім раскладзе месца лібэральнай палітычнай альтэрнатывы як супрацьвагі і лукашэнкаўскаму, і нацыяналістычнаму папулізму? І ці не зьяўляецца прычынай паразы рынкавых ідэяў (ува ўсіх іх інтэрпрэтацыях - ад бээнэфаўскіх праз сацыял-дэмакратычныя да злотнікаўскіх) тое, што ім не хапала адпаведнага электаральнага афармленьня, што папулісцкі лоск, магчыма, быў апошнім шанцам, каб «прадаць» ідэі грамадзтву?

Што тычыцца злотнікаўскага аналізу беларускай эканомікі, то пераказ можа заняць амаль столькі ж месца, як і сама кніга. Значная частка тэксту прысьвечаная прагнозам, і шмат якія зь іх сапраўды збыліся, за што аўтар, паводле яго ўласных слоў, «не нясе ніякай адказнасьці». Аднак і вядомаму эканамісту ня ўсё ўдалося спрагназаваць. Прычына няўдачаў, аднак, можа быць аднесеная да агульнай перакананасьці лібэральнай

інтэлігенцыі і рынкавых эканамістаў у тым, што антырынкавая палітыка асуджаная на крах і што гэты крах непазьбежны цягам найбліжэйшых месяцаў альбо нават тыдняў. Прывядзём некалькі прыкладаў: у выніку эканамічнага «краху» ўзровень жыцьця ў Беларусі стане адным з найніжэйшых у былым СССР (прагноз зроблены ў канцы 1994 году; цяпер па гэтым паказьніку Беларусь знаходзіцца мінімум на трэцім месцы ў СНД, пасьля Казахстану і Расеі, і на першым - сярод дзяржаваў, што не жывуць за кошт прыродных рэсурсаў). У 1995 годзе нам ізноў былі абяцаны крах і масавыя народныя выступы. І зусім сьмешным падаецца прагноз 1999 году аб тым, што «ў гарадзкіх кватэрах, верагодна, удасца ўтрымаць узімку тэмпэратуру ў межах 10-14 градусаў цяпла».

Часткова Злотнікаў сам дае адказ на пытаньні, чаму чаканьні краху не апраўдаліся. У яго артыкулах шмат разважаньняў аб «раўнавазе» паміж эканамічнай сыстэмай і чаканьнямі насельніцтва, аб здольнасьці беларусаў да адаптацыі да цяжкасьцяў і г. д. Але ўсіх пытаньняў гэтыя засьцярогі не здымаюць. Як дакладна вызначыць зусім не ідэальны стан беларускай эканомікі? Ці адпавядаюць рэчаіснасьці дэфініцыі кшталту «абвал», «крызыс», «крах», «катастрофа», якія паўтараюцца ў незалежнай прэсе з сталай пэрыядычнасцю? Ці, можа, беларуская эканоміка проста функцыянуе ў рэжыме стабільнай стагнацыі і тэхналягічнай адсталасьці, аднак у стане раўнавагі з жыцьцёвымі чаканьнямі значнай часткі беларускага насельніцтва, чые элемэнтарныя патрэбы яна здольная задавальняць? І чаму, нягледзячы на прадказаньні аб «падзеньні ў прорву», эканоміка расьце, каб потым трошку даць назад? Ці толькі празь зьмены ў вонкавых фактарах, такіх, як стаўленьне Крамля да беларускіх уладаў, цэны на сыравіну альбо наяўнасьць замежных крэдытаў? Ці была «беларуская эканамічная мадэль» і эканамічная палітыка ўладаў канстантай на працягу ўсяго мінулага дзесяцігодзьдзя? Ці знаходзілася Беларусь «у пятлі папулізму», напрыклад, у пэрыяд з восені 1994-га да зімы 1995 году (першая фінансавая стабілізацыя), у 2000-2001 гадох (уніфікацыя валютных курсаў і другая фінансавая стабілізацыя), нарэшце, у 2003 годзе?

І тут я зусім не зьбіраюся аспрэчваць вядомую лібэральную

ідэю пра ўзаемасувязь дабрабыту і рынкавай эканомікі, альбо дабрабыту і дэмакратыі. Аніводную з краінаў СНД нельга назваць ні дэмакратычнай, хіба што ў самым фармальным сэнсе (Грузія, дзе пераход да дэмакратыі адбыўся некалькі месяцаў таму, мусіць вытрымаць цяжкі іспыт), ні ў поўнай ступені рынкавай. Ня буду аспрэчваць і наяўнасьці крызысных тэндэнцыяў, небясьпечнасьць якіх зь цягам часу павялічваецца (можна прыгадаць, напрыклад, імклівы рост колькасьці стратных прадпрыемстваў, інвэстыцыйны голад і г. д.). Заўважым проста, што заідэалягізаванасьць эканамічнай думкі цягам многіх гадоў не дае падставаў для больш-менш бесстароньняга, пазытыўнага аналізу, пакідаючы чытача ў чаканьні прышэсьця яшчэ адной утопіі (крах і як вынік - лібэральная рэвалюцыя; альбо, заўважым, зусім не лібэральная).

Пачытаць гэтую кнігу варта нават тым, хто не падзяляе аргумэнтаў Злотнікава. Багаты матэрыял і вастрыня думкі аўтара заахвочваюць да больш глыбокага аналізу таго, што адбылося і адбываецца ў Беларусі. Бескампраміснасьць доказаў вымушае больш дбайна падысьці да падрыхтоўкі ўласных аргумэнтаў. Час пакажа, чым яна стане для нашых расейскамоўных лібэралаў: сапраўдным цытатнікам або напамінам пра пару, калі іх уласная ўтопія здавалася рэчаіснасьцю.
[image]
[image]

Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

Робэрт Котрэл Пуцінская пастка

РОБЭРТ КОТРЭЛ
рэдактар часопісу «ARCHE». Жыве і працуе ў Менску. Летась уклаў і выдаў гістарычныя творы Яна Станкевіча ды зборнік аналітыкі «Мясцовыя выбары ў найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі».

Выданьні, якія разглядаюцца ў гэтым артыкуле:

Vadim Volkov. Violent Entrepreneurs: The Use of Force in the Making of Russian Capitalism. Cornell University Press, 201 pp.

Rodric Braithwaite. Across the Moscow River: The World Turned Upside Down. Yale University Press, 372 pp.

Yegor Gaidar. State and Evolution: Russia's Search for a Free Market, translated from Russian by Jane Ann Miller. University of Washington Press, 139 pp.

Калі ў 1995 годзе я пачаў працаваць замежным карэспандэнтам у Маскве, хаос, што панаваў у гэтым горадзе, быў, з вузкапрафесійнага пункту гледжання, адной з яго найбольш прывабных рысаў. Ніхто ні ў чым не быў упэўнены, а гэта азначала, што твае здогады пра тое, што адбываецца, былі такія самыя правільныя, як чые хочаце іншыя. Са шматлікіх тэорыяў, як у той час функцыянавала (я ўжываю гэта слова ў вельмі шырокім сэнсе) расійская дзяржава, мне прыгадваецца толькі адна, распрацаваная Томасам Грэхемам і Ліліяй Шаўцовай, якая, як потым выявілася, мела нейкую прагнастычную каштоўнасць. Паводле гэтай тэорыі, чальцы расійскай палітычнай і бізнес-эліты былі згуртаваныя ў чатыры

ці пяць варожых адзін аднаму кланаў, і кожны раз, як нейкі адзін клан рабіўся занадта моцным, іншыя аб'ядноўваліся дзеля таго, каб паставіць яго на месца. Гэткі падыход адначасова тлумачыў і прагназаваў вечнае бязладдзе, за што мы, каментатары, і былі яму ўдзячныя[1].

Аказалася, працэс стабілізацыі ўсё ж у нетрах расійскай дзяржавы адбываўся і пакрысе рабіўся ўсё больш відавочным. Найбольшае значэнне мела прасоўванне з сярэдніх на вышэйшыя пасады маладзейшага пакалення савецкіх чыноўнікаў, якім на момант краху камунізму было за трыццаць, а на той момант, калі скончылася кіраванне Ельцына і ім спала ўлада - за сорак. Яны працягвалі працаваць у бюракратычнай машыне або спецслужбах, бо былі занадта дурныя або занадта разумныя, каб пайсці ў бізнес ці крымінал. Найбольш вядомым прадстаўніком гэтай узроставай групы з'яўляецца прэзідэнт Уладзімір Пуцін. Ён і іншыя ягоныя аднагодкі цяпер аднаўляюць заснаваную на кульце сакрэтнасці цэнтралізаваную і мілітарызаваную палітычную культуру сваёй маладосці, кладучы канец шмат якім добрым і шмат якім кепскім пачынаннямі. Пуцін, як і ўсе кіраўнікі эпохі «Независимой газете», 1995, 23 лістапада. Грэхем працаваў у амерыканскім пасольстве ў Маскве, а цяпер ён робіць у Нацыянальнай радзе бяспекі ў Вашынгтоне. Лілія Шаўцова - старшы навуковы супрацоўнік Фонду Карнегі. У траўні 2003 году яна выпусціла цудоўнае даследаванне расійскага палітычнага механізму апошніх гадоў «Пуцінская Расія».

1 Thomas Graham, «The New Russian Regime», перакладзены ў «Независимой газете», 1995, 23 лістапада. Грэхем працаваў у амерыканскім пасольстве ў Маскве, а цяпер ён робіць у Нацыянальнай радзе бяспекі ў Вашынгтоне. Лілія Шаўцова - старшы навуковы супрацоўнік Фонду Карнегі. У траўні 2003 году яна выпусціла цудоўнае даследаванне расійскага палітычнага механізму апошніх гадоў «Пуцінская Расія».

Калі б я мог адкруціць час назад і вярнуцца ў Маскву 1995 году, адной з кніжак, якую б я ўзяў з сабой, была б «Сілавыя прадпрымальнікі: выкарыстанне гвалту пры фармаванні расійскага капіталізму» Вадзіма Волкава. У ёй я бачу мноства рэчаў, якіх, на вялікі жаль, я не ведаў у сярэдзіне 90-х, калі спрабаваў зразумець, як увогуле прадпрымальніцтва выжывае сярод такога бяспраўя і карупцыі. Волкаў дадае звяно, якога не ставала, каб спалучыць амаль усе публікацыі пра бізнес і амаль усе публікацыі пра арганізаваную злачыннасць у посткамуністычнай Расіі. Ён з аднолькавай увагай падыходзіць да абедзвюх гэтых сфер дзейнасці - бізнесу і злачыннасці - як да прадмету сацыялагічнага даследавання, і дзякуючы гэтаму яму ўдаецца зрабіць першы праніклівы аналіз іх узаемаўплыву. Калі б ён або іншы гэтаксама абдораны аналітык змог патлумачыць у другім томе ўзаемадзеянне паміж бізнесам і палітыкай у посткамуністычнай Расіі, мы б змаглі наблізіцца да

разумення таго, як сфармавалася новая расійская дзяржава. Кніга «Сілавыя прадпрымальнікі» заснаваная на інтэрв'ю з прафесійнымі злачынцамі - расійцы называюць іх «бандытамі», - а таксама з прадпрымальнікамі, міліцыянерамі і работнікамі прыватных ахоўных агенцтваў. Волкаў распавядае, як ён заваяваў іхні давер:

Мне давялося навучыцца хутка пісаць, бо пра дактафон не магло быць і гаворкі. Я тлумачыў, што мяне як сацыёлага цікавяць агульныя ўзоры, схемы ды прыклады і што я не высвятляю, хто каго забіў, і не шукаю інфармацыі, якая «падставіла» б мяне або майго суразмоўніка. Падчас інтэрв'ю я мог задаваць любыя пытанні, аднак мой рэспандэнт адказваў толькі на тыя, на якія хацеў. Мы дамовіліся, што ён проста прапускае тыя пытанні, якія палічыць нязручнымі. Маючы такія гарантыі, бандыты ахвотна выгаворваліся.

З «Рамана», сярэдняе рукі прадстаўніка пецярбургскай злачыннай групоўкі, Волкаў выцягнуў наступную аўтабіяграфію.

У семнаццаць гадоў той атрымаў тытул майстра спорту па боксе. Па сканчэнні школы ён пайшоў у армію і трапіў у Афганістан. Вярнуўшыся ў 1989 годзе, Раман сышоўся з некалькімі групамі махляроў і ценявых дзялкоў, забяспечваў ім фізічную ахову, пры дапамозе сілы вырашаў іх спрэчкі. У той самы час ён не прапускаў магчымасці паўдзельнічаць у лакальных узброеных канфліктах у якасці наёмніка, ваяваў у Абхазіі, Прыднястроўі і нават у Босніі. Ягоны цяперашні асноўны бізнес - нелегальная вытворчасць гарэлкі з таннага спірту, што ўвозіцца з Беларусі.
Карыснае знаёмства.
Бандыты паходзяць з любых асяроддзяў, у якіх фармуецца групавая парука і адпаведная залежнасць ад яе: крымінальныя сеткі ў савецкіх турмах, спартовыя каманды, аб'яднанні ветэранаў вайны ў Афганістане, казацкія саюзы і нават дзяржаўныя службы бяспекі. Прафесійныя злачынцы выконваюць тыя самыя падставовыя віды дзейнасці, што органы бяспекі. Яны запалохваюць, ахоўваюць, збіраюць інфармацыю, залагоджваюць канфлікты, даюць гарантыі,

сочаць за выкананнем дамоваў і збіраюць падаткі. Яны маюць у сваім распараджэнні той самы рэсурс - арганізаваны гвалт. Чым лепш яны яго выкарыстоўваюць, тым мацнейшымі яны робяцца. Адсюль найменне, што дае ім Волкаў, - «сілавыя прадпрымальнікі».[2]

Ён праводзіць адрозненне паміж гэтымі бандытамі 90-х, чые прыёмы ўзыходзяць да вулічнага гандлю і дробнамаштабнага рэкету канца 80-х гадоў, і больш традыцыйным тыпам расійскага злачынца[3]. Злачынец нічога не стварае і не прэтэндуе на тое, каб нешта ствараць. Бандыт, наадварот, прапаноўвае паслугі, заснаваныя на выкарыстанні ці пагрозе выкарыстання гвалту, і адмыслова рэкламуе гэты факт. Менавіта таму, заўважае Волкаў, у любым буйным расійскім горадзе на працягу 1990-х гадоў бандытаў можна было распазнаць па іхніх залатых упрыгожаннях, кароткай стрыжцы, скураных куртках, масіўных чорных аўтамабілях і напорыстых паводзінах. Злачынец імкнецца праскочыць у грамадскіх месцах незаўважаным, бандыт хоча, каб яго пазнавалі.

Эканамісты могуць палічыць, што Волкаў хіне да даўно вядомага тлумачэння, паказваючы, што пры слабой дзяржаве бізнесоўцы звязваюцца з неафіцыйнымі групоўкамі, у тым ліку і крымінальнымі, каб забяспечыць сабе фізічную ахову і нагляд за выкананнем пагадненняў. Але Волкаў ідзе значна далей, сцвярджаючы, што мала лічыць гэтыя канкурэнтныя групоўкі «ўсяго толькі пасіўнымі пастаўшчыкамі пэўнага тавару». Злачынныя групоўкі часта маюць надзвычай эфектыўныя рычагі ўздзеяння на фірмы, з якімі маюць справы. Іхняя прапанова - не тая, ад якой можна адмовіцца. Волкаў імкнецца дакладна вызначыць, хто яны, чым яны займаюцца і якія метады пры гэтым ужываюць. І дзякуючы свайму смеламу і заснаванаму на першакрыніцах даследаванню яму гэта ўдаецца.

Ён адзначае, што адносіны бандытаў і бізнесменаў хутка ператвараюцца ў нешта падобнае да ўзаемазалежнасці. «Мы нешта накшталт вымушаных партнёраў», - тлумачыць яму адзін з гангстэраў, і Волкаў ужывае гэты выраз[4] для апісання больш цесных адносінаў паміж бандытамі і камерсантамі, што

[2] Волкаў зазначае, што гэты тэрмін не з'яўляецца ягонай вынаходкай, а выкарыстоўваўся раней у працах на тэму сіцылійскай мафіі, у прыватнасці, у кнізе Антона Блока (Anton Blok. The Mafia of A Sicilian Village: A Study of Violent Peasant Entrepreneurs. Oxford: Basil Blackwell, 1974).

[3] Я ўжываю

прыйшлі на змену звычайнаму рэкету, характэрнаму для
пачатку 1990-х. На той час банды з ужываннем сілы
падзялілі сферы ўплыву ў канкрэтных гарадах або
прамысловасці і дзякуючы гэтаму атрымалі кантроль
асобна ўзятымі бізнесменамі, якія плацілі ім даніну.
разглядаюць прадпрымальнікаў як безадказных і
слабахарактарных слабакоў, якім нельга даверяць.
Эксплуатаванне іх часта «ўспрымаецца бандытамі
маральны абавязак», піша Волкаў.

Той бізнесмен, які хаця б аднойчы заплаціў бандзе даніну,
разглядаецца як уласнасць гэтай банды і абкладаецца
назаўсёды[5]. Аднак, паколькі ён фактычна робіцца
банды і крыніцай даходу, яго трэба абараняць ад
і нават дапамагаць яму зарабляць болей грошай.
пачынаюць забяспечваць сваіх прадпрымальнікаў
пра канкурэнтаў, выбіваць іх пазыкі і дапамагаць у
практычных праблемах, уключаючы адносіны з
Калі карыстацца тэрміналогіяй эканаміста Манкура-Олсана,
яны робяцца «аселымі» бандытамі, зацікаўленымі ў росце
дабрабыту сваіх ахвяраў, а не «качавымі», якія забіраюць усё. І,
што найважнейшае, банды, паколькі яны ведаюць і ў нейкім
сэнсе паважаюць адна адну, становяцца гарантамі дамоваў,
якія заключаюць «іхнія» прадпрымальнікі. Гэтая практыка
ператвараецца ў правіла, прычым, як адзначае Волкаў,
настолькі паўсюдна, што ва ўсёй расійскай эканоміцы

большасць здзелак на вялікія сумы падпісваецца толькі пры ўмове, што ў іх у якасці дадатковых гарантаў удзельнічаюць «вымушаныя партнёры» (злачынныя групоўкі або законныя сілавыя структуры). Сам факт адсутнасці ўзаемна прызнанага «вымушанага партнёра» можа сарваць здзелку.

Волкаў прыгадвае пытанне, якім Ніцшэ пачынае другую частку
сваёй «Генеалогіі маралі»: «Вывесці жывёлу, якая
насмельваецца даваць абяцанні, - ці ж не гэта ёсць тая
парадаксальная задача, якую паставіла сабе прырода ў
дачыненні да чалавека?» Трох-чатырох гадоў капіталізму ў
Расіі было дастаткова, каб вывесці такую пароду людзей -
прыстасаваную да мясцовых умоваў, хоць і непрывабную ў

[4] У гэтым месцы інтэрв'ю Волкаў зазначае: «Спрабуючы вырашыць

іншых адносінах.

Аднак гвалт, на якім трымаліся дамоўленасці, мусіў быць рэальным і час ад часу ўжывацца. Паступова перамог прынцып узаемнага стрымлівання, і пік заказных забойстваў быў пройдзены ў 1995 годзе. У той час на рынак аховы парадку пачалі прыходзіць новыя гульцы, у прыватнасці, тысячы былых афіцэраў расійскіх органаў бяспекі і элітных вайсковых падраздзяленняў, якіх прымусілі сысці ў адстаўку маральнае разбэшчанне і нізкія заробкі. Яны стварылі ўласныя прыватныя ахоўныя агенцтвы або далучыліся да ўжо існых, прапануючы прадпрымальнікам усё больш эксклюзіўныя паслугі, і захавалі цесныя, хаця й нефармальныя, сувязі з уладамі. За пэўную плату яны маглі замяніць бандытаў, што апекаваліся той ці іншай фірмай, сваёй, больш легітымнай аховай. Гэткая паслуга, вядомая пад назвай «зняцце страхі», прывяла да істотнай дэкрыміналізацыі расійскага бізнесу пры канцы 1990-х.

Паколькі злачынныя групоўкі прайгравалі навейшым і не такім адыёзным прыватным ахоўным агенцтвам, яны былі вымушаныя прыстасоўвацца да сітуацыі. Адны спрабавалі «касіць» пад прыватныя ахоўныя фірмы, рэарганізаваўшы сваю дзейнасць і дысцыплінаваўшы яе. Іншыя, такія, як «тамбоўская групоўка» ў Санкт-Пецярбурзе, расшырылі сваю дзейнасць або цалкам змянілі яе характар, зрабіўшыся інвестарамі і заняўшыся ўласным бізнесам[6]. Волкаў аддае належнае «сілавым прадпрымальнікам» за зробленую «большую частку чорнай работы», неабходнай, каб падрыхтаваць глебу для кансалідацыі дзяржаўнай улады, якая і адбываецца падчас кіравання Ўладзіміра Пуціна. Расійская дзяржава цяпер спрабуе адваяваць манаполію на ўжыванне гвалту, вяршэнне правасуддзя і збор падаткаў - манаполію, якую яна гэтак прынізліва згубіла за Гарбачовым і Ельцыным. Адкрытым застаецца пытанне, ці можна гэта зрабіць, не абапіраючыся на таталітарныя і аўтарытарныя метады, якія пераважалі на працягу ўсёй расійскай гісторыі. Пуцін падае ўсё больш знакаў, што аўтарытарныя метады захаваюцца - прынамсі, тыя з іх, якія яшчэ не страцілі сваёй актуальнасці і могуць быць выкарыстаныя.

праблему інтэлектуальнай уласнасці, я падзякаваў рэспандэнту за, як мне падалося, каштоўнае і траннае аналітычнае азначэнне... і сказаў, што збіраюся выкарыстаць гэты тэрмін як аналітычную катэгорыю. Той не пярэчыў».

5 Паводле ацэнкі Волкава, крымінальныя групоўкі звычайна забіралі ад 20 % да 30 % прыбыткаў фірмы, якая знаходзілася пад іхняй «страхой».

[6] На думку Волкава, тамбоўская групоўка кантралявала кампанію ПТК, якая спецыялізавалася на пастаўках паліўна-змазачных матэрыялаў. Паміж 1994-м і 1999-м кампанія паступова зрабілася асноўнай паліўнай кампаніяй Пецярбургу і вобласці. Паводле часопісу «Newsweek» ад 3 верасня 2001 году, кантракт, які надаў ПТК фактычную манаполію на рознічны гандаль бензінам у Санкт-Пецярбурзе, быў

падпісаны Ўладзімірам Пуціным, намеснікам мэра гораду ў 1994-1996 гадах. Гэта не значыць, што Пуцін патураў злачынцам, аднак паказвае, наколькі цесна ў Расіі ў 90-я перапляліся бізнес, палітыка і крымінал.

2

Я спыніў сваю працу замежнага карэспандэнта ў Маскве ў мінулым кастрычніку, калі сутыкнуўся з парай такіх сілавых прадпрымальнікаў у пераходзе пад Кутузаўскім праспектам, галоўнай вуліцай на захадзе Масквы, дзе месціўся мой офіс. Я ўвайшоў з імі ў паглыблены кантакт. Наступны тыдзень я правёў у Інстытуце неўралогіі, а большую частку зімы - у розных бальніцах і клініках у якасці амбулаторнага пацыента. На Каляды я ўжо мог нармальна адкрываць рот. У сакавіку я зноўку быў у стане пісаць. Я пакінуў Расію і пераехаў у Латвію, краіну, якую некалі анексаваў Савецкі Саюз. Цяпер яна рыхтуецца ўступіць у Еўрапейскі Саюз.

З дапамогай перамены месца я змог адчуць, што паводзіны Расіі ў Злучаных Штатах ці Заходняй Еўропе не кранаюць непасрэдна амаль нікога, пакуль не выбухаюць атамныя бомбы або атамныя электрастанцыі. Аднак для Латвіі і іншых краін, якія мяжуюць з Расіяй, яе паводзіны і намеры маюць большае значэнне, чым усё іншае ва ўсім свеце. У краінах Балтыі

дагэтуль прысутнічае адчуванне, што кароткае імгненне незалежнасці можа быць перарванае векавым замежным панаваннем, перш-наперш расійскім. Мы можам быць абсалютна пэўнымі, што Расія сёлета не ўяўляе сабой ніякай пагрозы ані для Латвіі, ані для любой іншай краіны, і, цалкам магчыма, не будзе ўяўляць яе ў найбліжэйшыя дзесяць год. Аднак хто можа прадказаць, што здарыцца гадоў праз дваццаць пяць - пяцьдзесят? Усё залежыць ад таго, як будзе развівацца Расія. Для суседніх з ёю краін надзвычайнае практычнае значэнне мае адказ на пытанне, ці сапраўды Расія перастала быць надзвычай небяспечнай формай кіравання - імперскай дыктатурай - і замест гэтага набыла па вызначэнні мірную форму дэмакратычнай дзяржавы. Большасць міжнародных экспертаў лічаць, што гэткая змена адбываецца ці ўжо адбылася. Хочацца верыць, што яны не памыляюцца.

Сэр Родрык Брэйтуэйт, брытанскі амбасадар у Маскве ў 1988-1992 гадах, падае добра падмацаваны прыклад такога меркавання ў сваіх праніклівых і вясёлых мемуарах «За Масквой-ракой: перакулены дагары нагамі свет». Ён удала спалучае свой аптымізм у ацэнках Расіі з уменнем бачыць яе недахопы, гэткія, як, напрыклад, схільнасць да маны нават на найвышэйшым афіцыйным узроўні. Гэта, як ён кажа, «неад'емная частка грамадскага жыцця... Улада маніла свайму народу і замежнікам». І тым не менш, на ягоную думку, тыя замежнікі, якія маюць пераважна крытычнае ўяўленне пра Расію, - гэта або нядобразычліўцы, або кепска інфармаваныя людзі, або і адны, і другія адначасова. Толькі «інтэлектуальна лянівыя людзі», сцвярджае ён, могуць думаць, што,

паколькі Расія заўсёды была імперыяй, расійцамі будуць заўсёды кіраваць імперскія інстынкты. Паколькі Расія заўсёды была аўтакратыяй, дэмакратыя ніколі не зможа там расквітнець, а расійцы будуць заўжды патрабаваць моцнага лідэра, чыя ўлада будзе трымацца на рэпрэсіўным апараце. Паколькі дзяржава кіравала расійскай эканомікай, расійцы ніколі не будуць здольныя весці сумленны бізнес. Паколькі расійцы заўсёды былі эмацыянальныя, спагадныя, цярплівыя, разбадзяныя, схільныя да алкагалізму і лжывыя, то такімі яны і застануцца.

Брэйтуэйт прытрымліваецца іншай думкі. *«Гісторыя і геаграфія,* - падсумоўвае ён, - *магчыма, і змясцілі Расію на пэўны адлегласць ад еўрапейскай ліберальнай традыцыі, адлегласць, цвёрдых падставаў меркаваць, што Расія абсалютна пераадолець сваё мінулае»*[7].

Аднак калі мы сцвярджаем, што Расія можа парваць ці ўжо парвала з аўтарытарнай ды імперскай мінуўшчынай і, зусім нядаўна - з савецкай дыктатурай, то мы абавязаны запытацца, чаму посткамуністычная Расія не зрабіла нічога, каб адцурацца, ужо не кажучы каб пакараць, тых, хто нясе найбольшую адказнасць за самыя страшныя бакі савецкай сістэмы, з якімі, як прынята меркаваць, Расія ўжо развіталася. Вось тлумачэнне Брэйтуэйта:

Люстрацыя накшталт той, што правялі чэхі, выкрыла б галоўных злачынцаў. Аднак яна б таксама назаўсёды заплямiла мноства прыстойных у іншых адносінах людзей, якія, апынуўшыся пад ціскам паліцэйскай дзяржавы, ішлі на кампраміс, хлусілі і даносілі на сваіх калегаў або нават сяброў і сваякоў. Цяжар, які б гэта наклала на грамадства, якому і без таго было нялёгка вынесці шок пераменаў, мог бы аказацца большым, чым яно магло б вытрымаць. Было б ілюзіяй меркаваць, што такі судовы працэс быў бы ўхвалены грамадствам. Для ўсіх расіян ён стаўся б не чым іншым, як апошнім судовым шоў у змрочным шэрагу паказальных палітычных працэсаў, якія стагоддзямі нявечылі гісторыю Расіі. З цягам часу, з адыходам пакаленняў, якія жылі пры камуністычным рэжыме, і з фундаментальнымі зменамі, якія трансфармуюць прыроду расійскага грамадства, гэтае балючае пытанне нарэшце згубіць вастрыню. Такое рашэнне ніколі не задаволіць педантаў, а таксама людзей помслівых або прыхільнікаў ідэальнай справядлівасці. Аднак, напэўна, гэта было адзіна магчымае рашэнне.

Некаторыя з гэтых аргументаў можна прыняць, але не ўсе. Ці звязана з помслівасцю або педантызмам патрабаванне, каб адказныя за ГУЛАГі, або дэпартацыі прыбалтыйскіх грамадзян, або за забойства Рауля Валенберга і пераслед Іосіфа Бродскага сталі перад судом? І ці можна ўпэўнена гаварыць пра

7 Гэта параецца ўпэўненае, што ўстаноў «цвёрдых» і «абсалютна» быць дададзеныя да тэксту на стадыі рэдактарскай апрацоўкі. Тым не менш, думка ясная.

«фундаментальныя змены» ў Расеі, калі мы адразу дадаём, што яна не можа або не хоча трымаць адказ за свае ранейшыя правіны?

Калі Брэйтуэйт прыніжае матывы тых, хто імкнецца да справядлівасці, ён, безумоўна, робіць памылку. Калі ён гаворыць пра здольнасць Расіі да пераменаў, мы мусім пагадзіцца, што ён шмат у чым мае рацыю. Трэба быць аптымістам у літаральным сэнсе гэтага слова, каб не заўважыць, што адбыліся ў Расіі пасля краху камуністычнага рэжыму. Зазвычай шмат пішуць і гавораць пра ператварэнне «Масквы ў зацыклены на грошах геданістычны горад, з адкрытымі круглыя суткі крамамі і рэстаранамі[8]. Менш заўважныя (і замежных візіцёраў, але больш істотным з гледзішча нацыянальнага адраджэння стаў росквіт высокай культуры. Кнігавыданне, тэатр, музыка і кінематограф перажываюць творчы ўздым, які, праўда, не заўсёды суправаджаецца камерцыйным поспехам[9].

[8] Да прыкладу, Мішыгін Тексэн «Маскоўскія хроны» ў MS Word (Вернуўся з Масквы ў зацыклены на грошах горад, 13 кастрычніка 2003 году). У амаль 22-мільённым горадзе, паводле «прадпрымальнік-мільянер» Яфер Лаўроў сцвярджае, што «на колькасці элітных начных клубаў Масква далёка апярэджвае Парыж, Лондан і Нью-Ёрк... Новыя клубы адчыняюцца ў Маскве ў сярэднім двойчы на месяц, і ўсе яны запоўнены

Тым не менш, не ўсе змены ў Расіі адбываюцца ў адным і тым самым напрамку або з адной і той жа хуткасцю. Найхутчэй, лібералізуецца і вестэрнізуецца гарадское насельніцтва. Буйны бізнес рухаецца за ім больш павольна і больш выбіральна. Дзяржава не пасунулася амаль што зусім, а барацьбу Пуціна за ўзнаўленне кантролю Крамля над прэсай і тэлебачаннем, парламентам, уладай у рэгіёнах і буйным бізнесам можна разглядаць як частковы адкат назад. Раней я меркаваў, што Пуціну ў аднолькавай ступені ўласцівая схільнасць да лібералізму і этатызму ды што ліберальныя тэндэнцыі могуць перамагчы. Але цяпер становіцца ясна, што ягоныя глыбінныя інстынкты заклікаюць да «моцнай рукі»; што ў сваім сэрцы ён усё яшчэ мент, што ён і прадэманстраваў у адказе студэнту Калумбійскага ўніверсітэту. Падчас яго наведання 26 верасня 2003 году на пытанне, ці ён «парушае свабоду слова ў Расіі», Пуцін адказаў:

У нас ніколі не было свабоды слова, таму я нават не ведаю, што парушаць... На пачатку 90-х да нас прыйшла свабода. Яе па-рознаму разумелі ў грамадстве і прэсе. Свабода, і свабода прэсы ў прыватнасці, разумелася як усёдазволенасць, як анархія і прага разбурэння ўсяго і ўсіх[10].

Вось вам і свабода слова, адзін з здабыткаў 90-х гадоў у Расіі, безумоўна варты захавання. Цікава, ці застаўся цяпер Брэйтуэйт гэткім жа аптымістам, якім ён быў год ці два таму? Ён асабіста не выказвае асаблівага захаплення Пуціным, апісаўшы яго пасля першай сустрэчы ў 1995 годзе як «маленькага чалавечка, якому цяжка глядзець вам у вочы», пазней як «цень са свету спецслужб». Ён выказвае «здагадку», што пры Пуціну, былым афіцэру КГБ, у Крамлі «зноў узрасла гонар» за расійскія спецслужбы. Аднак, скончыўшы пісаць сваю кніжку на пачатку 2002 году, ён прыйшоў да перакананасці, што нават «маскоўская ліберальная інтэлігенцыя дастаткова задаволеная Пуціным, бо яе прадстаўнікі лічаць, нібыта,

незалежна ад прэзідэнта, краіна будзе-такі працягваць рухацца ў патрэбным напрамку, да ўсеагульнага росквіту, не адмаўляючыся пры гэтым ад дэмакратычных заваёваў, здабытых падчас кіравання двух ягоных папярэднікаў.

На жаль, у Расіі нічога ніколі не здараецца «незалежна ад прэзідэнта». Пуцінская цяга да ўсёабсяжнага дзяржаўнага кантролю ўжо ўвайшла ў супярэчнасць з імкненнем да большай незалежнасці з боку буйных расійскіх прыватных кампаній, напрыклад, падчас кампаніі ўладаў, накіраванай на запалохванне ўладальнікаў велізарнай нафтавай карпарацыі «Юкас» і, магчыма, нават на яе рэнацыяналізацыю. Што здарыцца, калі пуцінскія імкненні да цэнтралізацыі будуць усё больш разыходзіцца са спадзяваннямі шырокіх мас насельніцтва? Я не сцвярджаю, што неўзабаве грамадская думка ўвогуле павернецца супраць яго. Ён дагэтуль застаецца найлепшым расійскім лідэрам апошніх часоў. Найбольшую небяспеку для Пуціна тоіць расчараванне грамадства ў палітыцы, якая праводзіцца пасля таго, як ён паставіў на высокія дзяржаўныя пасады палітычна маладасведчаных ветэранаў КГБ. Ні ў барацьбе з карупцыяй, ні ў вайсковай рэформе, ні ва ўстанаўленні трывалага міру ў Чачні прагрэсу дасягнута не было. Напярэдадні снежаньскіх парламенцкіх выбараў Пуцін пайшоў на пераслед буйнога бізнесу, спадзеючыся, што гэты крок спадабаецца грамадскасці. Магчыма, так яно і ёсць. Аднак калі гэта прывядзе да большага дзяржаўнага ўмяшання ў прамысловасць, што ў сваю чаргу

Дарэчы, Радрык Брэйтуэйт працуе ў «Майбах» пазней як «цень са свету спецслужб». Ён выказвае «здагадку», што пры Пуціну, былым афіцэру КГБ, у Крамлі «зноў узрасла гонар» за расійскія спецслужбы. Аднак, скончыўшы пісаць сваю кніжку на пачатку 2002 году, ён прыйшоў да перакананасці, што нават «маскоўская ліберальная інтэлігенцыя дастаткова задаволеная Пуціным, бо яе прадстаўнікі лічаць, нібыта,

незалежна ад прэзідэнта, краіна будзе-такі працягваць рухацца ў патрэбным напрамку, да ўсеагульнага росквіту, не адмаўляючыся пры гэтым ад дэмакратычных заваёваў, здабытых падчас кіравання двух ягоных папярэднікаў.

На жаль, у Расіі нічога ніколі не здараецца «незалежна ад прэзідэнта». Пуцінская цяга да ўсёабсяжнага дзяржаўнага кантролю ўжо ўвайшла ў супярэчнасць з імкненнем да большай незалежнасці з боку буйных расійскіх прыватных кампаній, напрыклад, падчас кампаніі ўладаў, накіраванай на запалохванне ўладальнікаў велізарнай нафтавай карпарацыі «Юкас» і, магчыма, нават на яе рэнацыяналізацыю. Што здарыцца, калі пуцінскія імкненні да цэнтралізацыі будуць усё больш разыходзіцца са спадзяваннямі шырокіх мас насельніцтва? Я не сцвярджаю, што неўзабаве грамадская думка ўвогуле павернецца супраць яго. Ён дагэтуль застаецца найлепшым расійскім лідэрам апошніх часоў. Найбольшую небяспеку для Пуціна тоіць расчараванне грамадства ў палітыцы, якая праводзіцца пасля таго, як ён паставіў на высокія дзяржаўныя пасады палітычна маладасведчаных ветэранаў КГБ. Ні ў барацьбе з карупцыяй, ні ў вайсковай рэформе, ні ва ўстанаўленні трывалага міру ў Чачні прагрэсу дасягнута не было. Напярэдадні снежаньскіх парламенцкіх выбараў Пуцін пайшоў на пераслед буйнога бізнесу, спадзеючыся, што гэты крок спадабаецца грамадскасці. Магчыма, так яно і ёсць. Аднак калі гэта прывядзе да большага дзяржаўнага ўмяшання ў прамысловасць, што ў сваю чаргу

выкліча пагаршэнне кіравання эканомікай, падзенне інвестыцый і, непазбежна, колькасці працоўных месцаў, і рэжым значна страціць папулярнасць.

кільдыя Расіі, ўзоны «Financial Times Weekend Magazine» (6 верасня 2003 году). Астроўскі, які пераклаў на расійскую мову апошнюю трылогію Стопарда «Бераг утопіі», распавядае, як «цікавасць да сур'ёзных слоў і думак» вярнулася ў расійскі тэатр пасля «ўсёабсяжнага сарказму, кпінаў і насмешак», якія, разам з нецэнзурнай лексікай, былі праявай няпэўнасці і цынізму 90-х.

[10] Гл.

«Дзяржава і эвалюцыя», назва, якая абыгрывае «Дзяржаву і рэвалюцыю» Леніна, успрымаецца як своечасовы каментар на тэму пуцінскай Расіі, хаця Ягор Гайдар упершыню апублікаваў сваю кнігу ў 1994-м, адразу пасля таго, як пакінуў урад. У 1991-1992 гадах ён быў міністрам фінансаў і выконваў абавязкі прэм'ер-міністра, у 1993-1994 гадах быў міністрам эканомікі. Ён быў творцам першых вялікіх эканамічных рэформаў у Расіі, дэрэгуляцыі цэнаў, што адкінула за мяжу беднасці масу людзей, і пачаткаў буйнамаштабнай прыватызацыі, адным з метадаў правядзення якой быў выпуск ваўчэраў, якія пасля шырока набываліся буйнымі інвестарамі[11]. Ягоная кароткая, але змястоўная кніга выйшла цяпер у цудоўным англійскім перакладзе Джэйн Эн Мілер. Яе варта прачытаць, каб не толькі прыгадаць, якім разумным і дасціпным пісьменнікам можа быць Гайдар, але і пабачыць, як мала пытанняў, узнятых ім амаль дзесяцігоддзе таму, было паспяхова вырашана за гэты час. Ці то Гайдар гэткі празорлівы, ці то Расія нагэтулькі нязменная, аднак «Дзяржава і эвалюцыя» чытаецца, нібыта ўчора выйшла з-пад пяра аўтара. Узяць хаця б гэтае папярэджанне аб пагрозе аўтарытарызму, якое, несумненна, больш своечасовае для цяперашняга часу, чым для 1994 году:

Мы, відавочна, назіраем адзнакі новага ледавіковага перыяду. Шмат людзей, якія ў 1989-91 гадах кляліся ў адданасці грамадзянскай супольнасці і дэмакратычным ідэалам, цяпер гэтаксама палка прысягаюць у адданасці моцнай дзяржаве «моцнай руцэ».

Не менш трапнымі з'яўляюцца разважанні Гайдара пра прыватную ўласнасць і яе цэнтральную ролю ў любым ліберальным грамадстве. У «Дзяржаве і эвалюцыі» ён часта вяртаецца да гэтай тэмы, даследуючы эканамічныя ўклады

штодзённы інфармацыйны бюлетэнь МЗС Расіі (29 верасня 2003 году).

[11] Гл. таксама рэцэнзію на кнігі Пола Клебнікава «Хросны бацька Крамля: Барыс Беразоўскі і разбурэнне Расіі» (Paul Klebnikov, Godfather of the Kremlin: Boris Berezovsky and the Looting of Russia, Harcourt, 2000) і Крыстыі Фрылэнд «Распродаж стагоддзя: дзікая гонка Расіі ад камунізму да капіталізму» (Chrystia

Расіі з часоў мангольскага ярма і да сённяшніх дзён. Ён апраўдвае праведзеныя ягоным урадам эканамічныя рэформы, надзвычай непапулярныя тады, калі пісалася гэтая кніжка, і ненашмат больш папулярныя цяпер, неабходнасцю ператварыць у Расіі плацдарм для прыватнай уласнасці і капіталізму. Ягоную думку, галоўным фактарам, які стагоддзямі спрыяў таму, аддзяляў Расію ад усёй Еўропы», была «адсутнасць традыцыі легітымнай уласнасці», кульмінацыяй чаго стаў крывавы шлях камуністаў супраць любой прыватнай уласнасці наагул. Расійская традыцыя бліжэйшая да краінаў Усходу, дзе ўласнасць і камерцыя заўжды былі нечым падазронным, усё кантраляваліся і кіраваліся ўсёведным і ўсюдыісным бюракратычным апаратам. Пры дэспатычных рэжымах канфіскацыі, захопы маёмасці, страта сацыяльнага статусу і права на ўласнасць, абмежаванні ў карыстанні прадметамі раскошы могуць напаткаць нават найбагацейшых прыватных уласнікаў, варта ім толькі згубіць сувязі з уладамі. Гэта і пазіцыі - страта маёмасці. Уласнасць - натуральная «здабыча», а дзяржава - натуральны драпежнік, які заўжды напагатове, заўжды чыніць перадзел і пераразмеркаванне здабытых трафеяў.

У гэтым апісанні непакоіць тое, што яно відавочна нагадвае Расію Пуціна. Мабыць, Гайдар з усіх сілаў намагаўся ўвесці паняцце неадчужальнай прыватнай уласнасці, але ці паспяхова? Два гады таму Пуцін з задавальненнем назіраў, як паліцыя, падаткавікі і падкантрольныя дзяржаве крэдыторы аднялі ў мэдыя-магната Ўладзіміра Гусінскага яго медыя-імперыю, а яго самога вымусілі падацца ў выгнанне. Прыхільнікі Пуціна падавалі гэта як нетыповы прыклад разборак, справакаваных супрацівам самога Гусінскага, або як звычайную камерцыйную справу, звязаную з вяртаннем запазычанасці. Пераслед Барыса Беразоўскага, злога генія расійскага бізнесу 1990-х, які нядаўна атрымаў палітычны прытулак у Брытаніі, тлумачыўся прыблізна таксама.

Сёлета Пуцін зноўку ўзяўся за старое - ці хутчэй ягоныя пракуроры і падатковая інспекцыя, у той час як ён робіць выгляд, што назірае за справай з адлегласці. Аплачаная Крамлём кампанія пераследу «Юкасу», найвялікшай расійскай

Erland, Sale of the Century: Russia's Wild Ride from Communism to Capitalism (Crown, 2000)

у «The New York Review» ад 19 кастрычніка 2000 г. Гэтакама стаіць і «Рабіць ці быць?» на кнігу Пітэра Рэдаўэя і Дзмітрыя Глінскага «Трагедыя расійскіх рэформаў: рынкавы бальшавізм супраць дэмакратыі» (Peter Reddaway and Dmitri Glinski, The Tragedy of Russia's Reforms: Market Bolshevism

нафтавай кампаніі, што пачалася ў ліпені 2003 году з арышту цесна звязанага з ёй фінансіста, дасягнула кульмінацыі пры канцы кастрычніка з арыштам Міхаіла Хадаркоўскага, старшыні праўлення і ўладальніка кантрольнага пакету акцый «Юкасу». Здаецца, галоўнае злачынства Хадаркоўскага палягала ў тым, што ён стаў занадта багатым і занадта ўплывовым чалавекам і пачаў сябе паводзіць, як багаты і ўплывовыя людзі ў іншых краінах, г. зн. фундаваць палітычныя партыі і выказвацца па пытаннях дзяржаўнай палітыкі.

Мала таго што Хадаркоўскага кінулі ў турму - 30 кастрычніка пракуратура замарозіла ягоныя акцыі «Юкасу», а таксама акцыі іншых сузаснавальнікаў кампаніі. Ёсць думка, што акцыі былі арыштаваныя для таго, каб Хадаркоўскі або ягоныя паплечнікі гарантавана выплацілі дзяржаве кампенсацыі, калі суд прызнае іх вінаватымі ў махлярстве або ўхіленні ад падаткаў. Аднак кошт акцый (каля 11 мільярдаў долараў) нагэтулькі перавышае магчымую суму штрафу за ўчыненне крымінальнага злачынства (каля 1 мільярда долараў), што з'яўляюцца сумневы ў законнасці гэтага затрымання. Шмат хто разглядае гэта як першы крок да выцяснення Хадаркоўскага з «Юкасу», або шляхам рэнацыяналізацыі кампаніі, або вымусіўшы яго прадаць сваю долю ўхваленаму Крамлём пакупніку за прызначаную Крамлём цану[12].

Як і мае быць, 3 лістапада была апублікаваная заява Хадаркоўскага, у якой паведамлялася, што ён «сыходзіць з кампаніі». На наступны дзень на пасадзе старшыні праўлення яго замяніў Сямён Кукес, ветэран нафтавага бізнесу, які нейкі час кіраваў іншай буйной расійскай нафтавай кампаніяй, ТНК, палову актываў якой у пачатку 2003 году набыла брытанская «British Petroleum». Гэтая навіна выклікала рост акцыяў «Юкасу», адлюстраваўшы спадзяванні інвестараў на тое, што Крэмль можа спыніць пераслед кампаніі, нават калі ціск на Хадаркоўскага будзе працягнуты.

Другая з гэтых магчымасцяў падаецца вельмі верагоднай. 4 лістапада «New York Times» паведаміла, што Хадаркоўскі

Against Democracy, United States Institute of Peace, 2001) у «The New York Review» ад 4 кастрычніка 2001 году.

12 Хадаркоўскі прызнае, што сцэнараваў правацэнтрысцкую партыю «Яблык», якая часта дэманструе апазіцыйнасць Крамлю, але насуперак паведамленням у расійскай прэсе адмаўляе, што фінансаваў КПРФ.

падумвае наконт таго, каб скласці Пуціну канкурэнцыю на прэзідэнцкіх выбарах наступнага году, - перспектыва, што гарантавала яму працяглы пераслед, калі не турэмнае зняволенне.

Інвестары таксама спадзяваліся, што Кукес зможа зноў аднавіць перамовы аб продажы «Юкасу» замежнай нафтавай кампаніі. Арышту Хадаркоўскага і замарожванню ягоных акцыяў, магчыма, паспрыялі і вераснёўскія чуткі пра марожа адбыцца пагадненне з «ExxonMobil» (ЗША): такім чынам Крэмль перашкодзіў яму выйсці з гульні з каласальным прыбыткам ад частковага продажу кампаніі, якую той набыў амаль задарма падчас хаатычнай і часцяком крымінальнай прыватызацыі сярэдзіны 1990-х[13].

У палітычным сэнсе Хадаркоўскі быў прывабнай і ўрадлівай мішэнню, бо ён, як Гусінскі і Беразоўскі, належаў да т. зв. алігархаў, якія ледзьве не захапілі кантроль над расійскай дзяржавай падчас прэзідэнтуры Барыса Ельцына, забраўшы ў яе нафтавыя кампаніі і іншыя прыродныя рэсурсы, якія і зрабілі іх цяпер казачна багатымі. Заступаючы на пасаду прэзідэнта, Пуцін сказаў, што алігархі могуць захаваць свой бізнес пры ўмове, што яны не будуць умешвацца ў палітыку і будуць плаціць падаткі. Сімпатыкі Пуціна цяпер сцвярджаюць, што Хадаркоўскі парушыў гэтую дамоўленасць, а значыцца, ягоны бізнес больш не з'яўляецца недатыкальным для новых атак падатковых інспектараў і генеральнай пракуратуры. Іншыя алігархі пазіраюць на гэта з асцярогай. Раман Абрамовіч, адзін з сузаснавальнікаў нафтавай кампаніі «Сібнафта» і групы «Расійскі алюміній», цяпер распрадае большую частку сваіх фондаў у абедзвюх кампаніях[14].

У абарону Пуціна можна сказаць, што ўлада алігархаў сапраўды стварае пэўныя праблемы. У іншых краінах спансараванне палітычных партый бізнесменамі можа быць агульнапрынятай практыкай і нават лічыцца праявай адказнасці перад грамадствам. Аднак у Расіі чатырма пятымі ўсёй прыватнай прамысловасці валодае вельмі вузкая група вельмі багатых людзей, уключна з Хадаркоўскім, якія могуць паспрабаваць купіць пэўную манаполію на вызначэнне

[13] Напаўняе лёс замарожаных акцый будзе вырашаны ці набыў адбудзецца продаж усяго «Юкасу» ці яго часткі. Незадоўга да свайго арышту Хадаркоўскі паклапаціўся, каб у выпадку прызнання яго неправаздольным юрыдычны кантроль за ягоным пакетам перайшоў да шэрагу вызначаных ім асобаў. Як паведамлялася, першымі кандыдатамі з гэтага

дзяржаўнай палітыкі (як яны гэта ўжо зрабілі на карысці пры Ельцыну, падтрымаўшы ягонае пераабранне якз'яўляюцца фінансавымі ўнёскамі, так і праз уласныя тэлевізійныя каналы). Таму было б зразумела, калі б Пуцін хацеў не пускаць алігархаў у палітыку, баючыся, што яны пачнуць дамінаваць у палітычным жыцці або надзяляць сябе новымі нафтавымі кампаніямі. Але папраўдзе Пуцін хоча зачыніць ім адсутнасці - палітыку, каб захаваць уласную манаполію на палітычную ўладу.

Расіі не пашкодзіла б мець болей палітычнай канкурэнцыі, нават з боку такіх, як Хадаркоўскі, які ўжо перастаў быць тым драпежнікам, якім ён быў яшчэ пяць год таму. Кантралюючы адну з найбуйнейшых расійскіх кампаній, ён сам быў бы моцна зацікаўлены ў тым, каб зрабіць Расію стабільнай, квітнеючай, адкрытай краінай, у якой выконваюцца законы і шануюцца права на прыватную ўласнасць. І гэта, у сваю чаргу, зрабіла б яго значна бліжэйшым да заходніх ліберальных каштоўнасцей у параўнанні з Пуціным, асабліва ўлічваючы нядаўнія захады апошняга - арышт Хадаркоўскага і канфіскацыю яго ўласнасці.

Сотні час з'яўляюцца ныя суперпакальнікі «Юкасу», у выніку іх адсутнасці - брытанскі фінансіст лорд Джэйкаб Ротшыльд. 14 б кастрычніка 2003 году лонданская «Sunday Times» паведаміла, што Абрамовіч прадаў палову сваёй 50-працэнтнай долі ў «Расійскім алюмініі» другому галоўнаму акцыянеру кампаніі, Алегу Дзерыпаску, прыкладна за 2,3 мільярда долараў ЗША. За два

дні да гэтага «Юкас» пацвердзіў сваё набыццё кантрольнага пакету «Сібнафты» ў Абрамовіча і драбнейшых акцыянераў.

Пуцін сам сябе загнаў у пастку. Ён імкнецца да стварэння вялікай Расіі, разумее, што яе можна пабудаваць толькі на моцнай эканоміцы, і ведае, што моцная эканоміка магчымая толькі пры магутным і незалежным прыватным бізнесе. Аднак ён хоча карыстацца ўсімі перавагамі магутнага і незалежнага бізнесу, не дазваляючы яму быць ні магутным, ні незалежным. Ён разрываецца паміж сваімі адначасовымі стаўкамі на эканамічны рост і палітычны кантроль[15]. Хутчэй за ўсё ён выбера кантроль, нават ужо з той прычыны, што, пакуль цэны на нафту застаюцца высокімі, ён будзе спадзявацца на эканамічны рост таксама магчымы, тым больш што ён таксама зашмат хцівых і зайздросных людзей, якія разглядаюць кантроль над расійскім бізнесам як спосаб уласнага ўзбагачэння. Яны хочуць стаць, кажучы словамі Вадзіма Волкава, новымі «вымушанымі партнёрамі» бізнесу.

Гэта не найгоршы сцэнар для Расіі. Усё ж кансалідацыя ўладаў пры Пуціну пакідае краіне больш свабоды, чым у савецкія часы, а таксама значна больш магчымасцяў для дасягнення дабрабыту. Жаданне Пуціна карыстацца павагай заходніх лідэраў можа і надалей стрымліваць ягоную аўтарытарную жылку, хоць гэтага ні ў якім разе нельга сцвярджаць з усёй пэўнасцю. Існуе небяспека, што яго нядаўні зварот да тактыкі «моцнай рукі» ва ўнутранай палітыцы можа сведчыць пра рост уплыву рэакцыянераў з яго найбліжэйшага атачэння, якія бачаць замежную палітыку Расіі больш канфрантацыйнай у дачыненні да Захаду. Адным з трывожных сігналаў пры канцы

[15] Гэта таксама фармулёўкай не абмежаваны Дзяжкіна Шарэнжным. Ён разрываецца паміж сваімі адначасовымі стаўкамі на эканамічны рост і палітычны кантроль. Хутчэй за ўсё ён выбера кантроль, нават ужо з той прычыны, што, пакуль цэны на нафту застаюцца высокімі, ён будзе спадзявацца на эканамічны рост таксама зашмат хцівых і зайздросных людзей, якія разглядаюць кантроль над расійскім бізнесам як спосаб уласнага ўзбагачэння. Яны хочуць стаць, кажучы словамі Вадзіма Волкава, новымі «вымушанымі партнёрамі» бізнесу.

кастрычніка стала адстаўка Аляксандра Валошына, кажучы аб вытанчанага і дасведчанага кіраўніка пуцінскай адміністрацыі, які захоўваў гэтую пасаду яшчэ з часоў Ельцына.

Паводле расійскіх мерак Валошын быў лібералам. Ён таксама валодаў усімі патрэбнымі палітычнымі прыёмамі, каб не даваць ходу былым генералам арміі і КГБ, якімі Пуцін насяліў шматлікія іншыя крамлёўскія кабінеты. Калі ж пад уплывам справы «Юкасу» фондавыя рынкі захісталіся і пачаліся ўцёкі капіталу з Расіі, Пуціну хапіла розуму не перапужаць інвестараў яшчэ больш, аддаўшы пасаду Валошына карготаму ветэрану спецслужбаў. Ён прызначыў на яе намесніка Валошына Дзмітрыя Мядзведзева, чалавека заслужанага і паважанага. Аднак Мядзведзеў - нашмат слабейшая за Валошына фігура. Ён не зможа загарадзіць дзверы кабінету свайго шэфа, калі ў іх будуць ламіцца яго аднакашнікі з КГБ. Трэба чакаць адставак і іншых магутных, звязаных з буйным бізнесам палітыкаў ельцынскага прызыву. Сярод іх прэм'ер-міністр Расіі Міхаіл Касьянаў, якому ягоная яўная сімпатыя да Ходаркоўскага можа пасля думскіх выбараў каштаваць пасады. Анатоль Чубайс, колішні архітэктар шырокамаштабнай прыватызацыі эпохі Ельцына і цяперашні кіраўнік расійскай энергетычнай манаполіі, які выказваўся ў падтрымку Валошына.

Гэта не найгоршы, але далёка і не найлепшы сцэнар для Расіі. Выглядае на тое, што пуцінская Расія збіраецца застацца краінай, у якой важныя палітычныя рашэнні прымаюцца не на аснове адкрытай і інфармацыйна насычанай дыскусіі, а групай асобаў у Крамлі, большасць якіх страціла сувязь з народам і мяркуе, што так і мае быць, а ўсё большая частка якіх падзяляе грубыя і агрэсіўныя палітычныя інстынкты савецкай эпохі. А гэта зарука непрадказальнасці, безадказнасці, неэфектыўнасці і, нарэшце, слабасці. Слабая Расія будзе няшчаснай Расіяй. Калі такое здарыцца, гэта закране нас як мінімум у такой жа ступені, як і саміх жыхароў Расіі.

5 лістапада 2003 году

З англійскай пераклала Мілана Міхалевіч
[image]

мінімум, працы, працаваць разам з тым, хто ягоныя погляды мадэлюе, - значыць настойваць на прынцыпе, які можа быць захаваны толькі з дапамогай сілы. (Дзеркало тижня. 2003. 16 жніўня.)

Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ
крытык літаратуры, сталы аўтар «ARCHE»

Анатоль Сідарэвіч
Дух і літара

Якуб Колас. Новая зямля: Паэма / Агул. рэд., пасьлясл. Я. Янушкевіча; Уклад. У. Гілеп, Я. Янушкевіч; Прадм. М. Мушынскага; Пер. на рас. мову С. Гарадзецкага і інш.; Пер. на польск. Ч. Сэнюха; Камэнт. М. Мушынскага, Я. Янушкевіча; Маст. В. Шаранговіч. - Менск: БФК, 2002.

У Максіма Гарэцкага ёсьць парадаксальнае выказваньне пра тое, што творчасьць Купалы «болей нацыяналістычна, чым творчасьць Коласа, і меней нацыянальна... чымся коласаўскі эпас». Хочаш таго ці не, мусіш згадзіцца і з Гарэцкім, і з вызначэньнем Коласавай паэмы «Новая зямля» як энцыкляпэдыі жыцьця беларускага сялянства. Жыцьця - заўважым - дакалгаснае эпохі. І паказальна, што менавіта гэтая, багата аздобленая мастаком Васілём Шаранговічам, паэма была выдадзеная ёмістым томам да 120-х угодкаў песьняра.

Скажам шчыра: том мог быць танчэйшы, калі б не сэрвілізм нашага чынавенства, якое і ў страшным сьне ня можа прысьніць, што Коласаў шэдэўр надрукаваны на мове арыгіналу і ў перакладзе на польскую безь перакладу на расейскую&sup1. Хоць перакладу на «вялікую і магутную» насамрэч няма: калі ў арыгінале мы налічваем 10953 радкі, дык у расейскім перакладзе - на 966 радкоў меней. Асабліва не

пашанцавала песьні XIII («Падгляд пчол»), якую расейскі перакладнік скараціў на 109 радкоў. Мусіць, за апісаньне сялянскага (з чыйгосьці гледзішча - кулацкага) «раю», што было недапушчальна пасьля галадамору (ад голаду пухлі сяляне і ў беларускім савецкім Палесьсі) ды падчас карткавай сыстэмы. Істотна абсечаная і песьня XXIV («Вялікдзень»). Ізноў жа: і карціна сытасьці ў ёй, і стаўленьне народу да рэлігіі ня так, як «трэба», паказанае.

Беларуска- і расейскамоўную вэрсіі камэнтароў напісаў Міхась Мушынскі. Ён тлумачыць чытачу, што такое Вербніца, Вялікая Субота, Піліпаўка і г. д. Рэлігійнае невуцтва, мабыць, нішто не ўдалося адолець, калі трэба тлумачыць такія паняцьці. А адмыслова для расейскамоўнага чытача падаецца гісторыя перакладу «Новае зямлі» на «вялікую і магутную» і самім Якубам Коласам. Пясьняр адзначаў, што «в переводе на русский язык поэма звучит далеко не по-русски». На ўсе стараньні Коласа (які нават сам перакладаў кавалкі за перакладнікаў), яму «не ўдалося дамагчыся поўнай адпаведнасьці арыгіналу». Дый як яе было дамагчыся, калі пільна працавала цэнзура і ня менш пільна - самацэнзура перакладнікаў. Вылазіла навонкі і іх савецкасьць, жаданьне выслужыцца перад уладаю. Як скажаўся дух паэмы, як яе героям прыпісвалі атэізм[2] - гэта М. Мушынскі дэманструе пры супастаўленьні цытатаў з арыгіналу і перакладу.

І вось расейскі пераклад «Новае зямлі» друкуюць пад адной вокладкаю з арыгіналам...

Зь Міхасём Мушынскім трэба паспрачацца наконт пераліку выданьняў «Новае зямлі». Ён называе першае (1923), трэцяе (1934), чацьвертае (1941), пятае (1946) выданьні. Але я не магу згадзіцца з такою нумарацыяй, бо «Новую зямлю» выдавалі таксама ў Заходняй Беларусі, вывучалі ў нешматлікіх беларускіх і дзьвюхмоўных школах, і заходнебеларускія дзядзькі «шпарылі» яе на памяць цэлымі разьдзеламі. У 1928-1929 гадох трыма выпускамі і ў розных віленскіх друкарнях убачыла сьвет трэцяе выданьне «Новае зямлі»[3], а ў 1931 годзе - чацьвертае. Менскае выданьне 1934 году было, такім чынам, пятым.

Так яно і было: у Савецкім Саюзе галоўны Коласаў твор нельга было цалкам перакласьці на расейскую, а бээсэсэраўскае і саюзпісьменьніцкае кіраўніцтва і не магло, і не жадала замаўляць яе пераклад на іншыя мовы. (Напрыклад, я перакананы, што «Новая зямля» выдатна гучала б па-ўкраінску, як гучаць на гэтай мове ў перакладах Рамана Лубкіўскага і Паўла Гірныка купалаўскія «Яна і я» ды «На Куцьцю».) Тым часам за пераклад паэмы ўзяўся быў Тадэвуш Хрусьцялеўскі (Chróścielewski). У гэтую працу ён уцягнуў сваю дачку Дароту і Бажэну Клёг-Гагалеўскую (Klog-Gogolewska). Для кнігі Якуба Коласа «A tak śpiewa dudka miła» (Лодзь, 1982) былі перакладзены фрагмэнты песень I, XXVII, XXVIII, XXIX (Т. Хрусьцялеўскі), XIII, XVII, XXVI, XXX (Д. Хрусьцялеўская), VIII і IX (Б. Клёг-Гагалеўская). Апрача таго, Б. Клёг-Гагалеўская пераказала ў тым самым томе зьмест усяе паэмы. Адначасова высьветлілася, што лодзінскія перакладнікі рабілі пераклады толькі для дадзенага зборніку Коласавых твораў, зацікаўленасьці поўным перакладам яны ня мелі намеру.

У сваім пасьляслоўі «Наша Песьня Песьняў» і ў каментарох да трохмоўнага выданьня Язэп Янушкевіч распавядае, з чаго і калі пачалася праца Чэслава Сэнюха над новым перакладам «Новае зямлі», і ледзь не па днях паказвае, калі якая песьня была перакладзеная. Перакладнік працаваў бязмала дзесяць гадоў - недзе на два гады менш, чым сам аўтар. А перад пачаткам гэтае працы была размова Янкі Брыля з Чэславам Сэнюхам у коласаўскай Альбуці...

Тое, што за пераклад «Новае зямлі» ўзяліся ў Польшчы, ня дзіўна: польскія і беларускія сяляне з цэнтральных і заходніх земляў нашае краіны, якія забылі пра пазямельную грамаду, вельмі блізкія ў сваёй мэнтальнасьці. Ім, бадай, аднолькава была ўласьцівая вера, што свая ральля - гэта «наймацнейшая аснова і жыцьця першая умова». Розьніла іх тое, што польскае сялянства, выхаванае сваім каталіцкім духавенствам, загартаваным у супрацьстаяньні з захопнікамі, здолела адпрэчыць калгасны лад. Коласавы ж Міхал, Антось і Ганна, як і мільёны іхніх суайчыньнікаў, у найлепшым разе маглі дастаць на Вялікдзень з-за бэлькі старую кантычку - як успамін пра сваё колішняе каталіцтва... Ды я заходжу на іншую дзялянку -

[2] Хаця, дарэчы, ва ўкраінскай літаратуры сяўцоў працу публікацыі паэмы, пакідаюць напісаньне *Бог*. Думаецца, справядліва было б пісаць у гэтым выданьні паэмы *Бог*. Ці нельга пераканацца у слушнасьці такога пераканаьня, калі паглядзець дасавецкія публікацыі падобных песьняў? Мы

гістарычную, хоць і лічу, што прыняцьце хрысьціянства ведаем, Бізантыі сталася прычынаю нашае адсталасьці, а Унія была толькі зьлёгку мадыфікаваным праваслаўем.

Дык вось, Язэп Янушкевіч, падлічваючы радкі ў расейскім ды польскім перакладах, адзначае, што і Чэслаў Сэнюх не дасягнуў ідэалу эквілінэарнасьці: ягоны пераклад на 164 радкі болыны за арыгінал. Ведама, ідэал ёсьць ідэалам, але не самамэтаю. У дзьвюх песьнях ідэал дасягнуты, у дзевяці песьнях перакладу радкоў меней, чым у арыгінале. Меней іх на адзін, на два і тры, і нават на пятнаццаць, як у песьні II («Раніца ў нядзельку»). У васьмі песьнях на адзін-дзевяць радкоў болей, чым у арыгінале, і ў адзінаццаці іх болей на дзесяць («Пярэбары», «Дзедаў човен», «Вялікдзень») і нават на дваццаць два («Дарэктар»), на дваццаць тры («Сьмерць Міхала») або на дваццаць дзевяць («На глушцовых токах»).

Паглядзім, што скарочана ў песьні «Раніца ў нядзельку». Два радкі «згубленыя» ў фрагмэнце, у якім гаворыцца пра жаночую долю (радкі 70-78 арыгіналу), але сутнасьць яго ад гэтага не пацярпела (радкі 70-76 перакладу). Найбольш прапала радкоў у той частцы, дзе дзядзька Антось вяртаецца зь Нёмна і апавядае пра рыбалку (радкі 147-229 арыгіналу, 145-209 перакладу). Аўтар тут трохі пакеплівае з свайго героя:

...А дзядзька мерна йдзе з-за кладкі,
Ідзе бяз шапкі, круціць носам -
Гаворыць пацеры з засосам;
Для сьмешак твар яго зацяты,
Дык, моў, ня лезьце, парасяты.
І дзеці змоўклі, больш ні слова:
Няхай канчаецца размова
Антося дзядзькі са сьвятымі, -
Тады пагутарыць і зь імі.
А покі скончыць ён маліцца,
То можна ў Сьвержні апыніцца:
Псальмоў адкоціць з паўдзясятка,
Дык так выразна, ды так гладка,
Што дзяк і той ня ўсякі зможа,
Як рэпу грыз, - даруй грэх, божа!
Не гаварыў, а сек языкам!

Янка Купала
Якуб Колас
Максім Багдановіч
Цётка
Францішак Багушэвіч
Вацлаў Ластоўскі
Алесь Гарун
Сяргей Палуян
Сяргей Новік-Пяюн
Алесь Дудар
Сяргей Дарожны
Алесь Разанаў
Уладзімір Арлоў
Сяргей Законнікаў
Сяргей Законнікаў
Сяргей Законніка

Маліўся дзядзька з тым разьлікам.

старонкі на зацемкі, і ўсё ж другі выпуск, зроблены ў друкарні «Рах», пачынаецца са 123-й старонкі. У першым выпуску, у якім напісана, што гэта «адбітка з «Народу» (газэты Беларускае сялянскае партыі Яна Станкевіча), пазначана таксама: выданьне 3-е. А вось другі і трэці выпускі выдаўцы чамусьці пазначылі як 4-е выданьне паэмы. У трэцім выпуску, надрукаваным у друкарні «Pogoń - Рах»,

таксама адзначана, што яно набрана літарамі У. Знамяроўскага (беларускага выдаўца). Асаблівасьцю трэцяга выданьня ёсьць тое, што замест літары *й* ва ўсіх трох выпусках выкарыстаная літара *j*

У перакладзе гэты фрагмэнт і скарочаны. Я выдзеліў тыя радкі, якія маглі б выклікаць у польскіх чытачоў зь ліку шчырых вернікаў неадэкватнае разуменьне стаўленьня аўтара да рэлігіі. Перакладнік, думаю, кіраваўся перш за ўсё гэтым меркаваньнем[4]. Што гэта так, сьведчыць і наступны прыклад. У песьні «Падгляд пчол» ёсьць даволі запамінальны вобраз: *«Крыніца бурнага натхненьня, // Мінут вясёлых, ажыўленьня, //* Стаяць, як біскупы, бутэлі, *// І ласа ўсе на іх глядзелі».* Аднак у перакладзе гэтага вобразу няма. У беларусаў, якіх пераводзілі з аднае веры ў другую, трохі іншае стаўленьне да вонкавых праяў рэлігійнасьці і да духавенства, чым у большасьці палякаў.

На шэсьць радкоў скарочаны дыялёг дзядзькі з Алесем пра шчупака, які разам з кручком сарваўся яму з вуды (радкі 199-229 арыгіналу, 185-209 перакладу). Што праўда, скарачэньне гэтае не прынесла нейкіх зьмястоўных стратаў і не скажае вобразу дзядзькі Антося. Шэсьць радкоў перакладнік дабірае ў трох заключных разьдзелах песьні (вяртаньне Міхала з абходу).

А вось песьня XXII («На глушцовых токах»). Два першыя разьдзельчыкі эквілінэарныя. Пасьля трэцяга, у якім пабольшала на тры радкі, эквілінэарнасьці ўжо няма, але дух Коласавай паэмы, характарыстыкі герояў (таго ж Абрыцкага) захаваныя. Пакуль Міхал падыходзіў да агню, ля якога сядзелі Абрыцкі, Дземідовіч, Астахновіч ды іншыя, пераклад перавысіў арыгінал ужо на шаснаццаць радкоў (139:123). Пасьля апісаньня бойкі Пшавары й Абрыцкага гэтая розьніца павялічылася на васямнаццаць радкоў. Далей усё зноў ідзе радок у радок, але, пакуль Міхал хадзіў «сачыць глушцоў, шукаць іх токі», у перакладзе паболела на дваццаць пяць радкоў, а ў канцы песьні, калі лесьнікі вярнуліся да будана, дадаліся яшчэ чатыры радкі. І цяжка ўпікнуць перакладніка, што ён зграшыў супраць літары і духу песьні.

Дваццатая песьня («Каляды», назва якой гучыць не «Kolędy», як можна было б чакаць, а «Gody») у перакладзе большая на тры радкі за арыгінал. А здарылася гэта таму, што аўтар (мусіць, як і Міхалавы дзеці ў паэме) у чаканьні смакаты пасьля Піліпаўкі (Адвэнту) вельмі ж прыглядаўся, што і як матуля гатуе на Куцьцю да сьвяточнага стала.

І вось вячэра пачалася!
Спыніцца мушу я на квасе:
Ён колер меў чырванаваты;
Тут быў таран, мянёк пузаты,
Шчупак, лінок, акунь, карась,
Кялбок і ялец, плотка, язь,
Яшчэ засушаныя зь лета.
Але ня ўсё яшчэ і гэта:
Аздоблен квас быў і грыбамі…

Чэслаў Сэнюх перакладае ледзь ня літара ў літару, але, як сын і знаўца звычаяў нашае зямлі, удакладняе, нешта дадае сваё (гэтыя радкі выдзеленыя):

I już wieczerza w całej krasie!
Lecz chcę zatrzymać się na kwasie:
Ten kwas swój kolor czerwonawy
Od buracznej miał zaprawy,
A był w nim taran, lin brzuchaty

I ułow nasuszony z lata -
Szupak, okonie, płocie, jazie,
Kiełbiki, jelce i karasie
I jeszcze miętus na okrasę.
Lecz to nie wszystko. Kwas jest kwasem,
Gdy suszonymi go grzybami
Dopełnić...

Перакладнік заўсёды троху камэнтатар. Тут якраз той выпадак: хто так цяпер спраўляе Куцьцю? І хоць патрабаваньне эквілінэарнасьці парушанае, дух фрагмэнту захаваны. Літара не пакрыўджаная і праўда жыцьця захаваная. Ці вось радкі з тае самае песьні:

Ялінка ў хаце так прыгожа!
А колькі радасьці і ўцехі!
На ёй валоскія арэхі,
А з пазалочанай паперкі
Глядзяць панадныя цукеркі...

Перакладнік тут (мусіць, згадваючы сваё маленства) «папраўляе» аўтара і піша, што ялінка

...daje dzieciom moc radości,
Kusz&#261c ich oczy cukierkami
I złoconymi orzechami...

І такая дэталь нешта дадае для разуменьня колішняга сялянскага і дробнашляхецкага быту, не пярэчыць духу «Новае зямлі». Але вернемся да пытаньня пра эквілінэарнасьць. У перакладзе песьні XXVI («Агляд зямлі») на два радкі меней, чым у арыгінале. Ды вось чытаем апісаньне слуцкага пэйзажу: «Прад імі Случчына ляжала...» Перакладнік палічыў патрэбным пакінуць у тэксьце слова «азярод», але радок *«Па старасьвецкіх азяродах»* ён мусіў патлумачыць. Таму й чытаем: *«Po staroświeckich «aziarodach» - // Krzyżakowatych urz&#261dzeniach ⁄⁄ Do bujnych traw i zbóż suszenia» </i><small>⁵</small>.</p> </div> <!-- структура вынаскі: --> </td> <!-- канец папярэдняга слупка --> <td width="30"> </td> <!-- новы слупок-падзел --> <td width="100" valign="top"*

*align="left">⁴Хоць і ня скажаш, што ўсе палякі такія ўжо вернікі і дзеці Касьцёлу (газэта «Nie» з нумару ў нумар крытыкуе духавенства, пачынаючы ад якога вясковага кандыдата і канчаючы біскупам Рыму, а тыраж мае досыць вялікі), перакладнік меў на ўвазе przeciętego Polaka зь яго культам Бога, Касьцёлу і Айчыны. Ёсьць у палякаў і культ войска, а таму ў іх немагчымы вобраз кшталту Івана Чонкіна. Менавіта ze względów idejowych (Войска польскае не выглядае ідэальна) пераклад раману Янкі Брыля «Птушкі і гнёзды» ня змог убачыць сьвету ні ў Польшчы камуністычнай, ні ў Польшчы дэмакратычнай. Вяртаючыся да рэлігійных матываў: перакладнік учыняе недакладнасьць, калі ў песьні «Летнім часам» радкі «To там, то сям у чэсьць пятровак ⁄⁄ З грудзей тых макавых галовак, ⁄⁄ Дзяўчатак слаўных, яснавокіх, ⁄⁄ Ў лугах прасторных і шырокіх ⁄⁄ Плывуць-дрыжаць сьпяванак тоны...» перакладае як «A że to w Dzień Piotrowy było, ⁄⁄ Z piersi tych dziewczyn jasnookich⁄⁄ Śpiewanki płyn&#261 pod obłoki...» Колас пісаў пра пятроўкі (пятроўку) - пост, што пачынаецца праз тыдзень пасьля Сёмухі (Зялёных сьвятаў) і працягваецца да дня Пятра і Паўла. А ў сам Пятроў дзень людзі на працу не хадзілі. У перакладзе трэба было б «Dzień Piotrowy» паправіць на «post Piotrowy», і тады было б зразумела, чаму тыя сьпяванкі «Tajemnym smętkiem zamącone». </td> <!-- новы слупок для вынаскі --> </tr></table> <!-- новая табліца, нанаваньне структуры --> <table border="0" cellpadding="0" cellspacing="0" width="740"> <tr><td width="150" align="center" valign="top" background="../images/f00.gif"> </td> <td width="20"> </td> <td width="437">
 Веданьне геаграфіі краю дазваляе перакладніку (ці не з настальгіяй?) «устаўляць» сваё, як у песьні «Зіма ў Парэччы» з знакамітым паляваньнем на зайцоў («Забілі зайца, не забілі, ⁄⁄ Але ж, брат, гуку нарабілі»). Кіруе «паляваньнем» дзядзька Антось. Дае*

дарэктару ён бляху. - Звані ў яе, бі чым папала, Абы мацней яна гучала - На ўсю Сьвяржэнскую граду! У перакладзе: «Darektarowi» daje blachę: - Masz walić w ni&#261 czym tylko da się, By las się zatrz&#261sł w tym hałasie Od Stołpców aż po Nowojelnię! Ад гэтага «od Stołpców aż po Nowojelnię» камічны эфэкт нават узмацняецца: і сапраўды «huku-krzyku było! ». Або слова «капэля». У нашым кутку, калі падшпаркі зьбіраліся ці то ў лес, ці то на возера, дарослыя казалі паблажліва: «Бач ты, сабралася капэля». А тут - у песьні «Зіма ў Парэччы» - яшчэ з бляхаю, патэльняю... І хоць слова «капэля» ў арыгінале няма, перакладнік уводзіць яго, і гучыць яно натуральна: Ruszyli w las. Stryj już zawczasu Obmyślił, jaki rewir lasu Przepędz&#261 law&#261, w któr&#261 stronę Cała k&#261pela pójdzie gonem... Або з імёнамі праблема. Бывае так, што дзеля рыму і рытму імя трэба мяняць. Звычайна гэта робіцца з імёнамі трэцярадных пэрсанажаў, якіх мы сустракаем у паэме толькі адзін раз. Дзядзька Антось з Таксаю палюе на тхароў, бо «У Сьвержні Іцка з Моўшам проста ⁄⁄ Да шкуркі ўліпнуць, як кароста». У перакладзе ж у тым самым Сьвержні за шкурку ледзь не пацалуюць руку Гірш і Іцак. У песьні «Воўк» аўтар згадвае Дароту, перакладнік - Агату, у песьні «Летнім часам» у аўтара Аўдоля, у перакладніка - Алёна... Гэтыя недакладнасьці ня маюць істотнага значэньня, бо і ў аўтара імёны гэтых пэрсанажаў, бадай, выпадковыя, «пад рыфму». Іншы раз перакладнік уводзіць імя дадаткова. Вось дзед Юрка (вобраз, сьпісаны з рэальнага паэтавага дзеда), той дзед Юрка, што, падгуляўшы, «трохі сына памуштруе» (nota bene: будучага Старшыню Рады БНР і акадэміка Язэпа Лёсіка). У Коласа (песьня «Дзедаў човен») імя ўласьніка шынка, у якім дзед Юрка падгуляў, ня згадваецца. Перакладнік жа ўдакладняе: «A gdy wróciwszy z szynku Srula ⁄⁄ Dziadek rozbawił się, rozhulał...» І тут ён не скажае арыгіналу, бо

*імя гэтага шынкара (Сроль) мы сустрэнем у песьні «Сэсія». Добрае веданьне тэксту, заходнебеларускіх рэаліяў, звычаяў і наднёманскіх мясьцінаў - усё гэта дапамагае перакладніку ўвесьці чытача ў сьвет Міхалавай сям'і, яе турботаў, у яе прыроднае і сацыяльнае атачэньне. Мяне цікавіла, як перакладзеныя тыя радкі з паэмы, якія часта цытуюцца, сталі афарызмамі. Скажам так: ня ўсё перакладніку ўдалося (дый, мусіць, ён такое адмысловае мэты перад сабою ня ставіў), але шмат што і па-польску гучыць запамінальна. Вось паралельныя тэксты: <!-- структура вынаскі: --> </td> <!-- канец папярэдняга слупка --> <td width="30"> </td> <!-- новы слупок-падзел --> <td width="100" valign="top" align="left"> ⁵ «Заашчадзіў» перакладнік на іншым. У прыватнасьці, у гэтай песьні ёсьць сэнтэнцыя: «Наогул хата - справа дробна, ⁄⁄ Абы зямля была ўпадобна» У гэтых двух радкох - сялянская філязофія. У нас на Палесьсі чалавеку, які кажа, што ў кагосьці надта малая хата, адказваюць: «Хоць ракам лезьці - было б што есьці». З гісторыі ЗША мы ведаем, што фэрмэры жылі ў зямлянках датуль, пакуль не даводзілі да ладу зямлю і не «станавіліся на ногі». Шкада, што Чэслаў Сэнюх якраз гэтыя два радкі і не пераклаў. </td> <!-- новы слупок для вынаскі --> </tr> </table> <!-- новая табліца, нанаваньне структуры --> <table border="0" cellpadding="0" cellspacing="0" width="740"> <tr> <td width="150" align="center" valign="top" background="../images/f00.gif"> </td> <td width="20"> </td> <td width="220"> <small>
 Мой родны кут, як ты мне мілы!..
 Забыць цябе ня маю сілы!

 А за сталом на верашчаку
 Падгатаўлялі ўжо атаку…

 А ў пост, скажы, сварыцца можна,
 Калі ты гэтака пабожна?

 І мяккім робіцца паганы -
 Хоць ты кладзі яго да раны.

 І так, бывала, наясіся,
 Што хоць на пупіку круціся…

 А чыгунок, бы пан пузаты,
 Кіпіць, пыхціць, шуміць заўзята…

 Які ты, хлопча, нецярпячка,
 Няхай цябе затопча качка!

 Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,
 Каб з панскіх*

*выпутацца пут...

 Наняўся, кажуць, як прадаўся! -
 Міхал зласьмешна адазваўся.

 А будзе йсьці навука туга,
 Падгоніць бацькава папруга!

 Паны на момант слупянеюць,
 Жаваць іх сківіцы ня сьмеюць...

 Сказаць: салгаў - не выпадае,
 Паверыць - веры не хапае...

 Сьпяваеш добра, ды ці тое?
 Вярзеш, брат, грушу на вярбе.

 ...можна б сьмела зьесьці булку,
 Каб абысьці гэту качулку...

 Ідзе так дзядзька і па бруку
 Адзін за дзесяць робіць груку.

 Чыноўнік буркнуў штось сярдзіта,
 Як той вяпрук каля карыта...

 А нашча чарачку кульнуць -
 Усё адно, што ў рай зірнуць. </small> </td> <td width="5"> </td> <td width="220"> <small>
Kraju rodzinny, sercu miły!
 Zapomnieć ciebie nie mam siły!..

 I już na mis&#261 z wereszczaką
 Stół się szykował do ataku.

 Jak jesteś tak&#261 już pobozną,
 To powiedź: w post przeklinać mozna?

 Najgorszy zlośnik uglaskany,
 Choć bierz i przyłóż go do rany...

 Więc brzuszki im pęczniały prędko,
 Choć bąka kręć na własnym pępku...

 Sagan puzaty jak panisko
 Już prawie kipie, warem pryska…

 Oj, niecierpliwy ty okropnie!
 A niechże ciebie kaczka kopnie!

 Kupić na własność trochę ziemi
 I już nad sobą pana nie miec...

 Najęty, mówia, jak sprzedany -
 Zakończył Michał prawdą znaną.

 A na lenistwo i narowy
 Mam sposób pewny: pas ojcowy!

 Wszyscy zamarli w osłupieniu,
 Aż zapomnęli o jedzeniu...

 Powiedzieć: kłamstwo - nie uchodzi,
 Uwierzyć - rozum się nie godzi...

 Czy ty nam prawdę tut przedstawiasz,
 Czy gruszki nam na wierzbie wmawiasz?

 ...człek by wrąbał bułkę z mlekiem,
 Zanim by obszedł*

*taką bekę...

 Idzie tak stryjo i na bruku
 Sam za dziesięciu robi huku.

 Burknąl czynownik rozeźlony,
 Jak nad korytem wieprz spasiony...

 A na szczo walnąć po sto gramów
 To tak, jak zajrzeć w raju bramy. </small> <td> <!-- структура вынаскі: --> </td> <!-- канец папярэдняга слупка --> <td width="10"> </td> <!-- новы слупок-падзел --> <td width="115"></td> <!-- новы слупок для вынаскі --> </tr> </table> <!-- новая табліца, нанаваньне структуры --> <table border="0" cellpadding="0" cellspacing="0" width="740"> <tr> <td width="150" align="center" valign="top" background="../images/f00.gif"> </td> <td width="20"> </td> <td width="437">
Ведама, усяго зрабіць радок у радок і сугучна не атрымалася. Напрыклад, славутага «А для дзяцей набольша сьвята ⁄⁄ Абы наесьціся багата» ці ня менш запамінальнага «А сок быў сьвежы, такі хвацкі, ⁄⁄ Такі салодкі забіяцкі!». Затое хораша гучаць наступныя радкі: «O jakże bliski serci dziecka ⁄⁄ Jest brzęk patelni na przypiecku!». А гэтая «рэкляма» Хадыкам свае зямлі? Вось паплавец мой. Сена - піва!
 Яркое, брацікі, на дзіва:
 Запраў, дык есьці будзе поп.
 А жыта! ну, ня ўзьнімеш сноп!
 Глядзеце: ржышча - чараціны,
 Ня вашы менскія націны,
 Бо вашы менскія пясочкі
 Знаёмы добра мне, браточкі, -
 Мясіў уласнымі нагамі,
 Ядзяць іх мухі з камарамі!
 Tam ląka. Siano z niej jak piwo,
 Zapachów, smaków w nim na dziwo,
 Choć swatów częstuj nim czy popa!
 A żyto! Nie podźwigniesz snopa!
 O tutaj rżysko: jak po trzcine,
 Nie jak po waszej tam zbożynie
 Na mińskich piachach zamorzonej.
 Znam te waszy piaski płone,
 Zdeptałem swymi je nogami,
 Jadły je muchy z komarami! Сёе-тое перакладнік папраўляе, і даволі ўдала. Вось дзядзька Антось з Грышкам хочуць узысьці на Замкавую гару ў Вільні. Вартаўнік кажа ім, што трэба «білет купіць на права ўходу». Гэты*

*радок рыфмуецца з наступным: «Сябры спынілісь - грошай шкода». У перакладзе вартаўнік патлумачыў, што трэба купіць білет, а далей ідуць два радкі, што ствараюць жывы, сюжэтны малюнак: «Stanęły chłopy koło wchodu, ⁄⁄ W głowy się drapią: grosza szkoda!» Агульнавядомаю праблемаю ў перакладзе зьяўляюцца фразэалягізмы, праўдзівей - пошук іх адпаведнікаў. У песьні VII («Дзядзька-кухар») у вядомых словах дзядзькі Антося пра кансэрватыўнасьць жанок («Як іх на розум тут ня ставяць, ⁄⁄ Яны ж сваё ўсё права правяць ⁄⁄ І робяць так, як і рабілі, ⁄⁄ Калі пяшком пад стол хадзілі») трэба адпаведна перакласьці ўстойлівы выраз «калі пяшком пад стол хадзілі». У перакладзе чытаем: Kobietom w głowie się nie mieści,
 Że chłop nie tylko sieje, orze,
 Lecz i na kuchni znać się może.
 I warzą strawy jak warzyły,
 Gdy jeszcze siusiumajtki były. Адпаведнік знойдзены, аднак і такое адзначыць трэба: у той час, калі пісалася паэма, вясковыя дзяўчынкі майтак ня ведалі. Перакладнік тут ажыцьцявіў мадэрнізацыю. Перакладнік - асабліва ў паэзіі - можа ўставіць «родны» фразэалягізм у пераклад, нават калі ў арыгінале ніякага фразэалягізму няма. Так робіць і Чэслаў Сэнюх. У песьні XXV («Летнім часам») у заключным разьдзеле (назавём яго ўслаўленьнем грыбоў) перакладнік (відаць, што сам аматар grzybobrania) ня змог утрымацца, каб ня ўславіць баравікі і сваім словам: Prawdziwki! Wielkie jak kopyta,
 W ogromnych ciężkich kapieluszach,
 Istne paniska, bez przesady,
 Grzybowa szlachta w dzień parady,
 Że hulaj dusza bez kontusza! Ад арыгіналу гэтыя і наступныя радкі далекаватыя, але неяк ня хочацца дакараць перакладніка, бо падзяляеш яго настрой. Асабліва ж радуе гэтае польскае «hulaj dusza bez kontusza», бо перад намі праўдзівае апісаньне грыбнога балю. Аднак калі зыходзіць з патрабаваньняў тэорыі, перакладніку яшчэ давядзецца папрацаваць над гэтым*

*разьдзелам, каб і прынцып эквілінэарнасьці задаволіць, і літару арыгіналу. Або вось яшчэ адзін прыклад увядзеньня свайго ўстойлівага выразу. У песьні XII («Сэсія») Міхал ідзе праз засьценак і разважае: ...І хоць няважныя харомы
 Тут гэта шляхта збудавала,
 Але жыве і гора мала!
 Хоць шляхціц цёмны, як саган,
 Затое ж сам сабе ён пан:
 Паноў лясьнічых знаць ня знае,
 Прад імі сьпіны не згінае... У гэтым фрагмэнце ёсьць два ўстойлівыя выразы: «цёмны як саган», «згінаць сьпіну». Чэслаў Сэнюх мяняе першы зь іх, у якім факусуецца кплівае і нават пагардлівае стаўленьне пісьменных і заможных мужыкоў да цёмнае ды беднае шляхты, затое ўводзіць іншы, польскі выраз, у якім ідэалізуецца праўны статус гэтае самае шляхты: Był to zaścianek mu znajomy,
 Jak chłopskie chaty kryte słomą
 I tak jak one już nie nowy.
 Lecz żył tut szlachcic szaraczkowy.
 Choć jak chłop ciemny, w swej zagrodzie
 Wolnością równy wojewodzie.
 Nie zgina przed leśniczym karku,
 Nie zna odrobku i szarwarku... Гэтае «jak chłop ciemny», калі экстрапаляваць яго на сялянскую масу, нібыта й апраўданая папраўка, але ж у фрагмэнце выказваецца менавіта Міхалава стаўленьне да шляхты, а ён - мужык і пісьменны, і нябедны. Аднак паколькі заможнасьць ягоная крохкая, бо трымаецца на панскай ласцы, устаўка «w swej zagrodzie wolnością równy wojewodzie» апраўданая: хоць перакладнік і ідэалізуе праўны стан дробнае шляхты, устаўкаю ён падкрэсьлівае ейную эканамічную ды юрыдычную незалежнасьць - сапраўдныя прадметы Міхалавай зайздрасьці. Устаўку асабліва апраўдвае перакладніцкае ўзмацненьне гэтага Міхалавага пачуцьця: «Aż westchnął Michał z tej zazdrości: ⁄⁄ Czemuż nie on wśród jegomości?» (у Коласа: «Міхал зірнуў і пазайздросьціў: ⁄⁄ Чаму й ня ён між ягамосьцяў?»). ...Удалечыні ад роднага кутка паэт пісаў: Эх, досьвітак*

*маленства, лета!
 Вамі навек душа сагрэта! Удалечыні ад роднага кутка перакладчык піша: Chłopiectwo moje! Lato, lato!
 Mam co wspominać! Dzięki za to! Застаецца сказаць, што ня кожнаму паэту, ня кожнаму твору ўдаецца знайсьці свайго перакладніка. Якуб Колас і «Новая зямля» знайшлі яго ў асобе Чэслава Сэнюха. Не ў апошні чарод таму, што перакладнік, аддалены часам і прастораю ад сваёй радзімы, здолеў прасякнуцца пачуцьцямі паэта, увайсьці ў створаны ім сьвет. </td> <td width="3"> </td> <td width="130" valign="top"> </td> </tr> </table> <table border="0" cellpadding="0" cellspacing="0" width="740" align="center"> <tr> <td height="6" width="740" colspan="3"><img src="../images/0.gif" width="1" height="1"></td> </tr> <tr> <td height="2" width="740" bgcolor="#BDCFD7" align="center" colspan="3"><img src="../images/0.gif" width="1" height="1"></td> </tr> <tr align="right" valign="top"> <td height="25" width="740" colspan="3">Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае</td> </tr> <tr> <td width="490" height="50" valign="top" align="left"> № 1 (30) - 2004 <img src="../images/0.gif" width="150" height="1">да Зьместу </td> <td width="250" height="50" valign="top" align="left"> <table border="0" cellpadding="0" cellspacing="0" width="250" align="center"><tr> <td width="250" height="5"><img src="../images/0.gif" width="1" height="1"></td> </tr> <tr> <td width="250" height="1" bgcolor="#808080"><img src="../images/0.gif" width="1" height="1"></td> </tr> <tr> <td width="250" height="44"*

valign="top" align="right"><img
src="../images/k-dol.gif" alt="Праект ARCHE" width="242"
height="42" border="0"></td> </tr> </table> </
td></tr></table> <table border="0" cellpadding="0"
cellspacing="0" width="740" align="center"> <tr>
<td><p><img src="../images/0.gif" width="150"
height="1"><font face="Tahoma,Verdana,Arial,Helvetica,sans-serif"
size="1">да Пачатку СТАРОНКІ</
font>
<hr width="740" color="#A7BFC9"></td> </tr>
</table> <table border="0" cellpadding="0" cellspacing="0"
width="740" align="center"> <tr> <td width="150"
valign="center"> <!-- Akavita counter code --><a target=_top
href="http://adlik.akavita.com/bin/link?id=116"> <script
language=javascript><!--
d=document;w=window;n=navigator;d.cookie="cc=1";
r="+escape(d.referrer);js=10;c=(d.cookie)?1:0;j=0;
x=Math.random();u="+escape(w.location.href);lt=0;
h=history.length;t=new Date;f=(self!=top)?1:0;cd=0;
tz=t.getTimezoneOffset();cpu=n.cpuClass;ww=wh=ss=0; //--></
script><script language="javascript1.1"><!--
js=11;j=(n.javaEnabled()?1:0); //--></script><script
language="javascript1.2"><!-- js=12;lt=1;s=screen;ss=s.width;
cd=(s.colorDepth?s.colorDepth:s.pixelDepth); //--></script><script
language="javascript1.3"><!--
js=13;wh=w.innerHeight;ww=w.innerWidth; wh=(wh?
wh:d.documentElement.offsetHeight); ww=(ww?
ww:d.documentElement.offsetWidth); //--></script><script
language=javascript><!-- q='lik?id=116&d='+u+'&r='+r
+'&h='+h+'&f='+f; q+='&c='+c+'&tz='+tz+'&cpu='+cpu
+'&js='+js+'&wh='+wh; q+='&ww='+ww+'&ss='+ss
+'&cd='+cd+'&j='+j+'&x='+x; d.write('<img src="http://
adlik.akavita.com/bin/'+ q+'" alt="Akavita" '+ 'border=0
width=88 height=31>'); if(lt){d.write('<'+'!-- ');}//--></
script><noscript> <img src="http://adlik.akavita.com/bin/lik?
id=116" border=0 height=31 width=88 alt="Akavita"> </
noscript><script language="JavaScript"><!-- if(lt)
{d.write('--'+'>');}//--></script> <!-- Akavita counter code
--></td> <td width="502" align="left"><p> <a
href="mailto:mailto:analityka@yahoo.com" title="Напісаць ліст у

рэдакцыю" > Сувязь з рэдакцыяй,
Майстраваньне <a
href="mailto:mk-@tut.&#9
b>], Абнаўленьне <a
href="mailto:czyk@tut.by">[czyk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак"
magazine
 Апошняе абнаўленьне:
2004/10/21
 <img src="../
images/0.gif" width="1" height="8"></p> </td> <td
width="88" valign="center"> <script language="javascript">
d=document;rn=Math.random(); y="<a href='http://
u164.46.spylog.com/cnt?f=3&rn="+rn+"' target=_blank><img
src='http://u164.46.spylog.com/cnt?"; y+="p=1&f=4&rn="+rn
+"' border=0 width=88 height=31>"; d.write(y); </script>
<noscript> <a href="http://u164.46.spylog.com/cnt?f=3&p=1"
target=_blank> <img src="http://u164.46.spylog.com/cnt?
p=1&f=4" alt='SpyLog' border='0' width=88 height=31>
</noscript></td> </tr> </table> </body> </html>

ЯРАСЛАЎ ГРЫЦАК

Яраслаў Грыцак
Гульні з качаргою: усур'ёз і па-ўкраінску

Выказваю ўдзячнасьць Аляксею Панічу за ягоныя заўвагі да папярэдніх варыянтаў гэтага тэксту. Аўтар.

Кнігі і часопісы, згаданыя ў эсэ:

David Edmonds and John Eidinow. *Wittgenstein's Poker. The Story of a Ten-minute Argument between Two Great Philosophers.* - London, 2002.

Kreatives Milieu. *Wien um 1900. Ergebnisse eines Forschungsgesrpäches der Arbeitsgemeinschaft Wien um 1900. Herausgegeben von Emil Brix und Allan Janik.* -München, 1993.

Stefan Simonek. *Ivan Franko und die "Moloda Muza". Motive in der Westukrainischen Lyrik der Moderne.* - Weimer, Wien, 1997.

Historycy Europejscy o Inteligencji i Intelektualistach. [Wydany jako numer] Kultura i Społeczeństwo. Kwartalnik. T. XLIV. 2002. № 2 (травень-чэрвень).

Inteligencja Południowo-Wschodnich Ziem Polskich, pod red. Haliny Kurek, Franciszka Tereszkiewicza. - Krakow, 1998.

Rodowody inteligencji. Prus, Wyspiański, Miciński, Witkacy, Kolakowski. - Znak, 2002. № 3 (сакавік).

Паваенны брытанскі Кембрыдж ня быў падобны да Кембрыджу сёньняшняга, зь ягонымі ахайнымі будыначкамі ды шыкоўнымі кветнікамі. Калі 25 жніўня 1946 году Кембрыдзкі Маральны навуковы клюб сабраўся на сваё чарговае паседжаньне ў адным з будынкаў каледжу «Кінгз», бальшыні яго чальцоў, прафэсарам і студэнтам філязофскага факультэту, давялося сядзець у верхнім адзеньні. Бо ўвесь будынак ацяпляўся адным-адзінюткім камінам, які даваў мала цеплыні, затое шмат куродыму - пра гэта красамоўна сьведчылі брудныя сьцены і прыцьмянелыя насьценныя росьпісы. Зацямняльнае маскаваньне на вокнах і цяжкія вайсковыя чаравікі ды галіфэ асобных чальцоў Клюбу нагадвалі, што вайна была яшчэ сьвежым успамінам.

Дакладчык др. Карл Попэр прыбыў з далёкай Новай Зэляндыі. Ён толькі што выдаў сваю кніжку «Адкрытае грамадзтва й ягоныя ворагі», якая здабыла ў Англіі багата прыхільнікаў. Адзін зь іх, Бэртран Расэл, і арганізаваў Попэру візыт у Кембрыдж. Менавіта «арганізаваў», бо кандыдатура Попэра раз за разам выклікала пярэчаньні з боку старшыні Клюбу - на думку многіх, найбольшага філёзафа «ўсіх часоў і народаў» прафэсара Людвіга Вітгенштайна. Абодва, і Попэр, і Вітгенштайн, паходзілі зь Вены. Яшчэ да пераезду на доктарскія студыі ў Кембрыдж Вітгенштайн наведваў лягічна-пазытывісцкі гурток і зрабіўся чымсьці накшталт боства для старшыні гуртку Морыца Шліка. І таму першы ж выступ Попэра на гуртку закрыў для яго туды дарогу: прамоўца пачаў агрэсіўна крытыкаваць Вітгенштайна і раззлаваны гэтым Шлік сышоў у сярэдзіне яго выступу. Ён быў упэўнены, што Попэр - інтэлектуальная пасрэднасьць і не разумее самой сутнасьці філязофіі, таму ня варта дапускаць яго да кола абраных. Згодна зь Вітгенштайнам, філязофскія пытаньні - гэта праблемы, якія вынікаюць зь недасканаласьці нашай мовы ды абмежаванасьці нашага інтэлекту. Попэр жа лічыў, што за філязофскімі пытаньнямі

крыюцца сапраўдныя жыццёва важныя праблемы, ад якіх немагчыма адмахнуцца, як ад інтэлектуальных забавак. Тэма ягонага выступу ў Кембрыджы так і гучала - «Ці існуюць філязофскія праблемы?». Тыя, каго ён сабраў у залі каледжу «Кінгз», чакалі скандалу. Ні для кога не была таямніцай запальчывасьць і нэўратычнасьць Вітгенштайнавай натуры: студэнты параўноўвалі тэмпэрамэнт свайго прафэсара з атамнаю бомбай. Ён умеў і любіў быць зьнішчальным, саркастычным, дзёрзкім і пагардлівым, заўсёды застаючыся бліскучым, вытанчаным і... непераможаным. Ісая Бэрлін прыгадваў, як пасьля крытыкі з боку Вітгенштайна пераканаўся, што ніколі ня зможа зрабіцца сапраўдным філёзафам і яму варта заняцца чымсьці лягчэйшым, напрыклад інтэлектуальнай гісторыяй. Сам факт запросінаў Попэра, роўна як і тэма ягонага выступу, - гэта быў просты і непрыхаваны выклік Вітгенштайну. І гэта, уласна, падабалася Расэлу, якога Вітгенштайн у апошнія месяцы непрыхавана і прылюдна зьневажаў. Лекцыя Попэра магла прынамсі разьятрыць Вітгенштайна, а можа, нават (на што вельмі спадзяваўся Расэл) і зацьміць ягоны арэол як найвялікшага філёзафа.

У сэмінарскім пакоі пахла крывёю. На пачатку Попэр прывёў некалькі прыкладаў праблемаў, якія ён лічыў сапраўднымі філязофскімі пытаньнямі. Адкінуўшы іх усе да адной, Вітгенштайн у момант найвышэйшай экспрэсіі выхапіў з каміну нагрэтую да чырвані качаргу і пачаў размахваць ёю, нібы дырыгенцкаю палачкай, перад самым носам дакладчыка. І калі ён, прагнучы выявіць бязглуздасьць цьверджаньняў Попэра, папрасіў, каб той даў прыклад якога-небудзь маральнага закону, Попэр спакойна адказаў: «Не пагражаць запрошаным прафэсарам качаргой». Разьюшаны Вітгенштайн шпурлянуў качаргу на падлогу і хуткім крокам выйшаў з пакою, штосілы ляснуўшы за сабой дзьвярыма.

Такім чынам, першая і апошняя сустрэча двух філёзафаў доўжылася ня больш за дзесяць хвілін. Попэр лічыў, што выйшаў зь яе пераможцам: прынамсі, так ён апісваў гэты эпізод у сваёй інтэлектуальнай біяграфіі «Unended Quest», выдадзенай амаль праз трыццаць гадоў пасьля здарэньня - у 1974 годзе. Зь дзевяці сьведкаў той дуэлі, што яшчэ жылі напрыканцы 1990-х,

з Попэравым варыянтам пагадзіўся толькі адзін. Восем іншых кажуць, што Вітгенштайн сышоў з сэмінару раней, чым Попэр сфармуляваў свой «прынцып качаргі». Гэта малюе ўсю гісторыю зусім у іншым сьвятле: у такім выпадку Вітгенштайн пакінуў сэмінар хутчэй знуджаным, чым пераможаным.

Дэйвід Эдмандз і Джон Айдынаў у кнізе «Вітгенштайнава качарга» паспрабавалі высьветліць, што ж здарылася за тыя дзесяць хвілін, якія скаланулі сьвет заходняй філязофіі. І Вітгенштайн, і Попэр зрабілі вельмі шмат, каб растлумачыць прыроду чалавечага разуменьня, насамперш - межы чалавечага розуму ды чалавечага маўленьня. Кожны зь іх верыў, што выбавіў філязофію ад памылак мінуўшчыны і скіроўвае яе на слушны шлях. Вось толькі паказвалі яны ў супрацьлеглыя бакі, таму кожны лічыў свайго суперніка сьмяротным ворагам. Гісторыя з качаргою, на думку Эдмандза і Айдынава, не зьмяшчаецца ў рамкі кароткай дзесяцігхвіліннай сустрэчы. Яе немагчыма аддзяліць ад гісторыі ўсяго XX стагодзьдзя. Пачалася яна ня ў Кембрыджы і ня ў 1946 годзе, а ў Вене канца XIX - пачатку XX стагодзьдзяў, дзе нарадзіліся Вітгенштайн (1889) і Попэр (1902).

За розьніцай іхных поглядаў, сьцьвярджаюць аўтары «Вітгенштайнавай качаргі», стаяць ня проста філязофскія разыходжаньні, а два розныя жыцьцёвыя досьведы цэнтральнаэўрапейскіх габрэяў. Абодва былі выхрыстамі, глыбока асымілявanымі ў аўстрыйска-нямецкую культуру. Але ў сям'і Людвіга Вітгенштайна такімі былі ўжо некалькі генэрацыяў перад яго нараджэньнем, тады як у сям'і Попэра першым пакаленьнем хрысьціянаў былі ягоныя бацькі. Вітгенштайны пераўзыходзілі сваіх землякоў Попэраў ува ўсім. Гэта быў найбагацейшы пасьля Ротшыльдаў род Габсбурскай манархіі. Пра сярэднюю клясу, да якой належала сям'я адваката Попэра, яны зьняважліва гаварылі як пра людзей з «Рынгштрасэ». Вітгенштайны былі ўласьнікамі аднаго з найбольш імпазантных венскіх палацаў, які разам з тым быў і найбольш славутым музычным салёнам у горадзе. Тут можна было сустрэць і паслухаць Малера, Брамса ці Рыхарда Штраўса. Попэры жылі ў самым цэнтры Вены, насупраць Штэфанусдому - цэнтральнага каталіцкага касьцёлу (катэдры), у кватэры,

перапоўненай кнігамі. Яны маглі дазволіць сабе хадзіць на канцэрты, больш за тое, нават фундаваць іх. Вітгенштайнам можна было не хадзіць нікуды - канцэрты самі прыходзілі ў іхны палац, разам з кампазытарамі, дырыгентамі і піяністамі, да паслугаў якіх у гасьцёўні было шэсьць раяляў, на любы густ і колер.

Вітгенштайна параўноўвалі з чараўніком: усё, да чаго дакраналася ягоная рука, станавілася творам генія. Яшчэ ў маладосьці, абраўшы кар'еру інжынэра, ён сканструяваў авіяцыйны рухавік, прататып рэактыўнага. Пазьней, у 1928 годзе, ужо закінуўшы інжынэрыю дзеля філязофіі, Вітгенштайн узяўся праектаваць інтэр'ер для дому сваёй сястры. Радыятар, які ён сканструяваў, давялося замаўляць за мяжой: ува ўсёй Аўстрыі не знайшлося ніводнага майстра, які мог бы вырабіць гэты шэдэўр.

Попэр таксама ня грэбаваў ручной працай. Юнаком ён пайшоў у вучні да майстра-сталяра. Ад яго, прыгадваў пазьней філёзаф, ён даведаўся пра тэорыю пазнаньня больш, чым ад любога з сваіх прафэсараў. Гэтага нельга сказаць пра сталярскае рамяство. Пад канец сваёй навукі малады Попэр змайстраваў навясную кніжную палічку. Груба зробленая, з прымітыўным дызайнам, яна сьведчыла пра мізэрнасьць уменьня ды брак густу і, безумоўна, не ішла ні ў якае параўнаньне зь беласьнежным і элегантным радыятарам Вітгенштайна.

Нягледзячы на сваё паходжаньне, Вітгенштайн быў ворагам ідэі арыстакратызму і абранасьці. Падчас першай сусьветнай вайны ён выкарыстаў свой высокі статус і сямейныя сувязі не для таго, каб пазьбегчы фронту (перанесеная ў юнацтве хірургічная апэрацыя фармальна вызваляла яго ад вайсковай службы), а каб патрапіць туды добраахвотнікам. У траншэях, сярод сьмерцяў і распусты, сфармавалася ў агульных рысах адзіная ягоная кніга - «Лёгіка-філязофскі трактат» (1922), якая прынесла яму славу найвялікшага філёзафа сучаснасьці. Пасьля вайны ён з уласнага жаданьня пайшоў працаваць вясковым настаўнікам у глухую аўстрыйскую правінцыю. Другая сусьветная вайна засьпела яго ў Англіі, калі яму было ўжо за пяцьдзясят. Але ён пакінуў прафэсарскі Кембрыдж і вызваўся

працаваць мэдбратам у лёнданскай больніцы.

Попэр таксама цярпець ня мог элітарнасьці і снабізму - але не з прычыны ўласнага выбару, як Вітгенштайн, а хутчэй зь яго адсутнасьці. Ён не ваяваў на фронце: першая сусьветная вайна скончылася, калі яму было толькі 16 гадоў, а на пачатку другой сусьветнай ён апынуўся ў Новай Зэляндыі, на бясьпечнай адлегласьці ад эўрапейскага тэатру ваенных дзеяньняў. Уласным унёскам у перамогу над Гітлерам ён лічыў сваё «Адкрытае грамадзтва». Попэр пачаў пісаць гэтую кнігу ў дзень, калі нацысцкія войскі ўступілі ў ягоную родную Аўстрыю, а закончыў, калі ніхто ўжо не сумняваўся ў іхнай паразе.

Існавала хіба адзіная рэч, што аднала Вітгенштайна і Попэра: абодва лічылі вайну з Гітлерам сваёй асабістай вайною. Але, ізноў-такі, Вітгенштайн - з выбару, Попэр - зь непазьбежнасьці. У штодзённым жыцьці нічога не нагадвала Вітгенштайнам пра іхнае габрэйства. Працьверазеньне прыйшло адразу ж на другі дзень пасьля аншлюсу, калі аўстрыйскіх бюракратаў габрэйскага паходжаньня звольнілі з працы, некалькіх найбагацейшых прадпрымальнікаў забілі, а лекараў і адвакатаў вывелі на вуліцы, прымусіўшы зубнымі шчоткамі сьціраць зь сьценаў антынацысцкія лёзунгі, пад насьмешкі і сьвіст венскага натоўпу. Вена была абвешчаная вольным ад габрэяў горадам (judenfrei). Выключэньне рабілі толькі для тых грамадзянаў Вялікага Райху, якія былі габрэямі на чвэрць ці на восьмую частку або мелі ваенныя заслугі перад Райхам: пасьля дакумэнтальнага пацьверджаньня гэтага факту іх абвяшчалі «мяшанцамі» (Mischlinge).

Справы аб наданьні такога статусу знаходзіліся пад асабістым кантролем фюрэра. У 1939 годзе ў Бэрлін прыйшло 2100 прашэньняў аб пераглядзе расавай прыналежнасьці. Гітлер задаволіў толькі 12 зь іх. Адной з гэтых 12 была справа Вітгенштайнаў. Усё вырашылі грошы: нягледзячы на ўяўную прынцыповасьць, кіраўніцтва Райху было ня супраць пагандлявацца. Вітгенштайн сам распачаў гэтую справу і правёў яе хутка й пасьпяхова, як і ўсё, за што браўся. 5 ліпеня 1939 году, адразу пасьля атрыманьня брытанскага грамадзянства, Вітгенштайн прыляцеў у Бэрлін, у самае лагво ворага, дзе

правёў аднадзённыя перамовы з кіраўнікамі Райхсбанку. А яшчэ празь сем тыдняў, перад самым пачаткам вайны, ягоныя сёстры атрымалі дакумэнты аб арыйскім паходжаньні. Гэта дазволіла ім перажыць усю вайну ў Вене.

Сям'я Попэра такога шчасьця ня мела: 16 ягоных найбліжэйшых сваякоў сталі ахвярамі галакосту. У жывых засталася толькі ягоная сястра, якая абачліва выехала ў Швайцарыю (бацькі памерлі яшчэ перад вайною). Сам Попэр двойчы, у 1938 і 1941 гадох, спрабаваў атрымаць брытанскае грамадзянства. Але з гэтага нічога ня выйшла, і ён пражыў усю вайну ў Новай Зэляндыі без грамадзянства - як «прыязны чужынец» (friendly alien). Вітгенштайн і тут узяў над ім верх.

Лёгкасьць, зь якой Вітгенштайн пераадольваў жыцьцёвыя праблемы, тая нічым не абмежаваная асабістая свабода, падмацаваная яго сямейным дабрабытам і сямейным паходжаньнем, былі ўрадлівай глебай для пераканаьня, што сапраўдных філязофскіх праблемаў не існуе - яны ёсьць толькі праблемамі лёгікі ды мовы. Ня так было з Попэрам: ён усяго мусіў дамагацца «ўласным гарбом», часта перажываць прыніжэньні, паразы ды страты. Ён ведаў, што праблемы такі існуюць і іх немагчыма пераадолець аднымі толькі моўнымі практыкаваньнямі.

Усё жыцьцё Попэр марыў узяць рэванш над Вітгенштайнам. Філёзафы і цяпер дыскутуюць, ці ўдалося гэта яму й наколькі. Нас цікавіць іншае - наколькі карэктнай была выснова Эдмандза ды Айдынава пра кембрыдзкую спрэчку 1946 годзе як пра адлюстраваньне спэцыфічнай цэнтральнаэўрапейскай сытуацыі?

Галоўнымі сымбалямі Вены канца XIX стагодзьдзя былі Малер, Фройд, Шнітцлер, Краўс, Герцль, Адлер, Бар ды шмат іншых дзеячоў навукі і мастацтва, якія стаялі ў выразнай апазыцыі да паноўнай аўстра-нямецка-каталіцкай культуры. Большасьць гэтых «іканаборцаў» яднае тая ж рыса, што й Вітгенштайна з Попэрам: яны былі асымілявanымі габрэямі. Нябожчык Пэтэр Ганак, вугорскі гісторык, у сваім дасьледаваньні творчых асяродкаў Вены і Будапэшту (многія зь венскіх славутасьцяў паходзілі з вугорскай сталіцы, як, напрыклад, Герцль)

пацьвердзіў гэтае назіраньне статыстычна: прыблізна дзьве траціны іх у выпадку Будапэшту і тры чвэрці ў венскім выпадку былі асымілявanымі габрэямі.

На першы погляд можа падацца, што гэты фэномэн ёсьць прадуктам статыстыкі. Вена мела трэцюю па велічыні, пасьля Варшавы і Будапэшту, габрэйскую грамаду і вышэйшы за ўсе астатнія эўрапейскія гарады працэнт выхрышчаных габрэяў. Значыць, можна было чакаць, што габрэйскі адсотак будзе высокім у кожным сацыяльным слоі: ці сярод іканаборцаў, ці сярод іконашанавальнікаў. Але на найвышэйшай прыступцы назіраецца іншае: габрэяў зусім не было пры кайзэрскім двары і амаль не было ў кайзэрскім урадзе. Хрышчэньне было адначасова і ўмовай прасоўваньня ў габсбурскім грамадзтве, і абаронай ад ягонага антысэмітызму (Франц Ёзэф неяк сказаў дачцэ: «Безумоўна, мы мусім рабіць усё, каб абараніць нашых габрэяў, але хто з нас у душы не антысэміт?»). Заўсёдная безабароннасьць і сацыяльная маргіналізаванасьць правакавалі атмасфэру няспыннага пошуку, уразьлівасьці і творчага неспакою. Гэта, у сваю чаргу, стварала спрыяльны грунт для мадэрнізму - зь яго націскам на ірацыянальнасьці, падсьвядомых інстынктах ды сэксуальнасьці, гучнымі скандаламі ды правакацыямі ў мастацтве, зь ягонай крытыкай агульнапрынятых нормаў ды ідэалаў, веры ў Бога, прагрэс і наагул у тое, што ўсё гэта калі-небудзь добра скончыцца.

Быў яшчэ іншы важны аспэкт маргіналізаванасьці творцаў венскага мадэрнізму. Асымілявaныя габрэі нідзе не маглі пачувацца цалкам «дома»: для русінаў (украінцаў) і славакаў яны былі палякамі ці вугорцамі, для палякаў, вугорцаў і чэхаў - немцамі, для немцаў - аўстрыякамі, для ўсіх нацыяў сьвету - габрэямі, а для габрэяў - здраднікамі сваёй веры. Адкінутыя за межы кожнай нацыянальнай грамады, венскія мадэрністы былі пазбаўленыя моцнай нацыянальнай ідэнтычнасьці - у адрозьненьне ад вугорца Бартака, паляка Высьпяньскага ці чэха Гашака. Гэта вызваляла іх ад цяжкай ношы «будаваньня нацыі» і адкрывала магчымасьць зьвяртацца да найглыбейшых экзыстэнцыйных пытаньняў.

Вядома, у Вене было нямала мастацкіх дзеячоў-мадэрністаў,

якія не былі габрэямі, але пераймаліся тымі самымі праблемамі й пытаньнямі, што й дзеці габрэйскай буржуазіі. Аднак без габрэяў горад папросту ня мог функцыянаваць як культурны ды інтэлектуальны цэнтар. Зрэшты, свой статус эўрапейскай культурнай сталіцы Вена страціла ў 1930-х гадох, калі заняпала, а пасьля 1938 году амаль цалкам зьнікла яе габрэйская грамада.

* * *

Увосень 1892 году, за некалькі гадоў да таго, як Вена стала тым, чым была пазьней, у сталіцу Габсбурскай імпэрыі прыехаў Іван Франко. Прыехаў на запрашэньне Ватраслава Ягіча, прафэсара славістыкі Венскага ўнівэрсытэту, каб рабіць дактарат. Франко меў ужо 36 гадоў - век зусім не малады для такой задумы. Але гэта не было ягонай віною: маладыя гады пайшлі на рэвалюцыйную прапаганду, немінучыя турэмныя адседкі, беднае, галоднае ды халоднае існаваньне і працу ў розных газэтах ды часопісах, каб зарабіць на пражыцьцё. Зрэшты, была ў тым і перавага: за плячыма ў Франка стаяла слава руска-ўкраінскага пісьменьніка ды высокакваліфікаванага дасьледніка ўсходнеславянскага фальклёру. Кірыла Студзінскі, у тыя часы венскі студэнт, прыгадваў, што зьяўленьне Франка ў Венскім унівэрсытэце было сэнсацыяй дня. Акурат Франко выклікаў зьмену ў поглядах Ягіча на адрознасьць украінцаў ад расейцаў. Дагэтуль той клаў першых і другіх у адну шуфляду, а патрыятычна настроеным украінскім студэнтам з Галіччыны гаварыў, што сваю нацыянальную самастойнасьць яны мусяць спачатку давесьці навуковымі дасьледаваньнямі. І Франко, слухач сэмінару ў Ягіча, прыносіў такія дасьледаваньні адно за адным, а разам з тым - і доказы, што ўкраінцы маюць права на самастойнае жыцьцё сярод славянскіх народаў.

Пляны Франка ў Вене не абмяжоўваліся атрыманьнем ступені доктара навук. Ён прагнуў навязаць тут карысныя знаёмствы, якія пасьля вяртаньня ў Галіччыну прыдаліся б яму больш, чым дактарат. Гэтая частка ягонага пляну была надзвычай пасьпяховай: сярод яго венскіх знаёмцаў мы знаходзім імёны лідэра аўстрыйскіх дэмакратаў Віктара Адлера, ідэоляга літаратурнага мадэрнізму Германа Бара, творцы мадэрнага

сіянізму Тэадора Герцля, пазьнейшага чэхаславацкага прэзыдэнта Томаша Масарыка, а таксама дзясяткаў сёньня менш вядомых, але на той час вельмі знакамітых прадстаўнікоў творчага асяродзьдзя Вены канца стагодзьдзя. Асабліва важным для папулярнасьці Франка ў Вене было сталае супрацоўніцтва з газэтай «Die Zeit», якую паводле яе тагачаснай уплывовасьці можна параўнаць зь сёньняшняй «New York Review of Books». Некаторыя зь венскіх публікацыяў Франка, перадрукаваныя потым з «Die Zeit» у іншых славутых эўрапейскіх выданьнях, выклікалі гарачыя дыскусіі - ды што там дыскусіі, нават дуэлі.

Але не паўсюль Франка ў Вене чакалі перамогі. Яму не ўдалося здабыць прызнаньня ў галоўнай галіне - галіне, як тады казалі, прыгожага пісьменства. Шлях да літаратурнага прызнаньня пралягаў тут праз тэатральную сцэну. У Львове спэктакль паводле ягонага «Скрадзенага шчасьця» меў небывалы посьпех: камплімэнтаў не шкадавала ні ўкраінская, ні польская тэатральная крытыка. Цяпер Франко піша аповесьць «Для хатняга вогнішча» і разам з «Скрадзеным шчасьцем» аддае яе на разгляд дырэкцыі Фолькстэатру - але безвынікова.

Франко спрабаваў надрукаваць у «Die Zeit» аповесьць «Boa constrictor», якая здабыла яму на той час найбольшую літаратурную славу (прынамсі, ніводзін іншы ягоны твор ня быў перакладзены на столькі моваў). У рэдакцыі аповесьць патрапіла да Германа Бара, які ўжо зрабіўся тады заканадаўцам венскага літаратурнага мадэрнізму. Бар адхіліў твор нібыта з фармальных прычынаў: маўляў, ён завялікі для газэты, у «Die Zeit» яго папросту не прачытаюць. Цяжка сказаць, ці было гэта сапраўднай прычынай адмовы: аповесьць Франка ўсё ж такі надрукавала іншая венская газэта, сацыял-дэмакратычная «Arbeiter Zeitung». А вось у асуджэньні Франковага «Паэта здрады» - найскандальнейшага сярод ягоных венскіх артыкулаў, скіраванага супраць Адама Міцкевіча як нібыта ўзгадавальніка польскага нацыянальнага крывадушша і падвойных стандартаў, - Бар быў шчыры дарэшты. Ён не прымаў бязглуздага, на ягоную думку, цьверджаньня Франка, што з твораў паэта можна вывесьці палітычную тэндэнцыю. «Ці стаў бы я «Паэтам лесьбійскага каханьня», - пытаўся Бар у Франка, - калі б у маіх вершах абмаляваў лесьбійскія стасункі?

Здрада - праблема эстэтычная, ёй можна прысьвяціць усё жыцьцё, ня робячыся пры гэтым здраднікам».

За розьніцай поглядаў Франка і Бара ляжала сьветапоглядная прорва. Франко верыў у прагрэс, яго пазытыўныя наступствы для асобы і грамадзтва. Літаратура павінна быць «работніцай на полі чалавечага прагрэсу». Яна павінна паказваць заганы грамадзкага ладу і абуджаць у чытача жаданьне іх паправіць.

Венскія ж мадэрністы прадстаўлялі, паводле словаў Пэтэра Гея, Мадэрнізм зь вялікай літары, які ненавідзеў мадэрнізм зь літары малой. Для іх прагрэс быў ідэяй падманлівай, нават шкоднай: разьвіцьцё тэхналёгіяў не паляпшае чалавека - наадварот, увесь час пагражае ягонай існасьці ды існаваньню. Літаратура павінна быць бестэндэнцыйнай; замест грамадзкай заангажаванасьці яна хутчэй мела б прысьвяціць сябе адлюстраваньню асобы ды ірацыянальных матываў яе ўчынкаў.

Франко volens nolens заразіўся новымі эстэтычнымі плынямі і прывёз гэтую венскую заразу з сабою ў Львоў - хоць і стараўся сам сабе ў гэтым не прызнавацца. Аднак гэта цяжка было схаваць. У 1896 годзе Васіль Шчурат, які жыў разам з Франком на кватэры ў Вене, надрукаваў у львоўскай газэце «Зорі» ягоны літаратурны партрэт. У ім ён выразна паказаў новыя, мадэрнісцкія (дэкадэнцкія) матывы ў нізцы вершаў Франка «Завялае лісьце». Тое, што ў вуснах Шчурата гучала як пахвала, Франко ўспрыняў як асабістую абразу. Зь ягонай гнеўнай рэакцыі паўсталі вядомыя строфы, зьвернутыя да Шчурата:

> Які я дэкадэнт? Я сын народу,
> Што ўгору йдзе, хоць быў замкнёны ў лёх.
> Мой лёзунг: праца, шчасьце і свабода,
> Я ўвесь мужык, пралёг, не эпілёг.

У дыскусіі з Шчуратам Франко меў рацыю толькі напалову. Сучасны аўстрыйскі літаратуразнавец Стэфан Сымонэк у кніжцы «Іван Франко і «Молода Муза» паказвае разарванасьць Франка паміж ягонай пазыцыяй грамадзкага лідэра й ягоным літаратурным талентам. Ён называе Франка «сарамлівым мадэрністам». На шматлікіх прыкладах Сымонэк дэманструе сугучнасьць Франковых паэтычных вобразаў і тэмаў з

творчасьцю асноўных прадстаўнікоў эўрапейскага мадэрну: Поля Вэрлена, Валер'я Брусава, Тэтмаера, Стэфана Малармэ, Мэтэрлінка, Оскара Ўайльда, Габрыэля д'Анунцыё. Сымонэк заклікае па-новаму прачытаць Франка - не як прадвесьніка сацыялістычнага рэалізму, але як цьвярозага, крытычнага і цікавага аўтара з пэрыфэрыі Габсбурскай манархіі.

З гэтым цяжка не пагадзіцца - Франко быў цікавым, але ўсё ж такі пэрыфэрыйным аўтарам. Па-за сфэраю «хатняга ўжытку» Франко не пакінуў трывалага й выразнага сьледу ані ў сусьветнай, ані нават у цэнтральнаэўрапейскай культуры.

Як бы ні ганарылася ўкраінскае франказнаўства знаёмствам Франка з Германам Барам, Тэадорам Герцлем ці Шніцлерам, на гэтых дзеячоў яно не зрабіла аніякага прыкметнага ўплыву (прынамсі, у дэталёвых дзёньнікавых запісах Бара, Герля і Шніцлера прозьвішча Франка нідзе ня згадваецца). Хутчэй наадварот: якраз яны ўплывалі на Франка, хаця ён і не сьпяшаўся гэта прызнаваць.

* * *

Эрнэст Гелнэр у адным з сваіх апошніх інтэрвію прыгадваў, што Вітгенштайн прыдумаў сваю ўласную градацыю чалавечых тыпаў, адпаведна ўзроўню іхнага інтэлекту. На яе вяршыню ён ставіў кембрыдзкіх мысьліцеляў, а на самы ніз - непісьменных польскіх сялянаў. Калі гэта праўда, дык і абсалютна непаліткарэктнае цьверджаньне Вітгенштайна, і асабісты прыклад Франка перагукаюцца з высновай Эдмандза і Айдынава: узровень і характар інтэлектуальнага жыцьця залежыць ад нацыянальна-канкрэтных абставінаў.

Вывучэньнем розных нацыянальных формаў існаваньня інтэлігенцыі занялася дасьледчая група Польскай акадэміі навук пад кіраўніцтвам вядомага варшаўскага гісторыка Ежы Ядліцкага. Вынікам гэтай працы стаў зборнік артыкулаў «Эўрапейскія гісторыкі пра інтэлігенцыю ды інтэлектуалаў». Нават беглы перагляд адных толькі загалоўкаў сьведчыць, што ў розных мовах для апісаньня гэтай групы ўжываюць розныя словы: інтэлігенцыя, інтэлектуалы, асьвечаная буржуазія (Bildungsbürgertum). Тэрмін «інтэлігенцыя» ўпершыню зьявіўся

ў нямецкай мове ў 1840-я гг. - у працах гегельянцаў. Адтуль ён перайшоў у польскую, а потым - у расейскую ды ўкраінскую мовы. І цяпер, гаворачы пра «інтэлігенцыю», маюць на ўвазе перш за ўсё Ўсходнюю Эўропу.

Усходнеэўрапейская інтэлігенцыя, як сьцьвярджае расейская дасьледчыца Людміла Булгакава, вылучаецца перш за ўсё дзьвюма асноўнымі рысамі: «любоўю да народу» і «апазыцыйнасьцю да ўлады». Абедзьве рысы выкліканыя яе родаваю траўмай: яна нарадзілася ў самадзяржаўнай, абсалютысцкай дзяржаве - Расейскай імпэрыі, дзе грамадзкая ініцыятыва была скаваная ўсюдыіснай уладай, і апэляцыя да «масаў» бачылася спосабам пераадоленьня эканамічнай ды культурнай адсталасьці. Падпольнае існаваньне інтэлігенцыі прыпадабняла яе да грамадак першых хрысьціянаў, ствараючы адпаведны этас: гатоўнасьць да самаахвяраваньня дзеля «супольнага дабра», ідэйнасьць, падвышаная адчувальнасьць да грамадзкіх праблемаў - але разам з тым дактрынэрства, схільнасьць да максымалізму і кансьпірацыі.

Французскія ды ангельскія інтэлектуалы (пра іх гаворыцца ў двух цудоўных эсэ Магдалены Міцынскай) цешыліся непараўнальна большымі палітычнымі свабодамі, чымся ўсходнеэўрапейскія інтэлігенты. Адпаведна, іншым было іхнае грамадзкае крэда: прафэсіяналы ў сваіх вузейшых дзялянках - навуцы, журналістыцы ці прыгожым пісьменстве, яны лічылі сваім абавязкам выходзіць за межы сваіх прафэсійных інтарэсаў кожны раз, калі гэтым палітычным свабодам пагражалі абмежаваньні, поўнае альбо частковае скасаваньне і да т. п. Хаця сам тэрмін «інтэлектуалы» ўжываўся значна раней, дату нараджэньня пазначанай намі групы можна ўстанавіць дакладна: 1898 год, справа Дрэйфуса ў Францыі. Інтэлектуалы ўпершыню скарысталіся тады трыма правамі, што належаць ім дагэтуль: правам выклікаць скандал, правам ствараць лігі і арганізацыі, што мусяць памнажаць моц іхнага пратэсту, і правам паклікацца на сымбалічную духоўную ўладу, вышэйшую і старэйшую за ўладу дзяржаўную.

Нямецкая інтэлігенцыя йшла іншым шляхам. Пра яе, а таксама пра блізкія да яе чэскую і аўстрыйскую напісаў Мацей Яноўскі.

Тэрмін «інтэлігенцыя» ў нямецкай культурнай традыцыі не прыжыўся - яго выцесніў панятак «асьвечаная буржуазія». Да яе належыць ня кожны, хто атрымаў вышэйшую адукацыю, - але кожны, чый грамадзкі статус гэтая асьвета вызначала (у адрозьненьне ад эканамічнай буржуазіі, грамадзкую пазыцыю якой вызначаў матэрыяльны статус). «Асьвечаны буржуа» ня тоесны ўсходнеэўрапейскаму інтэлігенту, бо ўва Ўсходняй Эўропе хто быў асьвечаным, той, як лічылася, ня быў буржуа. У нямецкай традыцыі да асьвечанай буржуазіі залічвалася і дзяржаўнае чыноўніцтва, чаго немагчыма ўявіць сабе ў расейскім выпадку, дзе бюракрат - як і буржуа - быў антыподам інтэлігента. Падставай нямецкай спэцыфікі быў выбух вышэйшай адукацыі ў Нямецкай імпэрыі канца XIX стагодзьдзя, калі ўнівэрсытэты пачалі прадукаваць спэцыялістаў у дагэтуль (а для некаторых краінаў - і пасьля) нябачанай колькасьці. Гэтыя спэцыялісты сталі рухавікамі капіталістычных зьменаў, маторам мадэрнізацыі, бюракратамі, якія рацыяналізоўвалі, у духу тэорыі Макса Вэбэра, грамадзкае жыцьцё і стваралі грамадзянскую (у нямецкай мове - «буржуазную») супольнасьць, або, адпаведна зь Юргенам Габэрмасам, публічную сфэру - інакш кажучы, асяродзьдзе, аб'яднанае супольнымі вартасьцямі і супольнай камунікацыйнай сеткай (прэсай, выдавецтвамі, таварыствамі, клюбамі, навуковымі інстытуцыямі), а таму гатовае імгненна рэагаваць на дзейнасьць літаратараў ды інтэлектуалаў.

Мацей Яноўскі высоўвае цікавую гіпотэзу (і яе падтрымлівае Ежы Ядліцкі): нямецкія асьвечаныя буржуа і расейскія інтэлігенты займалі нібыта два супрацьлеглыя полюсы ў шырокім спэктры розных гістарычных варыянтаў цэнтральна-ды ўсходнеэўрапейскай інтэлігенцыі. Бліжэй да нямецкага полюсу разьмяшчалася чэская эліта, далей за ёю - творчыя асяродкі Вены, якія былі блізкія да нямецкай мадэлі, але з прычыны свайго касмапалітычнага характару вызначаліся большай незалежнасьцю, чымся «асьвечаныя мяшчане», і гэтак далей аж да другога краю спэктру, дзе, бліжэй за ўсё да расейскай паласы, разьмясьцілася польская інтэлігенцыя Расейскай імпэрыі.

Дзе ў гэтым спэктры месца ўкраінскай інтэлігенцыі? На жаль,

зьмешчаны ў зборніку артыкул Георгія Касьянава не дае нават прыблізнага адказу на гэтае пытаньне. Гісторык сам сабе звузіў дасьледчую пэрспэктыву, узяўшы за зыходны пункт свайго аналізу «інтэлігенцыю пары гістарычнага матэрыялізму». Ён доўга разважае над савецкімі схемамі й дэфініцыямі - а паколькі яны, зразумела, мала да чаго прыдатныя, ён бярэцца за іх рэвізію, пераказваючы пры гэтым зьмест сваіх ранейшых кніг. Такім чынам, чытач мусіць здаволіцца наступным азначэньнем: інтэлігенцыя - гэта, паводле Касьянава, «спэцыфічная прафэсійная група, якая вызначаецца ўласнымі грамадзка-псыхалягічнымі, культурнымі, этычнымі ды іншымі рысамі. Яна зьяўляецца пэўнай сацыякультурнай зьявай, правілы разьвіцьця і функцыянаваньня якой таксама адметныя». Пасьпяховасьць такога абыходжаньня з дэфініцыямі можа ў вольны час ацаніць кожны ахвотнік, спрабуючы праверыць, як дзейнічае прапанаванае азначэньне ў дачыненьні да такіх «спэцыфічных грамадзка-прафэсійных групаў», як дворнікі, алігархі ды «зладзеі ў законе». У любым выпадку, зь яго немагчыма зразумець, што адрозьнівае ўкраінскую інтэлігенцыю ад, скажам, інтэлігенцыі армянскай, беларускай ды эстонскай, якія таксама паўсталі ў выніку пераўтварэньня грамадзтва «традыцыйна-сельскагаспадарчага» ў «мадэрна-прамысловае», таксама пражылі траўматычны досьвед сталінізму і савецкай бюракратызацыі, каб потым расьцьвісьці фэномэнам дысыдэнцтва - хіба што ўкраінская інтэлігенцыя стварала ўкраінскую нацыю, а не армянскую, беларускую ці эстонскую?

Гісторыя ўкраінскай інтэлігенцыі да 1917 году ці да ўтварэньня СССР абмяжоўваецца сымбалічнымі двума-трыма радкамі, дзе-нідзе расьцярушанымі. А дарма. Бо самыя раньнія і далёка не другарадныя дыскусіі пра ролю і прызначэньне ўкраінскай (ці, як тады казалі, руска-ўкраінскай) інтэлігенцыі вяліся менавіта тады й там. Можна нават сьцьвярджаць, што стрыжнем гэтых дыскусіяў быў выбар мадэлі, паводле якой мела б усталёўваць свае функцыі ды ролю гэтая нованароджаная група. Для аўстрыйскай Галіччыны традыцыйным вобразам інтэлігента быў гладкі і добра апрануты пан з гімназійным дыплёмам у кішэні, які ўмеў паводзіць сябе галянтна, пакрываючы гэтым недахоп уласных перакананьняў, і чыім ідэалам была ўрадавая

канцылярыя ды дзяржаўная зарплата - гэта значыць ужо знаёмы нам тып нямецка-асьвечанага буржуа, з папраўкай на галіцка-шляхецкую вытанчанасьць. Такіх тыпаў аўстрыйская імпэрыя выпускала сотнямі, калі ня тысячамі на год. Гэта ставіць пад сумнеў слушнасьць высновы Касьянава, нібыта ўкраінская эліта перад 1917 годам фармавалася ў межах дзяржаваў, не зацікаўленых ува ўтварэньні ані ўкраінскай, ані наагул якой-небудзь інтэлігенцыі - бо ані Габсбургі не былі такімі дурнымі, каб ня песьціць у сваіх падданых пачуцьця ляяльнасьці да сябе, ані «руская» інтэлігенцыя (як, зрэшты, польская, чэская ды іншая) не была такой наскрозь рэвалюцыйнаю, каб дазволіць сабе адмовіцца ад раскошы інтэлігенцкага стану (зацікаўлены чытач можа больш даведацца пра гэта з кнігі венскай дасьледчыцы Вальтраўд Гайндль, прысьвечанай фармаваньню бюракратыі ў Габсбурскай імпэрыі).

Варта прыгледзецца і да мараў маладога, «дарэвалюцыйнага» яшчэ Франка пра пасаду гімназійнага настаўніка і славу салённага пісьменьніка - ён тады і ня думаў пісаць для сялян і пра сялян. Яго ператварэньне ў радыкала адбылося пад уплывам новай мадэлі інтэлігенцыі - мадэлі расейскай, зь яе любоўю да народу і вечнай апазыцыйнасьцю да ўлады. Гэтую мадэль прапаноўваў, нават агрэсіўна навязваў з эміграцыі Міхаіл Драгаманаў. Тое, што яму ўдалося ў далёкім 1876 годзе зрабіць з Франком ды ягонымі таварышамі, магчыма, ува ўкраінскім выпадку адыграла ня меншую ролю, чым у французскім - справа Дрэйфуса. Пра драматызм гэтай зьмены сьведчыць хаця б тое, што Франко пасьля драгаманаўскай крытыкі ад сораму за тое, што ён думаў і пісаў раней, нават хацеў зрабіць сабе сьмерць. На шчасьце, Франко абмежаваўся тым, што забіў у сабе асьвечанага буржуа і потым пасьлядоўна ваяваў зь ім да канца жыцьця, пры кожнай нагодзе паўтараючы: «У нас няма інтэлігенцыі. У нас ёсьць тысячы пісьменных людзей, але інтэлігенцыі няма».

Згаданыя тут кніжкі і зборнікі ўтрымліваюць адну асноўную - хоць, можа, і не такую новую, як на неўкраінскія ўмовы, - тэзу: што дэфініцыя, роля, функцыі інтэлігенцыі залежаць ад гістарычных умоваў. Гісторыя ставіць перад інтэлігентамі задачу вызначыцца, кім яны ёсьць у кожны канкрэтны момант і

ў кожным месцы. Такое самавызначэньне ў месцы і часе асабліва важнае ў пераломныя для краіны й нацыі моманты. Асабліва для той часткі інтэлігенцыі, якую называюць «творчай» ці «апініятворчай» (у многіх мовах да яе стасуюць карацейшы і больш ёмісты тэрмін: «інтэлектуалы» - каб вылучыць яе з шырокай «інтэлігенцкай» масы).

Няма сумневу, што крах камунізму ды першыя дзесяць гадоў украінскай незалежнасьці ёсьць такім пераломным момантам, які заклікае ўкраінскіх інтэлектуалаў крытычна перагледзець сваю ідэнтычнасьць. Такі перагляд павінен быў бы выразна акрэсьліць прынамсі тры гістарычныя кантэксты. Першым ёсьць амаль 150-гадовая гісторыя іх існаваньня. Другі кантэкст - гэта ўласна дзесяць гадоў посткамуністычнай трансфармацыі, якая радыкальна зьмяніла ўмовы іхнага існаваньня. Трэці - кантэкст глябалізацыі, для азначэньня якога найчасьцей ужываюць прэфікс «пост-» (постмадэрны, посткаляніяльны і постсэкулярны) і які - нібыта! - пагражае ім немінучай пагібельлю.

Ува ўкраінскай гістарыяграфіі ніводзін з трох кантэкстаў не раскрыты ня тое што ў кнігах, але нават у грунтоўных нарысах (выняткі накшталт выдатных эсэ Івана Лысяка-Рудніцкага «Выраджэньне ды адраджэньне інтэлігенцыі» ці «Ў абарону інтэлекту» ёсьць акурат выняткамі, а ня правілам). Але той, хто тоне, мусіць хапацца за саломінку. Ува ўкраінскім выпадку, на шчасьце, існуе выратавальны круг - кнігі пра ролю інтэлігенцыі ды інтэлектуалаў у «сумежных» (расейскім, нямецкім, а найбольш польскім) выпадках. Апрача ўжо цытаваных кніг, скарыстаемся яшчэ двума польскімі выданьнямі з Кракава: «Інтэлігенцыя паўднёва-ўсходніх польскіх земляў» (1998) і сакавіцкі 2002 году выпуск часопісу «Znak» пад загалоўкам «Радаводы інтэлігенцыі». Там няма аніякіх рэцэптаў, але ёсьць прынамсі падказкі, як структураваць дыскусію.

Адна з найважнейшых падказак - уменьне ўжываць спэцыфічна інтэлігентную мову. Працы з сацыялёгіі польскай мовы перадаюць адну характэрную рысу мовы звычайнага польскага інтэлігента - у ёй вельмі часта сустракаюцца словы «пэўны», «якісьці», «нібыта», «як быццам». Гэтая спэцыфіка адлюстроўвае

акалічнасьць, пра якую ня варта забывацца й нам, украінскім інтэлігентам: інтэлігентам ёсьць той, хто ведае, што ён ведае, а чаго ня ведае, і для разьмежаваньня першага ад другога знаходзіць рытарычную форму экспрэсіі. Для напалову інтэлігента характэрная дзёрзкая псэўдарыторыка, бо ён думае, што ведае ўсё.

Гэта асабліва варта памятаць, калі заходзіць гаворка пра першы кантэкст. Тут заўсёды хаваецца небясьпека гіпэркрытычнага стаўленьня - асуджаць усё, што было раней, і пачынаць адлік ад сябе самога. А ў кожным канкрэтным выпадку кожны ўкраінскі інтэлігент мусіць яшчэ пераадолець сваю «скунсавую» - паводле выразу Ліпінскага - хваробу лічыць сябе «ўкраінскім геніем». Украінскі інтэлігент час ад часу адчувае патрэбу ўстаць на катурны і выгукнуць, сьледам за Франком, што ў нас няма інтэлігенцыі: у нас ёсьць сотні (тысячы, мільёны) адукаваных людзей, а «сапраўднай» інтэлігенцыі няма.

Насуперак гэтаму гіпэркрытычнаму стаўленьню трэба сьцьвердзіць наступнае: украінская інтэлігенцыя - як і польская, расейская, нямецкая ды іншыя, - нягледзячы на пастаянныя самаабвінавачаньні, сумневы ўва ўласным існаваньні і расчараваньне ў самой сабе, усё ж такі існуе, і вось ужо 150 гадоў яна падзяляе цяжар грамадзкай адказнасьці, займаецца задачамі, якія ў нармальных умовах павінна была б вырашаць дзяржава, і такім чынам забясьпечвае пераемнасьць і ўласнага існаваньня, і часткі грамадзтва ў полі нацыянальнай культуры. Спэцыфіка ўкраінскай інтэлігенцыі - ізноў-такі, як і ўсёй інтэлігенцыі ўсходнеэўрапейскай - палягае ў асаблівай нацыятворчай функцыі інтэлектуалаў. Гэта адначасова і іхнае блаславеньне, і іхнае праклятьце. Блаславеньне, бо прыносіць пачуцьцё асаблівай, ні з чым не параўнальнай гераічнай місіі. Праклятьце, бо накладае на яе такія інтэлектуальныя абмежаваньні, зь якіх немагчыма вырвацца.

Каб дасягнуць сапраўдных інтэлектуальных вышыняў, трэба перамагчы сілу нацыянальнага прыцягненьня - гэта даводзіць прыклад венскіх асымільваных габрэяў. Ува ўкраінскім выпадку гэтая гравітацыя ўзмацняецца нешматлікасьцю ўкраінскай інтэлігенцыі. Узяць любы абсяг - музыку, літаратуру,

гістарыяграфію - яскравых аўтараў і твораў хапіла б на некалькімільённую нацыю, кшталту эстонскай ці славацкай, але не на краіну з 40-50-мільённым насельніцтвам. Да таго ж, ува ўкраінскай культуры й навуцы, як і раней, адсутнічаюць цэлыя кірункі. Прыклад гістарычнай навукі мне найбліжэйшы, таму спашлюся на яго: у нас ледзь-ледзь «наскрабецца» некалькі дзясяткаў спэцыялістаў у расейскай гісторыі, менш за дзясятак - у гісторыі польскай. І гэта гісторыя нашых найбліжэйшых суседзяў! Што ж тады казаць аб адмыслоўцах з гісторыі Францыі, Нямеччыны, Швэцыі, Партугаліі ці так званых «архідэйных спэцыяльнасьцях», як бізанталёгія, антычны сьвет ці эгіпталёгія! Гэта правакуе ўкраінскіх інтэлектуалаў быць «майстрамі на ўсе рукі», г. зн. выходзіць за рамкі сваёй прафэсіі і пераходзіць у суседнюю, каб такім чынам с(т)имуляваць структурную паўнавартаснасьць украінскай культуры. Не сакрэт, што такая ўнівэрсальнасьць дасягаецца коштам якасьці. Лэся Ўкраінка калісьці ўшчувала Франка, што той узяўся расфарбоўваць - з нацыянальнай патрэбы! - платы, наступаючы на горла свайму высокаму мастацкаму таленту.

Кантэкст апошніх дзесяці гадоў шмат чаго зьмяніў - але адначасова ўвідавочніў драматычнасьць украінскай сытуацыі. Бо цяпер украінская культура павінна была б дасягнуць статусу дзяржаўнай ды вядучай - а насамрэч застаецца культурай меншасьці ў сваёй краіне. Не сакрэт, што ўсё самае цікавае і вартаснае ўва ўкраінскай навуцы і культуры нараджаецца збольшага не пры падтрымцы ўласнай дзяржавы, а насуперак ёй. Украінская інтэлігенцыя мусіць змагацца за статус большасьці, бо інакш страціць сэнс свайго існаваньня. Таму яна павінна адначасова і пісаць творы, і ствараць асяродкі, здольныя іх успрымаць. Яна нагадвае тэнісіста, які, зрабіўшы падачу, мусіць стрымгалоў пераскокваць цераз сетку, каб адбіць мяч з другой паловы поля, - і такім чынам ствараць ілюзію гульні. Як доўга можна вытрымаць такую сытуацыю без псыхалягічных надломаў, раньніх інфарктаў ды інсультаў - мала таго, яшчэ й трымаючыся пэўных інтэлектуальных ды мастацкіх стандартаў?

Сучасныя ўкраінскія інтэлігенты - люстэркавая супрацьлегласьць англа-французскіх інтэлектуалаў. Тыя

інтэлектуалы зьяўляюцца спэцыялістамі ў сваёй вузкай дзялянцы і пакідаюць яе толькі ў выпадку патрэбы - каб падаць свой голас у грамадзкіх справах. Украінскія інтэлігенты вельмі часта ёсьць спэцыялістамі ў нічым або перасталі быць спэцыялістамі ў чымсьці. Але яны бяруцца разважаць пра ўсё: сёньня - пра Дэрыду, заўтра - пра найноўшыя сацыялягічныя апытаньні, пасьлязаўтра - пра пэрспэктывы эўрапейскай інтэграцыі. У адрозьненьне ад герояў старой савецкай песьні пра «мантажнікаў-высотнікаў», якія ганарыліся тым, што яны не качагары і не цесьляры, нашыя ўкраінскія інтэлігенты гатовыя і качагарыць, і бярвеньне часаць, і на высотныя слупы залазіць. У гэтым не было б бяды, калі б яны ў кожным выпадку датрымліваліся законаў аднаго рамяства і аднаго жанру. Але, на жаль, ім раз-пораз карціць прыхапіць на высакавольтныя лініі качаргу. Асабліва гэта датычыць фэномэну так званай «літаратурнай Украіны» (ня блытаць з назвай газэты), калі палітычны аналіз вядзецца зь літаратурнай пэрспэктывы, а паліталягічныя катэгорыі падмяняюцца вобразамі й катэгорыямі літаратуры ды паэзіі.

Украінскія інтэлектуалы грэбуюць сваім прызначэньнем - артыкуляваць новую сытуацыю адпаведна зьмененым умовам існаваньня грамадзтва. Найбольшым інтэлектуальным здабыткам тут ёсьць руйнаваньне старых - ці, хутчэй, застарэлых - мітаў, якія жывыя яшчэ толькі дзякуючы ляноце ды самападману колішніх інтэлектуальных правадыроў ды ўра-патрыятызму нашай дзяржавы. Але самой крытыкі замала. Бо дэканструкцыя без канструкцыі мяжуе зь безадказнасьцю.

«Пост»-кантэкст завастрае глябальную праблему сучаснасьці - пагрозу страціць унутраную салідарнасьць грамадзтва. Пра гэтую пагрозу гаварыў нядаўна Юрген Габэрмас, калі яму ўручалі прэмію нямецкіх кнігавыдаўцоў (яго выступ стаўся прадметам абмеркаваньня ў кракаўскім часопісе «Znak»). Здабыцьцё свабоды правакуе атамізацыю грамадзтва, бо сам панятак свабоды рэдукуецца - ператвараецца з асноўнай рысы заходняй цывілізацыі ў просты выбар спосабаў спажываньня: ад адзеньня й машын да сэксуальных партнэраў ды ідэнтычнасьцяў. Акурат гэта адбывалася да нядаўняга часу ў ЗША - спатрэбілася трагедыя 11 верасьня 2001 году, каб

вярнуць страчанае пачуццьцё грамадзкай салідарнасьці. І якраз так часьцей за ўсё разумеюць заходнія вартасьці ў посткамуністычным сьвеце.

Габэрмас заклікае вярнуць рэлігію - праўда, у яе сэкулярызаванай форме - у публічную сфэру. Невядома, які яшчэ пярун мусіць скалануць украінскае неба, каб украінскі грамадзянін нарэшце перахрысьціўся. Няхай гэта гучыць парадаксальна, але так яно ўжо ёсьць: у сучаснай Украіне бліжэй да габэрмасаўскага этасу стаяць не інтэлектуалы, а палітыкі. Гледзячы на тое, як на прэс-канфэрэнцыі сядзяць побач, адкінуўшы свае партыйныя разыходжаньні, Мароз, Сіманенка і Цімашэнка, задаешся пытаньнем, ці здольныя на такое дзеля лабіяваньня супольных інтарэсаў прадстаўнікі змаргіналізаваных украінамоўных і ўдвая больш змаргіналізаваных расейскамоўных інтэлектуальных колаў?

Шэрасьць і беспрасьветнасьць кучмаўскага рэжыму прымушае пазычыць у палякаў іхны лёзунг патрэбы арганічнай пазытыўнай працы. Ня маючы спадзеву штосьці зьмяніць цяпер, трэба працаваць на будучыню: пісаць свае кніжкі, выдаваць свае часопісы, выхоўваць сваіх вучняў. Але якраз польскі прыклад паказвае, што мала абвясьціць новы лёзунг - трэба дэталёва прааналізаваць ранейшыя промахі ды ілюзіі. Найперш і перадусім - пазбавіцца рамантычнай традыцыі дэманізаваць ворага і ідэалізаваць уласнае грамадзтва. Многія, калі не пераважная большасьць украінскіх інтэлектуалаў, прызначылі на ролю ворага расейскамоўную палову ўкраінскага грамадзтва: яна й «зрусіфікаваная», і «саўковая», і «крэольская» - папросту кажучы, безнадзейная. І для дабра ўкраінскае справы ёй лепш за ўсё было б наагул пакінуць Украіну, прыхапіўшы з сабой свой Данбас і Поўдзень.

Мала сказаць, што супраць такога артыкуляваньня ўкраінскай ідэі крычаць дадзеныя сацыялягічных апытаньняў. Яно зьяўляецца папросту самазабойчым, бо заганяе ўкраінства ў такі катух, адзіным выйсьцем зь якога ёсьць Кучма як генэратар і гарант украінскай саборнасьці. Можна толькі павіншаваць украінскага прэзыдэнта з такой інтэлігенцыяй: пакуль яна актыўна ангажуецца ў правапісныя ды могілкавыя войны,

ягонай уладзе нічога ўсур'ёз не пагражае.

Ёсьць штосьці трагічнае ў постаці інтэлектуала - калі не трагікамічнае. Ён заўсёды пачынае... і прайграе. Ён ініцыюе вялікія грамадзкія зьмены, ад якіх церпіць першым і найбольш.

Але ягоная сытуацыя зусім не безнадзейная. Яна можа паслужыць падмуркам новай веры. Бо, як любіць паўтараць Лешак Калакоўскі, самая ўдалая дэфініцыя веры - гэта прызнаньне асобай сваёй уласнай паразы, заўсёднай перамогі свайго жыцьця над сабою.

Ці гэтая вера можа быць асновай для ўзьнікненьня новай салідарнасьці? Ня ведаю. Ня ўпэўнены. Магчыма. Але што яшчэ застаецца ўкраінскаму інтэлектуалу, як ні паспрабаваць яшчэ раз?

* * *

А напрыканцы некалькі слоў пра жыцьцё пасьля сьмерці. Попэр перажыў Вітгенштайна аж на 45 гадоў і перад сваёй сьмерцю ў 1996-м пераўзышоў яго ў сусьветнай славе. Але перамога была хутчэй вынікам палітычнай каньюнктуры: з падзеньнем бэрлінскай сьцяны ягоная кніга пра адкрытае грамадзтва зноў зрабілася актуальнай. Да ліку найбольшых прыхільнікаў Попэра належыць Джордж Сорас. Ён уклаў вялізныя капіталы ў спробы збудаваць на руінах камуністычнай сыстэмы адкрытае грамадзтва паводле рэцэпту Попэра. Пасьля дзесяці гадоў інтэнсіўнай грашовай тэрапіі пацыент яшчэ не памёр і нават падае надзеі на папраўку, хаця чым далей, тым меншыя. Затое ў краінах «пераможнага адкрытага грамадзтва» слава Попэра завяла. Прынамсі, прафэсары ўсё радзей раяць сваім студэнтам ягоныя кнігі. Такі кошт перамогі. Крытыка дагматычнасьці мысьленьня, націск на талерантнасьці былі вельмі радыкальнымі ў 1946 годзе. Але ў 2003-м яны ўспрымаюцца як банальнасьці паліткарэктнасьці - што ёсьць хіба найлепшым сьведчаньнем Попэравай інтэлектуальнай перамогі.

У той самы час прафэсійнае апытаньне ў 1998 годзе вывела Вітгенштайна на пятае месца сярод найвялікшых філёзафаў сьвету, пасьля Арыстотэля, Плятона, Канта і Ніцшэ. А Попэр ня

трапіў нават у першую дзясятку. Вітгенштайнава філязофія набыла шмат пасьлядоўнікаў, аж да постмадэрністаў - хаця сам ён, відаць, перавярнуўся б у труне, калі б даведаўся пра гэта. Ёсьць і іншыя, менш неспадзяваныя вынікі: у сваёй кнізе пра паэтычную мову ХХ стагодзьдзя амэрыканскі літаратурны крытык Марджоры Пэрлаф налічвае восем раманаў, дванаццаць паэтычных нізак і шэсьць экспэрымэнтальных сцэнічных пастановак, крыніцай зьяўленьня якіх, непасрэднай ці апасродкаванай, паслужыла філязофія Вітгенштайна.

Франко памёр у 1916 годзе, у самоце, пакутах і без дагляду. Ён пакінуў пасьля сябе каля 4500 твораў - аповесьцяў, апавяданьняў, вершаў, перакладаў, навуковых і публіцыстычных артыкулаў, рэцэнзіяў. Гэта роўна ў чатыры разы перавышае ўсю прадукцыю руска-ўкраінскай інтэлігенцыі ў Галіччыне з 1801 па 1856 год, г.зн. да году ягонага нараджэньня. Нават калі б украінская кніжная ды газэтная прадукцыя ў Галіччыне абмежавалася адным толькі Франком, ня трэба было б лепшага доказу існаваньня ўкраінскай нацыі.

Праблема з Франковымі пісаньнямі, аднак, тая самая, што й зь нямецкім паэтам Кляпштокам, героем вядомага прыслоўя: хто ж ня ведае цяпер Кляпштока - але хто яго чытае? Кожны з нас чытаў Франка ў школе - але колькі з нас бяруць у рукі Франка з уласнае волі? Пра Галіччыну, нават пра родны Франкоў Драгобіч, сьвет больш ведае дзякуючы Бруна Шульцу, чым Івану Франку. Дастаткова параўнаць колькасьць перакладаў першага і другога. У Галіччыне дагэтуль дыскутуюць, чаму яно так - бо ж і напісаў Шульц нашмат менш, і ўсе тыя пісаньні нейкія «пэрвэрсіўныя», ня тое што Франкова проза ды паэзія! Адказ падаецца досыць простым: асымілiяваны габрэй Шульц ня меў патрэбы будаваць нацыю, а таму не наступаў на горла свайму літаратурнаму таленту. Ягонае габрэйства пачало перасьледаваць яго напрыканцы жыцьця, калі перадваенная польская нацыяналістычная крытыка патрабавала выгнаць «жыдоў» Шульца і Тувіма з польскай літаратуры, і канчаткова дагнала яго ў выглядзе кулі зь пісталета нацысцкага афіцэра. Але гэта не пазбавіла яго славы - толькі дадала да яе літаратурны міт.

А Франка да канца жыцьця мучыла іншае: вобраз ягоных ненароджаных дзяцей - ненапісаных геніяльных вершаў. Ненапісаных празь нястачу часу, а ня таленту. Грэхам было б абвінавачваць у гэтым самога Франка: ён ня меў вялікага выбару. На шчасьце, ува ўкраінскіх інтэлектуалаў пасьля 1991 году - і пагатоў пасьля 2001-га, калі стала да канца зразумела, што ўкраінскай дзяржаве ніхто, апроч саміх украінцаў, не пагражае і можна вызваліцца ад нацыябудаўнічага абавязку, - такі выбар зьявіўся. Важна, аднак, каб яны перасталі палохаць сябе і ўвесь сьвет сваімі напаўлітаратурнымі - напаўпаліталягічнымі фантазмамі. І, падобна да Вітгенштайна ці Попэра, заняліся б пошукам вялікіх адказаў на вялікія пытаньні. З качаргою. І ўсур'ёз.

Пераклала з украінскай Віялета Кавалёва паводле «Критика», № 1-2, 2003.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (30) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

АЛЯКСАНДАР БАТУРА
палітоляг, сталы аўтар «ARCHE». Жыве ў Дубліне (Ірляндыя).

Аляксандар Батура Ці ёсьць у Беларусі нацыянальныя інтарэсы?

Што добра для Злучаных Штатаў, тое добра і для «General Motors». І наадварот.

Чарльз Э. Вільсан

У нас няма вечных хаўрусьнікаў, няма ў нас і вечных ворагаў. Толькі нашы інтарэсы вечныя, і гэта наш абавязак - выконваць гэтыя інтарэсы.

Лорд Палмэрсан

1

Нацыянальны інтэрас зьяўляецца адным з самых зацяганых як самімі палітыкамі, так і навукоўцамі паняцьцяў. У залежнасьці ад кантэксту, у якім яно выкарыстоўваецца, і, што яшчэ больш істотна, ад таго, кім і зь якімі мэтамі выкарыстоўваецца, нацыянальны інтэрас можа мець розны, часам супрацьлеглы зьмест. Артыкуляваць інтэрас азначае прэзэнтаваць пэўную патрэбу. Артыкуляваць нацыянальны інтэрас - пазначаць

пэўную патрэбу, сапраўдную ці ўяўную, ад імя нацыі. Інтарэсы могуць разглядацца як суб'ектыўныя шляхі вызначэньня аб'ектыўна існых патрэбаў - стратэгічных, палітычных і эканамічных. Працэс пераўтварэньня гэтых аб'ектыўных патрэбаў у інтарэсы йдзе пад уплывам шматлікіх суб'ектыўных фактараў, адсюль і блытаніна ў паняцьцях. У беларускім палітычным дыскурсе шмат ужо пісалася і гаварылася пра нацыянальныя інтарэсы. Інтэрпрэтацыі былі розныя - трэба ўзгадаць хаця б дыскусію наконт палітыкі беларускай энэргазалежнасьці ад Расеі, якая «ажыцьцяўлялася ў дзяржаўных інтарэсах Беларусі» (інтэрпрэтацыя ўлад) і «была супраць нацыянальных інтарэсаў Беларусі» (інтэрпрэтацыя дэмакратычнай супольнасьці).

У гэтым артыкуле я паспрабую прааналізаваць праблему акрэсьленьня нацыянальных інтарэсаў Беларусі. Звычайна ў міжнародных зносінах пад нацыянальнымі інтарэсамі разумеюцца абарона дзяржавы і эканамічныя патрэбы. Я паспрабую пайсьці трохі далей і адказаць на некалькі пытаньняў «як» і «чаму». На ступені ўзьнікненьня нацыянальнай дзяржавы, нявызначанай ідэнтычнасьці і існаваньня некалькіх узаемасупрацьлеглых нацыянальных праектаў вызначыць нацыянальныя інтарэсы надзвычай цяжка. Калі сытуацыя склалася такім чынам, я паспрабую прынамсі вызначыць, што не зьяўляецца нацыянальнымі інтарэсамі Беларусі. Спачатку я разгледжу праблему вызначэньня нацыянальных інтарэсаў праз прызму нацыянальнай ідэнтычнасьці, пасьля зраблю спробу вызначыць месца нацыянальных інтарэсаў сярод агульначалавечых, дзяржаўных і рэжымных інтарэсаў.

Гісторыя паняцьця пачынаецца разам з гісторыяй узьнікненьня сучасных нацыянальных дзяржаваў у Эўропе XVI-XVII стагодзьдзяў, яно ўзьнікае спачатку ў Італіі, а пасьля ў Брытаніі. Разуменьне і абгрунтаваньне нацыянальных інтарэсаў зьвязана з эвалюцыяй дзяржаўнай улады. Падчас узьнікненьня нацыянальных дзяржаваў улада была Абсалютам, то бок неабмежаванай, і афіцыйны дыскурс забараняла любы супраціў уладзе. Як выказаўся тагачасны «палітоляг» Жан Бадэн, валадар неабмежаваны нічым і нікім.

У першых спробах адасобіць дзяржаву ад валадара дзяржава робіцца крыніцай неабмежаванай вярхоўнай улады замест ранейшай улады Караля. Пераход ад сувэрэнітэту сувэрэна да сувэрэнітэту дзяржавы азначае, што тэрытарыяльная дзяржава ўжо мае неабмежаваную ўладу па-над сваімі падданымі ў межах сваёй тэрыторыі. Аднак узнікаюць новыя палітычныя праекты, і паступова дзяржаўны *raison d'Etat* таксама дае дарогу новаму сувэрэну - на гэты раз сувэрэнітэту народу - ідэя, якую сьпярша прапануе Ж. Ж. Русо і якая пасьля заменена абатам Сэесам на сувэрэнітэт нацыі, ці нацыянальны сувэрэнітэт.

З таго часу паняцьце нацыянальных інтарэсаў пачынае шырока ўжывацца і злоўжывацца палітыкамі ды палітычнымі камэнтатарамі. Так, амэрыканцы пачынаюць артыкуляваць свае нацыянальныя інтарэсы недзе адразу пасьля прыняцьця Канстытуцыі з канца XVIII стагодзьдзя. З таго часу «нацыянальныя інтарэсы» займаюць месца «цяжкай зброі» ўва ўсіх асноўных дэбатах наконт амэрыканскай замежнай палітыкі. У імя «нацыянальных інтарэсаў» Злучаныя Штаты ўступаюць у абедзьве сусьветныя вайны, «нацыянальныя інтарэсы» вядуць Амэрыку ў Віетнам і паралізуюць спробы з годнасьцю выйсьці зь відавочна прайгранай вайны. У наш час «нацыянальныя інтарэсы» прывялі і да неабходнасьці другой вайны ў Пэрсыдзкай затоцы.

«Нацыянальныя інтарэсы» існуюць і ў іншых краінах. Усходнеэўрапейскія хаўрусьнікі Савецкага Саюзу, якія імкнуліся самастойна вызначаць замежную палітыку падчас паглыбленьня крызысу сацыялістычнай сыстэмы, абгрунтоўвалі новую палітыку сваімі «нацыянальнымі інтарэсамі» (напрыклад, Вугоршчына так тлумачыла свае стасункі з МВФ на пачатку 1980-х). Цяпер расейскі прэзыдэнт Пуцін акрэсьлівае «краіны блізкага замежжа» ў сваёй замежнай палітыцы як сфэру расейскіх нацыянальных інтарэсаў. «Нацыянальныя інтарэсы» ўзгадваюцца кожны раз у якасьці «цяжкай» зброі, калі пэўную палітычную мэту трэба абгрунтаваць у пераканаўчых тэрмінах, якія не патрабуюць далейшай дыскусіі.

Трэба адразу вызначыць адрозьненьні паміж паняцьцямі нацыі і

дзяржавы. У ангельскай мове паняцьце «nation» можа разумецца як «нацыя» - пэўная сацыяльная супольнасць - і як «дзяржава» - палітычная тэрытарыяльная арганізацыя. Часам адрозьненьне бачнае з кантэксту, у якім ужыты прыметнік «нацыянальны». Але не заўсёды гэтае адрозьненьне відавочнае, асабліва калі гаворка йдзе пра нацыю, межы расьсяленьня якой не супадаюць зь межамі нацыянальнай дзяржавы. Як пісалі Тэд Гур і Барбара Харф, «мапа сьвету, акуратна падзеленая на краіны з сваімі межамі і акрэсьленай тэрыторыяй, дае падманліва спрошчаны вобраз палітычных ідэнтычнасьцяў людзей»[1].

Увядзём для далейшага аналізу паняцьці нацыі, дзяржавы, грамадзтва і ўраду. Нацыю мы разумеем як пэўную супольнасьць людзей, якія валодаюць супольным культурным (і, магчыма, этнічным) паходжаньнем і пражываюць на акрэсьленай тэрыторыі. Нацыя павінна ўсьведамляць сваю адрозную ад іншых, ідэнтычнасьць. Хоць вызначыць нацыю надзвычай складана, звычайна для гэтага выкарыстоўваюць шэраг маркераў - мова, тэрыторыя, супольная гісторыя і традыцыі, рэлігія.

[1] Ted Robert Gurr and Barbara Harff, *Ethnic Conflict in World Politics*, Boulder: Westview, 1994, p. 1.

Дзяржава - гэта незалежны суб'ект міжнароднага права, які мае сувэрэнітэт над пэўнай тэрыторыяй і выконвае шэраг асноўных, аднолькавых для ўсіх дзяржаваў функцый, напрыклад такіх, як падтрымка грамадзкага парадку і абарона ад вонкавых ворагаў.

Інстытуты дзяржавы ня тоесныя з органамі ўраду, першыя трэба разумець шырэй. Урад прыходзіць і сыходзіць, а дзяржава застаецца. У лібэральных дэмакратыях зьмена ўраду не вядзе да якасных зьменаў у інстытутах дзяржавы, дзяржаўная адміністрацыя, бюракратычныя кадры, ніжэйшыя за міністра ці ягонага намесьніка, застаюцца нязьменнымі. У аўтарытарных жа дзяржавах адрозьненьне паміж дзяржаўнымі і ўрадавымі інстытутамі нярэдка зьнікае і зьмены ўраду могуць прыводзіць да поўных зьменаў у дзяржаўных інстытутах.

Грамадзтва можна вызначыць як сацыяльную супольнасьць, якая, у сваю чаргу, складаецца з шэрагу меншых супольнасьцяў. Грамадзтва працягваецца з пакаленьня ў пакаленьне і вызначаецца пэўнымі каштоўнасьцямі, мэтамі,

мэтадамі сацыялізацыі і паводзінаў, што падзяляюцца ягонымі чальцамі. Менавіта грамадзтва ў лібэральных дэмакратыях артыкулюе свае патрэбы праз палітычныя партыі, абмяркоўвае надзённыя праблемы і, зноў жа праз партыі, вызначае ўрад.

Нягледзячы на ўсе спробы вызначыць паняцьце нацыянальных інтарэсаў, да гэтага часу не існуе іх агульнапрынятага азначэньня ані сярод палітыкаў-практыкаў, ані сярод навукоўцаў-тэарэтыкаў. Няма нічога дзіўнага, што кожны палітык мае сваё азначэньне «нацыянальных інтарэсаў», - зрэшты, разуменьне такіх палітычных паняцьцяў, як дэмакратыя, свабода, незалежнасьць, таксама вагаецца ў залежнасьці ад ідэалягічных поглядаў, геаграфічнага становішча, часу і суб'ектыўных поглядаў палітычных дзеячоў, якія ўжываюць іх. Так, як некалі трапна заўважыў вядомы палітычны тэарэтык Робэрт Даль, паняцьцем дэмакратыі цяпер настолькі злоўжываюць, што яно можа пазначаць што заўгодна. Значна большая праблема паўстае з ужываньнем тэрміну нацыянальных інтарэсаў у палітычным аналізе, бо тут не існуе згоды нават у акадэмічнай супольнасьці. Рэймон Арон, напрыклад, адмаўляецца ад спробаў рацыянальнага вызначэньня «нацыянальнага інтэрасу» і ўвогуле прызнае гэтае паняцьце невызначальным ці незразумелым[2]. Фрэд Грын падзяляў скептыцызм Арона і лічыў, што нацыянальныя інтарэсы ёсьць ня што іншае, як калекцыя прыватных інтарэсаў, якія прыкрываюцца нацыянальнай шырмай дзеля здабыцьця сабе большай легітымнасьці[3]. Як відаць, дзеля таго каб больш-менш сур'ёзна разважаць наконт нацыянальных інтарэсаў, трэба знайсьці індыкатары, якія б іх «вымяралі». Інакш кажучы, калі аб'ектыўны нацыянальны інтэрас існуе, павінны існаваць пэўныя індыкатары, што фіксуюць яго незалежнае існаваньне і адрозьненьне ад інтарэсаў розных палітычных і эканамічных груповак, калі тыя дзеюць ад імя нацыянальнага інтэрасу.

2

Існуюць два фундамэнтальна розныя падыходы да аналізу нацыянальных інтарэсаў, іх можна ўмоўна назваць аб'ектывісцкім і суб'ектывісцкім[4]. Аб'ектывісты сьцьвярджаюць, што існуюць прыманэнтныя, нязьменныя інтарэсы, якія могуць

[2] Raymond Aron, *Peace and War*, London: Weidenfeld and Nicolson, 1966, p. 89.

[3] Fred Greene, *Dynamics of International Relations: Power, Security,*

and Order, New York: Praeger, 1964, p. 37.

4 Аб'ектывізацыі суб'ектыўнай ідэнтычнасці ў нацыянальныя інтарэсы прысвечаны працы: Jutta Weldes, «Constructing National Interests», *European Journal of International Relations*, 1996, 2(3), pp. 275-318; Jutta Weldes, «Constructing National Interests and US Foreign Policy», *Millennium: Journal of International Studies*, 1998, 27(1), pp. 73-94; Jutta Weldes, Mark Laffey, Hugh Gusterson, Raymond Duvall, «Introduction: Logics of Culture and Security», in: Jutta Weldes, Mark Laffey, Hugh Gusterson, Raymond Duvall (eds.), *Cultures of Insecurity: States, Communities, and the Production of Danger*, Minneapolis: University of Minnesota Press, 1999, pp. 1-33.

5 Joseph Frankel, *National Interest*, London: Pall Mall Press, 1970, p. 17.

6 Там жа, с. 76.

7 Rodney Bruce Hall, «Territorial and National Sovereignty», *Security Studies* 8, nos. 2/3 (winter 1998/99 – spring 1999), p. 145-197.

Нацыянальныя інтарэсы ёсць на што іншае, як адрозны суб'ектыўных патрэбаў грамадзтва. Гэтыя інтарэсы «зарадкаваны» каштоўнасьцямі асноўных палітычных актораў. Немагчыма падабраць неабходныя індыкатары для іх аб'ектыўнага аналізу – нацыянальныя інтарэсы ёсць не тым, іншым, як адлюстраваць чым-небудзь нацыянальнай ідэнтычнасьці, характару і агульных нацыянальных патрэбаў. Трэба вывучаць асаблівасьці нацыянальнай ідэнтычнасьці, агульныя патрэбы грамадзтва, каб зразумець нацыянальныя інтарэсы.

Пераканаьні, каштоўнасьці, нормы дзяржавы (дзяржаўная ідэнтычнасьць) уплываюць на нацыянальныя інтарэсы[7]. Прыкладам брытанскай дзяржаўнай ідэнтычнасьці (вонкавы імідж) будуць традыцыі, манархія, найлепшая ў сьвеце бюракратыя, моцныя партыі і рацыяналізм у палітыцы. Кожнай дзяржаве ўласьцівы свой стыль замежнай палітыкі, які адрозьнівае яе ад астатніх. Амэрыканскі прагматызм, культура спаборніцтва і эканамічнай экспансіі вядуць да актыўнай, агрэсіўнай амэрыканскай палітыкі. Нямецкі парадак і рацыяналізм («падкарэктаваны» пасьля паразы ў апошняй вайне) мае таксама такі ж адрозны «нямецкі» стыль. Згодна з гэтай лёгікай, дзяржаўная ідэнтычнасьць у стане вызначаць дзяржаўныя інтарэсы.

Гэтаксама каштоўнасьці, што існуюць у грамадзтве, могуць вызначыць, якія спосабы дасягненьня нацыянальных інтарэсаў

будуць інтэрпрэтаваныя як справядлівыя[8]. Іншымі словамі, пэўныя нормы і практыкі, якія ўтвараюць ідэнтычнасьць, вызначаюць, якія стратэгіі зьяўляюцца найбольш легітымнымі і найбольш прыдатнымі ў пэўных сытуацыях. Пры гэтым разуменьне легітымных стратэгіяў замежнай палітыкі нават заходнімі ўрадамі можа быць абсалютна супрацьлеглым. У якасьці найбольш імавернага кандыдата на пасаду асноўнай «каштоўнасьці», супольнай патрэбы, супольнага інтэрасу значнай часткі, калі ня большасьці, беларусаў, што ўплывае на нацыянальныя інтарэсы Беларусі, як ні шкада, просіцца патэрналізм. Патэрналізм далёка не абмяжоўваецца дзяржаўнымі каналамі, зьверху-ўніз, дзяржава-грамадзяне. Патэрналізм, як той рак, імкнецца пранікнуць у кожную шчыліну, у кожны закуток беларускага грамадзтва. Ён песьціцца зьверху, але ж ён ветліва прымаецца і зьнізу. Патэрналізм - гэта ня толькі загады калгасам з самага верху, колькі сеяць, «сэлектарныя прамовы», «турботы» дзяржавы, каб хаця грамадзяне жылі лепей. Мне здаецца, усё намнога горш. Патэрналізм - гэта калі ў XXI стагодзьдзі калгасы ўспрымаюцца як нармальная зьява; калі студэнты вязуць ад бацькоў сала ў горад, замест таго каб падпрацоўваць афіцыянтамі ў рэстарацыях; калі выпускнікі эканамічнага ўнівэрсытэту з радасьцю ідуць працаваць у Камітэт фінансавых расьсьледаваньняў (мама «ўладкавала»), а не ў прыватную фірму (гэта менш стабільна і ня так прэстыжна); калі асьвятленьне ў пад'езьдзе ўключаецца і выключаецца недзе ў цэнтры, замест таго каб кожны з жыхароў дому вызначаў, калі яму ўключаць і выключаць яго... А самае галоўнае - калі ні ў кога такі парадак рэчаў не выклікае зьдзіўленьня. Каб пачаць сваю справу, трэба прайсьці сто інстанцыяў, і, замест таго каб стаць мэнэджэрам ці прыватным доктарам, моладзь хутчэй выбера пасаду інспэктара пажарнай бясьпекі або рэгістратара рыбакоў. Чытач можа не пагадзіцца і справядліва заўважыць, што патэрналізм навязваецца зьверху, - але зьверху няма нічога з таго, чаго б не было зьнізу. Як нехта зь вялікіх казаў, «я ненавіджу толькі тое, што ёсьць часткай мяне самога. Тое, чаго я не падзяляю, рэч мне нецікавая».

Дзякуючы патэрналізму нацыянальным інтэрасам Беларусі робіцца забесьпячэньне краіны ненармальна таннымі газам і

нафтай, якія так міла прапануюцца Расеяй і якія пасьля беларуская дзяржава, як клапатлівая маці, дзеліць паміж беларусамі. Такім чынам, патэрналізм выступае вельмі моцным кандыдатам на пасаду супольнага інтэрасу беларусаў - цэмэнтам, які змацоўвае паўсталую нацыю, фактарам, празь які трэба разглядаць нацыянальныя інтарэсы. Пакуль ён ня зжыты, не спрацоўваюць сэмінары, гранты, «выбірайкі» і пра дэмакратычныя альтэрнатывы нават размовы быць ня можа. Хоць патэрналізм - гэта дарога ў нікуды, ёсьць падставы сьцьвярджаць, што ў Беларусі ўжо цяпер зь ім пачынае канфліктаваць самы сапраўдны спажывецкі матэрыялізм. Нацыянальны інтэрас можна зьвязваць з патэрналізмам, а можна і з стварэньнем вобразу ворагаў. Дэвід Кемпбэл лічыць, што дзяржава апраўдвае сваё існаваньне толькі праз рэпрадукцыю стану небясьпекі, які фармуе яе raison d'etre. Нацыянальныя інтарэсы будуць артыкулявацца, каб стварыць уражаньне існаваньня гэтага стану небясьпекі. З гэтай мэтай дзяржава зьвяртаецца да шэрагу мэтафар (напрыклад, квазірэлігійнай дыхатаміі дабра і зла ў духу Джорджа Дабл'ю Буша), каб умацаваць мяжу паміж «намі» (амэрыканцамі, Вольным сьветам) і «імі» (тэрарыстамі). Такі падзел на «нас» і «іх» удала служыць мабілізацыі патрыятызму і ляяльнасьці падданых, для павароту ўвагі грамадзтва ад праблемаў, якія дзяржава ня хоча ці ня ў стане вырашыць, да тых, якія яна можа вырашыць. Такім чынам, дзяржава і практыка «захаваньня бясьпекі» заснаваныя на гэткай дыхатаміі ідэнтычнасьці[9]. У Беларусі курс на пабудову моцнай дзяржавы таксама пастаянна легітымізуецца існаваньнем нейкіх ворагаў.

3

Нацыянальную ідэнтычнасьць можна падзяліць на ўнутраную і вонкавую.

«Унутраная» ідэнтычнасьць вызначае сукупнасьць частак-каштоўнасьцяў, якія складаюць падмурак нацыянальнай дзяржавы («мы», наша мова, культура, гісторыя і г. д.), і тое, якім чынам гэтая сукупнасьць праяўляецца ў ляяльнасьці да нацыянальнай дзяржавы. Пад «вонкавай» ідэнтычнасьцю маюцца на ўвазе адрозьненьні вобразаў адной нацыянальнай

дзяржавы ад вобразаў іншых дзяржаваў («яны»)»[10].

Сьцяпан Дубавец, *Ідэалогія беларускай дзяржаўнасьці*, Менск, 1993.

Сьветапогляды нацыянальных элітаў таксама ўплываюць на нацыянальныя інтарэсы. Як піша Болдын, «нацыянальныя інтарэсы» будуюцца, ствараюцца з асабістых вобразаў, празь якія разумеецца сьвет, у прыватнасьці дзяржава і яе месца ў міжнароднай сыстэме»[12]. У амэрыканскім выпадку «нацыянальныя інтарэсы» цяпер фармуюцца на аснове сьветапогляду Джорджа Буша (яшчэ тры гады таму ледзьве знаёмага з геаграфіяй), які можа назваць пакістанцаў у тэлеэтэры брудной мянушкай «пакі». У беларускім выпадку нацыянальныя інтарэсы фармуюцца на аснове сьветапоглядаў бюракратычнай савецкай эліты і камсамольскага сярэдняга звяна, дзе, як вядома, ідэалогія адыграла важную ролю, і яна застаецца актыўным, а інтарэсы дэмакратычнай грамадзкасьці - на жаль, пакуль што.

[11] Fernand Braudel, *The Identity of France: History and Environment*, vol. 1, trans. Sian Reynolds, New York: Harper and Row, 1986, p. 379-374.

[12] K. E. Boulding, «National Images and International Systems», *Journal of Conflict Resolution*, № 3, 1959, с. 120-131.

Вонкавая нацыянальная ідэнтычнасьць дзяржавы (вобраз, імідж) адрозьнівае яе ад астатніх дзяржаваў. У адной зь нешматлікіх спробаў інтэграваць гіпотэзы наконт асаблівасьцяў палітычных і эканамічных зносінаў паміж нацыянальнымі дзяржавамі ў адзіную тэорыю вонкавай нацыянальнай ідэнтычнасьці Рычард Катам* і яго калегі прапанавалі клясыфікаваць дзяржавы на аснове трох індыкатараў: пагроза ці магчымасьці, параўнальныя здольнасьці, культурная дыстанцыя. Трохі пазьней іншы дасьледчык Рычард Херман** ўпарадкаваў гэтую тыпалёгію і прапанаваў «3 × 3 × 8» клясыфікацыю. Табліцы Катама-Хермана прыведзена ніжэй.

*Richard Cottam, *Foreign Policy Motivation* (Pittsburgh: University of Pittsburgh Press, 1977).

**Richard Herrmann and Michael P. Fischerkeller, «Beyond the Enemy Image and Spiral Model», *International Organization* 49, no. 3 (summer) p. 415-450

[13] Audie Klotz, *Norms in International Politics: The Sruggle Against Apartheid*, Ithaca: Cornell University Press, 1995. *Новыя вобразы ўведзены для гэтага аналізу

Існуе шэраг агульнапрынятых і ўнівэрсальных патрэбаў, якія падзяляюцца дэмакратычнымі і недэмакратычнымі дзяржавамі і разумеюцца як іх нацыянальныя інтарэсы. Яны зьвязаныя з сувэрэнітэтам і бясьпекай дзяржавы, тэрыторыі і грамадзян. Гэта нацыянальныя інтарэсы, якія разумеюцца аксіяматычна, не патрабуюць папярэдняга аналізу. Сапраўды, калі дзяржава не абараняе свайго нацыянальнага сувэрэнітэту, яна ня ўдле азначэньня не зьяўляецца сувэрэннай дзяржавай.

16 Morton Kaplan, *Systems and Process in International Relations*, New York: John Willy and Son, 1964, p. 164.

Інтэграцыя эўрапейскіх краінаў у межах ЭЗ вядзе да пэўнай страты незалежнасьці. Але гэта не ўшчамляе нацыянальных інтарэсаў - эўрапейская інтэграцыя шырока падтрымліваецца як урадамі, так і грамадзтвам дзяржаваў - удзельніц ЭЗ, якія адкрыта абмяркоўваюць наступствы інтэграцыі. Нэгатыўныя наступствы страты часткі сувэрэнітэту кампэнсуюцца тым, што ніводная краіна не дамінуе падчас гэтай інтэграцыі і ўсе яны досыць эфэктыўна прадстаўленыя ў наднацыянальных інстытутах. Інтэграцыя таксама адбываецца згодна з эканамічнымі нацыянальнымі інтарэсамі. Кожная дзяржава шукае лепшых магчымасьцяў для эканамічнага разьвіцьця - і гэта другі (пасьля бясьпекі) узровень агульнапрынятых нацыянальных інтарэсаў.

Трэці ўзровень нацыянальных інтарэсаў - інтарэсы ў падтрыманьні нацыянальнага прэстыжу. Дзяржава павінна імкнуцца падтрымліваць нацыянальны прэстыж, сваё добрае імя-«брэнд» у сьвеце - гэта, па-першае, спрыяе нацыянальнаму экспарту (нямецкія аўтамабілі - немцы - парадак - дакладнасьць - якасьць - Нямеччына; тут пазытыўны эфэкт ідзе ў два бакі: добрыя аўтамабілі павялічваюць давер да Нямеччыны, Нямеччына дапамагае стварыць добры імідж для аўтамабіляў), па-другое, гэта вельмі істотна для турызму; нарэшце, добра для ўсёй нацыі - культурна і палітычна. Прэстыж так проста не прыходзіць, на яго працуюць гадамі, і калі краіна яго страціць, пасьля надзвычай цяжка яго вярнуць. Напрыклад, цяпер Сэрбія і Чарнагорыя ўклалі шмат сродкаў у кампанію-прэзэнтацыю сваёй краіны «Fall in Love Again» («Палюбі зноў»).

На аснове гэтых трох узроўняў можна правесьці папярэдні аналіз - ці адпавядае замежная палітыка Беларусі нацыянальным інтарэсам. На ўзроўні сувэрэнітэту і бясьпекі - нераўнапраўная інтэграцыя з Расеяй, якая калі нават эканамічныя вынікі будуць пазытыўнымі, можа ўвогуле прывесьці да страты нацыянальнага сувэрэнітэту. Наконт палітыкі бясьпекі цяжка даць адназначную ацэнку - з аднаго боку, Беларусь добраахвотна адмовілася ад ядравай зброі, а вайсковы хаўрус з Расеяй - носьбітам гэтай зброі - дае пэўныя гарантыі бясьпекі. З другога боку, нэгатыўнае стаўленьне да адзінай супэрдзяржавы - Злучаных Штатаў - разыходзіцца з тым, што адпавядае нацыянальным інтарэсам малой краіны. Так і на другім узроўні - эканамічным: з аднаго боку, «беларускі эканамічны цуд» канца 1990-х, замежная палітыка, скіраваная на забесьпячэньне буйной беларускай прамысловасьці рынкамі збыту, праводзілася ў нацыянальных інтарэсах. Іншае пытаньне, што такая палітыка не стварыла доўгатэрміновага падмурку для эканамічнага росту, «праміргала» магчымыя заходнія інвэстыцыі для мадэрнізацыі застарэлых прамысловых магутнасьцяў і завязала энэргетычную бясьпеку на адну крыніцу - што ня можа быць нацыянальнымі інтарэсамі Беларусі. На апошнім узроўні - нацыянальны прэстыж - вынікі больш зразумелыя, як мы казалі трохі вышэй. Нам патрэбная свая кампанія «Беларусь - палюбі зноў» - але ці палюбяць?

Гэтыя высновы маюць папярэдні характар і патрабуюць далейшага аналізу. Таму мы паспрабуем раскрыць як мага паўней мэтадалёгію аб'ектыўнага аналізу нацыянальных інтарэсаў.

Дасьледчык Франкель імкнецца даць як мага больш апэрацыйнае і колькаснае азначэньне паняцьця інтэрасу, дзеля вывучэньня эвалюцыі нацыянальных памкненьняў і выяўленьня ўплыву гэтых памкненьняў на рэальную палітыку. Ён прапануе дзяліць нацыянальныя інтарэсы на чатыры катэгорыі: асьпірацыйны, апэрацыйны, тлумачальны і палемічны[15]. Асьпірацыйную разнавіднасьць нацыянальнага інтэрасу можна вызначыць як пэўную візію дабрабыту, нейкі ідэал, які дзяржава хацела б рэалізаваць, калі б гэта было магчыма. Калі

[15] Joseph Frankel, *National Interest*

нацыянальныя інтарэсы артыкулююцца толькі на гэтым узроўні, гэта азначае, што цяпер іх ніхто не зьбіраецца рэалізаваць, але гэта ня значыць, што яны ня маюць ніякай вагі. Яны ўказваюць на агульны пажаданы кірунак развіцьця, калі раптам зьявяцца пэўныя спрыяльныя вонкавыя зьмены ці магчымасьці, ён можа стаць апэрацыйным[16]. Так, асьпірацыі Вугоршчыны далучыцца да ЭЗ на пачатку 1990-х гадоў ператварыліся ў «апэрацыйны» нацыянальны інтэрас пасьля прыняцьця фармальнай заявы аб уступе. У беларускім выпадку імкненьне Аляксандра Лукашэнкі аднавіць Савецкі Саюз таксама нельга адкідаць як бессэнсоўнае для палітычнага аналізу, бо яно адлюстроўвае пажаданы агульны кірунак разьвіцьця дзяржавы. Таксама і імкненьне дэмакратычных элітаў далучыць Беларусь да ЭЗ можа празь нейкі час ператварыцца ў апэрацыйны нацыянальны інтэрас. Такія нацыянальныя інтарэсы звычайна заснаваныя на ідэалёгіі, іх ня трэба пераводзіць у канкрэтную дзейнасьць, дастаткова пазначыць кірунак пажаданага разьвіцьця. Яны могуць быць супярэчлівымі і вызначацца бягучымі палітычнымі памкненьнямі.

Interest, London: Pall Mall Press, 1970, p. 31.

[16] Ibid, p. 31-32.

Пад апэрацыйнай разнавіднасьцю «нацыянальных інтарэсаў» маецца на ўвазе рэальная штодзённая палітыка. Такі інтэрас паўстае як сума абгрунтаваных неабходнасьцю ці патрэбамі кароткатэрміновых інтарэсаў, хутчэй эканамічнага характару, якія можна рэалізавацаць у агляднай будучыні. Ён заснаваны на рэальных магчымасьцях. На гэтым узроўні нацыянальныя інтарэсы пасьлядоўна артыкулююцца і рэалізуюцца ўрадам. Інтарэсы можна ўмоўна падзяліць на максымальную (ідэальную, якую можна рэалізаваць пры найлепшых абставінах) і мінімальную (неабходную для жыцьцядзейнасьці дзяржавы) праграмы[17]. Асобы, адказныя за рэалізацыю апэрацыйных інтарэсаў, фармулююць інтарэсы прагматычна і на аснове рэальнага досьведу. Гэтыя асобы могуць не зьвяртаць увагі на рэальныя магчымасьці краіны і кошт дасягненьня інтарэсаў. Прыкладам такога несупадзеньня можа служыць замежная палітыка Савецкага Саюзу, якая збольшага нагадвала заходнюю прагматычную палітыку, але ў той жа час характарызавалася ідэалістычным, часам бессэнсоўным умяшальніцтвам Палітбюро ў справы МЗС.

На тлумачальным і палемічным узроўні паняцьце нацыянальнага інтэрасу выкарыстоўваецца дзеля абгрунтаваньня, рацыяналізацыі ці крытыкі замежнай палітыкі апазыцыяй, пазаўладнымі групоўкамі інтарэсаў, міжнароднымі інстытутамі, іншымі краінамі.[17]

[17]Ibid, p. 34.

Паняцьце нацыянальнага інтэрасу таксама можна разглядаць у вонкавым і ўнутраным аспэктах. Напрыклад, можна пачуць, што забесьпячэньне краіны збожжам ці якаснае мэдычнае абслугоўваньне ўваходзяць у лік нацыянальных інтарэсаў. Тутака ўнутраны аспэкт нагадвае інтарэсы ў захаваньні бясьпекі. Вядома, нацыянальныя інтарэсы, што артыкулююцца дзеля спажываньня звонку і дзеля спажываньня ўнутры дзяржавы, аналітычна адрозьніваюцца. З аднаго боку, унутры краіны дзяржава зазвычай мае досыць сродкаў, каб забясьпечыць артыкуляцыю «нацыянальных інтарэсаў» для насельніцтва, у той час як за мяжой, асабліва калі дзяржава малая, яна абмежаваная ў гэтым аб'ектыўнымі фактарамі - адсутнасьцю сродкаў, каб штодня замаўляць пазытыўныя артыкулы ў «New York Times».

Урад адыгрывае дамінантную ролю ў фармуляваньні замежных інтарэсаў. Нацыянальныя інтарэсы, артыкуляваныя ўрадам, навязваюцца як агульнанацыянальныя інтарэсы. У той жа час урад, асабліва ў дэмакратычных краінах, ня мае манаполіі на палітычны дыскурс унутры краіны, і там магчыма грамадзкае абмеркаваньне рэальных нацыянальных (або дзяржаўных) інтарэсаў. Калі прыярытэты палітычнага і сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця краіны цяжка ці немагчыма вызначыць, паноўныя клясы, каб адвярнуць народ ад сапраўдных праблемаў унутры краіны, часта накіроўваюць увагу на штучна разьдзьмутыя крызысы нацыянальных інтарэсаў за мяжой. Прыкладам можа служыць палітычная кампанія ў Расеі ў сярэдзіне 1990-х, якая завастрала ўвагу на палітычным перасьледзе расейскамоўных у Прыбалтыцы, у той час як большасьць расейцаў у самой Расеі апынулася на мяжы галечы! Абарона расейскамоўных у Прыбалтыцы разглядалася як абарона нацыянальных інтарэсаў. Падставы для занепакоенасьці, безумоўна, існавалі, але маштаб расейскай кампаніі па абароне нацыянальных інтарэсаў не адпавядаў

маштабу праблемы.

Франкель падзяляе нацыянальныя інтарэсы на стратэгічны[18] (вайсковы), палітычны і эканамічны кампанэнты[18]. Першыя два ў асноўным супадаюць (абарона сувэрэнітэту і цэласнасьці краіны), а наконт апошняга трэба зазначыць, што эканоміка цяпер паўстае як усё больш і больш дамінантны кампанэнт нацыянальных інтарэсаў. У кожнай краіне таксама можна вылучыць «жыцьцёва неабходныя» інтарэсы - інтарэсы, за якія краіна можа пайсьці на надзвычайныя захады, нават пачаць вайну. З аднаго боку, жыцьцёва неабходныя інтарэсы таксама можна разглядаць як пэрманэнтныя інтарэсы - абарону сувэрэнітэту краіны і яе палітычнага ладу. Такія інтарэсы могуць таксама інтэрпрэтавацца даволі шырока, напрыклад, як ЗША інтэрпрэтавалі свае інтарэсы ў Віетнаме. Зь іншага боку, жыцьцёва неабходныя, «пэрманэнтныя» нацыянальныя інтарэсы могуць мяняцца. Так, зьмены жыцьцёвых поглядаў, каштоўнасьцяў у кіраўніцтва, ці ўва ўсёй нацыі, ці ў першага і ў другой могуць прывесьці да зьменаў жыцьцёва неабходных «пэрманэнтных» інтарэсаў. Ці могуць прывесьці трывіяльныя зьмены ў магчымасьцях і рэсурсах дзяржавы, поглядах кіраўніцтва да поўнага перагляду інтарэсаў? Паспрабуем выявіць месца нацыянальных інтарэсаў розных узроўняў, якія можна сустрэць унутры кожнай палітычнай сыстэмы.

Як ужо згадвалася напачатку, артыкуляваць інтэрас - азначае прэзэнтаваць пэўную патрэбу. Артыкуляваць нацыянальны інтэрас - значыць выявіць пэўную праблему ад імя нацыі, сапраўдную ці ўяўную. Інтарэсы могуць разглядацца як суб'ектыўныя шляхі вызначэньня аб'ектыўных патрэбаў. Кожны індывід мае асноўныя чалавечыя інтарэсы. Не пачынаючы дыскусіі наконт унівэрсальнасьці правоў чалавека[19], можна зазначыць, што на пэўным фундамэнтальным узроўні кожны чалавек аднолькава рэагуе на раздражняльнікі і ўзьніклыя найпрасьцейшыя праблемы. Такім чынам, вызначым агульначалавечыя інтарэсы і ўключым у іх агульны інтэрас чалавечай істоты супраць вайны, сьмерці, беднасьці і катаваньняў, агульныя правы чалавека на найпрасьцейшым узроўні. Інтарэсы дзяржавы, ураду і нацыі грунтуюцца на агульначалавечых інтарэсах. Інтарэсы дыктатарскіх рэжымаў могуць, аднак, разыходзіцца з

[18] Ibid, p. 34.

[19] Большасьць аналітыкаў пагаджаецца, немагчыма аб'ектыўна абгрунтаваць перавагу адной сыстэмы каштоўнасьцяў над іншай сыстэмай (так званая дыхатамія факту/каштоўнасьці). Гэта не павінна нас пераканаць, аднак, што расправа без суду ці катаваньні павінны быць нашай каштоўнасьцю.

[20] Падобная клясыфікацыя ўжываецца ў Alexei Voskressenski, *Russia and China: A Theory of Inter-State Relations*, London: RoutledgeCurzon, 2003, p. 63-65; Robert Johansen, *The National Interest and the Human Interest. An Analysis of U.S. Foreign Policy*, Princeton, NJ: Princeton University Press, 1980, p. 20-28; Patrick

Мусіна, Ганна і Шапіро, Ганна. *The Comparative Study of Foreign Policy*. Лондан: Sage Publications, 1973, с. 42. У адрозненне ад найраней тэорыі, якія даследавалі знешнюю палітыку асобных краін, неарэалізм разглядае сістэму ў цэлым як самастойны аб'ект, які ўплывае на паводзіны ўсіх яе ўдзельнікаў.

[2] Barry Buzan, Richard Little, *International Systems in World History: Remaking the Study of International Relations*, Oxford University Press, 2000, p. 11.

[3] Charles Lindblom, *Inquiry and Change*, Yale University Press, 1990, p. 23.

[4] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[5] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[6] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[7] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[8] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[9] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[10] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[11] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[12] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[13] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[14] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[15] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[16] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[17] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[18] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[19] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[20] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[21] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[22] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[23] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[24] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[25] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[26] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[27] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[28] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[29] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[30] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[31] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[32] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[33] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[34] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[35] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[36] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[37] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[38] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[39] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[40] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[41] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[42] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[43] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[44] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[45] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[46] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[47] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[48] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[49] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

[50] Ян Аксельрод, Чарльз Філіпс. *What Is at Stake in the Iraq War*. Нью-Йорк: Palgrave Macmillan, 2004, с. 12.

Як ужо ўзгадвалася вышэй, на міжнародным узроўні, у адрозьненьне ад унутранага ўзроўню, дзяржава выступае ад імя ўсяго грамадзтва, артыкулюючы «нацыянальныя інтарэсы». Гэта, аднак, не азначае, што дзяржава рэпрэзэнтуе інтарэсы ўсяго грамадзтва, бо выступаць ад імя і рэпрэзэнтаваць штосьці - гэта зусім розныя рэчы. У грамадзтве існуе шэраг групаў інтарэсаў - палітычных партыяў, клясаў, кланаў. У дэмакратычным грамадзтве ўладу трымае партыя (ці партыйная кааліцыя), якая набрала большасьць на дэмакратычных выбарах. Партыя можа прадстаўляць выбарцаў, якія за яе галасавалі, а можа прадстаўляць групоўкі інтарэсаў, якія яе прафінансавалі (як у ЗША). Нават у прадстаўнічай сыстэме няма аніякай гарантыі, што ўрад сфармуе партыя, якая сапраўды прадстаўляе большасьць насельніцтва[23], - хутчэй за ўсё, урад будзе рэпрэзэнтаваць меншасьць (большасьць тых, хто прыйшоў і прагаласаваў, але меншасьць ад агульнай колькасьці выбарцаў). Інтарэсы грамадзтва і дзяржавы могуць супадаць, а могуць і не супадаць ці супадаць толькі часткова. Здаецца ўсё ж, што самая галоўная каштоўнасьць дэмакратыі, нават карумпаванай, - тое, што пры ёй існуе магчымасьць зьмяніць некампэтэнтны ўрад.

У дэмакратычным грамадзтве адрозьненьне паміж дзяржаўнымі і грамадзкімі інтарэсамі невялікае ці ўвогуле не існуе - дзяржава прадстаўляе інтарэсы ўсяго грамадзтва[24]. У таталітарным грамадзтве адрозьненьне, наадварот, вялікае. Пры аўтарытарызьме адрозьненьне вагаецца паміж двума полюсамі[25]. Інтарэсы могуць супадаць з інтарэсамі мацнейшых бізнэс-груповак, арміі, нацыянальнай царквы, землеўладальнікаў (пэўная частка грамадзтва), як у Гішпаніі Франка, а могуць набліжацца да таталітарызму. Як піша Аляксей Васкрасенскі, у такіх варунках немагчыма замерыць адрозьненьне паміж дзяржаўнымі і грамадзкімі інтарэсамі, але можна знайсьці пэўную карэляцыю паміж імі.

Такім чынам, адрозьненьне паміж дзяржаўнымі і грамадзкімі інтарэсамі ёсьць ня што іншае, як пэўнае адрозьненьне ў тэрміналёгіі (чым бліжэйшыя дзяржаўныя інтарэсы да грамадзкіх, тым лепш), а ўрадавыя інтарэсы вузейшыя за дзяржаўныя паводле азначэньня. Сэктар, які спалучае

грамадзкія і дзяржаўныя інтарэсы ў ідэальнай ці абстрактнай сытуацыі, завецца «нацыянальнымі інтарэсамі». Трэба дадаць, што інтарэсы могуць вагацца нават у дэмакратычных дзяржавах.

Так, інтарэсы сёньняшняга брытанскага ўраду Тоні Блэра, які пачаў вайну з Іракам, нягледзячы на амаль поўную адсутнасьць грамадзкай падтрымкі, яўна не супалі з інтарэсамі грамадзтва. Відавочна, Блэр так і ня здолеў адкалібраваць урадавыя інтарэсы ў адпаведнасьці з грамадзкімі ці «пераканаць-адкалібраваць» грамадзкую думку і наблізіць яе да сваёй.

На схеме можна было б пазначыць сфэру ўрадавых інтарэсаў, якая вагаецца па-за межамі грамадзкіх інтарэсаў. Калі дзяржава аўтарытарная, грамадзкія інтарэсы зьяўляюцца толькі адной - можа, нават найменшай - часткай дзяржаўных ці ўрадавых інтарэсаў. «Нацыянальныя інтарэсы» ў гэткім выпадку выкарыстоўваюцца для захаваньня status quo, палітычнай і эканамічнай улады ў руках эліты. Гэтыя інтарэсы могуць афарбоўвацца як дзяржаўныя інтарэсы (і могуць быць імі, калі дзяржаўныя інтарэсы і ўрадавыя інтарэсы супадаюць, асабліва калі інстытуты дзяржавы штучна створаныя ўрадам) ці як «нацыянальныя інтарэсы», але яны ёсьць толькі інтарэсамі кіраўнічай эліты - урадавымі інтарэсамі. Ува ўмовах несфармаванай нацыі нацыянальныя інтарэсы могуць увогуле не існаваць.

Як згадвалася вышэй, палітычная сыстэма імкнецца да стабільнасьці - раўнавагі вонкавых, аб'ектыўных унутраных ды суб'ектыўных унутраных фактараў. Сыстэма не знаходзіцца ў ізаляцыі, і структурныя зьмены сусьветнай сыстэмы ўзьдзейнічаюць на ўнутранае становішча сыстэмы. Унутраныя фактары маюць тэндэнцыю да пэўнай дынамікі і зьменаў, што таксама патрабуе зьменаў у раўнавазе сыстэмы. Так і ўнутраная сыстэма Беларусі не знаходзіцца ў ізаляцыі ды зазнае ўзьдзеяньне шэрагу фактараў. Напрыклад, сусьветныя зьмены пасьля 11 верасьня 2001 году можна апісаць так. «Шок», спрычынены звонку на ўнутраную сыстэму ЗША, прывёў да шэрагу зьменаў сярод аб'ектыўных (больш увагі бясьпецы) і суб'ектыўных фактараў (зьмены ў зьмесьце і кірунках

«нацыянальных інтарэсаў», вайна супраць тэрарызму). У выніку зьменаў, выкліканых «новымі» нацыянальнымі інтарэсамі, унутраная сыстэма Расеі, у ліку сыстэмаў іншых краінаў, імгненна адрэагавала ў 2001 годзе, кардынальна зьмяніўшы «нацыянальныя інтарэсы». Узьдзеяньне звонку на ўнутраную сыстэму Беларусі прыйшло як наўпрост з ЗША (увага да міжнароднага гандлю ўзбраеньнямі), так і апасродкавана, але больш істотна - праз Расею ў 2002 годзе (расейцы сталі больш прагматычна адстойваць свае нацыянальныя інтарэсы ў Беларусі). Дзеля нягнуткай сыстэмы камунікацыі паміж дзяржавай і грамадзтвам, нізкага дынамізму палітычнай сыстэмы, завязанай на аднаго чалавека, палітычная сыстэма Беларусі пачала рэагаваць на вонкавыя зьмены з спазьненьнем ажно ў два гады.

Калі грамадзкія інтарэсы зьмяняюцца пад узьдзеяньнем унутранай эвалюцыі ці вонкавых фактараў, сыстэма, каб ня страціць сваёй стабільнасьці, можа рэагаваць на зьмены двума спосабамі - або адкалібраваць дзяржаўныя і ўрадавыя інтарэсы ў кірунку грамадзкіх інтарэсаў, іншымі словамі, шляхам лібэралізацыі (калі грамадзтва імкнецца да лібэралізацыі), або перагледзець мэтады маніпуляцыі грамадзкай думкай, прапаганды і перацягнуць «высьлізгаючыя» грамадзкія інтарэсы бліжэй да дзяржаўных інтарэсаў. Сыстэма ня можа застацца такой, якой яна была, або ў адваротным выпадку яна можа страціць стабільнасьць, паколькі грамадзкія інтарэсы пад уплывам зьменаў аб'ектыўных унутраных фактараў і зьменаў звонку будуць працягваць рухацца ў адваротным ад дзяржаўных інтарэсаў кірунку і могуць дэлегітымізаваць дзяржаўныя інтарэсы, а ў будучыні артыкуляваць нацыянальныя інтарэсы. Нядзіва, што ў Беларусі абраная апошняя стратэгія, грамадзтва павінна адкалібраваць свае інтарэсы і наблізіць іх да ўрадавых інтарэсаў. Дзеля гэтага патрэбна ідэалёгія. Спроба зразумелая, у найбліжэйшай будучыні, магчыма, пасьпяховая, але ў доўгатэрміновай пэрспэктыве відавочна няўдалая. Нягледзячы на ўвесь беларускі «калектывізм», грамадзтва ўсё ж апанаванае ўтылітарнымі, спажывецкімі каштоўнасьцямі і ў ім грошы маюць нават большае значэньне, чым на «спажывецкім» Захадзе. Пабудаваць пасьлядоўную ідэалёгію, якая

сьцьвярджае, што матэрыяльныя каштоўнасьці другасныя, і ў той жа час заклікае да прыватнай ініцыятывы, нерэальна. Адзінае, да чаго ўсё гэта можа прывесьці, - да агульнага цынізму і прытворства, як у часы застою.

5

Такім чынам, ані «суб'ектыўныя,» ані «аб'ектыўныя» тэорыі не даюць дакладнага адказу на пытаньне, ці існуюць у Беларусі нацыянальныя інтарэсы і дзе яны. У «сталых» дзяржавах таксама можа існаваць шэраг супрацьлеглых поглядаў на нацыянальныя інтарэсы. Аднак на базысным узроўні існуе кансэнсус наконт аксіяматычных паняцьцяў сувэрэнітэту, бясьпекі, асноўных эканамічных кірункаў, нацыянальнага прэстыжу. Ува ўмовах несфармаванай нацыі немагчыма разважаць пра сфармаваныя грамадзкія інтарэсы. Розным сацыяльным групам, партыям, асяродзьдзям уласьцівыя ўзаемна супрацьлеглыя погляды на разьвіцьцё нацыянальнай дзяржавы, у тым ліку такія, якія адмаўляюць існаваньне нацыянальнай дзяржавы наагул. Калі не існуе адзінства ўнутранай нацыянальнай ідэнтычнасьці, не існуе і супольных грамадзкіх інтарэсаў. Той факт, што ўсе гульцы грунтуюцца на агульначалавечых інтарэсах (як мы спадзяёмся), мала што дае. Да сёньня цяжка гаварыць і пра сапраўдныя дзяржаўныя інтарэсы: шматлікія дзяржаўныя інстытуты, з кадрамі даўно не існай дзяржавы, былі ня ў стане дый не хацелі артыкуляваць інтарэсы новай беларускай дзяржавы. Інтарэсы беларускага кіраўніцтва скіраваныя на кароткатэрміновую эканамічную і палітычную выгаду, адлюстроўваюць супярэчлівыя погляды некаторых сацыяльных групаў і таксама ня могуць лічыцца нацыянальнымі. Можа, яны і сапраўды адлюстроўваюць сапраўдныя погляды грамадзтва, але пры адсутнасьці грамадзкага дыялёгу проста немагчыма даведацца, нацыянальныя яны ці не. Больш за тое, можна сьцьвярджаць, што да нядаўняга часу «нацыянальныя інтарэсы», артыкуляваныя беларускім кіраўніцтвам, былі ня чым іншым, як функцыяй нацыянальных інтарэсаў Расеі, якія вагаліся разам зь зьменамі ў ёй. Цяпер, здаецца, сытуацыя трохі зьмянілася. Але ні пра якія доўгатэрміновыя нацыянальныя інтарэсы гаворка не ідзе.

На цяперашні момант немагчыма вызначыць нацыянальныя інтарэсы Беларусі. Як было абазначана раней, для папярэдняга аналізу можна ўжываць «звычайна зразумелыя» нацыянальныя інтарэсы на трох узроўнях - бясьпека і сувэрэнітэт, эканамічны дабрабыт і нацыянальны прэстыж. Вылучыць нацыянальныя інтарэсы можна тады, калі ў грамадзтве існуе кансэнсус наконт асноўных каштоўнасьцяў і фундамэнтальных кірункаў разьвіцьця, нацыянальная згода і падтрымка палітычнай сыстэмы, а таксама стабільнае вонкавае асяродзьдзе. Нічога гэтага ў Беларусі цяпер няма.
Дэвід Клінтан уважае, што існуе аб'ектыўны нацыянальны інтэрас, унікальны для пэўнага грамадзтва. Будучы сталым і негістарычным ды залежачы ад асноватворных прынцыпаў грамадзтва26, ён адрозьнівае грамадзтва як нацыянальную супольнасьць, і таму можа быць незразумелы для грамадзтва іншага тыпу. Згодна з Клінтанам, дзяржаўныя інтарэсы выцясьняюць сапраўдныя нацыянальныя інтарэсы і замест іх ставяць кароткатэрміновыя мэты - гандлёвыя пагадненьні, геапалітычныя выгады, гандаль зброяй і г. д. Калі прытрымлівацца лёгікі Клінтана, то сфармуляваць аб'ектыўныя нацыянальныя інтарэсы такі можна. Але такія нацыянальныя інтарэсы ў беларускім выпадку будуць сфармуляваныя «сьвядомай» меншасьцю насельніцтва, магчыма, 10 адсоткамі, якія ня маюць ані вагароў узьдзеяньня на дзяржаўныя інтарэсы, ані падтрымкі большасьці насельніцтва. Ці ж тады можна назваць іх сапраўды нацыянальнымі інтарэсамі?

Ня трэба разглядаць ані нацыянальную і дзяржаўную ідэнтычнасьці, ані дзяржаўныя і нацыянальныя інтарэсы як нешта сталае, якія, аднойчы сфармаваныя (ці несфармаваныя), будуць бясконца рэпрадукаваць сябе. Дзяржаўныя ідэнтычнасьці і, разам з тым, нацыянальныя інтарэсы маюць тэндэнцыю зьмяняцца падчас бясконцага ўзаемадзеяньня паміж грамадзкімі групоўкамі, клясамі, палітычнымі партыямі, урадам. Азначэньні нацыянальных інтарэсаў, як і іх вонкавы ды ўнутраны кантэкст, увесь час мяняюцца. Беларуская нацыя яшчэ фармуецца, і якой яна паўстане ў будучыні, яшчэ ня ведаюць ані беларускамоўныя, ані расейскамоўныя беларусы, ані тыя, сярод апошніх, хто ня верыць у існаваньне асобнай беларускай нацыі. Гандаль, турызм, міграцыя, культурныя і

адукацыйныя абмены, усе новыя формы камунікацыі непасрэдна ўзьдзейнічаюць на нацыянальную дзяржаву. Магчыма, нашы нацыянальныя інтарэсы неўзабаве акрэсьляцца. Пакуль што можна дакладней вызначыць інтарэсы, якія не зьяўляюцца нацыянальнымі інтарэсамі Беларусі.

Небясьпечная залежнасьць Беларусі ад расейскіх энэрганосьбітаў, канфліктныя адносіны з адзінай на сёньняшні дзень супэрдзяржавай, сталы нэгатыўны імідж у Эўропе не зьяўляюцца нацыянальнымі інтарэсамі Беларусі. Патэрналізм, ані ўнутраны, ані вонкавы, ня ёсьць у нацыянальных інтарэсах Беларусі. Гэта дарога ў Трэці Сьвет. Чым раней Беларусь гэта зразумее, тым лепей.
[image]
[image]

№ 1 (30) - 2004

Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ

Даніла Жукоўскі
У лабірынце з постмадэрністам

публіцыст, крытык літаратуры, сталы аўтар «ARCHE». У мінулым нумары часопісу апублікаваў эсэ «Ідзі і глядзі». Робіць на гарадзенскай руце.

...Утварыўся лябірынт тэкстаў са шматлікімі галерэямі й сьцежкамі, па якіх блукаюць самотныя аўтары й ня могуць выйсьці да чытача, бо чытач блукае па сваіх сьцежках. Інфармацыйна-тэкставы лябірынт - гэта й ёсьць на сёньня нашае культурніцкае поле.

Пятро Васючэнка

Я цалкам згодзен з братам, але хацеў бы перавесці нашу спрэчку крыху... убок.

Уладзімір Караткевіч.
«Хрыстос прызямліўся ў Гародні»

ТЭЗЕЙ

Пачалося з непаразумення. Мой заклік да творцаў не хаваць за словам «постмадэрнізм» уласных недапрацовак[1] палічылі задачай літаратуразнаўства постмадэрнізм. Ніхто // ARCHE. 2003. № 4. і турбуе іншае: змаганне грамадскіх дзеячоў за эмансіпацыю ад беларускай аўдыторыі. Злоўжыванне ПМ - малы эпізод, зручная ілюстрацыя. Але для Сяргея Балахонава чыстае і светлае імя беларускага постмадэрнізму ёсць справай гонару,[2] і Балахонаў з кроплі сляпога постмадэрнізму // ARCHE. 2002. № 1. ідзе ў бой. Сяргей Балахонаў - асоба, якая ў нашым літаратуразнаўстве ўжо стварыла ім'я, і малюнку выклікалі пытанні што да абраных ім крытэраў постмадэрнасці, якія самі па сабе ёсць ці не найлепшым прыкладам ПМ-мыслення, якое адмаўляе іерархіі ды ўніверсальную, адзіную для ўсіх ісціну.

Грунтуючыся ў тым ліку на гэтым тэксце, Аляксей Бацюкоў трапна вызначыў сітуацыю з літаратурным авангардам:

*Шаноўныя людзі напісалі прыгожыя, нават захапляльныя кнігі ды артыкулы пра сучасны беларускі авангард і пры гэтым самі стварылі ці ня самыя яркія авангардныя творы. Асабіста я не знаходзіў у літаратараў і ў творах, дасьледаваных імі, тых глыбокіх сэнсаў і тых повязяў з самымі сучаснымі сусьветнымі плынямі, якія былі раскрытыя і паказаныя спадарамі В. Акудовічам і Ю. Барысевічам. Падыход, выяўлены спадарамі С. Балахонавым і В. Акудовічам... навязвае нейкі стэрэатып. Постмадэрн выступае як нешта акрэсьленае і моднае, усім зразумелае і што ўжо тым-гэтым выкарыстоўваецца напоўніцу альбо часткова, у той час як застаецца адкрытым пытаньне, па якім крытэры да ліку постмадэрновых можна **не** далучаць пэўных тэкстаў*[3].

Даволі пікантная сітуацыя (сапраўдны зрух літаратуры ўбок; але не штурханне, хутчэй дрэйф) - **пра** мастацкія тэксты чытаць нашмат цікавей, чым самі тэксты: больш выразнасці, інтрыгі, фантазіі. Чарговы выступ сп. Балахонава[4] не развеяў уражання: баронячы ПМ ужо ад сп. Бацюкова, ён падаў азначэнне постмадэрнізму й крытэры далучэння тэксту да ПМ-сям'і, чаго не ставала першаму артыкулу, і вычарпальна праілюстраваў іх цытатамі, вызваліўшы чытачоў ад неабходнасці звяртацца «да першакрыніцаў».

Азначэнне тыповае, крытэры звычайныя. Найбольшыя засцярогі

[1] Данілаў Жыбуй. Пастмадэрнізм і постмадэрнізм // ARCHE. 2002. № 1.

[2] Сяргей Балахонаў. Архіпэляг «постмадэрн» // ARCHE. 2002. № 1.

[3] Аляксей Бацюкоў. Штурханьне ўбок // ARCHE. 2003. № 1.

[4] Сяргей Балахонаў. Архіпэляг «постмадэрн», альбо Аналізу халодная сляза // ARCHE. 2003. № 3.

выклікае «парадыйны спосаб апавяданьня, валадараньне адметнага кшталту іроніі», кшталт якой варта было б удакладніць, бо лёгкасць, з якой аўтар знаходзіць патрэбныя рысы і выдае твору ПМ-сертыфікат, спакушае агаласіць шэдэўрамі постмадэрну па-балахонаўску «Чжуан-цзы» або «Гільгамеша».

Інтэлектуальны энтузіязм, нават данкіхоцкага тыпу, выклікае павагу. Але хацелася б, высветліўшы канчаткова параўнальна простае пытанне пакрыўджанага постмадэрнізму, прапанаваць высілкам калегаў больш адпаведнае рэчышча.

МІНАТАЎР

Нараканні на нечытэльнасць ды жанравую беднасць трапляюць на старонкі часопісаў адчувальна радзей, чым клопат пра постмадэрнізм. Прасцей не чытаць беларускага, балазе іншага хапае, тым больш што нешматлікія публікацыі літаратурная грамада сустракае бетонным мурам маўчання. Галасы клічуць у пустыні:

Сказ з трох словаў: «Беларуская літаратура - нудоціна». Я, вядома, не пагаджаўся, прыводзіў прыклады Караткевіча, Маўра і... Вось на гэтым «і» я і спыняўся, бо больш ня мог згадаць... І вось з майго двухгадовага дасьледаваньня паўстала зусім непрыгожая карціна: сучасная масавая беларуская літаратура адсутнічае[5].

Ня маем мы ня толькі фантастыкі, дэтэктываў, прыстойных гістарычных твораў, мы ня маем звычайнай добрай сучаснай літаратуры, дзе б аўтары з застарэлым дысыдэнцтвам не настальгавалі па савецкім часам (С. Астравец, І. Сідарук, В. Мудроў), не капіявалі шэранькіх заходніх твораў у расейскім перакладзе (Ю. Станкевіч), не гублялі галавы на прыдуманай уласнай «геніяльнасьці» (Адам Глёбус), не імкнуліся моўным ды тэматычным эпатажам прыхаваць адсутнасьць двух найважнейшых складнікаў сапраўднай літаратуры - мець, што сказаць, і ўмець гэта сказаць (Ільля Сін, З. Вішнёў)... Ці ня ў гэтым уся справа - у халтуры пісьменьнікаў, непрафэсійнасьці... няздольнасьці пісаць цікава, у перакананасьці, што чытач праглыне любое, як-бы й пра што-б яму ні пісалі, бо тое - па-

[5] Раман Кардонскі // Беларус. 2003, чэрвень.

беларуску?[6]

Ніякае дыскусіі не завязваецца. Ніхто нават не пакрыўдуецца. Нідзе публічна. На інтэрнэт-форумах на litara.net і knihi.com здараюцца абмены думкамі паміж бакамі: ультралібералы супраць секціўны этыкет, карнавальнае стракаценне мянушкамі супраць разняволеная форма выказванняў іншым разам спрыяе шчырасці, нашмат часцей (і звычайна з ініцыятывы прадстаўнікоў літаратурнай супольнасці) - пустому балбатанню і дэзарыентацыі. Фактычна накінуты літаратарамі і іх паплечнікамі стыль аргументацыі выключае сур'ёзнае стаўленне да таго, што гаворыцца на форумах. Самае ж галоўнае: *збліжэння не назіраецца*. Мінатаўр беларускага лабірынту завецца Самота.

НЯЎЛОЎНЫ

Тое, што *«асаблівасьць постмадэрновага тэксту - гэта спалучэньне арыентаванасьці на масавага спажыўца на першым узроўні … з складанымі сымбалямі і «кодамі» на другім узроўні тэксту, дабрацца да якога чытач можа толькі праз пэўныя намаганьні»* адзначаў, з спасылкаю на працы В. Акудовіча, Аляксей Бацюкоў[7].

З ягонай наступнай высновай, што ў творах, якія ў беларускай шырака абвяшчаюцца постмадэрнымі, бракуе якразьвіцьцёвага «простага» ўзроўню, нагэтулькі цяжка не пагадзіцца. Шматслойнасць апанент абмежаваўся менш дакладнай фармулёўкай: *«Шматслойнасьць закліканая даць праўду кожнаму чытачу згодна з роўнем яго падрыхтаванасьці, адукаванасьці, абазнанасьці, эрудыцыі»* [8].

Асцярожнасць беларускіх прыхільнікаў ПМ у абыходжанні з сапраўднымі словам «шараговы» красамоўная. Ці ўваходзіць у «кола» такіх чытач, які хоча пачытаць вечарам цікавую й захапляльную кнігу? Прыкладаў такога падыходу ў беларускай літаратуры няма. У сусветнай магу без затрымкі згадаць «Імя ружы».

Постмадэрнісцкіх тэкстаў у поўным сэнсе гэтага слова ў нас няма. Ёсць толькі Валянцін Акудовіч, які імкнецца сцвердзіць адваротнае, ды Сяргей Балахонаў, пяру якога належыць ці не адзіны вынятак - серыя мініяцюр на чале з «Аднарогамі Беларусі». Калі б «Клакоцкі...» не выклікаў нераможнага

6 Ніудуев Баляшэвіч // Беларусы 2003, лістапад.

7 Бацюкоў Штохаяньне… Архіў

8 Сяргей Балахонаў. Архіў

жадання заснуць, калі б Караткевіч напісаў «Хрыста…» на дваццаць год пазней… Каб мець шансы злавіць беларускага аднарога, трэба рызыкнуць і сказаць колькі словаў наконт тэхнічнага боку.

ПОСТМАДЭРНІСЦКІ МЛЫН

Галоўная, на мой погляд, памылка абаронцаў постмадэрнісцкага млыну ў тым, што яны блытаюць прыём і метад. Постмадэрнісцкі арсенал у беларускай літаратуры карыстаецца вялікім попытам, спробаў стварыць паслядоўна постмадэрнісцкі тэкст - нашмат менеў, не кажучы ўжо пра поспех.

Менш за ўсё чакаеш сустрэць постмадэрнісцкі «часова-прасторавы кактэйль» у творах на гістарычныя тэмы. Аднак што ў аповесці Андрэя Федарэнкі «Нічые» («Полымя» № 3, 2001, тэма - Слуцкае паўстанне), што ў рамане Алеся Наварыча «Літоўскі воўк» («Маладосць» №№ 4-6, 2003, тэма - паўстанне 1863 году) знарочыстыя анахранізмы, нечаканыя перамяшчэнні нашага сучасніка ў герояў, якія набываюць выгляд маскі, што гаворыць чужым голасам, з'яўляюцца важкім сродкам выказвання аўтарскае пазіцыі.
Ірына Шаўлякова[9] прыводзіць нямала забаўных прыкладаў з «Нічыіх»: *«Вельмі хутка* тэнісіст узмахнуў ракеткаю, *нібы палякі, прыкаціліся чырвоныя»* . У «Літоўскім ваўку» гістарычна гарманічна з неадназначным (у вузка звышсучасным кантэксце) стаўленнем аўтара да сваіх герояў - удзельнікаў «інсургенцкіх» ягонай выразнай арыентацыяй на расійскую гістарычную паўстання гучыць фраза пра кітайскую пагрозу Еўропе, укладзеная ў вусны расійскага чыноўніка.

[9] Іра Шаўлякова. Пісьмы з Чэчні. // Дзеці Арбата, 2003, № 3.

Абсалютна немагчымая для еўрапейца ў сярэдзіне XIX стагоддзя філіпіка падаецца нялішняй. Наварыч-грамадзянін звяртаецца да сучаснікаў. У гэтай фразе, паміж іншага, можна заўважыць *адметнага кшталту іронію* (sic!), звернутую да чытача: маўляў, што вы сабе галаву забіваеце нейкім паўстаннем напаўзабытым, калі тут вунь якая пагроза навальваецца.

Наўрад ці нават Сяргей Балахонаў рызыкне залічыць

вышэйзгаданыя тэксты да набыткаў беларускага постмадэрну. Проста прыёмы зрабіліся агульнаўжывальнымі, і ў адзінкавым, несістэматычным ужыванні не з'яўляюцца маркерам ПМ. Гэта мова эпохі, да складання яе спрычыніліся што Эйнштэйнава тэорыя адноснасці і квантавая механіка, што мультыкультуралізм ды тэалогія пасля Асвенціму.

Гэтая мова гучыць у «Юрлівых санетах» Юрася Пацюпы, апавяданнях Уладзімера Някляева і ў шмат якіх іншых творах. Сапраўдная постмадэрнісцкая гульня з сэнсамі, кодамі, стэрэатыпамі, пазбаўленымі звыклага іерархічнага кантэксту, якая, на думку ПМ-тэарэтыкаў, павінна выпрадукаваць твор, цікавы *ўсім*, але кожнаму па-свойму, складанейшая за знакамітую Glasperlenspiel. У Беларусі, як і паўсюль, аматараў на гэткія высілкі няшмат.

Жаданне палічыць прыём за метад цалкам зразумелае: паставіўшы мэту зацікавіць і шараговага спажыўца, беларускія постмадэрністы рызыкуюць зрабіцца нават большымі рэвалюцыянерамі, чым меркавалі быць.

ЗАБЫТЫ ХОД

Браць у разлік спажыўца - цымус усяго постмадэрнісцкага. Спажывец - саўдзельнік стварэння сімвалаў, кодаў і стэрэатыпаў, без яго цытаты і алюзіі губляюць водар і сэнс, а гульня з імі нагадвае беганіну з мячом па стадыёне самотнага малога, які кампенсуе адсутнасць іншых гульцоў усёмагутнай дзіцячай фантазіяй.

Прыгожая мара Пятра Васючэнкі, быццам *«інфармацыйны тэкставы лабірынт - гэта й ёсьць на сёньня нашае культурніцкае поле»* , застаецца адно мараю, ці самаашуканствам, пакуль *«блукаюць самотныя аўтары й ня могуць выйсьці да чытача, бо чытач блукае па сваіх сьцежках»* [10]. Яны для чытача ніякія не аўтары, а ён для іх ніякі не чытач. У лабірынце, паводле азначэння, розныя калідоры павінны злучацца паміж сабою, хай сабе заблытаным і складаным сасабам. Інакш ён не можа быць асобна - для аўтараў, асобна - для чытачоў.

Адштурхоўваючыся ад творчасці Ігара Бабкова, я прапанаваў бы пісьменніку заснуць. Заснуць і бачыць сны пра тое, што ён -

10. Ніна Мусіц Размова з чытачом // Дзеяслоў. 2000. № 8.

чытач. Калі ён будзе спаць усёй адданасцю, у нейкі момант мастак слова не зможа не спытаць сябе: «Хто я - пісьменнік, які сніць, што ён чытач, ці чытач, які прысніў, што ён - пісьменнік?»

Калі пачаць пісаць, не прачынаючыся (а гэта, мяркуючы па некаторых тэкстах, не створыць цяжкасцяў для майстроў пяра), ёсць неблагія шансы задаволіць вынікам і чытача, і пісьменніка. А калі чытач і пісьменнік раптам зазірнуць у адзін тэкст, тады й паўстане нарэшце культурніцкае поле. Без іхняга судакранання нічога *культурніцкага* не выйдзе.

Утвораць сілавыя лініі таго поля прымроены Пятром Васючэнкам лабірынт ці прымроены Паўлам Абрамовічам менскі філіял Александрыйскай бібліятэкі імя Хорхе Борхеса - пакуль невядома. Вядома іншае - на сёння гэты «лабірынт» больш за ўсё на свеце нагадвае вялікі цёмны пакой, у якім самотны Сяргей Балахонаў добрасумленна спрабуе адшукаць чорную котку, якая перабегла дарогу беларускаму постмадэрнізму. Але зламысніцы-коткі там?..

Свае, пра сваё, для сваіх

Нам непатрэбныя гаспадары над намі, якія будуць дыктаваць, што і як рабіць - што друкаваць, што пісаць, як пісаць і пра каго пісаць. Мы хочам быць самастойнымі, і мы будзем такімі!

З прадмовы да № 1 «Дзеяслова»

Стварэнне «Дзеяслова» было пададзенае як нараджэнне прынцыпова новага - незалежнага ад дзяржавы літаратурнага часопісу, узніклага ў полымі пісьменніцкага паўстання супраць дзяржаўнага адміністравання літаратурнымі выданнямі. Апошняе, хутчэй за ўсё, праўда. Малая частка праўды, каб

схаваць больш істотнае.

Зацікаўленыя чытачы чакалі новага выдання. Ім падавалася, што калі дзяржава засталася ўбаку ад новага стварэння, яны будуць яму калі не сапраўднымі, то хаця б хроснымі бацькамі. Таму, калі СМІ, выканаўшы ролю анёлаў і каляднае зоркі, гучна паведамілі пра з'яўленне часопісу, чытачы ўдзячна пацягнуліся на творчыя сустрэчы, да незалежных распаўсюднікаў ці ў «Кнігарню пісьменніка» на вул. Казлова. Бо *новае слова* нарадзілася. Імя яму - «Дзеяслоў». (Біблейскія алюзіі выкліканыя ўступным словам рэдактара, дзе згадваюцца - з вялікай літары - Слова і Дзея.)

Нумары новага выдання даюць падставу для абагульненняў: *адбылося кланаванне*. Параўноўваючы продка і нашчадка, не бачыш у новапаўсталым выданні прыніжальнага палітычнага лізаблюдства, спробаў угадаць наступны капрыз улады й загадзя паддобрыцца. У іншым - надзвычайнае падабенства з прататыпам. У тым ліку й спосаб узаемаадносінаў з чытачамі - натужлівая самаўпэўненасць, псеўдаакадэмічная самадастатковасць - застаўся палымянскім. Ці амаль такім.

Вызваліўшыся з-пад кіраўнічай рукі дзяржавы, часопіс захаваў настаўленне на «традыцыйную беларускую прозу і паэзію», то бок на стараннае рэпрадукаванне літаратурнае традыцыі, закладзенай у апошнія савецкія дзесяцігоддзі. Рэпрадукаванне, у якім самае пільнае вока не заўважыць рэакцыі на змены ў навакольным асяроддзі.

Нібы ў спыненым часе: настальгічныя, безнадзейна песімістычныя, прасталінейныя, без выкрутасаў і хітрыкаў тэксты, аднастайнасць добра знаёмых тэмаў, алергія на будзь-якую навацыю і экзотыку. Традыцыйна змрочная аповесць Юр'я Станкевіча перадае эстафету жыўцом узятай з кніжак анатоміі зайздрасці пяра Андрэя Федарэнкі («Чарнавікі і пісьмы»), якая робіць гонар ягонай начытанасці і віртуознаму валоданню словам, але не ўважлівасці да рэчаіснасці ці вынаходлівасці ў пабудове сюжэту. За сатырай Уладзіміра Някляева, які з невясёлай, крыху натужлівай усмешкай кляймуе беларускую бесхрыбетнасць, нехлямяжасць і, выбачайце, «саўковасць», ідзе апавяданне Анатоля Крэйдзіча з бездакорна бязрадаснай

назвай (і гэткім жа сюжэтам) - «За небакраем нічога няма».

Хай піша Людміла Рублеўская пра выбух тэматычнай разнастайнасці ў беларускай літаратуры, у самім «Дзеяслове» не знойдзем ніводнага мастацкага твору, пра які можна было б сказаць: «Во! Гэта нешта новае». Ці хаця б *прызабытае* старое. Нешматлікія постсавецкія рэаліі ў тэкстах толькі падкрэсліваюць, што погляд на жыццё застаўся, за невялікімі пакуль выняткамі, ранейшым, прыгнечана-зайздросным поглядам зацкаванага жыццём інтэлігента.

Чыстая крытыка ў часопісе прадстаўленая Людмілай Рублеўскай ды Ірынай Шаўляковай. Мусіць, маладосць надае апошняй смеласці час ад часу выходзіць па-за межы палымянскай закасцянеласці. Ейныя артыкулы - жывая, эмацыйная, свежая частка «Дзеяслова». Пры тым, што крытыка ніяк нельга залічыць да тых, хто раздае адно пахвалы. Каб гэтак пісаць, трэба верыць у будучыню беларускай літаратуры.

Тэксты Рублеўскай насцярожваюць кан'юнктурнай павярхоўнасцю, імкненнем сказаць тое, што трэба (чаго вартае хаця б вышэйзгаданае сцверджанне, што *«тэматычную прастору беларускай літаратуры можна параўнаць з пашырэннем Сусвету пасля выбуху Звышновай. Пішуць пра ўсё»* ; № 1, с. 208), але выклікаюць увагу аб'ёмам разгледжанага матэрыялу і шчыльнасцю выкладання думкі.

Чытаюцца (і глядзяцца - дзякуючы добрым ілюстрацыям) артыкулы, прысвечаныя выяўленчаму мастацтву. Але не яны і не паэзія вызначаюць твар часопісу, а трыяда проза-крытыка-публіцыстыка - з дадаткам буйных паэтычных твораў кшталту паэмы У. Някляева. А гэтая трыяда пераконвае ў тым, што маем справу не з выпадковасцю, бо часопіс выглядае вельмі прафесійна, а з пэўным падыходам.

Часопіс - маніфестацыя дыялогу. Пісьменніка і ўлады. Пісьменніка й грамадзянскай супольнасці. Пісьменніка й пісьменніка. Гэты факт магла ігнараваць улада, але на яго ніколі не забывалася па сваёй волі ніводная нармальная рэдакцыя. Тут жа адчуваецца свядома ўсталяваная накіраванасць выключна ўнутр, а не вонкі. Чытача не

прыцягваюць і не адпужваюць. Яго не заўважаюць. Гледзячы на мізэрны аб'ём крытыкі, адсутнасць хаця нейкае палемічнасці, немагчыма пазбавіцца адчування, што завітаў няпрошаным у чужы дом, дзе людзі цешацца адно з аднаго ў сямейным коле і дзе няма месца старонняму чалавеку. Свае, пра сваё, для сваіх. І гэта гняце і цісне.

Што ўсё тут «для асабістых патрэбаў», нагадваюць і недаведзеныя да акрэсленай жанравай формы мастацкія ды публіцыстычныя тэксты: дарожныя нататкі, замалёўкі, зацемкі, абразкі, выпіскі і г. д., не заўсёды абточаныя разважанні Леаніда Галубовіча, фрагменты радзіннага эпасу Адама Глобуса ды іншае да таго падобнае, што можа быць дарэчы ў коле родзічаў, але зусім інакш выглядае выстаўленым публічна, асабліва калі гэтакія «нядбайліцы» складаюць ладную долю часопісу.

У такім асяроддзі нават творы, якія вылучаюцца якасцю, арыгінальнасцю, свежасцю, набываюць характэрны змрочна-дагматычны выгляд. Пастаўленыя ў шэрагі *традыцыйнай беларускай прозы* глыбокія, па-майстэрску напісаныя навелы Ўладзіміра Сцяпана чытаюцца як чарговы меланхалічны радок на дошках занядбанага мемарыялу беларускай літаратуры, у апавяданні заўсёднага аптыміста Леаніда Маракова нечакана й недарэчна акцэнтуецца трагічны фінал, змястоўныя «абыпраштоскі» Яўгена Рагіна трапляюць у разрад неапрацаванае сыравіны. Гэта вынік канцэпцыі, якая хоцькі-няхоцькі працуе на вобраз беларускай літаратуры, калісь любоўна шліфаваны партыйнымі куратарамі: замкнёная ў сабе забава для невялікага кола пісьменнікаў.

Прыклады невыпадкова ўзятыя з чацвёртага нумару часопісу. Ён - нарэшце - дазваляе мець асцярожную надзею. У ім больш жыцця, разнастайнасці, больш адкрытасці і шырыні поглядаў на свет. Не настолькі, каб гаварыць пра якасную змену, але відавочнае адрозненне ад двух папярэдніх стварае прастору спадзяванням, што «Дзеяслоў» можа мець іншыя формы, акрамя няспраўджанага ладу, нязменнага трывання, абмежаванага ліку й пазачаснага часу.

Прыемныя неспадзяванкі былі ўжо ў першым нумары

(«Паланэз» Уладзіміра Някляева), але тады ў іх хацелася бачыць заяўку на нешта большае, на якасна новы ўзровень часопісу ў параўнанні з папярэднікам (бо здольнасць рабіць прыемныя нечаканасці перайшла таксама ад «Полымя» з «Маладосцю»). І ўсё ж клон найстарэйшага літаратурнага выдання адрозніваецца ад продка большай амплітудай дазволенага, дзеля чаго мы не губляем аптымізму. Сёння гэта адзіная надзея, якую звязвае з беларускімі пісьменнікамі нераспешчаны іхняю ўвагаю чытач.

Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

Сяргей Прытыцкі
Іран і Тэгеран
Нататкі з вандровак па Пэрсіі, Усходнім Курдыстане й Харасане

Улетку 2002 году я праехаў з канца ў канец Іран. Найбольшую ўвагу надаваў курдзкім раёнам, дзе быў найдаўжэй. Веданьне мовы і звычаяў дапамагала мне вырашаць бягучыя праблемы. Імёны й геаграфічныя назвы я крыху перайначыў зь меркаваньняў бясьпекі прыватнага жыцьця памянёных тут людзей.

СВАЕ І ЧУЖЫЯ

З пункту гледжаньня нацыянальнага пытаньня Іран можна параўнаць з Савецкім Саюзам. Краіна складаецца зь некалькіх адрозных рэгіёнаў, насельніцтва - зь немалой колькасьці этнічных групаў. Паводле ня вельмі афіцыйнай статыстыкі пэрсы (то бок «самі іранцы») складаюць усяго прыблізна 40 % ад нацыяльнага складу краіны. Нацмены - усе гэтыя курды, балуджы, азэрбайджанцы, туркмэны, луры (выбачайце, каго не

згадаў) захоўваюць свае этнічныя прыкметы, у тым ліку мову, а іх колькасьць не зьмяншаецца. Безумоўна, сяк-так асыміляцыя ідзе, але й цяпер у многіх раёнах няпроста паразумецца па-пэрсыдзку - бо людзі альбо зусім не валодаюць *«салодкай»* мовай (афіцыйны эпітэт для мовы фарсі, адпаведнік нашаму *мілагучная беларуская мова*), альбо гавораць на ёй, як грузіны па-расейску.

Для іншаземцаў, якія ведаюць пэрсыдзкую й арыентуюцца ў мясцовай сытуацыі, гэта дае магчымасьць «закасіць» пад нацмена. Гэта моцна спрашчае жыцьцё. «Ніколі не прызнавайся, што ты іншаземец. Кажы лепш - курд, адно глядзі, каб той суразмоўца таксама не аказаўся курдам», - гэта была апошняя парада маёй пэрсыдзкай знаёмай Н. перад маім ад'ездам.

Скажу адразу, чужым імем ніколі не карыстаўся. Ніколі, праўда, і не прызнаваўся, што я - чужынец. «Чужынец», асабліва эўрапеец, выклікае надзвычай шмат увагі.

Раскрылі маю чужынскасьць толькі пару разоў, дый тое праз маю ўласную нядбайнасьць. Напрыклад, запісваў на вачах у іншых па-беларуску свае нататкі (прызналі за пакістанца, бо паблізу стаяў пакістанскі аўтобус). А так увесь час строіў зь сябе курда ці яшчэ каго. Аднойчы ў Машгадзе (скрайні ўсход) падыходзіць да мяне дзядок і пытаецца:

- Братка, ты з поўначы прыехаў?

Я пагаджаюся.

- З Гіляну? (Гэта правінцыя на поўначы, дзе клопатам М. Фрунзэ некалі была абвешчаная савецкая рэспубліка.)

- Амаль.

- Я адразу здагадаўся, бо толькі там у людзей такія вочы. Тут у нас такіх не бывае.

Так мяне ахрысьцілі яшчэ і гілянцам.

ВАКОЛІЦЫ ТЭГЕРАНУ

Сваё падарожжа я пачаў з сталіцы. Тэгеран - места вялікае. Афіцыйная статыстыка ацэньвае колькасьць яго жыхароў у 7 мільёнаў, але, мяркую, у месьце й шматлікіх прадмесьцях жыве нашмат болей людзей. У адным з прадмесьцяў, пад мілагучнай назвай «Мэхршахр - канец аўтабану», я і спыніўся ў знаёмага азэрбайджанца.

Гэта быў рабочы пасёлак з усімі яго атрыбутамі - руінамі, незразумелымі закінутымі будынкамі, разьбітымі крывымі дарогамі, расьпісанымі мясцовымі рэвалюцыянэрамі сьценамі (насупраць нашага дому красаваўся надпіс «Сьмерць рэжыму клерыкалаў», прычым за ўсё лета яго ніхто не зацёр).

Дамы ў Іране большыя, чымся ў нас. Яны падзяляюцца на колькі пакояў ды асобную прастору для жанчын. Наўкола дому абавязкова стаіць высокі плот. Гэтае правіла датычыць жытла ня толькі заможных, але і бяднейшых іранцаў, якімі й былі насельнікі Мэхршахру.

Жылі ў пасёлку збольшага азэрбайджанцы. Маё зьяўленьне было ўспрынятае імі з пад'ёмам. Мой сябра яўна ганарыўся, што я спыніўся менавіта ў яго. Суседзі заходзілі, каб пагутарыць са мной, ці клікалі да сябе ў госьці. Гутарылі пра Беларусь, Іран, свабоду (нават самы апошні тамтэйшы нягоднік здолее патлумачыць вам, нашто яна патрэбная), жыцьцё, кабет. У Беларусі бяседа ідзе пры чарцы, а ў тых краёх - за шклянкай гарбаты. Гарбату запарваюць выдатную і глокцяць яе зранку да вечару ў неверагоднай колькасьці. Пры сьпёцы й нізкай вільготнасьці паветра зь цела выпараецца шмат вільгаці, таму яе трэба пастаянна кампэнсаваць. П'еш-п'еш, а вільгаць тут жа зьнікае.

На наступны дзень па маім зьяўленьні да мяне прыйшла з дачкой бурмістарка гэтага пасёлку, каб пагутарыць ды паказаць мне дасягненьні падсправаздачнай ёй тэрыторыі. Мне было сьмешна, але калі я ўбачыў, як паважліва маці майго сябра размаўляе зь мясцовай кіраўнічкай, я напусьціў на сябе сур'ёзнасьці. Давялося інспэктаваць мясцовы дом культуры ды асфальт на вуліцах.

Аднаго вечару сяджу, запісваю свае назіраньні. Падыходзіць

Мустафа (меншы брат майго сябра):

- Вах-вах, як прыгожа пішаш насталікам (вытанчаны стыль каліграфіі) па-ангельску.

- Гэта па-беларуску, а не па-ангельску, дый зусім не насталік.

- Усё адно. Напішы, калі ласка, віншаванку маёй сяброўцы на вашай мове і вершык пра каханьне падбяры, ангельскі.

- Ня ведаю ангельскіх вершаў.

- Ну, то беларускі, але каб пасаваў да імя.

Імя ейнае было Махтаб - «месячнае сьвятло». Нічога лепшага, як Багдановічаву «Зорку Вэнэру», не згадаў. Напісаў, даў пэрсыдзкі пераклад і транскрыпцыю беларускага тэксту. Хлопец зьзяў ад шчасьця - паштоўка, падпісаная сапраўдным іншаземцам на праўдзівай замежнай мове. Відаць, Махтаб захоўвае яе, як рэліквію.

ТЭГЕРАН

Перасоўвацца па Тэгеране цяжка і цікава. Ёсьць мэтро, але збудавалі яго неяк збоку ад цэнтру і мне было нязручна ім карыстацца, таму я яго і ня ўбачыў. Рухацца па месьце можна альбо на аўтобусе, альбо на таксі. Аўтобусы (гэткія самыя «Ікарусы») ходзяць па вельмі загадкавых маршрутах і толькі да дзявятай вечару.

Пасярэдзіне аўтобуса пастаўлены бар'ерчык: у хваставой частцы едуць кабеты, у насавой - мужчыны (у некаторых гарадох бар'ерчыкаў у аўтобусах я ня бачыў). Пры вялікай колькасьці пасажыраў правілы разьдзяленьня полаў захоўваюцца ня надта строга.

Зручней езьдзіць на таксі, якія абсалютна не адпавядаюць нашаму ўяўленьню пра гэты від транспарту. У іранскім таксі зазвычай едзе столькі людзей, колькі можа ўлезьці. Мне распавядалі, як дзевяць чалавек ехалі на адной машыне, а я сам ехаў аднойчы на таксі, дзе разам са мной было восем чалавек. Як яны зьмясьціліся ў стандартнай машыне таксі -

іранскім «пэйкане»? Дзьвярэў не зачынялі, а адзін з пасажыраў сеў з кіроўцам на адно сядзеньне.

Трэба ўмець таксама рухацца пешкі. У Іране, безумоўна, існуюць правілы дарожнага руху, сьвятлафоры, паліцыя, але… Зазвычай у гэтай сфэры пануе поўная свабода. Праз пару дзён я навучыўся пераходзіць нават тамтэйшыя аўтабаны (а іх нямала). Раскрыю сакрэт. Калі вы стаіце перад плыньню машын, што імчыць паўз вас, максымальна расслабцеся і засяродзьцеся на машынах. Уявіце сябе абкураным наркотам дый ідзіце, нібыта набліжаючыся да тыгра. Галоўнае - ня трэба рэзкіх рухаў (можаце зьбіць кіроўцу з панталыку сваімі скокамі). Вулічнае жыцьцё ў Іране нашмат весялейшае, чымся ў нас.

У ПАСТАРУНКУ

Еду аднойчы ў горад з свайго Мэхршахру патэлефанаваць дадому ды палазіць па Інтэрнэце. Гляджу - навокал паліцыянтаў, як у нас на 25 Сакавіка. Значыць, недарма прыехаў. Пэрсыдзкія сябры зь Менску даслалі мэйл: не хадзі 18 ціра па горадзе. Запісваю ў нататнік: не забыцца 18 ціра прыехаць у Тэгеран - і бачу, што асьветлены сонейкам каляндар на сьцяне інтэрнэт-кавярні паказвае - сёньня васямнаццатага ціра 1381 году!

Ваў, думаю, прыцягнуўся на пах крыві… Ну як не дапамагчы змагацца за свабоду - кажа сэрца, хоць галава спрабуе спыніць мяне - «згінеш, хлопча, за нішто». Заключаю сам з сабой пагадненьне: пайду, але каменьня кідаць ня буду, біць паліцыянтаў ня буду, падпальваць крамы таксама…

18 ціра (9 ліпеня) - крывавая дата ў найноўшай гісторыі Ірану. У гэты дзень у 1999 годзе быў учынены пагром у інтэрнаце Тэгеранскага ўнівэрсытэту, забіта некалькі чалавек. Штогод у памяць гэтых падзеяў на плошчы Рэвалюцыі ладзіцца дэманстрацыя, штогод яна брутальна разганяецца, хаця, кажуць, апошнім часам паліцыя лагадней ставіцца да дэманстрантаў.

Заскочыў у краму знаёмага аўганца. Ён мне адразу: «Сыходзь з

цэнтру гораду! Табе нельга быць тут, бо ты занадта падобны на студэнта. Сыходзь!» Ён прыбірае тавар ды заводзіць мапед. Спрабую даведацца падрабязнасьці, дзе галоўнае месца пратэстаў, але хлопец яўна хоча ўцячы і паўтарае свае парады, не разумеючы, чаму я нікуды не зьбіраюся сыходзіць. Урэшце кажа: «Ідзі да галоўнага ўваходу ўва ўнівэрсытэт».

Іду. Мноства людзей на вуліцах яўна нечага чакаюць. Паліцыя не дазваляе нікому спыняцца. Адзін з паліцыянтаў падыходзіць да хлопца, што стаіць каля ўнівэрсытэцкай агароджы, мэтры тры ад мяне, і лагодна кажа: «Рухайцеся, ня стойце». Не пасьпеў я ўладкавацца пад агароджай, як падышлі і да мяне. Адліпаю ад яе і пачынаю круціцца на пятачку сярод такіх самых разявак. Спрабую знайсьці калегаў-студэнтаў, але нікога ня бачу. Падыходжу да нейкіх хлапцоў, нечым падобных да пэтэвэшнікаў. Пытаюся, што і як. Яны ведаюць ня больш за мяне і раяць мне сысьці чым хутчэй. Ну, пасьля гэткіх словаў было б ганьбай сысьці.

Шмат людзей прыйшлі сюды сем'ямі. Людзей вельмі шмат, мо тысячаў трыццаць. Плошча Рэвалюцыі (як менская плошча Коласа, праўда, зручнейшая для дэманстрацыяў) і навакольныя вуліцы запоўненыя народам. Усе робяць невінаваты выгляд, але ўжо ў абед 18 ціра на плошчы Рэвалюцыі выпадковых людзей няма, і кожны ведае, нашто і куды ён прыйшоў.

Блізіцца вечар. Час ад часу зьяўляюцца групкі моладзі, што пасьпяваюць выгукнуць пару разоў нейкі лёзунг. За імі адразу сьпяшаюцца людзі ў цывільным і паліцыя, а сьмельчакі хаваюцца па крамах, якія яшчэ не пасьпелі зачыніцца. Крамнікі прапускаюць іх і апускаюць заслону перад носам ахоўнікаў парадку.

Нарэшце бачу мясцовых чарнасоценцаў. Гэтых дужых, даўно няголеных мужчынаў у чорных кашулях, якія дзейнічаюць пад апекай паліцыі, тут называюць «хэзболахі». Звычайна гэта цёмныя людзі, якія прыехалі ў горад зь вёскі і рады паганяць «разбэшчаных» ды «падкупленых ворагамі» апазыцыянэраў. За сваю працу гэтыя «санітары грамадзтва» атрымліваюць матэрыяльнае заахвочваньне. Словам, звычайная «чорная сотня».

Людзі канцэнтруюцца каля агароджы ўнівэрсытэту. Нейкі студэнт залазіць на яе і пачынае прамову. Вакол яго зьбіраецца ўсё большы натоўп. Раптам колькі плескачоў, крыкі. Натоўп бяжыць прэч. З галёканьня я разумею толькі - «хэзболахі, гоз». Ага - чарнасоценцы труцяць народ газам. Людзі нясуцца ўздоўж унівэрсытэцкага плоту, некаторыя падаюць. Труць вочы, нацягваюць на твары кашулі. Я таксама бягу і здагадваюся, што шум быў стрэламі. Амаль налятаю на дзяўчат. Іх хусткі зьехалі на шыі.

Дасьць Бог, не патручуся. Пастаянна перасоўваюся, пагатоў што паблізу зноў зьявіліся хэзбалахі на матацыклах без глушнікоў. Гэтыя дзецюкі ня толькі газам труцяць, але і страляюць, ды кастэтам і ножычкам могуць патрактаваць. Здалёк бачу, як паліцыянты цягнуць прамоўцу. Ён у крыві і не супраціўляецца.

Тым часам вакол такога ж прамоўцы зьбіраецца такі самы натоўп. Яго касьцяк складаюць ужо не студэнты. Ён пачынае імкліва рухацца ўздоўж праспэкту. Такой масавай дэманстрацыі я дагэтуль ня бачыў. Далучаюся. Раптам зараз адбудзецца рэвалюцыя?!

Цудоўна, што фотаапарат у заплечніку. Дастаю і здымаю першы кадар. Не, адсюль пагана здымаць, трэба з краю. Ссоўваюся ўлева і, не высоўваючыся з шэрагаў, прыцэльваюся.

Трэсь! Не пасьпеў націснуць на кнопку, як мяне круцяць людзі ў цывільным.

Супакойваю сябе - што яны са мной зробяць? Пашпарт - у кішэні кашулі, а камэру й пляцак ужо забралі. Вядуць у тутэйшы «апорны пункт». У ім ходзяць паліцыянты ў форме, і гэта добра. Найгоршае - трапіць чарнасоценцам.

Пашпарт у кішэні, можна было б зьбегчы, гары яны гарам, пляцак і камэра. Але я ня Стывэн Сыгал, каб размазаць па сьцяне чатырох галаварэзаў, якія стаяць у пакоі. Прыходзіць палкоўнік. Як імя, пытаецца, дзе вучышся? Адказваю па-партызанску - ня ведаю, не памятаю. Здаецца, не разумее, што іншаземец. І пачынае злавацца. Ператрасае мой пляцак. У ім

толькі пэрсыдзка-курдзкі слоўнік.

Цягнуць яшчэ аднаго акрываўленага мужыка. Палкоўнік шкуматае мой заплечнік. Ён яўна незадаволены маімі адказамі. Э, думаю, трэба здавацца, інакш атрымаю па галаве. Горда ўздымаю галаву і абвяшчаю:

- Я грамадзянін Рэспублікі Беларусі! Адпускайце мяне альбо выклікайце пасла. Я нічога кепскага не зрабіў.

Паліцыянты ня вераць.

- Дазвольце дастаць пашпарт.

Выцягваю. Ха! Пашпарт выклікае ў іх павагу. Больш ніякіх пытаньняў. Жыве Беларусь!

Адабралі стужку, астатняе паскідалі ў пляцак, аддалі мне й адпусьцілі. Ідзі адсюль, кажуць, тут цяпер небясьпечна.

РАТУЮСЯ «ІКАРУСАМ»

Іду да аўтобуснага прыпынку. Лёгкія прыцемкі. Народ шуміць, гудзіць, паліцыя бегае туды-сюды. Час ад часу налятаюць хэзбалахі, усчынаецца гвалт. Цяжка зразумець, што робіцца ў самім унівэрсытэце, а там дакладна нешта адбываецца, бо й хэзбалахі памчалі на сваіх матацыклах у яго бок.

Ні ў што ня ўмешваюся, іду на аўтобус. Падыходжу да прыпынку, чакаю аўтобус, нікога не чапаю. Побач стаяць яшчэ чалавек дзьвесьце, якія «чакаюць аўтобус». Транспарт ходзіць амаль нармальна. Відаць, усё скончылася.

Раптам з завулку выскокваюць з трыццаць студэнтаў. Многія заматаліся ў банданы, хаця МенТВ нідзе не відаць. Спрабуюць перакрыць вуліцу. Выгукваюць лёзунгі. Некаторыя я разьбіраю - «Справядлівасьці, справядлівасьці, свабоды думкі». У наш (і іхны) бок ляціць паліцэйская арда.

Паляцела недзе шкло, нешта грукаціць, страляе. Студэнты ўжылі кактэйль Молатава, і пасярод вуліцы імгненна ўтварылася сьцяна агню. Агонь тут распаліць няцяжка: па

ўзбочынах ляжаць кучы сьмецьця, якое імгненна высыхае. Паліцыянты страляюць газам, пасьля пачынаюць пешую атаку. Я адыходжу далей, але ўсюды паліцыя ды хвацкія малойцы ў чорных кашулях. Студэнты разьбегліся, паліцыя спрабуе тушыць агонь.

Ізноў нейкія студэнцкія налёты, атакі паліцыі ў адказ. Людзей паменела, паліцыянтаў і «цывільных» паболела. Усё, рэвалюцыя не адбылася, таму трэба звальваць, пакуль ізноў не схапілі.

Сунуўся ў адну вуліцу - заблякаваная паліцыяй. Другая - тое самае. Абышоў усе магчымыя выхады. Усё, гамон, узялі ў кальцо. Бачу, нейкія хлопцы мітусяцца. Здаецца, да хэзбалахаў не падобныя. Бягу зь імі, ня ведаю куды. Падлятаем да «Ікаруса». Вах-вах, ён яшчэ і з кіроўцам. Нехта з маіх незнаёмых таварышаў эмацыйна размаўляе зь ім, просіць вывезьці нас з плошчы. Кіроўца адмаўляецца: мы выглядаем як бандзюгі.

Праз хвіліну ўгаварылі-такі. Займаем аўтобус, у які залятаюць яшчэ пару дзясяткаў грамадзянаў больш мірнага выгляду. Кіроўца ставіць шыльдачку маршруту - «601 шахрак-е кодс».

Рушым. Насустрач нам у кірунку плошчы ідуць браневікі, за імі аддзелы людзей ува ўніформе - ня ведаю, жандары ці вайскоўцы. На паліцэйскім кардоне жандары з падозраньнем аглядаюць «Ікарус». Але ўрэшце машыны кардону рассоўваюцца - мы выяжджаем на волю!

Я сяджу на скрайку сядзеньня. Ніхто не штурхаецца. Хлопцы пачынаюць сьпяваць нейкую рэвалюцыйную песьню. Кіроўца абарочваецца: «Зараз жа дагоняць і пасадзяць усіх». Яго ніхто ня слухае.

ШТО ГЭТА БЫЛО

Сэнс падзеяў да мяне дайшоў назаўтра. Падчас дэманстрацыі галоўнае - інстынкт, то бок ня трапіцца «ім» і дапамагчы «сваім». А хто «яны» і хто «свае»?

Мушу патлумачыць свае погляды на іранскую палітыку. Я

сымпатызую Ісламскай рэвалюцыі 1979 году. Але менавіта Ісламскай рэвалюцыі, а не хамэйнізму, які ўрэшце зрабіў стаўку на адраджэньне тысячагадовай пэрсыдзкай традыцыі прыгнёту.

Праз колькі месяцаў пасьля рэвалюцыі клерыкалы ўзялі ў свае рукі ўладу, адсунуўшы ад яе дэмакратычныя арганізацыі. Былі забытыя ўсе пляны эканамічных пераўтварэньняў, пачаўся тэрор, да яго дадалася вайна з Іракам. У краіне ўсталяваўся палітычны лад, сутнасьць якога найлепш перадае лёзунг, павешаны апазыцыйнымі левымі студэнтамі на фасадзе Тэгеранскага ўнівэрсытэту праз колькі месяцаў пасьля ўсталяваньня клерыкальнага рэжыму:«1979 - год перамогі цемрашальства над тыраніяй».

Імідж Ірану ў нас нэгатыўны, але, па праўдзе, ён створаны перадузятым стаўленьнем СМІ да гэтай краіны. Не сказаць, што ў Беларусі дэмакратыі больш, чым у Іране. Усё-такі там выбары - і парлямэнцкія, і мясцовыя, і прэзыдэнцкія - апошнія гадоў восем рэальна ўплываюць на палітычнае жыцьцё.

Іранскі рэжым - адзін з самых дэмакратычных на Сярэднім Усходзе. Тры галіны ўлады ў краіне існуюць незалежна адна ад адной, але пад наглядам сьвятароў. Ахунды (шыіцкія рэлігійныя вучоныя) уважаюць сябе адказнымі за маральнасьць і рэлігійнасьць усяго грамадзтва, пільна сочаць за грамадзкім жыцьцём. Усе партыі, нязгодныя з ісламскай рэспублікай, забароненыя.

У сярэдзіне 1990-х грамадзтва пачало ўсё гучней патрабаваць аслабіць кантроль ахундаў над краінай. Адказам быў шэраг лютых забойстваў інтэлектуалаў і дысыдэнтаў у лістападзе-сьнежні 1998 году. У ліпені 1999-га студэнцкія дэманстрацыі скаланулі краіну, але былі брутальна задушаныя.

У 1997 годзе прэзыдэнтам краіны быў абраны Мухамад Хатамі, які дэкляруе палітыку рэформаў. Пра пераўтварэньні ў Іране гавораць усе. Але ніхто не задаволены іх хадой. Рэфармісцкія колы абвінавачваюць ува ўсім ахундаў. Маўляў, яны кантралююць судовую ўладу і такім чынам тармозяць пераўтварэньні. На практыцы ж кансэрватыўная судовая ўлада

забірае ліцэнзіі ў апазыцыйных СМІ, а лібэральнае міністэрства культуры тут жа іх аднаўляе (адно што назвы зьмяняюцца). За рэформы горача выступаюць студэнты, якіх у Іране больш чым мільён, а бальшыня - дзяўчаты.

Мне часта было няёмка падчас дыскусіяў з іранскімі студэнтамі, якія ведалі лепш за мяне заходнюю палітычную думку, хоць гэта да пэўнай ступені мой фах. Кнігарні ў Іране поўныя кніжак, пераважае сур'ёзная літаратура. Ведама, мноства заходніх перакладаў (нават пачынаеш сумнявацца ў наяўнасьці цэнзуры, хаця яна ё!). Галоўнае - гэта знаходзіць чытача.

Выказваю сваё захапленьне тамтэйшым студэнтам. Адзін зь іх кажа: «Ну, павалім мы гэты рэжым. Але наўзамен прыйдзе праамэрыканскі. Цяпер нас душаць рэлігіяй, а потым будуць душыць прадажнасьцю. Як было да рэвалюцыі 1979 г. Выгадна гэта будзе тым, хто цяпер разважае, як уцячы з краю. Ім тады ня трэба будзе ўцякаць, бо піць-гуляць можна будзе ў Іране. А першыя, каму дасьць у косьці праамэрыканскі рэжым, будзем мы - тыя, хто змагаўся з ахундамі. Бо яму ня будуць патрэбныя тыя, хто думае».

САНАНДАДЖ

Галоўнай мэтай падарожжа ўсё-ткі зьяўляецца Курдыстан. Мае знаёмыя ў Мэхршахры хапаюцца за галаву, калі паведамляю ім, куды накіроўваюся. Распавядаюць страшылкі пра курдаў-галаварэзаў. Раблю выснову - гэта акурат тое, чаго я хацеў. Бяру квіток да сталіцы іранскае правінцыі Курдыстан, Санандаджу (па-курдзку Сэнна).

У гэтым трохсоттысячным месьце я апынаюся а трэцяй ночы. Цёмна, аўтавакзал зачынены, у горад ісьці ўначы няма ніякага сэнсу. Таксісты прапануюць падкінуць пасажыраў у навакольныя мястэчкі. Але мне ехаць няма куды. Сядаю на каменную агароджу клюмбы. Welcome to Kurdistan!

Вакзал звонку нагадвае машынны двор у беларускай вёсцы. Жаўнер-турак, як чую па ягоным вымаўленьні, вартуе нейкі пастарунак. Пачынаем размаўляць пра жыцьцё, з пастарунку

высоўваецца злосная афіцэрская морда і праганяе мяне. Уладкоўваюся на бэтоннай тумбе. Нецярпліва чакаю сьвітаньня. Нарэшце сонца асьвятляе вышыні гораў ды паволі-паволі спускаецца ў даліну.

Усе гавораць па-курдзку. Я іду адсыпацца ў гарадзкі парк на гарэ. Выспацца тут цяжка, бо на выпаленых сонцам схілах гораў складана знайсьці сапраўдны цень, памятаючы пра небясьпеку скарпіёнаў. Ляжу, падаслаўшы газэту, на бэтоннай эстакадзе пад маленечкім ценем амаль лысага дрэва. Ценю ледзь хапае на маю галаву. У небе плыве пара хмарак, якіх я ніколі ня бачыў у Тэгеране.

У поўдзень сунуся шукаць гатэль. Атабарыўшыся ў гатэлі на цэнтральнай плошчы, разумею, што мне ня тое каб зусім блага, але нядобра. Здаецца, усё нармальна, але есьці не магу. Сьпісваю сваю немач на вышыню - відаць, трэба акліматызавацца. Што ж зьесьці? Згадваю, як Джэральд Дарэл карміў хворых малпаў у заапарку малаком і бананамі. На шчасьце, і адно і другое набыць тут няцяжка. Праз дні два са мной усё ўжо ў парадку.

Базар тут сапраўдны ўсходні, з дахам, збудаваны гадоў дзьвесьце таму. Усюды графіці «Сьмерць Комале». Комала - гэта падпольная арганізацыя левых курдзкіх нацыяналістаў. Яна была створаная яшчэ ў 1940-х гадах і дагэтуль ваюе за незалежны сацыялістычны Курдыстан. У гэтай справе ў яе ёсьць канкурэнты - больш памяркоўная Дэмакратычная партыя (Іранскага) Курдыстану, якая варагуе з аднайменнай партыяй ірацкіх курдаў. Яе, паводле маіх назіраньняў, падтрымліваюць 80 % насельніцтва Іранскага Курдыстану. Яшчэ адсоткаў 10 стаяць за Комалу. Рэшта - каму ўсё фіялетава. Наагул, увесь нацрух тут левы. Людзі, зь якімі я пазнаёміўся на базары, з сымпатыяй гаварылі пра СССР. Сымпатыі сягаюць яшчэ 1940-х гадоў, калі тут стаялі савецкія акупацыйныя войскі.

Трэба шукаць падручнік тутэйшай курдзкай мовы. Зь нямецкага падручніка я вывучаў курдзкі дыялект курманджы, але яго тут ніхто не разумее. (У курдзкай мове два асноўныя дыялекты: паўночны - курманджы, паўднёвы - сорані.) Мяне накіроўваюць у найлепшую кнігарню. Заходжу: сярод паліцаў з

кніжкамі сядзіць гандляр у курдзкай нацыянальнай вопратцы - шырокіх нагавіцах, адмысловай вольнай кашулі, падпяразаны шырокім пасам. Зь ім яшчэ два ў напаўэўрапейскай вопратцы. Прапануюць колькі кніжак па-курдзку.

КУРДЗКІЯ БРАТЫ Й БЕЛАРУСКІ ТАВАРЫШ

Больш у мяне не было ніякіх праблемаў у Санандаджы, бо мае новыя знаёмыя клапаціліся пра ўсё. У месьце мноства банкаў, іх так шмат, што, здаецца, месьцічы толькі і займаюцца банкаўскімі апэрацыямі. Але бальшыня - беспрацоўныя. Прамысловасьць выключна харчовая ці лёгкая, самі прадпрыемствы малыя.

Санандадж іранцы лічаць «прыгожым і дагледжаным». Мая ісфаганская знаёмая Захра дадае: «У ім ё штось эўрапейскае». Далібог, такое самае места, як і іншыя гарады й мястэчкі Курдыстану. Горнае паселішча, і таму бальшыня вуліцаў існуе хутчэй у вэртыкальным, чым гарызантальным вымярэньні. У цэнтры болей парадку: усё-ткі сталіца правінцыі. Гэты цэнтар пэрсы старанна вычышчаюць ад курдзкіх гістарычных памятак. Старыя курдзкія назвы пераймяноўваюцца на новыя пэрсыдзкія.

Кожны горад Ірану, як і кожнае места былога СССР, мае аднолькавую тапаніміку. Там абавязкова будзе плошча імама Хамэйні, плошча Рэвалюцыі, мноства вуліцаў імя герояў ірана-ірацкай вайны, колькасьць якіх з кожным годам павялічваецца, дарма што вайна скончылася ў 1989 годзе.

Музэй Санандаджу нагадвае наш абласны музэй. Мноства чарапкоў і такая самая ўбогасьць. Усё залатое-сярэбранае-каштоўнае адпраўляецца ў Тэгеран.

Вечарам іду на госьці да аднаго зь сяброў. Ён жыве ў двухпавярховым доме з добрым плотам. На сьцяне ў гасьцёўні вісіць каляндар з партрэтам Казі Мухамада, прэзыдэнта незалежнай Курдзкай Рэспублікі Магабаду сярэдзіны 1940-х гадоў. Гаворым пра Курдыстан і Беларусь. Яны добра, з паўслова разумеюць нашыя праблемы, а я - іхныя. З пэрсамі ніколі не атрымліваецца так па-сяброўску пагутарыць. Яны

нагадваюць у гэтым дачыненьні расейцаў. Нармальна зь імі можна гаварыць толькі пра «вялікую пэрсыдзкую культуру».

Размова пачынаецца з спрэчкі. Мае сябры не зразумелі маіх сымпатыяў да аджаланаўскай Партыі працоўных Курдыстану (ППК). Яны абураліся аджаланаўцамі, бо, маўляў, пару гадоў таму тыя падступна абышліся з маладымі курдамі Ірану, што спрабавалі аднавіць курдзкую партызанку ў Іране. Калі яны пусьцілі ў свой табар байцоў ППК, аджаланаўцы прыйшлі і вынішчылі іх. Ня ведаю, наколькі гэта праўда, але пра супрацоўніцтва ППК з Тэгеранам шмат пісалі.

Мае знаёмыя ў бальшыні сваёй падтрымлівалі цяпер падпольную «Дэмакратычную партыю (Іранскага) Курдыстану» (ДПІК). Партыя (за прыналежнасьць да яе ў Іране можна трапіць у турму і нават на шыбеніцу) была заснаваная яшчэ ў 1945 годзе, як кажуць нядобразычліўцы - пры дапамозе савецкага войска. ДПІК уваходзіць у Сацыялістычны Інтэрнацыянал. Партыя мае ўзброеныя аддзелы - каля 300 байцоў, што нікчэмна мала ў параўнаньні з 1980-мі гадамі, калі ДПІК мела тысячы байцоў ды кантралявала ледзь не палову Ўсходняга Курдыстану.

Ці не ўва ўсіх дамох я бачыў кніжкі ды касэты «адтуль», г. зн. з Ірацкага Курдыстану. Калі ў паўднёвых правінцыях Усходняга Курдыстану іранскія ўлады яшчэ сочаць за «падрыўной літаратурай» з Ірацкага Курдыстану, то ў правінцыях Курдыстан і Заходні Азэрбайджан не складае праблемы знайсьці па-курдзку ўсё што хочаш. Замаўляй сёньня - прывязуць заўтра! Частка літаратуры друкуецца на месцы - навукова-тэхнічны прагрэс дазваляе і такое.

Якасьцю гэтая літаратура нагадвае беларускія кніжкі, што выходзілі падчас нашага «рэпрынтнага» адраджэньня пачатку 1990-х. Праз тыдзень мяне запрасілі наведаць адно курдзкае выдавецтва. На першы погляд гэта была інтэрнэт-кавярня, але ў яе кутку тры чалавекі кляпалі падпольную й зусім не падпольную літаратуру, мантажавалі патрыятычныя кліпы.

Адзін зь іх робіць у вольны час курдзка-нейкі слоўнік. Ён просіць дадаць у параўнальную табліцу арыйскіх моваў

беларускія адпаведнікі выбраных словаў - тэрміны сваяцкасьці, некаторыя прылады працы і г. д. Вучу яго казаць «дзякуй». Ён пытаецца, як зьвярнуцца, каб не казаць слова «пан». Вучу слову «таварыш», запісваю з агаласоўкамі, і да майго ад'езду ён зьвяртаецца да мяне - «таваріш».

Мае сябры любяць схадзіць у мячэт, каб запытаць у «прававерната» прамоўцы чаго правакацыйнага. Амаль ні ў кога няма работы, усе абы-дзе тусуюцца дый чакаюць рэвалюцыі. Самы звычайны занятак там - кантрабанда ці паўкантрабандны памежны гандаль. Тут сыходзяцца Ірак, Іран і Турэччына, што некалі разарвалі краіну курдаў. Дзякуючы гэтаму тут толькі і жывуць. Хаця з 2003 году стала цяжэй, бо іранскі памежны кантроль стаў больш строгім - сытуацыя ў краі мяняецца акурат цяпер.

Мне трэба ў Тэгеран. Сябры праводзяць мяне, просяць прыехаць на партыйнае сьвята ДПІК - 16 жніўня. Шукаюць машыну, вязуць да самага аўтобуса, і, калі дастаю грошы набыць квіток, высьвятляецца, што квіток яны ўжо купілі. Доўга разьвітваемся, ад'яджаю, і сябры глядзяць усьлед аўтобусу.

НАЗАД У ТЭГЕРАН

Едзем празь дзікія-дзікія горы, за мэтры два ўлева ад мяне - бездань, а ўсяго адным кілямэтрам ніжэй зіхацяць агні паселішчаў. Найлепш для нэрваў - заснуць і не глядзець. У аўтобусе бальшыня - курды. Я вылучаюся тым, што не разумею іхнае мовы, чым выклікаю вялікае абурэньне кіроўцы, які, відаць, нешта падазрае.

Блёк-пост. Усіх будзяць, і пачынаецца пратрус. Мы высока ў гарах. Кучка пасажыраў пад пільным наглядам аўтаматнікаў, пражэктары, бранятэхніка наводдаль. Жаўнеры здагадваюцца, што я нетутэйшы. Дастаю чароўны беларускі пашпарт. У мяне яго выхопліваюць, абяцаючы вярнуць. Мой пляцак выклікае цікаўнасьць, і мяне распытваюць пра мэту й маршрут падарожжа. Нічога ня ведаю, проста еду. Але мяне дэмаскуюць курдзкія кніжкі. «Турыст, - жартуе вайсковец. - Тэрарыст!» Урэшце аддаюць пашпарт, і, калі я паглядзеў, ці ня вырвалі яны чаго сабе на памятку, мне становіцца не па сабе. Апоўначы

закончылася мая віза, а цяпер трэцяя ночы. Маглі затрымаць.

Заяжджаю да сваіх сяброў у Мэхршахр - маўляў, я жывы, вярнуўся. «Ну як, - пытаецца Алі, - заключыў вайсковы хаўрус з курдамі?» На наступны дзень я ў паліцыі, падаўжаю візу. Мне цяжка патлумачыць, чым я зьбіраюся займацца ў краіне, таму справа ідзе дужа марудна. У банку плачу пошліну і бачу, як перада мной выстройваецца натоўп непісьменных - просяць запоўніць іх квіткі. Наступныя паўгадзіны я дапамагаю аўганскім гастарбайтэрам аплаціць іх дазволы на працу, чым заслугоўваю яшчэ паўгадзіны ўдзячнасьці.

МАГАБАД

Выпраўляюся ў калыску курдзкага нацыяналізму - Магабад. Гарадок памерам з Маладэчна. Менавіта ў ім у 1940-х гадох першы і апошні пакуль што раз была абвешчаная курдзкая дзяржава - Магабадзкая Рэспубліка. Магабад належыць да правінцыі Заходні Азэрбайджан. Нягледзячы на сваю назву, правінцыя толькі напалову заселеная азэрбайджанцамі. Этнічная мяжа праходзіць па горадзе Ўрмія, які напалову азэрбайджанскі, напалову курдзкі. На поўдзень ад Урміі жывуць курды, на поўнач - азэрбайджанцы.

Падзел паміж імі ня толькі нацыянальны, але й рэлігійны: амаль усе курды - мусульмане-суніты (як і іншыя нацменшасьці Ірану), азэрбайджанцы ж, як і пэрсы, прытрымліваюцца афіцыйнае рэлігіі шыізму дванаццаці імамаў. Гэта дае ім прывілеі, параўнальныя з тымі, якімі валодалі ў СССР чальцы КПСС. Азэрбайджанцы нярэдка займаюць кіроўныя пасады (азэрбайджанскія карані мае, напрыклад, аятала Хамэнэі), курды ж рэдка калі прабіваюцца да сярэдняга эшалёну ўлады. Наколькі я разумею, гэта больш тлумачыцца рэлігійнымі, а не нацыянальнымі прычынамі.

Адразу адчуваеш, калі пераяжджаеш з шыіцкіх раёнаў у суніцкія. У суніцкім Курдыстане прасьцей з норавамі. Напрыклад, дома кабеты пры чужых ходзяць бяз хустак. Хаця ня трэба рабіць абагульненьняў - у ірацкіх курдаў усё інакш, хаця яны таксама суніты.

Я прыехаў у Магабад рана раніцай і адразу накіраваўся да плошчы Чар-чэра (Чатырох Ліхтароў). Тут у 1946 годзе была абвешчаная Курдзкая рэспубліка, а неўзабаве забіты яе першы прэзыдэнт Казі Мухамад. Плошча цяпер перайменаваная ў нейкі «пляц імама Хамэйні» ці «рэвалюцыі».

Гістарычныя будынкі часоў Казі Мухамада зьнесеныя, на іх месцы набудавана ўсялякай безгустоўшчыны ў стылі савецкага райцэнтру. Пасярод плошчы паставілі сымбаль Ісламскай Рэспублікі Іран - мэталёвую птушку, на якой пры дужа вялікім жаданьні ахвотныя могуць разгледзець пэўнае выслоўе з Кур'ану. Раблю кола па плошчы, чытаю памінальную за Казі Мухамада, уздыхаю і збочваю на першую-лепшую вуліцу.

Заходжу ў кнігарню, пытаюся, ці ё што па-курдзку. Прадавец даведваецца, адкуль я, выцягвае мапу ды з гонарам паказвае мне сінявокую і *«Мінскъ»* . Я нямею, бо пару дзён таму назад прадавец тэгеранскай кнігарні зусім сур'ёзна спытаў мяне, да якой правінцыі Ірану належыць Беларусь.

З каморы вылазіць дзядок часоў Магабадзкай Рэспублікі, які ў рамках савецкай дапамогі Магабадзкай Рэспубліцы ў 1940-х гадох вучыўся ў Бакінскай вайсковай вучэльні. Урэшце рэспубліку разграмілі, і дзед не давучыўся. Ён паказвае мне старыя бакінскія фатакарткі дый распавядае. Па-пэрсыдзку стары гаворыць пагана, і я слаба разумею гаворку.

Выходжу на вуліцу і вырашаю адшукаць магілу Казі Мухамада. Спыняю першага ж дзядзьку ды пытаюся. Ён нерухомее, пасьля на ледзь зразумелым фарсі кажа:

- Ты сапраўды шукаеш магілу Казі?

- Чаму я не магу шукаць магілы Казі?

Чалавек ледзь ня плача. Тлумачу, адкуль я і што тут раблю (а што я тут раблю?). Вакол нас зьбіраецца натоўп цікаўных: іншаземец хоча бачыць магілу Казі! Дзядзька выцягвае мяне з натоўпу, і мы паволі ўздымаемся ўверх па вуліцы. Ён тлумачыць: «Я дзесяць год сядзеў у турме за тое, за што павесілі Казі Мухамада». Пасьля яшчэ нешта, доўга і

незразумела, на пэрсыдзка-курдзкай трасянцы.

Магіла Казі Мухамада стаіць побач зь дзьвюма магіламі ягоных сваякоў, павешаных разам зь ім. Помнікі звычайныя - бэтонныя прастакутнікі. Адно што ляжаць яны на ўскрайку гораду, за агароджай. Дзядзька просіць мяне не падыходзіць надта блізка, мы залазім на груд побач, каб разгледзець лепш.

Мой новы знаёмы просіць мяне хаця б зайсьці на ягоную вуліцу. Заходзім - людзі жывуць дужа бедна, нідзе ані дрэўца, усюды пыл. Зьбягаецца натоўп мурзатай дзятвы. Ніхто ня просіць грошай - як звычайна бывае ў пэрсыдзкіх гарадох. Падыходзіць перапэцканы бэтонам хлопец маіх гадоў. Ён троху ведае фарсі. Распавядае мне, што спрабуе сёлета паступіць ува ўнівэрсытэт, але шанцаў вялікіх няма дзеля ягонай недасканалай пэрсыдзкай. Цяпер спрабуе зарабіць крыху грошай на навучаньне.

Увечары ён паказвае мне горад і знаёміць мяне з сваім сябрам-мастаком. Мы доўга размаўляем, седзячы на траве ў гарадзкім парку. Мастак просіць мяне заехаць да яго. Едзем па разьбітых дарогах, усё вышэй і вышэй. У ягонай сям'і апроч яго яшчэ два браты і дзьве сястры. Бацька пастаянна на заробках у Тэгеране, так што я яго і ня ўбачыў. Адзін брат працуе ў банку, другі - цырульнік, таму жывуць, на магабадзкія меркі, добра. Мяне ўгаворваюць застацца начаваць, і я пагаджаюся.

Увечары паразмаўляць са мной прыходзяць яшчэ колькі хлапцоў. Як заўжды, тэма для гутаркі - бесталковасьць ірацкіх курдаў і паганцаў Барзані ды Талабані (правадыроў ірацкіх курдаў). Як я разумею, тут прысутнічаюць асабістыя матывы. І Барзані, і Талабані любілі і любяць пагандлявацца з Тэгеранам, мяняючы ракеты на байцоў ДПІК ці Комалы, што хаваюцца на іх тэрыторыі…

Хлопцы кажуць пра нафтавыя грошы, якія дазволяць курдам збудаваць лепшае жыцьцё. Я заўважаю, што менавіта нафта не дала разьвівацца Ірану, які экспартуе апроч нафты толькі фісташкі ды дываны.

Курдыстан з прычыны сваёй беднасьці працягвае заставацца

парахавой бочкай Ірану. Тэгеранскі ўрад пасьля рэвалюцыі нібыта й палепшыў жыцьцёвы ўзровень, але зусім нязначна ў параўнаньні з рэштай краіны. Інакш і быць не магло, бо на пачатку 1980-х Курдыстан быў арэнай баёў паміж паўстанцамі й іранскім войскам.

Мяне зьдзівіла адсутнасьць у краі ўсякай прамысловасьці. У Курдыстане немагчыма дамагчыся дазволу на нейкае больш-менш значнае прадпрыемства. А ў Магабадзе, кажуць, быў час, што нават земляробствам перашкаджалі займацца. Тэгеран хацеў такім чынам прымусіць курдаў пакінуць горад, дзе пачыналася іх незалежнасьць. Марна.

Зранку выехаць назад мне не ўдаецца, і я чакаю аўтобуса ў парку. Саудавец Абдула казаў некалі мне ў Тэгеране: «Адзінае, што варта паглядзець у Іране, - гэта паркі». Вагабіт памыляўся - у Іране апрача сапраўды цудоўных паркаў багата яшчэ файнага. У парку можна пазнаёміцца зь дзяўчатамі, што зьяўляецца ў Іране справай няпростай.

Але цяпер вакол мяне бадзяюцца адно іранскія жаўнеры, якія, відаць, у адпачынку. Я сяджу й пішу ліст у Беларусь, чым прыцягваю да сябе ўвагу мінакоў, бо кірыліцы тут ня бачылі, відаць, з часоў Пімена Панчанкі (служыў тут у 40-х гг.). Ліст гэты так і не дайшоў да адрасата.

ХАРАСАН

Справы вымагаюць ехаць на скрайні ўсход краіны, да аўганскае мяжы, - у найвялікшую правінцыю краіны, Харасан. Яна мела адметны гістарычны лёс ды вызначаецца асаблівай культурнай спадчынай. Сёньня старажытны Харасан падзелены паміж Аўганістанам, Туркмэністанам і Іранам. Нейкай «нацыянальнай» сьвядомасьці ў жыхароў гэтых мясьцінаў няма, хаця яны вылучаюцца сваёй рэлігійнасьцю.

Адсюль паходзяць многія вядомыя асобы, такія, як Хаям, Фірдаўсі, Атар, Румі і г. д. Машгад - сталіца правінцыі, адна з шыіцкіх сьвятыняў (тут пахаваны іх сёмы імам Рэза), таму горад надзвычай шумны. Тут дужа горача, бо зусім побач пустыні. Едучы ў Машгад, даводзіцца праехаць па ўскрайку

адной зь іх.

Я прыехаў на машгадзкі вакзал жнівеньскай раніцай. Усе знаёмыя пакуль на працы, і мне давядзецца перачакаць колькі гадзінак. Іду да імама Рэзы, дакладней, у яго мэмарыяльны комплекс. Трэба пакінуць рэчы ў захавальні. Але куды дзець грошы? Найбольшая іранская купюра каштуе крыху больш за даляр. Ста даляраў даюць у эквіваленце ладны жмут паперы. Рассоўваю грошы па кішэнях нагавіцаў. На ўваходзе ахова спыняе мяне й патрабуе паказаць, што я хаваю ў кішэнях.

Маўзалей імама Рэзы ўражвае, хоць не кранае. Разам з натоўпам пілігрымаў прагна п'ю ледзяную ваду з цыстэрны. Пасьля доўга сяджу пад калёнай, бо сонца і пераадоленая тысяча зь лішкам кэмэ шляху даюцца-такі ў знакі па такой сьпякоце.

Пан Бог, відаць, пабачыў мае нягоды. Раптам узьнялася віхура, неба схмурнела, паветра напоўнілася неверагоднай колькасьцю пылу й сьмецьця. Усё гэта паляцела на мяне. І тут лінуў дождж! Вазьмеце самую вялікую беларускую залеву, павялічце разоў у дваццаць - тады вы зразумееце, што такое харасанскі дождж. Пыл на галаве імгненна намок, сарочка запэцкалася. Але горай тое, што многія вуліцы ператварыліся ў натуральныя рэкі. Зрэшты, празь дзьве гадзіны яны зноў былі сухімі, як да дажджу. Гэта быў адзіны дождж, пад які я трапіў за ўсё лета ў Іране.

Увечары з знаёмай дзяўчынай блукаем па месьце. Гэта досыць небясьпечная справа, бо дарма што ейныя бацькі ведаюць, куды мы ідзём, але ўсё адно просяць нас быць асьцярожнымі, каб ня трапіць у рукі *«комітэ»* ці *«басіджы»* (добраахвотныя захавальнікі маралі). Бо легальна вы можаце гуляць толькі з блізкімі сваячкамі (і пры гэтым мець пры сабе дакумэнты!). Таму, ходзячы па вуліцах, трэба пільнавацца, каб паблізу не было строгіх няголеных мужчынаў у чорных кашулях. Паліцыянтаў можна не баяцца, яны звычайна робяць выгляд, што іх гэта не датычыць. Зрэшты, і яны могуць прычапіцца да вас, каб злупіць якую капейку.

Калі зловяць - завязуць у пастарунак, выклічуць бацькоў,

адмысловы сьвятар прапануе пабрацца шлюбам. Калі ж у вас няма намеру браць шлюб у пастарунку ці наагул няма такога намеру, можна дастаць бізуноў ды штрафу. Гэта тады, калі бацькі вашае дзяўчыны ляяльна ставяцца да справы ці, прынамсі, ведаюць пра вашае сяброўства. Калі ж не…

Зрэшты, небясьпека падпільноўвае вас толькі на вуліцы. У таксі, кавярні ці рэстарацыі ніхто не пасьмее сачыць за вамі. Таксама можаце ўдаваць, што вы абое - іншаземцы. Увагі да вас будзе больш, затое ніхто ня будзе да вас чапляцца. Іншаземцам усё даруюць.

Назаўтра я ў гасьцёх у знаёмых, якія вучыліся ў Беларусі. У іх сабралася процьма сваякоў ды знаёмых. Сядзім на падлозе вакол вялікага абруса, на якім раскладзеныя стравы, - менавіта так, а не за сталом зазвычай харчуюцца іранцы, хаця і сталы, і крэслы ёсьць у кожнай хаце.

Ядуць іранцы больш, чым мы. Мы зазвычай абедаем, а ўжо праз гадзінку падмацоўваемся булачкай. Пасьля іранскага абеду я ўжо не вячэраў. Калі вы купіце на вуліцы тое, што тут называюць сэндвічам, хутчэй за ўсё, вам яго хопіць, каб паабедаць.

Я ўжо звыкся да пэрсыдзкіх манераў і не раблю найпершай памылкі эўрапейцаў, а пачынаю есьці плоў лыжкай (есьці плоў відэльцам - зьдзек з стравы). Мая знаёмая Бушра аж крыўдзіцца, калі бачыць гэта. Яна дэманстратыўна хапаецца за відэлец і сама пачынае «зьдзекавацца з стравы». Пры тым гучна прыгаворвае, што вось я ледзь трапіў на Ўсход і тут жа забыўся на ўсе правілы паводзінаў, а яна вось не - памятае, чаму яе навучылі ў Беларусі.

Далей болей. Раптам у маіх сяброў, якія ніводнага добрага слова пра нашыя парадкі не сказалі, пакуль былі ў Менску, знаходзіцца столькі пахвалы для нашай краіны! Яны апісваюць яе як свабодны, сучасны й разьвіты край. Я проста вушам сваім ня веру. Беларусь - краіна мары?.. Прысутныя за сталом у Беларусі, ведама, не былі і ўважліва слухаюць «менчукоў». Я толькі ўсьміхаюся й ківаю.

ВЯСЕЛЬЛЕ

Мяне запрашаюць на сапраўднае вясельле. Прасую свой «каляніяльны» гарнітур і прымаю як мага больш урачысты й парадны выгляд белага сахіба. На вясельлі я - трэцяя асоба пасьля маладых. Вясельле адбываецца ў некалькі этапаў. На першым, на які я і трапіў, усё ладзіцца ў садзе, падзеленым на дзьве часткі - адна завешаная для жанчын ды самых блізкіх сваякоў. Я, зразумела, належу да другой паловы, дзе паселі мужчыны.

Буду крывадушнікам, калі пахвалю цырымонію. Усё цікавае адбывалася на жаночай палове, і мужчынская палова лічыла гэта цалкам нармальным. На мужчынскай палове рабіць зусім не было чаго. Выбачайце мяне, харасанскія сяброве, але галосяць на беларускім пахаваньні неяк жывей, чым у Харасане весяляцца на мужчынскай палове вясельля. Мужчыны размаўляюць пра што заўгодна - бізнэс, палітыку, ураджай, але не пра вясельле. Жартуюць, што толькі папрывозілі сюды жонак ды знаходзяцца тут у якасьці кіроўцаў.

Абмеркаваўшы зь сябрам на талерцы плову тонкасьці пэрсыдзкай каліграфіі і стаміўшыся ў дваццаты раз тлумачыць усё новым і новым знаёмым тонкасьці эўрапейскага й беларускага жыцьця, зьбягаю з саду. З аднаго боку - голае поле і бязьмежжа камяністай пустэлі, зь іншага боку цямнеюць абрысы дамоў. Іду ў той бок. Сьцены, усюды сьцены. Аднак пачуцьця замкнутасьці не ўзьнікае. Цікава, што блукаць па цёмных вуліцах зусім бясьпечна, хуліганаў можна не баяцца. У краіне цяжка з алькаголем, але мноства наркаманаў, бо наркаты што гразі. Але ў наркамана няма таго баявога духу, які ёсьць у алькаголіка.

Празь нейкі час сябры шукаюць мяне па завулках. Вясельле, дзякуй Богу, ужо заканчваецца, на мужчынскай палове блізу што нікога няма. Падыходзіць мой стары сябра Маджыд і, падазрона пасьміхаючыся, пытаецца, ці спадабалася мне. Я дазваляю сабе нетактоўнасьць.

- Файнае вясельле, каб яшчэ й весялосьці, дык зусім было б добра.

- Гэта Харасан, такі звычай. Людзі на поўначы ладзяць супольнае вясельле і для кабетаў, і для мужчынаў, там шмат шумней і весялей. У Курдыстане вельмі вясёлыя вясельлі. А тут інакш.

- Разумею. Гэты горад занадта сьвяты, каб апаганіць яго весялосьцю.

Раптам мяне ў якасьці выключэньня запрашаюць на тую «завешаную палову», дзе могуць быць толькі сваякі. Прымаю ўрачысты выгляд і заходжу. На мяне накіравалі камэры і патрабуюць сказаць што маладым. На руках у мяне апынаецца соннае трохгадовае дзіця з зусім беларускім імем Німа (але ён ёсьць - маленькі акудовіч!). Тут жа робяць сэрыю пратакольных здымкаў мяне зь дзіцем. *White man's burden?*.. Бадзяюся паміж гасьцей. Тут музыка й танцы ёсьць. Праз гадзіну знаходжу-такі бацькоў Німы і вяртаю ім сына.

Урэшце вяртаемся зь сябрамі ў горад на старым пэйкане ўвасьмёх. У машыны гарыць толькі адзін паваротнік, і мы ляцім па неасьветленых завулках у цемры, а кіроўца распавядае, павярнуўшыся да мяне, пра свой бізнэс у Туркмэністане.

Назаўтра мае менскія знаёмыя вырашаюць мяне парадаваць. Яны таемна вараць для мяне бульбу. Я не магу схаваць сваёй радасьці. Увесь дом зьбягаецца паглядзець на маё шчасьце. У тых краёх штодзённым харчам зьяўляецца рыс, а бульба стаіць у кулінарным рэйтынгу нашмат ніжэй, і спажываюць яе мала. Я ж, сумуючы па ёй, журботна жаваў у Тэгеране бульбяныя чыпсы «Бомба», на маляўнічай упакоўцы якіх намаляваная зялёная жабка.

ДУХ ФІРДАЎСІ

Ляжу ўночы пад зорным небам. Не, мяне не выганялі з хаты. Справа ў тым, што ў мясьцінах гэтых дужа горача, таму найлепш спаць на даху ці ўва ўнутраным дворыку, балазе тамтэйшая архітэктура трымаецца прынцыпу захаваньня прыватнага жыцьця і ўнутраныя дворыкі ё ўсюды. Ні расы, ні дажджу не бывае. Паблізу - колькі садовых дрэўцаў, у куце -

ужо не захінутая маскавальнай сеткай спадарожнікавая антэна (забарона на яе зьнятая, але сетка ляжыць побач, як і раней, калі ёй закрывалі антэну падчас рэйдаў паліцэйскіх верталётаў). Абстаноўка райская, хіба гурый няма.

Назаўтра прашу сяброў падказаць мне месца, дзе мала турыстаў і многа «духу старажытнасьці». Яны накіроўваюць мяне на радзіму славутага паэта пачатку XII стагодзьдзя Фірдаўсі (і яшчэ некалькіх іранскіх славутых асоб), у горад Тус. Вялікае некалі месца ператварылася сёньня ў мястэчка. Каля яго мноства руінаў - памятак архітэктуры, у тым ліку даісламскіх часоў, якімі зусім не цікавяцца турысты, што прыяжджаюць толькі ў сам маўзалей іранскага песьняра.

Сядаю на маршрутны аўтобус тыпу ЛАЗ і праз паўгадзіны ў кампаніі сялянаў з рознымі гачкамі й палкамі-капалкамі трапляю ў сапраўдныя, нікому не патрэбныя разваліны. Ёсьць-такі нешта станоўчае ў міжнароднай ізаляцыі Ірану, бо тургрупы не паганяць гістарычных мясьцінаў.

Мэмарыял у Тусе народнаму песьняру паставіў яшчэ шаг. У яго, дарэчы, і цяпер шмат прыхільнікаў. «Шаг - то быў мужык, ня тое што цяпер!» - тлумачылі мне рабочыя ў тэгеранскім прымесьці. «Каб жа шаг вярнуўся, - журыўся дзядок у музэі Старажытнага Ірану. - Колькі ён усяго набудаваў!» Мне гэта нагадала тугу заходніх беларусаў па польскіх часах.

У Тусе ляжыць мноства грудаў гліны і камянёў, а пад імі - кучы сьмецьця. Гэта гарадзкія сьцены, якім больш за паўтары тысячы гадоў. Частку іх адрэстаўравалі, а частку пакінулі развальвацца далей. Я проста ў захапленьні - вось яна, сапраўдная забытая слава, непадфарбаваная для турыстаў гісторыя. Я адзін магу зь імі размаўляць гадзінамі. *Гэй, Хаям, мо і ты сядзеў пад гэтымі сьценамі дый еў сэндвіч, закусваючы агурком?*

У мэмарыяле Фірдаўсі я дакранаюся да грабніцы паэта й загадваю жаданьне. Непадалёк раскапаныя старажытныя вулкі, вузенькія-вузенькія дый зусім маленькія хацінкі. А яшчэ кажуць, што людзі драбнеюць!

У Іране поўна старажытнасьцяў. Усё-ткі колькі тысячагодзьдзяў

пісьмовай гісторыі. Многія мае сябры паказвалі мне фамільныя пэргамінавыя сувоі, напісаныя кручкаватым пісьмом, дадаючы, што менавіта на іх запісана, дзе схаваныя скарбы якога-небудзь Дарыя ці Кіра. (Дарэчы, ніколі не называйце гэтага славутага пэрсыдзкага цара такім імем пры іранцах. «Кір» азначае па-пэрсыдзку «хер». Пэрсы клічуць гэтага ўладара Куруш.)

Вакол маўзалею Фірдаўсі іранцы, расьсьцяліўшы посьцілкі проста паабапал дарогі, адпачываюць, п'ючы гарбату. Мне няма з кім выпіць гарбаты ў Тусе, бо прыехаў сюды адзін, а знаёміцца ні з кім ня хочацца. Замарыўся. Час вяртацца.

ДОМА

Здалёк Радзіма здаецца беззаганнай. Толькі трапіўшы на яе, пачынаеш згадваць пра нашыя беды. Яшчэ пару дзён мерзьнеш на сонцы і нязвычна прыглядаешся да дзяўчатаў бяз хустак. Галоўнае, што я прывёз з Ірану, - гэта разуменьне ці, дакладней, смак свабоды. А яшчэ жаданьне зноўку ўзьняцца ў горы, бліжэй да неба…
[image]
[image]

Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне [mk], Абнаўленьне [czyk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

Алеся Сёмуха Амэрыканскія занатоўкі: правілы гульні

Ня раз спрабавала занатаваць свае ўражаньні ад жыцьця ў Амэрыцы, але ўсё не ставала часу. Час - бадай, самае дарагое, што тут ёсьць. Можа, таму амэрыканцы ня любяць спазьняцца ці стаяць у чэргах - ня маюць на гэта часу. Хуткасьць жыцьця і ёсьць тым першым, што ўражвае і палохае тутака. Усё вірує ўдзень, увечары і ўначы. Адно спыняецца, яго падхоплівае іншае. І кожны ведае, што мае шанец схапіць удачу за руку, таму й рупіцца.

Амэрыка - краіна вельмі простых і натуральных жыцьцёвых правілаў, а амэрыканцы - вельмі, а часам і занадта аптымістычны народ. Многім эўрапейцам гэта падаецца прымітыўным і нават грубым. Неаднойчы даводзілася мне чуць ад знаёмых, што Амэрыцы бракуе духоўнасьці, тонкасьці і культурнасьці. Мне напачатку таксама так здавалася. Ну што за культура ў гамбургерах ды галівудзкіх баевіках? Але гэта, так бы мовіць, тандэтны экспарт. Прадукцыя ж для ўнутранага спажываньня нашмат багацейшая. Каб убачыць яе, трэба тут пажыць ці хацець убачыць. Зрэшты, неістотна, зь якога боку акіяну чалавек жыве. Нямала сустракала я сваіх землякоў, што

АЛЕСЯ СЁМУХА
нар. у 1968 у Менску. Скончыла філялягічны факультэт БДУ і аддзяленьне крымінальнага права «State University of New York». Жыве ў Вашынгтоне, працуе галоўным мэнэджэрам аддзелу маркетынгу ў паўночнай Амэрыцы і Эўропе кампаніі «Bowne Global Solutions Inc.» і карэспандэнткай беларускай

гады пражылі ў Амэрыцы з заплюшчанымі вачыма - хто ад страху і бездапаможнасьці, хто ад упартасьці, а хто ад звычайнай дурноты. І ў такім стане можна пражыць, нічога не бядуючы. Адно што ніякай сатысфакцыі. Хіба, вярнуўшыся на бацькаўшчыну, распавядаць пра тое, як там усё гібее.

Першае маё знаёмства з рэальнай Амэрыкай не было лёгкім. Давялося перавучвацца, засвойваць новыя правілы гульні, ці рэаліі, і перш за ўсё тое, што ў Амэрыцы кожны адказвае сам за сябе. А каб гэтая адказнасьць мела сэнс, кожны вольны рабіць, гаварыць ці верыць у што заўгодна (ці ня верыць). Вось табе, дзядзька, свабода, рабі з сабой што хоч. Хоч зарабляй грошы, а хоч не зарабляй, хоч ідзі ў прэзыдэнты, а хоч - на прэзыдэнта... Адно плаці дзяржаве падатак у залежнасьці ад даходу ды не прасі супу і асьпірыну, хіба што зусім бедны ці нягеглы. Страшная карцінка для саветамі ўзгадаванага чалавека. Свабода - гэта першае, ад чаго мая савецкая частка мазгоў адмаўлялася, абы ня браць адказнасьці, абы нехта забясьпечыў і гарантаваў. Вось гэтая сабачая прывычка і цягнула назад. Але цікаўнасьць і адчуваньне свабоды папіхалі наперад. Найперш трэ было вучыць мову, зарабляць на жыцьцё і асвойвацца ў новым сацыяльным асяродзьдзі. Пайшла вучыцца. Ня так важная была фармальная мясцовая адукацыя, як упэўненасьць у сабе і камунікацыя. І перад вучобай, і пасьля яе заканчэньня, пры ўладкаваньні на працу мяне ніхто ніколі не папрасіў паказаць дакумэнты пра адукацыю ці працоўную кніжку (зрэшты, панятку «працоўная кніжка» тут няма). Усё бралася на веру праз гутаркі і правяралася канкрэтнай працай. Што да працы, дык яе даводзілася шукаць праз агенцыі і газэты, рассылаць сотні заяваў, праходзіць тузіны сумоўяў з наймальнікамі, чуць не адно «мы з вамі скантактуемся». Аж нарэшце аднойчы нешта спрацавала, і я атрымала поштаю свой першы працоўны кантракт з абяцаньнем добрага заробку і ўсіх стандартных ільготаў карпаратыўнай Амэрыкі. Гэта было першае адчуваньне сапраўднай перамогі над сваім страхам. Грамадзтва канкурэнцыі карае страх і слабасьць досыць жорстка. Прымаўку «Галоўнае - не перамога, а ўдзел» амэрыканцы стасуюць да няўдачнікаў. Амэрыканскі дэвіз хутчэй гучыць як «Заўсёды імкнуцца да перамогі». Вядома, як і паўсюль у сьвеце, людзі тут розныя. Хтосьці - гулец, а хтосьці -

Свабода?
Гэта цікава
старонках
ную серыю
выданьня
«Беларус».

глядач. Але ўсе згаджаюцца, што роўнасьць немагчымая. Магчымая толькі свабода быць або тым, або іншым. Вось гэтая свабода і давала энэргію, якой не магло даць папярэдняе жыцьцё з гарантыямі.

Другая рэалія, да якой давялося прызвычайвацца, - цяжкая праца. Тут даводзіцца спаборнічаць за працоўнае месца і працаваць цяжэй і даўжэй. Гэтая традыцыя працы, што вядзе пачатак ад першых пратэстантаў-перасяленцаў з Эўропы, спалучаная з свабодай прадпрымальніцтва і неабмежаванымі рэсурсамі, спарадзіла своеасаблівы тып заходняга працаўніка - несупыннага вытворцы і адначасова спажыўца. Патрэба вырабляць, аднак, пераважвае патрэбу спажываць. Хоць ізноў-такі звонку здаецца, што амэрыканскі лад жыцьця - гэта суцэльнае спажываньне. У параўнаньні з эўрапейцамі амэрыканцы спажываюць меней у адсоткавым выражэньні, чымся ствараюць. Ня ведаю, якія на тое прычыны. Магчыма, гэта вера ў American dream. А можа, гэта тлумачыцца тым, што амэрыканцы ня маюць сыстэмы сацыяльнага забесьпячэньня і за ўсё мусяць плаціць з сваёй кішэні, таму й больш ашчадныя ў тратах. У Амэрыцы вы ня знойдзеце шыльдаў «замкнёна на абед» ці «рамонт» ані ў прыватнікаў, ані ў дзяржаўных установах. Амэрыканцы задавольваюцца шасьцю непрацоўнымі днямі ў год для дзяржаўных сьвятаў, у той час як немцы маюць 24. Права на вакацыі не існуе, як і права на працу. Зусім ня кожная праца гарантуе аплачаны адпачынак ці мэдычную страхоўку. Што да пэнсіяў, дык пераважная бальшыня амэрыканцаў (тыя, што хочуць жыць вышэй за рысу беднасьці) пра гэта мусяць паклапаціцца самі, адкладваючы грошы ўва ўласныя пэнсійныя фонды. Але цяжкасьць працы ня марная. Яна дае плён - грошы. Адны гэтыя грошы ўкладаюць у камфорт і матэрыяльныя даброты, другія - у вольны час. Я ж - у незалежнасьць ад беднасьці і змушанай працы ў старасьці. Гучыць амаль крамольна для маёй савецкай часткі мазгоў. Але што зь яе... Зь ёй я б да скону працавала на дзядзьку. Што й вядзе мяне да трэцяй рэаліі - выбару.

Зь першага дня жыцьця ў Амэрыцы давялося выбіраць. Якую ежу есьці, якую палітыку падтрымліваць, на якой мове гаварыць - усё, да апошняй дробязі, мусіла быць маім

рашэньнем. Ніякіх «ты мусіш». Выбар дае сапраўдную асалоду, нават калі ён невялікі, бо заўсёды можна зрабіць свой. Часам амэрыканцы пытаюцца ў мяне, чаму я засталася ў ЗША. Гэта як пытацца ў дзіцяці, чаму яно хутчэй хоча вырасьці дарослым, - бо ж ніхто мне ня будзе дыктаваць, якія газэты чытаць, які сьцяг шанаваць і якому богу маліцца. Але гэта ім цяжка растлумачыць, бо для іх яно натуральнае права. Для мяне ж гэта доўгачаканы скарб, які ўжо не магла б аддаць назад.

Свабода і праўнасьць, гэтыя простыя жыцьцёвыя перадумовы, і трымаюць у Амэрыцы мільёны імігрантаў мацней за тугу па бацькаўшчыне і цяжкасьці адаптацыі. Унутраная эміграцыя непараўнальна цяжэйшая за замежную. Пакуты замежнай - адлегласьць і прывычка. Трагедыя ўнутранай - адчужанасьць і бяспраўе.

Але як жа з духоўнасьцю і культурнасьцю? Сярэдні амэрыканец ня знойдзе на мапе сьвету Індыі і не гаворыць на некалькіх мовах. Але гэты стандарт культурнасьці больш эўрапейскі, чым амэрыканскі. Амэрыканцы за некалькі стагодзьдзяў выпрацавалі свой стандарт і ня надта дбаюць, як да яго ставіцца матухна Эўропа. Каб лічыцца ў Амэрыцы чалавекам культурным, зусім неабавязкова цытаваць на памяць Шэксьпіра і хадзіць на клясычны балет. Амэрыканскі стандарт - гэта спэцыялізацыя, адкрытасьць да новага і цярпімасьць. Сярод беларусаў бытуе пераканаьне, што наш народ талерантны, - міт, які можа быць праверaны толькі практычным суіснаваньнем рознага. Але дзе гэтае рознае і дзе суіснаваньне? Амэрыканцы ж адкрытыя і талерантныя практычна. Вядома, гэта не прыйшло адразу, з прыездам першых перасяленцаў і выцясьненьнем карэнных жыхароў кантынэнту. Цярпімасьць выпрацоўвалася на працягу стагодзьдзяў праз эканамічную і палітычную неабходнасьць міграцыі і свабоднае мысьленьне. Свабода і самаадказнасьць вымагалі і вымагаюць ад амэрыканцаў стварэньня ўласных, вельмі неаднародных культурных формаў. Адны маюць магчымасьць дамінаваць у поп-культуры, другія абмежаваныя асяродзьдзем і папулярнасьцю, элітарныя ці маргінальныя, але ўсе - існыя і неперасьледаваныя. Іхным суіснаваньнем і правяраецца амэрыканская талерантнасьць. Падобнае сужыцьцё і

супрацоўніцтва розных культураў ды расаў пакуль недасяжнае для збольшага монаэтнічных эўрапейцаў. Амэрыканцы ж навучыліся карыстацца гэтым як крыніцай энэргіі. Прасьцей кажучы, размаітасьць унутраных культурных формаў - гэта тое, чаго амэрыканцы не экспартуюць, а трымаюць для свайго спажытку і разбаўляюць дарагім выкшталцоным імпартам, які яны могуць сабе дазволіць. Экспартуецца ж тое, што лёгка прадаецца.

Для беларусаў, прывучаных за апошнія 80 гадоў да дзяржаўнай стандартызацыі формаў і зьместу культурнага жыцьця, гэткая размаітасьць здаецца размытасьцю. Там, дзе «павінен» існаваць Саюз пісьменьнікаў і пара-тройка вольных літаратурных суполак, існуюць сотні і тысячы саюзаў, груповак, тусовак і проста адзіночак. Ніхто не вызначае палітыкі, ніхто не дамінуе раз і назаўжды. Дзяржава не надае тытулаў і не навязвае любові да ляўрэатаў. Культура існуе па-за ёй, як і рэлігія, і часткова фундаваныя дзяржавай навука ды адукацыя. Я неяк паспрабавала асэнсаваць гэтую адасобленасьць праз вочы майго мужа-амэрыканца. Спытала яго, што ён думае пра ідэалягічны кантроль дзяржавы ў галіне культуры, навукі ці адукацыі. Ён не зразумеў, якая з гэтага можа быць карысьць той жа культуры ці дзяржаве. «Культуры - ніякай, дзяржаве - болей клопату, чым карысьці, а вось канкрэтным людзям, што ёй кіруюць, ёсьць - утрыманьне ўлады», - запярэчыла я. Ягоны адказ быў просты: чаго вартая ўлада над дзіравым чаўном? Натхні людзей стварыць цудоўны карабель і кіраваць ім, і насалоджвайся прагулкай. Кіруй найлепшымі памкненьнямі да стварэньня, а не зьнішчэньня. Хмм... Выбірай!

[image]
[image]

Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

Аліна Бельская
Дзіўная краіна Фінляндыя

АЛІНА БЕЛЬСКАЯ (нар. у 1979 у Менску) - магістрантка факультэту сацыяльных навук Хельсынскага ўнівэрсытэту. У Фінляндыі з 1997 году, куды эміґравала, ратуючыся ад крымінальнага перасьледу па справе Шыдлоўскага-Лаўковіча.

ПЕРШАЕ ЗНАЁМСТВА

Француз, амерыканец і фін пайшлі ў Індыі на паляванне і сустрэлі слана. Першая думка француза: «Цікава, як ён кахаецца?» Першая думка амерыканца: «Цікава, колькі ён зарабляе ў год?» Першая думка фіна: «Цікава, што ён думае пра Фінляндыю?» Такім анекдотам сустрэла мяне гэтая краіна. І сапраўды, трэцім пытаннем кожнай размовы было «Што вы думаеце пра Фінляндыю?». Спачатку я думала, што гэта такі дзіўны нацыянальны комплекс, але даволі хутка зразумела, што за гэтым пытаннем хаваецца вялікі гонар за сваю краіну, ды такі, што аж зайздросна робіцца. Але самым незвычайным вынікам гэтага пачуцця з'яўляецца тое, што ў адказ бальшыня чакае ад замежніка такога ж самага гонару за сваю краіну. Колькі разоў пры мне здаралася так, што як толькі чалавек пачынаў бяздумна ганіць сваю краіну, да яго гублялі цікаўнасць і павагу. Такая вось сур'ёзная краіна Фінляндыя.

MADE IN FINLAND - ЗНАК ЯКАСЦІ

Фінляндыя, ці Суомі, як сваю краіну называюць самі фіны, апошнім часам робіць сабе добрую рэкламу ў свеце. Да

сусветнага лексікону фінская мова дадала слова «саўна»; да стала - гарэлку «Фінляндыя»; да шоў-бізнэсу - Санта-Клаўса з Раваніемі; да інфармацыйных тэхналогій - «Нокію»; да дзяржаўнай палітыкі - паняцце «фінляндызацыя»; да міжнародных адносінаў - прэзідэнта Марці Ахцісаары, пасля міратворчых дзеянняў якога самым папулярным імем у Намібіі стала Марці; да жаночай эмансіпацыі - трох галоўных палітыкаў-жанчынаў: прэзідэнта Тар'ю Халанэн, прэм'ер-міністра Анэлі Ятэнмякі і мэра сталіцы Хельсінкі Еву Сітанэн; да музыкі - Яна Сібеліўса, «Апакаліптыку» і Расмуса; да літаратуры - Тувэ Янсан і мумі-троляў; да архітэктуры - Алвара Аалта; да дызайну - Тыма Сарпанэву і «Арабію»; да кінаіндустрыі - братоў Акі і Міку Каўрысмякі; да спорту - дык і не пералічыць.

Краіна маленькая, а вось унёсак даволі вялікі. Доўга думала, чаму так, разважала, якая фундаментальная, але цяжкаўлоўная рыса розніць іх ад нас. Магчыма, тое, што з прычыны малой колькасці насельніцтва фіны даражылі кожным чалавекам і заўсёды паважалі і падтрымлівалі асобу. Дагэтуль людзі старэйшага пакалення з жахам узгадваюць фотаздымкі часоў Фінскай вайны (1939-1940), калі Савецкі Саюз напаў на Фінляндыю, каб уключыць яе ў свой склад. Ад тагачасных карцінак з палёў бітваў дагэтуль дрыжыкі па скуры прабягаюць, бо на іх - цэлыя савецкія дывізіі, якія замярзалі да смерці, так і не пачаўшы біцца. Кожны раз прагляд гэтых фотаздымкаў выклікае ў фінаў аднолькавую рэакцыю - яны паціскаюць плячыма і пытаюцца: «Як так можна? Як чалавечае жыццё можа быць нічога не вартае?» Спачатку я спрабавала нешта адказаць, патлумачыць, што народу ў Савецкім Саюзе было шмат, пару мільёнаў замарозіць, пару дзясяткаў забіць - мала што мяняе ў жыцці вялікай імперыі. На такі мой адказ усе дзівіліся і казалі: «Такая маладая, а ўжо такая цынічная!» - і нястомна распавядалі пра каштоўнасць кожнага жыцця. Дарэчы, Расія для падтрымання свайго нацыянальнага міфу, які б ён там ні быў, ізноў спрабуе перапісаць гісторыю і ўскласці віну за пачатак Фінскай вайны на Фінляндыю, чатырохмільённую краіну, якая з якойсьці дзіўнай прычыны напала на 160-мільённы Савецкі Саюз.

Апрача Фінляндыі, мне пашчасціла крыху пазнаёміцца яшчэ з дзвюма заходнімі краінамі - Злучанымі Штатамі і Нямеччынай, але ні ў адной з гэтых краінаў я не сустрэла такой накіраванасці на выхаванне павагі да асобы і на развіццё асобы. У школе фінскія настаўнікі спрабуюць ацаніць моцныя ды слабыя бакі вучняў і вучыць, зыходзячы з гэтага; у выкладанні настаўнікі зыходзяць з таго, што трэба не прымушаць вучыцца, а паспрабаваць зацікавіць вучня праз розныя заданні, якія вучні выконваюць самастойна ці ў групах. Неяк праглядала падручнік з гісторыі, дык у ім вучылі чытаць газеты ды суадносіць гісторыю з тым, што робіцца ў сучасным свеце. Не дзіва, што пасля школы ў моладзі ўжо закладзеныя задаткі самастойнага мыслення і свайго погляду на рэчы.

У першы час было незвычайна тое, што пасля заканчэння школы многія маладыя людзі з'язджаюць ад бацькоў і пачынаюць цалкам самастойнае жыццё: самі зарабляюць грошы ды даволі часта жывуць са сваёй дзяўчынай ці хлопцам. Ледзьве не правілам добрага тону лічыцца гадоў да 25-27 паспець павучыцца ці папрацаваць за мяжой. Свая краіна хаця і адна з найлепшых у свеце па шматлікіх статыстыках, але галоўныя плыні, што віруюць у свеце, даходзяць са спазненнем, а хочацца ўсяго паспытаць і ва ўсім паўдзельнічаць, таму і даводзіцца часта пачынаць электроннае пасланне са словаў: «Ты цяпер у якой частцы свету?» Калі шчыра, дык я больш нідзе не сустракала такой упэўненай у сабе, начытанай і абазнанай у свеце моладзі.

Магчымасць падарожнічаць і аддаленасць фінскай мовы ад іншых эўрапейскіх дадае імпэту ў вывучэнні замежных моваў. Поруч з моцнай сістэмай адукацыі спрыяе гэтаму яшчэ і той факт, што ўсе тэлевізійныя праграмы на замежных мовах не дублююцца, а ідуць з субцітрамі, таму трэба вельмі моцна не хацець вучыць замежныя мовы, каб хоць нешта ў галаве не адклалася. Неяк адзін мой знаёмы дзівіўся: «Што гэта за краіна такая, дзе нават дворнікі па-англійску гавораць?» Відаць, людзей вельмі добра навучылі кіравацца прынцыпам знакамітага фінскага дзеяча Адраджэння Снельмана, які сказаў, што «багацце маленькай нацыі ў яе культуры».

КРЫХУ ПРА КУЛЬТУРУ

Пра фінскую культуру - ні пра высокую, ні пра папулярную - нельга размаўляць, не згадаўшы фінскай саўны. Саўна з'яўляецца часткай фінскай культуры ўжо некалькі тысячагоддзяў, і хоць ідэя саўны - гэта не фінская вынаходка, фіны гэтую ідэю запатэнтавалі, развілі і змадэрнізавалі. У Фінляндыі знайсці ванну ў кватэры амаль немагчыма - гэта лічыцца каталіцкай раскошай, для лютэранскай душы непрыстойнай, а вось саўну - калі ласка, бо яна загартоўвае і цела, і душу перад выпрабаваннямі жыцця. Калі ж некаторым не пашчасціла мець сваю саўну ў кватэры, дык у склепе пад'езду такая абавязкова будзе. Без саўны жыццё нават у горадзе немагчыма сабе ўявіць, таму шмат хто надае саўне ледзь не статус рэлігіі. Калі нехта запрашае да сябе ў саўну, гэта лічыцца праявай сяброўства і прыняцця ў сваё кола, таму адмаўляцца не рэкамендуецца.

Большасць гарадскіх саўнаў маюць печкі з электрападагрэвам, саўны на лецішчах разаграюцца дровамі, але самым шыкам лічыцца схадзіць у чорную, ці дымную саўну, печка якой не мае дымаходу, а дым збіраецца пад высокай столлю. Паход у саўну можа заняць увесь дзень. Падчас «саўнавання» не прынята нікуды спяшацца, гэта месца і час для расслаблення, медытацыі, вырашэння праблемаў свету ці, на крайні выпадак, сваёй краіны, але ні ў якім выпадку не асабістых, і прыняцця важных рашэнняў. Спачатку ў саўну ідуць жанчыны, затым праз гадзіну яны даюць месца дужаму полу, які пачынае падліваць вады на камяні, заганяць тэмпературу за 100 градусаў і спаборнічаць, хто даўжэй выседзіць. Спаборніцтва звычайна доўжыцца хвілінаў дзесяць, пасля чаго ўсе выскокваюць чырвоныя як ракі і бягуць у мора ці бліжэйшае возера ахаладзіцца. Парыцца і ахаладжацца ў тэмпе трэба як мінімум тры разы, пасля можна перайсці на палегчаны рэжым і ў перапынках папіць піва.

Былы прэзідэнт Фінляндыі Урха Кеканэн быў вялікім аматарам выкарыстання саўны як у сваіх асабістых, так і ў дзяржаўных мэтах. Урха Кеканэн лічыўся найлепшым перамоўцам з прадстаўнікамі Савецкага Саюзу. Даволі часта ён атрымліваў

тое, што хацеў, не ў апошнюю чаргу пры дапамозе гарэлкі ды саўны. Сваю палітыку ён праводзіў згодна з прынцыпам: «Голыя, расслабленыя палітыкі, якія пацеюць у саўне, прымаюць лепшыя і больш чалавечныя рашэнні, чым зацiснутыя ў вузкіх касцюмах, прыдушаныя гальштукамі асобы, якія пакутуюць у душных залах».

Сярод замежнікаў ходзіць анекдот, паводле якога можна вызначыць сваю прыналежнасць да фінскай нацыі: ты занадта доўга прабыў у Фінляндыі, калі лічыш, што мінус 20 на дварэ - гэта досыць цёпла, каб хадзіць без шапкі, а плюс 80 - занадта халодна, каб сядзець у саўне. Яшчэ адзін жарт падкрэслівае галоўную славутасць Фінляндыі, галоўную прыналежнасць фінскага мужчыны і галоўную рысу характару: Пека і Маці пайшлі ў саўну, селі на палкі, пасядзелі хвілінаў 10, тут Пека падымае бутэльку піва і кажа: «За здароўе!» На што Маці адказвае: «Мы сюды піць прыйшлі ці размаўляць?»

МАЎЧАННЕ І СВОЕАСАБЛІВЫ ГУМАР

Галоўнай рысай фінскай нацыі доўга лічылася маўклівасць. Калісьці яшчэ Бертальд Брэхт заўважыў, што фіны ўмеюць маўчаць на дзвюх мовах - фінскай і шведскай. Рэкламная кампанія першых мабільных тэлефонаў ішла пад слоганам «Каб фіны маглі больш размаўляць». З падобнага прыгадваецца яшчэ першая вечарына. Тут прынята пачынаць святкаванне Калядаў ужо недзе ў другой палове лістапада. Прыватна і на працоўных месцах ладзяць «малыя каляды» - вечарыны, дзе каштуюць глінтвейн, пернікі ды нападпітку жвава спяваюць караоке ці з задавальненнем робяць яшчэ якое глупства, за якое ўвесь наступны год саромеюцца. Дык вось неяк я патрапіла на пачатак такой вечарыны на сваім аддзяленні ва ўніверсітэце. Заходжу, аглядаюся па бакох - нікога няма, толькі нейкі голас чуецца са сталоўкі. Накіроўваюся туды, зазіраю ў прыадчыненыя дзверы і бачу, што вакол стала паўколам стаяць апранутыя ў чорнае людзі (тады я яшчэ не ведала, што жалоба ў адзенні пачынаецца з надыходам халадоў) і слухаюць сумную прамову (тады маё вуха яшчэ не прызвычаілася да амаль што безінтанацыйнай фінскай мовы, таму так і падалося). Я перапужалася, што папала на пахаванне, і цішком-цішком

пасунулася да выхаду. На наступны дзень запыталася ў знаёмых, хто памёр. Спачатку яны доўга не маглі зразумець, а калі зразумелі, пра што ідзе размова, доўга не маглі перастаць дзіка рагатаць, бо аказалася, што я папала на звычайную фінскую вечарыну, якую са сваім сярэднееўрапейскім тэмпераментам прыняла за пахаванне.

Да асаблівасцяў фінскага, а па-суседску і шведскага баўлення часу належаць 20-гадзінныя круізы ў мора і паездкі на пароме ў Швецыю, якія ўсе пяшчотна называюць п'янымі круізамі. У Хельсінкі на паром сядае пара тысячаў ахвочых павесяліцца, паром адыходзіць у мора і пачынае прадаваць бяспошлінны алкаголь, у выніку чаго пачынаецца непамерная весялосць: танцы, спевы і ўсё, што душа пажадае. Без такога круізу нельга сказаць, што ты паспытаў фінскага жыцця. Праўда, з расійскім мужыком спаборнічаць у літраболе ніхто не здольны.

З з'яўленнем сонца сітуацыя на вуліцах радыкальна мяняецца. Ужо ў красавіку з першым сонцам адкрываюцца тэрасы. Народ, захутаўшыся ў футры, шапкі, шалікі й пальчаткі, сядзіць на тэрасах і п'е піва, і, хоць стук зубоў чуваць аж за суседнім столікам, шклянку піва ў гонар надыходу вясны мусіш выпіць. Улетку ж з надыходам белых начэй пачынаецца сапраўднае святкаванне і кампанейства, якое пазначаецца тым, што на тэрасе з табой можа загаманіць незнаёмы чалавек - калі пашчасціць, вядома ж. Пра сацыяльныя здольнасці фінаў яны самі распавядаюць такі анэкдот:

- Чым адрозніваецца фін-экстраверт ад фіна-інтраверта?

- Пры сустрэчы фін-інтраверт глядзіць на свае боты, а фін-экстраверт - на твае. «СКОЛЬ!» - «ЗА ЗДАРОЎЕ!»

Праўда, гарэлка развязвае языкі нават самым маўклівым фінам, прычым піць трэба не ўсім вядомую «Фінляндыю», а мясцовую «Коскенкорву», ці, як яе ласкава называюць, «Косу» з рознымі варыяцыямі. Самы папулярны варыянт - гэта Салміякі-косу з лакрыцай, якая патыхае фенхелем. На наш смак дык гэта нешта такое, што можна прапанаваць нечаканым ці нялюбым гасцям, каб доўга не заседжваліся. Пад гарэлку дыскусіі звычайна не набываюць градусаў, хутчэй наадварот, робяцца

меланхалічнымі і разважнымі з усебаковым абмеркаваннем тэмы сэнсу жыцця. Гэта ім, відаць, у спадчыну ад Расійскай імперыі засталося, як і цэнтр сталіцы Хельсінкі, які называюць маленькім Санкт-Пецярбургам, з прычыны чаго Хельсінкі на пэўныя перыяды за савецкім часам рабіўся сталіцай сусветнага кінематографу. Калі дзеянне фільму адбывалася ў сапраўдным Пецярбургу, яго прыязджалі здымаць у Хельсінкі, ад чаго імідж Санкт-Пецярбургу ў вачах замежнікаў мусіў неймаверна палепшыцца, бо будынкі тут дагледжаныя, а вуліцы чыстыя.

ФІНСКІЯ ЦУДЫ - ЭКАНАМІЧНЫ ДЫ ЖАНОЧЫ

Але Фінляндыя можа быць удзячная Савецкаму Саюзу не толькі за кіно. Пасля другой сусветнай вайны згодна з мірнай дамовай паміж Фінляндыяй і Савецкім Саюзам Фінляндыя мусіла выплаціць пераможцу вялікія рэпарацыі, прычым прадукцыяй машынабудаўнічай прамысловасці, якой у Фінляндыі ў той час не было, бо да гэтага Фінляндыя гандлявала амаль што выключна сыравінай. Сціснуўшы зубы, падцягнуўшы паясы ды паклікаўшы на дапамогу пратэстанцкую этыку, фіны пабудавалі машынабудаўнічую прамысловасць і за сем гадоў выплацілі ўсе рэпарацыі. Гэты досвед і добра адукаванае насельніцтва дапамаглі і пасля, калі на пачатку 1990-х раптам не аказалася пад бокам Савецкага Саюзу, які як бяздонная бочка праглынаў усё, што толькі было даць. Фінская прамысловасць мусіла пераарыентавацца на новыя рынкі і, праскочыўшы цераз адну прыступку, стала ледзь не вядучай краінай у галіне інфармацыйных тэхналогіяў. Гісторыя «Нокіі» нечым нагадвае гісторыю Фінляндыі: усё пачыналася з тартаку, а скончылася мабільнымі тэлефонамі. Дарэчы, «Нокія» яшчэ дагэтуль вырабляе гумавыя боты паралельна з сотавікамі.

Але не гумавымі ботамі хацелася б скончыць, а чым-небудзь прыгажэйшым і цікавейшым. Хацелася б скончыць расповедам пра фінскіх жанчын. Фінляндыя, разам з іншымі скандынаўскімі краінамі, лічыцца краінай не толькі развітага сацыялізму, але і пераможнага фемінізму. Фінляндыя была першай краінай у свеце, дзе жанчынам у 1905 годзе было нададзена не толькі права голасу, але і права выбірацца ў парламент. З таго часу жанчыны вельмі актыўна карыстаюцца

гэтым правам, і Фінляндыя мела аднойчы жанчын на дзвюх галоўных дзяржаўных пасадах - прэзідэнта і прэм'ер-міністра адначасова. Шкада, што ў нас гэты інтэлектуальны рух так павольна набірае хуткасць, а слова «феміністка» яшчэ не перастала быць лаянкавым. Фемінізм, як гэта разумеюць фінкі, дае жанчыне большую свабоду быць сабой і не саромецца сваёй жаноцкасці ў жорсткім мужчынскім свеце. Хай усходнееўрапейскія мужчыны кажуць, што фінскія жанчыны не такія прыгожыя, як беларускі, але самі фінкі наконт гэтага асабліва не перажываюць. Нават фінскія актрысы падобныя да звычайных жанчын, а не да Барбі.

Добрая адукацыя, фінансавая незалежнасць і дакладнае веданне сваёй вартасці адкрываюць не толькі шмат магчымасцяў для напоўненага цікавымі падзеямі і сустрэчамі жыцця, але і для поўнасцю сведамага і добраахвотнага рашэння застацца дома.

Тут не пачуеш такога выказвання: «Такая прыгожая жанчына, а цікавіцца палітыкай, бізнесам, правам ці хоча займаць кіраўнічыя пасады, лепей знайшла б сабе мужа ды гадавала дзяцей».

ЗАМЕСТ ЭПІЛОГУ

У сваіх нататках пра Фінляндыю я прапанавала толькі некаторыя заўвагі пра рэчы, якія здзівілі, збілі з панталыку ці спадабаліся мне больш за ўсё ў Фінляндыі. Як і ў кожнай нацыі, у фінаў ёсць свае звычкі ці спосабы рабіць рэчы, якія мы назвалі б прыбабахамі ды замарочкамі. Розных расповедаў пра Фінляндыю і фінаў, сур'ёзных і не вельмі, развагаў аб падабенстве гісторыі Беларусі і Фінляндыі, анекдотаў пра нацыянальныя рысы ды і проста гісторый з жыцця набралася б на цэлую кнігу. Але скончу тут пажаданнем, каб кожнаму ў жыцці надарылася магчымасць наведаць Фінляндыю - сястру-блізнятку Беларусі, бо Фінляндыю таксама клічуць сінявокай і - краінай тысячы азёр.

[image]
[image]

Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**

Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21

[image]

Мікола Нікалаеў
Партрэт у Гарадышчанскім касцёле
Хроніка падзей

МІКОЛА НІКАЛАЕЎ (нар. у 1955 у Шчучыне) - супрацоўнік Расійскай нацыянальнай бібліятэкі, сябра вучонай Рады РНБ. Летась пераклаў на беларускую мову, зрэдаваўгаў і выдаў у Пецярбургу манаграфію Фрыды Турэвіч «Летапісны Новгородок старажытнарускі Наваградак». Апошняя публікацыя у «ARCHE» -

Сярод шматлікай і разнастайнай «беларусікі» Расійскай нацыянальнай (былой Імператарскай публічнай) бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу прыцягвае ўвагу аб'ёмістая (155 аркушаў) падшыўка разнастайных дакументаў з фірменнай наддрукоўкай на сіняй вокладцы: «Канцылярыя арцыбіскупа Магілёўскага, мітрапаліта ўсіх рыма-каталіцкіх касцёлаў у Расійскай імперыі». На ёй пяром і чарнілам рукапісны загаловак: «Справа аб Гарадышчанскім касцёле». Справа, што пачалася ў 1905 годзе, закончылася ўжо даўно і трагічна. Але, зазірнуўшы ў «Беларускую энцыклапедыю», мы зноўдзем толькі ўспамін аб узарваным у 1944 годзе фашысцкімі захопнікамі касцёле - нічога больш. Тым часам дакументы з сіняй папкі паведамляюць цікавы кавалак гісторыі пасёлку Гарадышча (менавіта так, а не «Гарадзішча», названы ён у старых паперах). Мы прапануем дакументальны пераказ гісторыі пра змаганне людзей - сялян, паноў, святароў - супраць паноўнай улады за сваю веру і годнасць. Змаганне было стваральнае, бо праводзілася ў жыццё праграма, якую адукаваныя чалавекі

мясцовага грамадства распрацавалі «для карысці вёскі і ваколіцы». У гэтым апавяданні, акрамя беларускіх палітычных і веравызнаўчых спраў, імёнаў і паселішчаў, ёсць яшчэ адзін фігурант - гэта Пецярбург. Тут, у доме паэта і сенатара Гаўрылы Дзяржавіна на Фантанцы, 118, знаходзілася канцылярыя рыма-каталіцкага арцыбіскупа - адсюль сачылі за Гарадышчам. Тут знаходзяцца Сенат і Сінод, тут Таўрыдскі палац, у якім у Першай Дзяржаўнай Думе засядае член Часовага камітэту па гарадышчанскім касцёле, дэпутат ад Менскай губерні Раман Скірмунт. На Загарадным праспекце жыве адвакат гарадышчанцаў Баляслаў Альшамоўскі, а на Неўскім, 6, працуе натарыус Забельскі, у якога Альшамоўскі завярае шматлікія копіі дакументаў. Напэўна, нехта з пецярбургскіх жывапісцаў напісаў партрэт…

Апавяданне разбіта на тры храналагічныя часткі, адпаведныя этапам гэтай мірнай барацьбы. Мы выкарыстоўваем цытаты з старога справаводства, таму часам прагучаць нязвыклыя моўныя звароты і да т. п. моўныя асаблівасці.

У 1662 годзе ў вёсцы Гарадышча, што на беразе Ясельды, побач з возерам Святым (цяпер яно «Палескае»), за 12 вёрстаў ад Пінску, полацкі ваявода Ян Караль Копаць заклаў кляштар і пры ім мураваны касцёл. Загадам Начальніка Паўночна-Заходняга Краю Расійскай Імперыі ад 25 красавіка 1865 году за № 1994 першакласны касцёл і бенедыктынскі манастыр пры ім былі зачынены. Менскі губернатар меркаваў перадаць будынкі кляштару і касцёлу праваслаўнай епархіі для пераводу сюды з Пінску манастыра і духоўнага вучылішча. Праваслаўныя адмовіліся ісці ў дазвання каталіцкую вёску, а 819 душ парафіянаў рыма-каталіцкага вызнання чакалі вырашэння лёсу сваіх святыняў. У лістападзе 1869 году будынкі касцёлу і кляштару з прыналежнай да іх зямлёй былі канфіскаваныя ў дзяржаўны скарб і прададзены сапраўднаму стацкаму саветніку (тытул, адпаведны генерал-маёрскаму) Дэлагардзі з умовай, каб будынак касцёлу быў знесены альбо перароблены ў жылое памяшканне з поўным змяненнем яго выгляду.

ЗМАГАННЕ. ЧАСТКА I (1897-1907)

У 1897 годзе, падчас следства аб крадзяжы ў маёнтку

Гарадышча, паліцыі сталі вядомыя наступныя акалічнасці: Дэлагардзі памёр, не выканаўшы да канца абавязкаў па сваёй нерухомасці. Будынак кляштару ён разабраў, а ў касцёле зняў толькі купал і мядзяны дах, пакрыўшы храм дахоўкай. Зямля з касцёлам перайшла ў спадчыну да ўдавы стацкага саветніка фон Гоера. У гэты ж час падпаручнік Антон Нелюбовіч-Тукальскі, шляхціч Юры Асмалоўскі і іншыя жыхары Менскай губерні звярнуліся да Ягонай Імператарскай Вялікасці, Гаспадара Імператара з прашэннем аб недапушчэнні зла будынку і аб дазволе ім выкупіць пляц з касцельным будынкам і цвінтаром. З прычыны гэтага прашэння менскі губернатар не палічыў неабходным патрабаваць ад спадарыні фон Гоер неадкладнага выканання абавязку па зносе касцельнага будынку. На пачатку 1899 году міністр унутраных справаў канфідэнцыйна паведаміў губернатару, што Ягоная Імператарская Вялікасць па хадайніцтве аб дазволе набыць будынак зачыненага Гарадышчанскага касцёлу 7 студзеня таго ж году зрабіў ласку загадаць: 1) азначанае хадайніцтва адхіліць і 2) прапанаваць менскаму губернатару не настойваць на прывядзенні ў выкананне пастановы аб разбурэнні альбо абсалютным змяненні выгляду касцёлу. Дзеля выканання гэтага загаду менскі губернатар аддаў сакрэтны загад Пінскай павятовай паліцыі аб непрад'яўленні да ўладальніцы маёнтку «Гарадышча» патрабавання аб зносе альбо пераробцы будынку былога касцёлу.

Напэўна, змест «сакрэтных» загадаў на шляху з Пецярбургу праз Менск і Пінск у Гарадышча зрабіўся вядомы зацікаўленым асобам. Як і безумоўная іншая ісціна: царская адміністрацыя мела на ўзбраенні шмат разнастайных прыёмаў і рычагоў для дасягнення сваіх мэтаў. У Менску вырашылі пакарыстацца лацінскім правілам divide et impera - падзяляй і пануй.

У верасні 1899 году гаспадыня маёнтку, Марыя фон Гоер, раптам прадала будынак касцёлу на злом пінскім яўрэям Ёселю Айзінману, Мойшу Эпштэйну і Лейбу Таўзісу. Калі ж азначаныя габрэі прыбылі ў маёнтак Гарадышча, сышоўся натоўп сялян і пагрозамі ды кіданнем камянёў не дапусціў пачатку працаў па зломе будынку - гэта з рапарту паліцэйскага чыноўніка. Адна з віленскіх газет пад рубрыкай «З Літвы,

Украіны і Беларусі» так напісала аб гэтым здарэнні: «Гарадышчане … выслалі ўсіх сваіх жанчын, каб перашкодзілі руйнаванню касцёлу. Пачэсныя гарадышчанкі так блізка да сэрца прынялі гэтую місію, што, падышоўшы пад касцёл, нарабілі вялікага ляманту. Новыя ўласнікі касцёлу, адчуваючы недарэчнасць такой куплі і азірнуўшыся на стромы бераг возера, дзе прысталі іхнія лодкі, у найвялікшай паспешнасці ўцяклі ў Пінск і занеслі ўладам скаргу, «што жанчыны бунтуюцца». Адразу ў Пецярбург на імя імператрыцы Марыі Фёдараўны пайшла тэлеграма сялян, у якой яны скардзіліся на памешчыцу фон Гоер за продаж хрысціянскай святыні іншаверцам. Імператрыца даручыла справу генерал-ад'ютанту Троцкаму, які зрабіў запыт менскаму губернатару. Тым часам у Пінску яўрэі (думаецца, з лёгкім сэрцам - бо атрымалі сумнеўны гешэфт) далі распіскі, што не будуць зносіць будынку да асаблівага распараджэння.

У траўні 1900 году міністэрства ўнутраных спраўаў з Пецярбургу просіць менскага губернатара паведаміць, ці працягвае ўласніца маёнтку Гарадышча Марыя фон Гоер настойваць на прывядзенні да выканання яе з Ёселем Айзінманам, Мойшам Эпштэйнам і Лейбам Таўзісам дамовы ад 7 верасня 1899 году і ці няма магчымасці захаваць гэты будынак, беручы пад увагу прыгажосць яго інтэр'еру, у якасці помніка мастацтва. Памешчыца адказала, што яна не настойвае на выкананні дамовы аб разбурэнні храму, аднак пры ўмове, што ёй будзе дазволена, каб пазбегнуць матэрыяльных стратаў, прадаць гэты будынак мясцовым сялянам-каталікам, каб тыя ўжо ўтрымлівалі яго ў належным для помніка даўніны выглядзе.

Са свайго боку менскі губернатар выказаў так, што хадайніцтва сп-ні фон Гоер, на яго думку, не падлягае задавальненню, бо дазвол мясцовым каталікам выкупіць будынак несумненна быў бы ўспрыняты былымі парафіянамі касцёлу як знак згоды з боку ўраду на аднаўленне зачыненага храму.

У 1905 годзе справа выкупу касцёлу спатыкнулася аб адсутнасць сродкаў, што відаць з «Рапарту» пробашча Пінскага касцёлу ксяндза Войціка мітрапаліту - у гэтым лісце ёсць і

звесткі аб гарадышчанскіх фрэсках: «…касцёл гэты… мураваны, знадворку значна папсаваны, дахоўка на страсе зусім рассыпаецца; у сярэдзіне засталіся голыя сцены, знізу падрапаныя і збэшчаныя надпісамі розных наведвальнікаў, якія на розных мовах пакінулі свае подпісы. Аднак увогуле сцены пафарбаваныя пэндзлем таленавітага мастака і там, дзе рука наведвальніка не дастала, вельмі далікатна выглядаюць, як толькі ўчора пафарбаваныя…» Далей ксёндз Войцік піша, што на выкуп касцёлу патрэбна больш за 12 тысяч рублёў, а з зямлёй і возерам - больш за 30 тыс. руб. Яму ж для рамонту Пінскага храму не стае 15-18 тысяч, а на іншыя патрэбы тым больш нічога нямашака… Напісаная ўпоперак рэзалюцыя мітрапаліта № 4535 датавана 30.08.1905: «Дзеля адсутнасці сродкаў куплю касцёлу адкласці да больш спрыяльных абставінаў». Гэтая рэзалюцыя датычыла толькі факту куплі. Адначасова мітрапаліт атрымаў прашэнне ад сялян Яна Савохі і Адама Гука дазволіць у гарадышчанскім касцёле набажэнствы. Як доказ таго, што храм знаходзіцца ў прыдатным стане, прыкладзены фотаздымак. Рэзалюцыя пралата Свідэрскага: «Прасіць Сп. Міністра аб дазволе ў гэтым касцёле багаслужбы». На фотаздымку вясковай святыні відаць інтэр'ер, дастойны багатага сталічнага храму.

ЗМАГАННЕ. ЧАСТКА II (1907-1909)

Рэвалюцыя 1905-1907 гадоў у Расеі паўплывала і на беларускія каталіцкія справы. Дэпартамент духоўных справаў замежных вызнанняў 30 лістапада 1907 году паведаміў менскаму губернатару, што не лічыць магчымым адмовіць жыхарам-каталікам вёскі Гарадышча Пінскага павету ў іхнім хадайніцтве аб дазволе ім адчыніць для багаслужбаў будынак раней зачыненага касцёлу, нагадаўшы, што, паводле новага закону 1906 году, для дазволу ўзнаўлення рыма-каталіцкіх касцёлаў неабходныя толькі згода адпаведнага рыма-каталіцкага епархіяльнага начальства, наяўнасць грашовых сродкаў і выкананне патрабаванняў Будаўнічага статуту. Таму, пісалі з Пецярбургу ў Менск, калі сп. Тэадаровіч (з 1903 году гаспадар Гарадышча) згодзіцца перадаць, на тых ці іншых умовах, будынак памянёнага касцёлу з пляцам пад ім тамтэйшым каталікам, то ім не можа быць забаронена адчыніць яго, на

памянёных падставах, для набажэнстваў. У хуткім часе даведка менскага губернскага архітэктара засведчыла, што сцены гарадышчанскага касцёлу выкладзены ў 9-10 цаглін, моцныя і будынак адпавядае патрабаванням Будаўнічага статуту да такога кшталту пабудоваў. У красавіку 1908 году сяляне-ўпаўнаважаныя Адам Гук, Ян Савоха і Станіслаў Коўб прасілі біскупа даручыць пінскаму вікарнаму ксяндзу Радзівону альбо дэкану ксяндзу Войціку адчыніць касцёл і правесці ў дзень Святога Духа набажэнства. На гэтае хадайніцтва кіраўнік справаў Магілёўскай арцыдыяцэзіі пралат Дзенісевіч адказаў, што не можа дазволіць богаслужэнне да таго, пакуль няма ведамкі ад пана Тэадаровіча адносна перадачы касцёлу. Адказ (на імя ўпаўнаважанага Станіслава Коўба) у арцыбіскупскай канцылярыі на набярэжнай Фантанкі, 118, надрукавалі, прысвоілі № 2436, падпісалі і адправілі… не па адрасе.

У канцы траўня 1908 году здзіўлены ксёндз Зэльба, адміністратар касцёлу ў Ваўчкевічах, прыслаў у канцылярыю Магілёўскага арцыбіскупа такі ліст: «Пры гэтым маю вярнуць рэляцыю № 2436 з тае прычыны, што ў маёй парафіі няма вёскі Гарадышча, у якой быў бы пабенедыктынскі касцёл, і прозвішча Коўба зусім не чуў». Справа адклалася.

Тым часам узнікла ініцыятыўная група асобаў, якая лістом на імя біскупа Стэфана Дзенісевіча пацвердзіла намер утрымліваць касцёл у Гарадышчы на свае сродкі. 9 кастрычніка 1909 году была напісана папера, дзе двое парафіянаў Гарадышчанскага касцёлу абавязваліся ўтрымліваць будынак храму ў належным выглядзе, паколькі ён будзе перададзены ў грамадскае карыстанне. Папера напісана рукой Рамана Скірмунта з Парэчча і падпісана таксама І. Кужанецкай. На наступны дзень падобны ліст падпісалі яшчэ восем асобаў - чатыры мужчыны і чатыры жанчыны (Канстанцыя Скірмунт, Леанціна Орда, Стэфанія Брэза і Аляксандра Бутрымовіч). Першым стаіць подпіс стрыечнай сястры Рамана Скірмунта Канстанцыі, якая жыла ў маёнтку Моталь. Гэтая пісьменніца, вядомая сваёй цікавасцю да гісторыі, якраз тады выдала ў Варшаве трэцюю кнігу з цыклу «Над Нёманам і Балтыкай». Кніга была прасякнута мясцовым літоўскім патрыятызмам і называлася «Міндоўг, кароль Літвы».

ПЕРАМОГА. ЧАСТКА III (1909-1917)

Калі ўсе ўмовы для распачынання багаслужбаў у Гарадышчы былі выкананыя, арцыбіскуп Стэфан Дзенісевіч афіцыйна дазволіў асвяціць касцёл і адслужыць імшу. Зрабіў гэта лунінецкі капелан ксёндз Станіслаў Іваноўскі. Пінскі дэкан 25 лістапада 1909 году даносіў у арцыдыяцэзію, што касцёл пасвечаны 18 лістапада, затым 21 лістапада была адслужаная ўрачыстая літургія і «ад гэтага часу штотыдзень з Пінску мае там служыць хто-небудзь з ксяндзоў па адной імшы - наколькі гэтаму не перашкодзяць непрадбачаныя акалічнасці».

У Пецярбургу на Фантанцы, 118 «трымалі руку на пульсе» - у папцы са справамі па Гарадышчы ляжыць змястоўная ў сваёй лаканічнасці тэлеграма ад 18.09.1909: «Сёння Гарадышча асвечана Іваноўскі». А «непрадбачныя акалічнасці» ўзніклі адразу ж. Ужо 9 снежня 1909 году менскі губернатар паслаў кіраўніку Магілёўскай арцыдыяцэзіі «Прадстаўленне», у якім паведаміў, што ксёндз Іваноўскі за незаконнае адкрыццё касцёлу прыцягнуты да суду, мерай стрымання для яго абрана падпіска аб нявыездзе, і прасіў спыніць «незаконныя» богаслужэнні. 7 студзеня 1910 году (роўна дзень у дзень юбілей разгляду справы імператарам і загаду «не бурыць») паступіў яшчэ адзін - вельмі рэзкі - ліст менскага губернатара з пагрозамі зачыніць касцёл не часова, а канчаткова.

Касцёл стаяў зачынены, а ў справе з'явілася яшчэ адна дзейная асоба - адвакат Баляслаў Губертавіч Альшамоўскі (Пецярбург, Загарадны праспект, 13, кв. 10). Арцыбіскуп Магілёўскі, мітрапаліт усіх рыма-каталіцкіх касцёлаў Расіі ў верасні 1911 году выдаў прысяжнаму паверанаму Альшамоўскаму даверанасць на прадстаўленне ўсіх інтарэсаў касцёлу і парафіянаў у справе Гарадышча ў Менскім акруговым судзе. У працэсе, які a priori меў палітычны характар, пецярбургскі адвакат стаў супраць менскай адміністрацыі. У якасці сведак былі пакліканыя пінскі паліцыянт Кільчэўскі, памешчык Тэадаровіч, сяляне Плюховіч, Тышко, Сямён і Аляксандр Лоі, Гарох, Мароз і Амельяновіч.

У «Справе Гарадышчанскага касцёлу» ёсць асобна пераплецены сшытак (45 старонак машынапісу) - плён працы

Альшамоўскага. Менскія чыноўнікі абвінавачвалі сялян з ініцыятыўнай групы ў тым, што яны без дазволу адрамантавалі (і гэтым самым прыстасавалі да магчымасці богаслужэньня) зачынены касцёл. Альшамоўскі пабудаваў абарону на доказах, што рамонт - справа зробленая, скончылася даўно і з тэрміну даўнасці не падлягае асуджэнню. Аднак суд пастанавіў, што рамонт - справа, якая мае працяг, і вырашыў наступнае: 1) сялян вёскі Гарадышча Пінскага павету Яна Савоху (45 гадоў), Адама Гука (67 гадоў), Станіслава Коўба (50 гадоў) і Васіля Казарына (50 гадоў) пакараць штрафам у памеры 50 рублёў з кожнага, з заменай арыштам пры паліцыі на два тыдні кожнага; 2) ксяндза Станіслава Аляксандра Іваноўскага прызнаць па судзе апраўданым. Апеляцыі ў Віленскую судовую палату і Касацыйны дэпартамент Сенату ў Пецярбургу вынікаў не далі - прысуд быў зацверджаны.

Невядома, што рабіў два тыдні ў паліцыі кожны з асуджаных, але напэўна яны вярнуліся дадому змагарамі і пакутнікамі за веру, а адвакат, які дамогся апраўдальнага прыгавору ксяндзу Іваноўскаму, стаў сімвалам справядлівасці. Пасля заканчэння працэсу ні прысяжны павераны Альшамоўскі, ні часовы Парафіяльны камітэт не спынілі намаганняў у адкрыцці храму - яны працавалі настойліва і ўпарта. Важным крокам стаў выкуп маёнтку: у чэрвені Міністэрства ўнутраных справаў на хадайніцтва Альшамоўскага дазволіла, а ў ліпені 1913 году натарыус Зміцер Васюковіч у канторы Пятра Пігулеўскага ў Пінску, на Кіеўскай вуліцы, аформіў купчую - гарадышчанскія сяляне Адам Гук, Ян Савох, Васіль Казарын і Станіслаў Коўб набылі ў калежскага саветніка Вікенція Тэадаровіча нерухомую маёмасць, а менавіта: «азёры пад назвамі «Святое» і «Гарадышча» з прыналежнай да іх зямлёй, на якой знаходзіцца прыстань пры рацэ Ясельдзе і сад, агароджаны цаглянай абгародкай, у якім знаходзіцца будынак зачыненага каталіцкага касцёлу са званіцай і цагляны недабудаваны дом…». У жніўні 1914 году хадайніцтва аб адкрыцці касцёлу знаходзілася ў сп. менскага губернатара, а 21 верасня таго ж году ў Петраградзе Дэпартамент духоўных справаў дазволіў рамонт і адкрыццё касцёлу для службаў.

У кастрычніку 1915 году мы знаходзім у Гарадышчы ксяндза

Адама Лісоўскага, які разам з вясковым старастам Васілём Тышком і панятымі Пятром Лагушкам ды Вінцэнтам Савохам склалі «Акт вопісу і ацэнкі касцельнай маёмасці». Пры гэтым сам будынак храму не быў ацэнены, як запісана ў акце: «З прычыны масіўнасці будынку касцёлу, пабудаванага ў стылі рэнесанс, і з прычыны велізарнай гістарычнай і мастацкай каштоўнасці старажытнага насценнага жывапісу «al fresco», які пакрывае ўсю сярэдзіну храму, што ў якасці старажытнага помніка дойлідства карыстаецца шырокай вядомасцю, ацэнку гэтага з прычыны некампетэнтнасці ацэншчыкаў зрабіць не было магчымасці».

Ці цяпер, на пачатку XXI стагоддзя, мы можам палічыць страты ад адсутнасці гэтага помніка, ці таксама «з прычыны некампетэнтнасці» не можам прэтэндаваць на ролю ацэншчыкаў нашага страчанага здабытку?

Сярод іншай маёмасці ў 1915 годзе згаданы абраз святой Ганны ў галоўным алтары, пісаны алейнымі фарбамі. Старажытны, мастацкі. Кошт 4000 рублёў. Ацэнка абраза зроблена на падставе водгукаў кампетэнтных наведвальнікаў храму. Яшчэ два абразы ацэнены па 500 рублёў: «Маленне аб чашы» і «Святы Бенедыкт» у срэбнай рызе. Тры абразы ацэнены па 200 рублёў і адзін - 100 рублёў.

Вопіс называе два старажытныя партрэты абатаў гарадышчанскага бенедыктынскага кляштару, старажытны партрэт заснавальніка кляштару і новы «партрэт дабрадзея касцёлу ў пазалочанай раме».

Жыццё складзенае так, што яшчэ не закончаны адзін яго эпізод, а ўжо пачынаецца другі. Не прайшло і году ад аднаўлення рэгулярнага богаслужэння ў Гарадышчы, а чальцы Часовага камітэту па Гарадышчанскім касцёле Раман Скірмунт (лістом ад 15.09.1915) і Канстанцыя Скірмунт (лістамі ад 17 лютага і 15 ліпеня 1915) турбуюць арцыдыяцэзіяльнае начальства разважаннямі пра пажаданую арганізацыю працы ў Гарадышчы і скаргамі на тое, што ксёндз А. Лісоўскі не надае сваёй парафіі дастаткова ўвагі. Раман Скірмунт - у гэты час чалец Менскага губернскага камітэту Ўсерасійскага земскага саюзу - уважліва ставіцца да спосабу выкарыстання маёнтку, што купілі на

грамадскія складкі.

Каб не быць галаслоўнымі, парафіяне складаюць і пасылаюць у Пецярбург «Мемарыял аб праграме, пажаданай для Гарадышча». Мемарыял гаворыць, што, «выкупляючы касцёл і маёнтак Гарадышча ў Пінскім павеце, людзі, якія гэта зрабілі, паставілі сабе наступныя мэты:

1. Дабіцца адкрыцця касцёлу, асадзіць пры ім пробашча і аднавіць парафію.

2. Праводзіць і развіваць у Гарадышчы грамадскую працу, ужо там раней распачатую (школу, рамёствы, узорны агарод) - для карысці вёскі і ваколіцы». Далей у сямі пунктах: «Маёнтак і яго прызначэнне» - праграма вываду маёнтку з запазычанасці банку, патрабаванне да біскупа зацвердзіць падзел абавязкаў пробашча і часовага Камітэту па кіраванні маёнткам, а з часам дэлегаваць кіраванне пінскаму Таварыству дабрачыннасці.

Шмат пазней, ужо пасля заканчэння другой сусветнай вайны, брат Канстанцыі Скірмунт Канстанцін узгадваў, што, калі Эліза Ажэшка хацела падарыць свой гарадзенскі маёнтак грамадскай арганізацыі, улада не дазволіла. А ў выпадку з Гарадышчам грамадскасць апынулася на вышыні!

Раман і Канстанцыя Скірмунты дамагліся свайго - хуткім часам менскі дэкан ксёндз Ягеловіч «для дапамогі пробашчу Гарадышчанскага касцёлу ксяндзу А. Лісоўскаму ва ўдзяленні духоўных патрэбаў мясцоваму каталіцкаму насельніцтву» пасылае ксяндза Аляксандра Астрамовіча (аднаго на Гарадышчанскі, Лунінскі, Лунінецкі і Осаўскі касцёлы), потым Астрамовіча замяняе ксёндз Ісідар Борыс, а ў траўні 1916 году ў Гарадышча пераязджае вікарны менскага Марыінскага касцёлу ксёндз Аляксандр Місевіч. Гэты чалавек стаў сведкам самых цяжкіх дзён Гарадышчанскага касцёлу, а яго рапарты, лісты і тэлеграмы сталі сведчаннем трагічных падзей. Вось ліст ксяндза Місевіча свайму арцыбіскупу ў Петраград ад 23 верасня 1916 году:
Excellentissime Domine! 19 верасня Гарадышча напаткала [illegible] няшчасце. Немцы абстралялі касцёл і рэшту гаспадарчых пабудоў, якія ацалелі ў часе вялікага пажару 27 траўня.

У касцёл трапілі 7 шасціцалявых снарадаў. Была моцна пашкоджана частка муру паміж уваходнаю брамай і бакавой капліцай з заходняга боку. З прычыны вялікага трасення пад хорам у адным месцы трэснуў мур, а ў капліцы, у сярэдзіне, адпала частка тынку разам з фрэскамі. Акрамя гэтага, быў разбіты бакавы алтар. Павыляталі шыбы з вокнаў.

Гэтаму абстрэлу не было ніякай відавочнай прычыны, бо расійскія вайсковыя ўлады ў справе кансервацыі касцёлу зрабілі ўсё, што было ў іх моцы.

З вялікім смуткам паведамляючы аб тым, што адбылося, прашу Вашу Эксцэленцыю аб звароце да Бога, каб Усявышні захаваў гэтую найпрыгажэйшую святыню ад далейшых няшчасцяў. Найніжэйшы слуга кс. Ал. Місевіч. Парахонск, 23 верасня, 1916.

З допісу таго ж ксяндза Місевіча ў арцыбіскупію мы дазнаёмся аб тым, хто ж паказаны на новым «партрэце дабрадзея касцёлу ў пазалочанай раме». Чытайма фрагмент апісання рабавання касцёлу салдатамі Ашалкерцкага палка ў чэрвені 1917-га: «… частка падсвечнікаў украдзена, частка зламана. Карціны з выявамі святых парэзаны. Партрэт дабрадзея касцёлу адваката Альшамоўскага працяты, відавочна, штыхом і прастрэлены куляй. Мошчы святых з алтароў вынеслі разам са скрынямі. Гіпсавыя фігуры анёлаў у галоўным алтары папсаваныя. Старажытныя люстраныя шыбы, што засталіся з часоў манахаў ордэну бенедыктынцаў, скрадзеныя… фісгармонія разбітая ў трэскі». Па факце вандалізму арцыбіскуп скардзіўся ваеннаму міністру.

FINIS

Гісторыя з Гарадышчанскім касцёлам мае сапраўды трагічны канец. Помнік дойлідства і мастацкай культуры разбураны. Сведчаннем пра яго ўнутраны выгляд з'яўляецца толькі пажоўклае старое фота, якое насілі міністру замежных вызнанняў Імперыі. Першае, што зрабіў НКВД у далучанай у 1939 годзе Заходняй Беларусі, - знайшоў і расстраляў 71-гадовага Рамана Скірмунта, былога члена Дзяржаўнае Рады гэтай Імперыі, а пазней раднага Рады Беларускай Народнай

Рэспублікі. Тое, што Раман Скірмунт быў актыўным сябрам часовага Камітэту па Гарадышчанскім касцёле і гэткім спосабам разам з суайчыннікамі змагаўся за сваю Радзіму і сваю святыню, яму не інкрымінавалі.

Трагічны канец не змяншае, аднак, магутнай пазітыўнай сілы гэтай гісторыі.
[image]
[image]

Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

АЛІСА БІЗЯЕВА
крытык, стваральніца літаратурнага рэсурсу litara.net. Нарадзілася ў Адэсе.

Аліса Бізяева Зьнікненьне аўтара: беларуская сеціратура

«Пра свой апублікаваны ў кнізе твор пісьменьнік кажа: ён больш не належыць мне. Але ў вачох чытача твор асацыюецца зь пісьменьнікам. Пры публікацыі ў Сеціве прападае і гэтая апошняя залежнасьць. Твор, які быў зьмешчаны ў Інтэрнэце і датуль не друкаваўся на паперы, НЕ НАЛЕЖЫЦЬ НІКОМУ…» (Marmon, 17.02.2003, Litara.net). У нас толькі цяпер пачынаецца літаратура новага кшталту - сеціратура, кібэратура. Адкрытасьць твору такой літаратуры дазваляе весьці дыялёг з чытачом ды крытыкам; нават увесьці гэтае абмеркаваньне ў тканіну аповеду, зьмяніць ці дадаць асобныя часткі ў любы момант існаваньня твору. Інтэрнэт-тэкст ня можа быць нечым замацаваным і скончаным. Ён звычайна застаецца адкрытым для працягу ды ўмяшальніцтва новых аўтараў, сюжэтных ліній.

Нават традыцыйны твор, патрапіўшы ў Сеціва, здабывае патэнцыял для новага разьвіцьця, ён можа ператварыцца ў чарнавік ці недапрацаваны матэрыял. Як сказаў адзін з удзельнікаў дыскусіі на сайце Litara.net Marmon, «Гюго або Сэлінджэр у Сеціве чытаюцца з тым самым адчуваньнем тэкставай вартасьці-нявартасьці, што і форумныя гавэнды

Кардонскага»[1] (Litara.net, форум Інтэртэкст, 17.02.2003).

Чытаньне ды ўспрыманьне твору, што зьмешчаны ў віртуальнай прасторы, таксама іншае. Гэта зазвычай актыўнае чытаньне, чытаньне з алоўкам, сьляды якога могуць быць адразу бачныя ўсім, у тым ліку аўтару тэксту. Тэкст у Сеціве падобны да гульні ў пінг-понг: аўтар пасуе, чытачы і крытыкі адбіваюць, надаюць новы вэктар і вяртаюць твор назад. Аўтар можа паправіць яго ці застацца глухім да парадаў, і гульня пачнецца наноў. Чым больш уважлівы да чытача аўтар, чым больш ён здольны завязаць гутарку на форуме, тым даўжэй цягнецца гульня - і ў выніку падчас прыземленай гутаркі можа сфармавацца літаратурная пэрліна.

Аднаго часу на сайце пра сучасную беларускую літаратуру Litara.net надзвычай часта сталі зьяўляцца паведамленьні, падпісаныя мянушкай Дон. Гэты пэрсанаж быў вельмі рознакаляровы ў сваіх перакананьнях і часам нават сам сабе супярэчыў. Але выказваньні ягоныя нельга было не заўважыць - нечаканыя, правакацыйныя, калі-нікалі даволі агрэсіўныя ў дачыненьні да астатніх удзельнікаў гутаркі. Пад гэтым нікам у форумах пісаў Сяргей Дубавец, называючы сябе собскім сабакам, які брэша на ўсіх, хто няшчыры ў сваёй любові да беларускай літаратуры. Можна было нават падумаць, што пэрсанаж дзейнічаў з сваёй волі й без дазволу чалавека, які яго нарадзіў. Падавалася, што сам Дубавец быў шчыра зьдзіўлены паводзінамі свайго стварэньня. Празь некаторы час спадар Сяргей паведаміў, што пад нікам Дон і некалькімі іншымі мянушкамі піша ня ён адзін, а яшчэ пяць чалавек, што таксама маюць доступ да гэтага ж кампутара. Ці паверыў хтосьці? Можа, і так. Але Дон застаўся супярэчлівым пэрсанажам Літары, і тое, колькі людзей удзельнічалі ў яго стварэньні, наўрад ці мае значэньне.

Ніколі не зьнікае зь першых радкоў форумаў на Літары нізка невялікіх твораў, якая кожны раз папаўняецца новымі рэалістычнымі замалёўкамі. Сьціплая назва «Абы пра што», а пад ёй Уладзімер Вашкоў, вядомы літаранцам як Палівач, распавядае сваё жыцьцё, успаміны, не зьмяняючы літаратурнага тону, адказвае на пытаньні сваіх чытачоў -

[1] Раман Кардонскі - адзін з наведвальнікаў сайту Litara.net, вядомы сваёй прыхільнасцю да дэтэктываў

наведвальнікаў Літары, якія ўцягваюцца ў гутарку, узгадваюць нешта і з свайго жыццёвага досьведу. У такім узаемадзеяньні ды ўзаемаўплыве нарадзіўся і дасюль ствараецца жывы шматаўтарскі твор, зь якога ўжо нельга зьнішчыць ніводнага сказу. Нехта падтрымлівае «гаспадара» і вядучага дыскусіі, нехта крытыкуе, але Палівачом кіруе думка: «Я бачу падабенства паміж вынаходзтвам Інтэрнэту і вынаходзтвам палкоўніка Кольта. Рэвальвэр Кольта зраўнаваў магчымасьці грамадзянаў Амэрыкі, забясьпечыў тым самым дэмакратыю. Інтэрнэт зраўнаваў таленты і бездараў. Добра гэта ці кепска, я ня ведаю» (Litara.net. Форум «Абы пра што», 27.07.2002).

Немагчыма ў творах сеціратуры шукаць аўтара, яго думкі ды ідэі, таму што адна зь яе асаблівасьцяў - калектыўнае аўтарства ці нават аўтарства саміх пэрсанажаў, што вядуць аповед, самастойна пішуць твор.

Сеціратура, штуршком і сродкам для разьвіцьця якой стаўся Інтэрнэт, - прастора, дзе гіпэраўтары й гіпэртэксты могуць рэалізоўвацца найбольш арганічным чынам. Тэкст становіцца багацейшым на сэнсы за той, які першапачаткова ствараў аўтар, ён можа выходзіць за межы асноўнай ідэі і атрымлівае разьвіцьцё ў новых напрамках, ствараючы сетку спасылак, сувязяў і асацыяцыяў. Тэкст перастае быць лінейным, таму што ён прымае розныя формы для кожнага, хто яго чытае.

Пісьменьнікі вынайшлі гіпэртэкст як сродак існаваньня літаратурнага сэнсу значна раней за зьяўленьне Інтэрнэту, але з стварэньнем літаратурных сайтаў стала магчымай літаратура з новай структурай ды ўзроўнем дынамічнасьці. Беларускія пісьменьнікі так ці інакш зьвяртаюцца да новых выяўленчых сродкаў, якія прапануе Інтэрнэт. Адам Глёбус піша раман «Дом», які, відаць, можа называцца раманам толькі ў віртуальнай прасторы, якая не адпавядае сапраўды буйным формам ды ня здольная ўтрымліваць сюжэтную лінію. Агульны сюжэт раману - гэта сувязі паміж яго героямі, але ў чымсьці і ўзаемаадносіны паміж удзельнікамі форумаў Літары, на вачах якіх «Дом» ствараўся, якія так ці інакш дапамагалі аўтару працягваць аповед. У пастскрыптуме да раману Адам Глёбус пералічвае ўсіх, хто ўдзельнічаў у напісаньні твору, і піша: «У

дзёньніку Кузьма Чорны пытаўся: «Хто напіша за мяне мае раманы?» Сапраўды, даводзіцца самому пісаць тое, што ніхто іншы напісаць ня зможа, самае сваё. Нарэшце завершана праца, напісаны першы беларускі раман у інтэрнэтным фармаце».

Усё часьцей на літаратурных сайтах і на асобных вэб-старонках зьяўляюцца безыменныя ці аўтарскія творы. Публікуючы свой твор ці частку твору на адкрытым рэсурсе, яны згаджаюцца «адкрыць» свой твор, уступіць у дыялёг з чытачом і крытыкам, якія часта паводзяць сябе фамільярна, не вытрымліваюць дыстанцыі. Коштам за гэткую фамільярнасьць можа быць больш дынамічная тканка аповеду, жывейшы малюнак падзеяў, сапраўдны дыялёг герояў, а не прапушчаны праз аўтарскае «я» жыцьцёвы досьвед. Ня кожны пісьменьнік, прызнаны ў рэальным сьвеце, на такое здольны.
[image]
[image]

Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне [**mk**], Абнаўленьне [**czyk**]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

Генадзь Лех
Як тварылася Міжрэгіянальнае аб'яднанне беларусаў Расеі

ГЕНАДЗЬ ЛЕХ (нар. у 1963 у Магілеве) - актывіст беларускай дыяспары ў Расеі. Скончыў Маскоўскі інстытут сталі і сплаваў. Загадвау лябараторыяй у адным з інстытуце лёгкіх сплаваў. Апошнім часам займаецца прыватным бізнэсам.

Упершыню размова пра неабходнасьць стварэньня агульнарасейскай арганізацыі беларускай дыяспары зайшла ў часе правядзеньня Першага зьезду беларусаў сьвету летам 1993 году. Гэта было пры канцы «рамантычнага» пэрыяду ў адраджэнскім руху, у пару вялікіх, але марных надзеяў на хуткае атрыманьне сваёй рэальнай, цывілізаванай эўрапейскай кватэры - незалежнай Беларусі. Шмат расейскіх беларусаў зьбіраліся вярнуцца (і вярталіся з надзеяй на лепшае жыцьцё і дабрабыт) на сваю Бацькаўшчыну. Але...

На Зьезьдзе пры падтрымцы Рады ЗБС «Бацькаўшчына» адбылося некалькі сустрэчаў кіраўнікоў суполак Масквы, Новасібірску, Пецярбургу і г. д. для абмеркаваньня гэтага пытаньня. У той жа час, у 1993 годзе, адбыліся зьезды ўкраінцаў і карэйцаў Расеі ды былі створаныя агульнарасейскія арганізацыі гэтых дыяспараў. Але ў беларусаў гэтая справа не знайшла рэальных выканаўцаў, бо вялікае патрэбы не было: суполкі імкнуліся мець кантакты ў першую чаргу зь Беларусяй,

а не міжсобку, дый Беларусь была мацнейшай, а тагачасны кіраўнік дзяржавы Станіслаў Шушкевіч з разуменьнем ставіўся да зычэньняў дыяспары.

Гэтак было да 1997 году, калі справы ў Беларусі ўжо ішлі зусім інакш. На гэты раз дыктатарскай Беларусі спатрэбілася агульнарасейскае аб'яднаньне беларусаў для падтрымкі панславісцкай ідэалёгіі й асабіста Аляксандра Лукашэнкі. 5 лютага 1997 году ў Менску адбылася афіцыйная «нарада прадстаўнікоў беларускіх суполак па пытаньні правядзеньня Зьезду беларусаў Расеі з мэтаю ўтварэньня агульнарасейскай арганізацыі беларусаў». Нарада адбывалася пад дахам грамадзка-культурнага таварыства «Радзіма», якое ў савецкі час было прыдаткам структур КДБ па працы з дыяспарай. Аб правядзеньні імпрэзы маскоўскія беларусы даведаліся выпадкова і адразу пажадалі прыехаць, бо праз сваіх землякоў атрымалі праграмку, у якой было пазначана, што на нарадзе будуць прысутнічаць дарадцы А. Лукашэнкі, прадстаўнікі беларускага Саўміну, мітрапаліт Філарэт, У. Замяталін, У. Латыпаў, іншыя вядомыя асобы. Мэтаю Зьезду ў задуме ягоных арганізатараў мусіла стаць падтрымка дыяспарай А. Лукашэнкі і ідэяў «саюзу», а ў пэрспэктыве - утварэньне паралельнага аб'яднаньня дыяспары ў сьвеце, у процівагу існаму ЗБС «Бацькаўшчына». Найсьмяшнейшае было тое, што пытаньне правядзеньня Зьезду беларусаў Расеі меліся вырашаць досыць адыёзныя асобы з Прыднястроўя, Башкартастану, Арменіі й Чарнігаўшчыны. Напрыклад, дэлегацыя з Арменіі ўяўляла сабою дзьвюх жанчын-габрэек з «Славянскага дому Арменіі», якіх у беларускіх справах нічога не цікавіла. На самім сходзе прамаўлялі толькі дарадцы Лукашэнкі - беларускамоўныя Яновіч і Гурко, невядомыя нам прадстаўнікі Саўміну, што ўразілі благой беларускай мовай, а розныя «славянасабораўцы» нат не высоўваліся. Першай рашуча выказалася супраць прапановаў арганізатараў мая, маскоўская дэлегацыя.

Пасьля заявы маскоўскіх беларусаў астатнім не было чаго казаць, акрамя агульных словаў пра «еднасьць народаў былога СССР». Настрой у арганізатараў быў сапсаваны. Маскоўская суполка пры падтрымцы піцерскіх беларусаў настаяла на тым, каб адкласьці разгляд і абмеркаваньне справы. Такім чынам,

пралукашэнкаўскі зьезд восеньню 1997 году не адбыўся, бо рэальна дзейныя суполкі дыяспары або ўстрымліваліся, або былі супраць. Але справа на гэтым ня скончылася. Дзеля ідэалягічнай падтрымкі ў Расеі і сьвеце лукашэнкаўскай дыктатуры ўсё адно было патрэбнае стварэньне новага паралельнага згуртаваньня беларускай дыяспары. Хай сабе і фармальнага.

Летам 1997 году ЗБС «Бацькаўшчына» праводзіла ў Беластоку чарговую навукова-культурную канфэрэнцыю «Культура беларускага замежжа». На гэты сход ад Расеі прыехалі кіраўнікі пяці найбуйнейшых суполак зь Пецярбургу, Іркуцку, Масквы, Новасібірску і Калінінграду. Пасьля канфэрэнцыі адбылося абмеркаваньне пытаньня аб правядзеньні Зьезду беларусаў Расеі. Старшыні пецярбурскага і маскоўскага таварыстваў беларускай культуры, найбуйнейшых і найстарэйшых, дамовіліся правесьці ў Маскве на пачатку 1999 году Зьезд беларусаў Расеі. Прадстаўнік Іркуцку Алег Рудакоў станоўча паставіўся да гэтага рашэньня і пазьней увайшоў у аргкамітэт Зьезду, а старшыня Новасібірскага таварыства ўстрымаўся (пазьней перайшоў на бок рэжыму). Прадстаўнік Калінінграду (сп. Шаховіч) паведаміў, што ягоная суполка ўваходзіць у Аб'яднаньне беларусаў Балтыі і ўдзельнічаць у расейскіх справах пакуль не зьбіраецца.

На працягу 1998 году маскоўскае ТБК інфармавала існыя суполкі і зацікаўленых асобаў аб падрыхтоўцы Зьезду. Быў створаны яго аргкамітэт, які на сваім паседжаньні вырашыў правесьці Зьезд беларусаў РФ 27 сакавіка 1999 году (найбліжэйшая да 25 сакавіка субота). З гэтаю мэтай аргкамітэт мусіў уступіць у кантакт зь Міннацам Расеі, Мінюстам Расеі і дэпартамэнтам па міжрэгіянальных сувязях маскоўскай мэрыі. Усе гэтыя расейскія ўстановы напачатку досыць прыхільна паставіліся да ідэі Зьезду. Мінюст Расеі даў даведку: на 1 верасьня 1998 году ў Расеі дзейнічала 14 афіцыйна зарэгістраваных у 1988-1995 гадох суполак, але, як высьветлілася, тры зь іх фактычна спынілі сваё існаваньне ў 1994-1996 гадох. Пры гэтым новыя не ствараліся, бо становішча ў самой мэтраполіі - Беларусі - не спрыяла гэтаму. Міннац Расеі паведаміў, што ён дасьць памяшканьне і возьме

на сябе расходы на прыезд дэлегатаў. Дэпартамэнт мэрыі ўзяў на сябе расходы па разьмяшчэньні дэлегатаў Зьезду. Маскоўскае таварыства, згодна з законам, за свой кошт надрукавала аб'явы пра час і мэту правядзеньня Зьезду ў шэрагу цэнтральных газэтаў. Адбылося дзьве сустрэчы з удзелам прадстаўнікоў мэрыі, Міннацу і аргкамітэту Зьезду, на якіх абмяркоўваліся ўзоры запрашэньняў, колькасьць дэлегатаў Зьезду і ганаровых гасьцей, здымкі дакумэнтальнага фільму пра Зьезд і іншыя тэхнічныя пытаньні. Добрае стаўленьне да аргкамітэту Зьезду з боку расейскіх урадавых структураў доўжылася да 11 студзеня 1999 году, пакуль чыноўнікі Міннацу не адмовіліся ад далейшага супрацоўніцтва на падставе інфармацыі лукашэнкаўскай амбасады ў Маскве, што дзейнасьць аргкамітэту Зьезду беларусаў супярэчыць «працэсу аб'яднаньня Беларусі і Расеі». На наступны дзень адмовілася ад супрацоўніцтва і мэрыя (пакінуўшы за сабой статус назіральніка ад расейскіх уладаў). З гэтага часу замест дапамогі ў правядзеньні гэтага Зьезду пачаліся перашкоды.

Што ж яны хацелі? Каб мы падтрымлівалі «аб'яднаньне Беларусі і Расеі»? Безумоўна ж, сапраўдны беларус ня будзе падтрымліваць акупацыі сваёй Радзімы! У той жа дзень чыноўнік Міннацу паказаў афіцыйную даведку ад Мінюсту, што на працягу апошніх двух месяцаў у Расеі зарэгістравана 42 (!) новыя беларускія суполкі і працэс працягваецца. Аргкамітэту Зьезду ўдалося высьветліць найцікавейшыя акалічнасьці: 1) стваральнікамі новых арганізацыяў зьяўляюцца, як правіла, тры асобы, найчасьцей адстаўныя службоўцы «сілавых структураў РФ»; 2) навастворaныя структуры маюць чатыры тыпы назваў: а) «Белорусско-славянский спортивный клуб г. Омска» и г. д., б) «Общество поддержки объединения Белоруссии и России и лично Президента Лукашенко г. Пскова» і г. д., в) рэгіянальныя фэдэральныя аўтаноміі беларусаў Комі, Карэліі і г. д., г) рэгіянальныя «белорусские землячества афганцев, интернационалистов і г. д. Москвы, Ленинградской области» і г. д.; 3) кантактныя тэлефоны і адрасы гэтых структураў, за выняткам навастворaных рэгіянальных аўтаномій, стварэньнем якіх займаўся Міннац РФ, часта зьяўляліся «ліпавымі»; 4) стварэньне і рэгістрацыю новых структураў курыраваў «кадравы рэфэрэнт» амбасады Беларусі ў Расеі. Амбасада ж і

фінансавала гэты працэс.

Пры канцы студзеня чыноўнікі Міннацу, Мінюсту РФ, лукашэнкаўскай амбасады, мэрыі Масквы і выканкаму Саюзу Беларусі і Расеі стварылі свой Аргкамітэт па правядзеньні зьезду на чале зь віцэ-прэм'ерам маскоўскага ўраду Францішкам Каўрыгам. Гэты аргкамітэт прыняў рашэньне аб правядзеньні Сходу па ўтварэньні Фэдэральнай аўтаноміі беларусаў у Расеі 2 красавіка 1999 году. Пры гэтым, згодна з законам аб Фэдэральнай культурнай аўтаноміі, неабходна было мець рэгіянальныя аўтаноміі больш чым у палове суб'ектаў РФ, што нерэальна было выканаць нават для іх. На гэта адзін з удзельнікаў гэтай «дзеі», загадчык Галоўнага ўпраўленьня выканкаму Саюзу А. Чарняк выказаў меркаваньне, што беларусы - нацыя спэцыфічная, іх цяжка на штосьці арганізаваць, таму Міннацу і Мінюсту трэба «падумаць», як «афарміць» гэтае ўтварэньне. Такім чынам, беларускія суполкі Расеі арганізоўвалі свой зьезд, а імпэрская намэнклятура - ФАРМАЛЬНЫ свой.

УСЯГО ГРОШЫ ДАЛІ БОЛЬШ ЗА СТО ЧАЛАВЕК

У гэтых надзвычайных варунках маскоўскае таварыства культуры правяло некалькі сходаў, сустрэчаў зь нешматлікімі беларускімі бізнэсоўцамі, пусьціла шапку па коле і талакой за два тыдні сабрала неабходныя грошы. Асабліва трэба падзякаваць спсп. Мішчанцы, Буку, Валюжэнічу, Бабарэку, Шкілёнку, якія разам унесьлі каля 1100 даляраў. Усяго грошы далі больш за сто чалавек, і неабходная сума хутка сабралася. Насуперак усяму, у настроях людзей панаваў уздым. Аплацілі залю ў ЦДЛ, апаратуру, гатэль, кавярню. Прадстаўнікі Іркуцку і Пецярбургу, што ўваходзілі ў аргкамітэт, ня мелі магчымасьці фінансава дапамагчы Зьезду, але дапамагалі інфармацыйна. Аргкамітэт зьвярнуўся да рэгіянальных адміністрацыяў РФ зь лістамі пра выдзяленьне дэлегацыям сродкаў на дарогу ў Маскву, і сродкі былі выдзеленыя. Толькі лукашэнкаўская амбасада працягвала шкодзіць, дасылаючы запрашэньні на свой сход і дэзынфармуючы беларускія суполкі. У прыватнасьці, невядомы супрацоўнік пасольства за чатыры дні да правядзеньня нашага, незалежніцкага Зьезду паведаміў

якуцкай дэлегацыі, што маскоўскія беларусы, маўляў, свой зьезд адмянілі і будуць удзельнічаць у «супольным сходзе 2 красавіка». Дык якуцкая дэлегацыя з шчырае душы і здала квіткі на самалёт. Самае нахабнае, што гэты «невядомы» спасылаўся на старшыню аргкамітэту Генадзя Леха...

І ўсё-такі Зьезд адбыўся. 27 сакавіка сабраліся прадстаўнікі суполак з Масквы, Пецярбургу, Іркуцку, Майкопу, Краснаярску (краявая аўтаномія), Цюмені, Маскоўскай і Ўладзімірскай абласьцей. Усяго прыехалі 76 дэлегатаў з правам голасу ды пяць дзясяткаў гасьцей, у тым ліку дэлегацыя Беларусі ў складзе Станіслава Шушкевіча й Сямёна Домаша, дэлегацыя ЗБС «Бацькаўшчына» (Ганна Сурмач і Барыс Стук), прадстаўнік Дэпартамэнту маскоўскай мэрыі па працы з славянскімі нацыянальнасьцямі Т. Волгіна, прадстаўнікі іншых дыяспараў Масквы, вядомыя барды Зьміцер Бартосік і Віктар Шалкевіч, прадстаўнікі СМІ зь Беларусі, радыё «Свабода» і іншыя. У расейскіх СМІ беларуская імпрэза асьвятленьня не атрымала, бо ў гэты час іх займала тэма Косава і хуліганскіх нападаў на амэрыканскую амбасаду ў Маскве. Будынак амэрыканскай амбасады, у які ляцелі фарба і яйкі, знаходзіўся за 400 мэтраў ад будынку ЦДЛ, дзе ішоў Зьезд беларусаў. У гэты ж дзень у Маскве праходзіў устаноўчы зьезд Саюзу правых сілаў. Цікава, што адтуль па С. Шушкевіча прыслалі «Мэрсэдэс». Аўто прастаяла чатыры гадзіны, але ён адмовіўся ехаць, кажучы, што яму важна быць тут, з роднымі беларусамі.

Зьезд пачаўся з абраньня Прэзыдыюму, у які ўвайшлі Ганна Сурмач, Станіслаў Шушкевіч, Генадзь Лех і Валянцін Грыцкевіч. Ахову Зьезду несла дружына маскоўскіх беларусаў (дзякуй Алесю і Янку Курысам, Алесю Калядзе). Заля была ўбраная бел-чырвона-белымі сьцягамі, гербам «Пагоня», бел-чырвона-белымі кветкамі. Перад урачыстым адкрыцьцём Зьезду маскоўскі фальклёрны гурт «Алеся» выканаў гімн «Магутны Божа». Акрамя ўрачыстае часткі, да абеду прагучаў грунтоўны даклад Анатоля Грыцкевіча пра стан беларускага руху ў Расеі. Пасьля абеду адбыліся выбары Рады Міжрэгіянальнага аб'яднаньня беларусаў Расеі, прыняцьце Статуту МАБР. Прэзэнтаваліся выданьні: маскоўскіх беларусаў - «Шляхам Скарыны», іркуцкіх - «Маланка», пецярбурскіх беларусаў-

каталікоў - «Крыніца». Старшынём Рады МАБР быў абраны аўтар гэтых радкоў, намесьнікамі - Анатоль Грыцкевіч (Пецярбург) і Алег Рудакоў (Іркуцк), сакратаром Рады МАБР - Таіса Мішчанка, сябрам Рады - вядомы бізнэсовец беларускага паходжаньня Анатоль Сілівончык зь Цюмені. Галоўным рэвізорам быў абраны Яўген Чапко.

Мы двойчы падавалі паперы на рэгістрацыю МАБР, яны прайшлі дзяржаўную і недзяржаўную экспэртызу. Тым ня менш, у рэгістрацыі МАБР было адмоўлена. У размове чыноўнік упраўленьня юстыцыі дакараў: «Деятельность Вашей организации противоречит процессу объединения Белоруссии и России...»

СУСТРАКАЎ СЬВІСТ - ЗА МОВУ ДЫ ПРАПАНОВЫ

2 красавіка пры паўпустой залі адбыўся Сход па ўтварэньні аўтаноміі «Белорусы России» пад расейскім і лукашэнкаўскім сьцягамі, з прывітальнымі словамі ад Лукашэнкі й Ельцына, з удзелам урадавых дэлегацыяў. Адзіным беларускамоўным выступоўцам быў урадавы дэлегат зь Беларусі. Затое былі прынятыя патрэбныя Заявы аб падтрымцы Лукашэнкі і палітыкі інкарпарацыі. Мінюст і Міннац РФ хуценька зарэгістравалі гэтае згуртаваньне.

У выніку двух праведзеных Зьездаў аформіліся два беларускія згуртаваньні - «фармальнае» і «нефармальнае». Нягледзячы ні на што, МАБР пачаў дзейнічаць, да яго пачалі далучацца «старыя» суполкі, што захоўвалі «нэўтралітэт». Галоўная задача МАБР - інфармацыйная каардынацыя дзейнасьці беларускіх суполак - выконваецца. МАБР існуе як рух і ідэя. Далейшы лёс МАБР у значнай ступені залежыць ад падзеяў у Беларусі як мэтраполіі беларускага руху і ў меншай ступені - ад падзеяў у Расеі і сьвеце, ад фармальнай рэгістрацыі і стаўленьня ўладаў. Галоўнае, што беларусы РФ не засталіся статыстамі ў прыкрых гульнях. На апошнім Зьезьдзе ЗБС «Бацькаўшчына» дэлегацыю афіцыёзных «аўтанамістаў» з РФ сустракаў сьвіст - за мову ды прапановы. Пасьля непамыснага для лукашэнкаўцаў разьвіцьця падзеяў у беларускай дыяспары працэс стварэньня сусьветнага таварыства «кішэнных беларусаў» заціх.

Дый нават у Расеі на апошняй (восень 2002 году) канфэрэнцыі «аўтанамістаў» аб наяўнасьці заявілі ўсяго 14 суполак (зь іх толькі 5 аўтаномій). Астатнія 28 прапалі бяз знаку. А мы - жывём!

Ганіф Курэйшы
Доўгія языкі й свабода

ГАНІФ КУРЭЙШЫ (нар. у 1954 у Бромлі, Англія) паходзіць зь сям'і пакістанца і англічанкі. Яго самыя вядомыя раманы гэта *«The Buddha of Suburbia»* і *«The Black Album»*. Больш інфармацыі пра яго можна знайсьці на сайце www.hanifkureishi.c

Гэты тэкст - газэтная вэрсія прамовы, зробленай

Узорны дысыдэнт Оскар Уайльд, чыё пакараньне ня здолела зьнішчыць напісанае ім, але дало нам добрую навуку, кажа: можа завесьці доўгі язык, пісаў пры канцы XIX стагодзьдзя: «Калі людзі апавядаюць нам пра іншых, гэта звычайна гучыць занудна. Калі яны гавораць нам пра сябе, яны амаль заўсёды выклікаюць цікавасьць». Гэтае маё эсэ - аб тым, хто мы такія і што мы ўспрымаем як само сабою зразумелае: мы жывёлы, якія ўмеюць гаварыць словамі, што надзвычайна ўзьдзейнічаюць на іншых, словамі, якія часам прымаюцца іншымі прыязна, а часам не. Я хачу сказаць сёе-тое пра словы, якія здаюцца нам магчымымі, і пра словы, якія можна назваць немагчымымі.

Нельга лічыць выпадковасьцю, што палітычныя і сацыяльныя сыстэмы нашай эпохі - камунізм, глябальны капіталізм, фашызм, імпэрыялізм, «нуклеарная сям'я», розныя варыянты рэлігійнага фундамэнталізму, пералік можна доўжыць бясконца - вызначаюцца адметным фактарам. У пэўных абставінах яны не спрыяюць таму, каб людзі гаварылі пра ўласнае жыцьцё. Тыраны зрабілі з маўчаньня форму кантролю. Тое, хто гаворыць, каму гаворыць і пра што гаворыць, выклікае страшэннае зацікаўленьне ўладаў, дыктатараў, бацькоў, настаўнікаў і чыноўнікаў усіх тыпаў.

Як падкрэсьліў Мілан Кундэра ў сваім вялікім рамане «Жарт», бываюць часы, калі жаданьне пажартаваць настолькі Цырымоніі небясьпечнае, што можа каштаваць вам свабоды. Ісаак Бабель, якога самога арыштавалі і расстралялі, называў кнігу «Ці ўжо Бабель убачаным праз прызму асобы». Ён быў здольны іранізаваць нават за кратамі і казаў: «Калі ў Савецкім Саюзе арыштоўваюць і кідаюць у турэмную камэру адукаванага чалавека, яму заўжды даюць аловак і паперу і кажуць: «Пішы!».

Сьледчыя патрабавалі ад Бабеля словаў. Зразумела, аднак, што «разбэшчваць» азначае скажаць, зводзіць, прыніжаць, у гэтым выпадку мову - тое, што лучыць нас зь іншымі.

У апавяданьні «Ў калёніі для зьняволеных» Кафка апісвае адмысловую машыну для катаваньня да сьмерці чалавека, асуджанага за непаслушэнства. Апарат абсталяваны балёнчыкамі з чарніламі, якія выпісваюць назву злачынства на целе ахвяры, нават калі тая сьцякае крывёю. «Гэтаму асуджанаму, напрыклад, - афіцэр паказаў на таго чалавека, - на целе напішуць: «Шануй старэйшых па званьні».

Увесь працэс пісаньня-забойства працягваецца 12 гадзінаў. Гэтую каліграфію каляніялізму можна назваць «учыненьнем забойства шляхам нанясеньня надпісаў», бо цела разрываецца на кавалкі тымі, хто трымае пяро. Сама ахвяра, натуральна, свайго пяра ня мае - ёй забаронена гаварыць. Яе вэрсія падзеяў, яе гісторыя пад увагу не бяруцца. Нават яе ўласнае цела нясе на сабе надпіс, зроблены іншымі.

Калектыўныя ці агульнапрынятыя гісторыі, якія яднае прыхаваная згода аб тым, якой павінна быць будучыня або які від людзей лепшы: героі, лідэры, маральныя аўтарытэты - з аднаго боку; шаленцы, нягоднікі, пагарджаныя і злыя - з другога, - можна таксама назваць ідэалёгіямі, традыцыямі, перакананьнямі, ладам жыцьця ці формай улады. Нейкі час яны цыркулююць у грамадзтве, а пасьля ператвараюцца ў палітыку, нашы інстытуты і, што важна, амаль падаюцца элемэнтам натуральнага парадку рэчаў, ды спрабуюць гэты парадак умацаваць. Ніколі ня позна падумаць аб групах і індывідах, пазбаўленых прывілею гаварыць і быць пачутымі, - імігрантах, беспрытульных, жанчынах, вар'ятах, дзецях, старых або

рабочых у краінах трэцяга сьвету.

Там, дзе канчаюцца або трапляюць пад забарону словы, - пачынаюцца абразы, расавы перасьлед, запалохваньні, пагарда і сэксуальны гвалт. Тады маўчаньне, як і атмасфэра сакрэтнасьці, даносіць вельмі важную інфармацыю наконт таго, якімі ўлады хочуць зрабіць усіх астатніх, важныя зьвесткі пра прыроду самой улады і той спосаб, якім яна хоча моўчкі зьнялюдзіць усіх астатніх.

Вядома, розныя сыстэмы карыстаюцца рознымі мэтадамі дасягненьня маўчаньня. Вырываньне языкоў, спальваньне кніг, выкарыстоўваньне сэксуальнай этыкі, а таксама сукрытых забаронаў, напрыклад, адносна людзей, якіх трэба ігнараваць, - усё гэта розныя шляхі забесьпячэньня дыктатуры пэўных галасоў ці дамінаваньня аднаго голасу. Калі адзін кажа ўсім астатнім, кім яны ёсьць на самай справе, і ў той жа час адмаўляе ім у праве на самаакрэсьленьне, гэта можа выклікаць у іх пэўную няўпэўненасьць у сабе ці нават унутраны разлад. Людзей можна выхаваць, а можна і зламаць гісторыямі, якія іншыя распавядаюць пра іх. Калі пра Жана Жэнэ* сказалі, што ён злачынца, на яго навесілі ярлык, які ён сашкрэбваў зь сябе амаль усё жыцьцё. Неабходнасьць пэўнага вытлумачэньня рэчаіснасьці і імпэратыў, які адстойвае гэтую ідэю, найбольш яскрава праяўляецца ў сям'і. Дзеці хутка пачынаюць усьведамляць сілу індывідуальнага самаакрэсьленьня і яго ўладу. Хаця большасьць бацькоў і ўсьведамляе, што дзецям для разьвіцьця трэба, каб іх слухалі, бацькі не заўжды хочуць чуць іх.

З свайго боку, безумоўна, дзяцей зачароўвае мова, а калі яны дазнаюцца, што існуюць словы, якія разьюшваюць палохаюць дарослых, пасьля якіх дарослыя хочуць іх адлупцаваць або прымусіць маўчаць. Дзеці могуць гаварыць тое, што разьюшвае дарослых. Выяўляючы нельга ці ня варта гаварыць, дзеці пазнаюць свой Яны дазнаюцца пра забароны і абмежаваньні, пра пакараньні, пра сакрэты і таямніцы, пра табу. Пасьля таго як яны даведаюцца, чаго нельга гаварыць, ім давядзецца навучыцца хлусіць або хаваць словы, часта ад саміх сябе. Калі ім пашчасьціць, яны знойдуць у сабе творчую жылку й будуць

*Жан Жанэ (1910–1986) — французскі драматург і паэт.

карыстацца мэтафарамі. Калі не, яны могуць здурнець.

Дэпрэсію, напрыклад, можна назваць свайго роду запаволенасьцю. Яе можна разглядаць як сьвядомую адмову рухацца з такой самай хуткасьцю, як іншыя, як непрыманьне банальнага і чужога спажывецкага сьвету на карысьць непаўторнай унутранай самасьці. Але, калі абстрагавацца ад такой ідэалізацыі, дэпрэсія найчасьцей суправаджаецца запаволенасьцю, якая звычайна адбываецца пры маўчаньні, па той бок мовы і сымбалізацыі. Таму, будучы ў дэпрэсіі, мы ня верым у мову як перадавальніцу значэньняў. Мёртвы ня можа сябраваць. Можна сказаць, што чалавек, які знаходзіцца ў дэпрэсіі, сам сябе змушае замаўчаць. Ён адчувае, што аддаляецца ад крыніцы ўласных словаў, якія, здаецца, нават размнажваюцца самі сабою, рухаюцца хаатычна і без усялякага сэнсу, як птушкі ў замкнёнай прасторы.

Тыя, хто маўчыць наўмысна, прынамсі надаюць сабе самім значэньне - калі яны замоўчваюць або перайначваюць свае ўласныя гісторыі. У той жа час тыя, хто маўчыць міжволі, могуць мець адчуваньне, нібыта іх словы ў іх саміх папросту скралі. Але для тых, хто мае ўладу, вымушаная цішыня мае практычны сэнс. Гэта зручная магчымасьць выканаць складаную і цяжкую працу - міталягізаваць тых, хто ня быў пачуты. Таго, хто маўчыць, трэба назваць інакш, напрыклад, прыблудам, замежнікам, імігрантам, беспрытульным. Ён можа быць таксама выгнаньнікам, нелегалам, чалавекам бяз роду і племені, адным з тых, з чыімі словамі лічыцца не прынята.

Гэты шэраг азначэньняў прынамсі паказвае, што мы ніколі не перастанем зьдзіўляцца прыўнесеным звонку, нязручным або чужародным часткам, элемэнтам саміх сябе, якія ня могуць гаварыць, акрамя як з дапамогай іншых. Прынамсі, расізм мог бы нас навучыць, што мы заўжды чужыя - ці іншыя, ці нежаданыя - для саміх сябе, асабліва тады, калі з намі здараецца бяда. Мы маглі б таксама зразумець, што тут мае месца дзіўная, хоць і інтрыгоўная маўклівая перамена. Узьніклы ў нас тып капіталізму заўжды быў цесна зьвязаны з каляніялізмам і заўжды патрабаваў як працоўнай сілы ў трэцім сьвеце, так і працоўнай сілы з трэцяга сьвету - іншымі словамі,

імігрантаў. Але, тым ня менш, наша патрэба ў іх заўжды падавалася як іхная патрэба, як іх залежнасьць ад нас. Для гэтага часта выкарыстоўваўся вобраз гатовых на ўсё людзей, што лезуць цераз аплецены калючым дротам плот, імкнучыся пранікнуць да нас і забраць усё, што ў нас ёсьць.

Аб'ект, якога абіраюць чужынцам, мае важнае значэньне. Ён павінен назаўсёды засесьці ў сьвядомасьці, павінен уплываць і апрацоўваць яе. Стаўленьне да небясьпечнага замежніка, чужаніцы, які ня ведае нашай мовы, можна параўнаць з жарсьцю. Нехта павінен заўжды займаць яго месца, каб іншыя маглі выказваць адмысловае стаўленьне да яго, каб нянавісьць магла квітнець. Я называю гэта жарсьцю, а не меркаваньнем, бо на месца адных фікцый пастаянна павінны прыходзіць другія. Іх нельга вызначыць раз і назаўжды; здаецца, што ахвяра ўвесь час унікае свайго акрэсьленьня. Калі б яе пастаянна не хавалі і не перахоўвалі пад патокам слоў і, вядома, іх узьдзеяньняў, яна магла б стаць падобнай да нас.

Калі імаверную вэрсію гісторыі XX стагодзьдзя можна апісаць з пункту гледжаньня маўчаньня і яго ўжываньня, гэта таксама дае падставы для аптымізму. У гэты пэрыяд людзі таксама настойвалі на сваіх словах і гісторыях, гаварылі за саміх сябе. У 1970-я, як мне помніцца, жыхары былых калёній, геі, жанчыны, вар'яты, дзеці прапанавалі сваё бачаньне падзеяў, расказалі яго ўласнымі словамі і былі пачутыя. У выніку дзенідзе адбыліся значныя сацыяльныя пераўтварэньні. Гавораць, што, калі ў Вялікай Брытаніі арыштавалі Піначэта, у Чылі ўсё зьмянілася. Дыктатар перастаў быць недатыкальнай асобай, людзі пачалі вольна гаварыць, і яго містычны арэол нарэшце быў разбураны.

Гэтае апісаньне, натуральна, спрошчанае, і ў ім ёсьць прабелы. Я меркаваў, што, з аднаго боку, ёсьць словы, якія чакаюць, каб іх вымавілі, а з другога боку, яны непажаданыя ці забароненыя, таму адзіная праблема з словамі - улады ня хочуць, каб іх пачулі.

Аднак у цэнтры ўсяго гэтага знаходзіцца яшчэ нешта - чалавек, які ня хоча слухаць сваіх уласных словаў. Гэты чалавек валодае імі, іх стварыла яго ўласнае цела, але ён адначасова мае і ня

мае доступу да іх; гэты чалавек і вязень, і турма, і закон. Рэальныя дыктатары ў сьвеце зьяўляюцца праекцыямі дыктатараў усярэдзіне індывідаў з пэўнымі асаблівасьцямі сьветаўспрыманьня.

Калі б мы хацелі стварыць дасканалую аўтарытарную сыстэму, у якой бы не было месца для доўгіх языкоў або, на індывідуальным узроўні, для хоць якога прыватнага жыцьця, яе трэба было б уладкаваць так, каб строга кантраляваліся сны. Нават будучы ў турме пад найпільнейшым наглядам, чалавек прынамсі можа бачыць сны. У сьне ён можа ўявіць ці ўбачыць у выглядзе сымбаляў тое, чаго нельга сказаць або нават забаронена казаць. Але як зразумець такія сны? Каму па сілах успрыняць гэтыя абрывістыя пасланьні, якія могуць стаць адзінай надзеяй чалавека?

У 1906-м адзін ангельскі хірург, размаўляючы з Эрнстам Джонзам, з пэўным зьдзіўленьнем прыгадаў аднаго дзіўнага венскага доктара, «які вельмі ўважліва прыслухоўваўся да кожнага сказанага яму слова сваіх пацыентаў».

Фройд разумеў, што існуюць надзвычай небясьпечныя і разбуральныя формы маўленьня, здольныя ламаць лёсы чалавека і грамадзтва, а таму людзі ня хочуць ведаць, што гэта за словы. Але, дадаваў ён, у іншым сэнсе яны насамрэч хочуць ведаць іх, таму што іх уласныя пакуты вымушаюць адчуць іх брак; яны прынамсі ведаюць, што не дасягнуць дасканаласьці бяз пэўных формаў самапазнаньня і што гэта вядзе да эмансыпацыі, нават калі наступствы такой эмансыпацыі будуць катастрафічнымі.

Людзі выяўляюць сапраўдны сэнс сваіх жаданьняў незалежна ад таго, хочуць яны гэтага ці не: у сваіх снох, фантазіях, пад хмелем, у сваіх жартах і памылках, у трызьненьні і рэлігійным экстазе, у балбатні і нават тады, калі яны гавораць адно, а думаюць другое. Да таго ж, трэба быць рацыяналістам, каб пабачыць, што рацыяналізм можа толькі падманваць спадзяваньні і што ў нашым маўленьні трэба павялічваць, а не памяншаць долю вар'яцтва. Інакш намі пачнуць кіраваць нашы целы, а яны могуць гаварыць самым неспадзяваным чынам, напрыклад праз гістэрыю, як у часы Фройда, або яе сучасны

эквівалент - дрэнныя звычкі, страту апэтыту, расізм ды разнастайныя фобіі.

Фройд вынайшаў новы мэтад камунікацыі, які прадугледжваў перабываньне двух чалавек у адным пакоі. Адзін гаворыць, другі - слухае, намагаючыся па паўзах, збоях і паўторах зразумець, што яшчэ гаварылася пад выглядам відавочнага. Потым слухач выяўляе гэтыя словы, пераводзіць іх у іншыя і вяртае іх моўніку назад.

Вялікія індывідуалісты, якімі, як і Фройд, мабыць, былі Ўайльд і Сакрат, вельмі любілі такую форму, як дыялёг. І сапраўды, у адным сваім эсэ Ўайльд перарабіў Сакратаў імпэратыў «пазнай сябе» ў «будзь самім сабой», які ў нашай вэрсіі «быцьця», г. зн. у межах пэўнай моўнай супольнасьці, можа азначаць «выкажы самога сябе». Тэрапэўтычная пара - гэта адзін з спосабаў зразумець пры дапамозе маўленьня, кім ты ёсьць, і гэта арыгінальная і вялікая вынаходка. Але грамадзтва, дзе кожны праходзіць тэрапэўтычны курс, было б, мякка кажучы, троху дзіўным. А вось пра ідэю, што толькі багаты можа купіць сабе псыхічнае здароўе, ня скажаш, што яна зусім надуманая.

На шчасьце, заўжды было іншае месца, дзе заўжды ішла гаворка пра найжудасьнейшыя і самыя небясьпечныя рэчы, што можна назваць формай непрафэсійнае тэрапіі. Мы ведаем, што гэты спосаб маўленьня эфэктыўны, паколькі выклікае мноства забаронаў. Яго часам называюць гутаркай, або тэатрам, або паэзіяй, або танцам, або раманам, або папулярным мастацтвам.

Тое, што называецца творчасьцю ці культурай, можа нагадаць нам Фройдаў мэтад, бо мноства творцаў казалі, што словы самі ўмеюць гаварыць. Пісьменьнік павінен толькі ўлавіць іх, упарадкаваць і занатаваць. Нават прарока Магамэта, чыё імя часта абыходзяць маўчаньнем, наведаў анёл, які даў яму закон. Магамэт ня склаў сваіх прыказаньняў сам; закон, аднекуль узяўшыся, гаварыў празь яго. Гэта яскравы прыклад «сьмерці аўтара», альбо аўтара па той бок самога сябе, аўтара як уласнага сакратара ці акушэра, ці, можна сказаць, стварэньня боскага закону, зьмяніць які ці запярэчыць якому ня ў сілах ніводны чалавек.

Любая культура - гэта акушэрка ўяўленьняў і сымбалізацыяў, месца, дзе чалавек гаворыць да кагосьці іншага, дзе словы нешта значаць і, паколькі яны знаходзяцца ў грамадзкай прасторы, могуць быць па-рознаму зразуметыя ці выкарыстаныя. У гэтым месцы таксама забаронена гаварыць пра пэўныя рэчы. Такім чынам, яна мае быць месцам, у якім ідзе гаворка пра пытаньні маўленьня і пакараньня. Калектыў можа весьці размову, таму што творцы любяць круціцца там, дзе разгортваюцца падзеі, дзе ўзьнікаюць праўныя калізіі. Калі разглядаць творцаў як тых, хто «знаходзіцца на краі», то яны знаходзяцца на краі нормаў, паблізу пакараньня і, як Бэкет, недалёка ад маўчаньня, - там, дзе маўленьне павінна быць амаль немагчымым, калі наагул мае сэнс.

Тое, што дадаў Фройд і што ведалі сюррэалісты, якія разам зь іншымі творцамі фармавалі нашу сьвядомасьць, - Бунюэль, Бэргман, Джойс, Пікаса, Вульф, Стравінскі, Пінтэр, - палягала ў наступным: для рэпрэзэнтацыі несьвядомага павінны існаваць новыя формы.

Гэтыя творцы ведалі, што звычайная мова і звычайнае мастацтва, якое ёй спадарожнічае, ператварыліся ў балбатню. Яны ведалі, што гэта працуе як блякіроўка ці фільтар для формаў ведаў, істотных, калі нам трэба не маўчаць, ці не перасьледаваць паводле расавых прыкметаў, ці не забіваць адзін аднаго зь незразумелых нам самім прычынаў. Таму, калі сучаснае мастацтва і тое, што за ім ішло, было спробай вымавіць невымоўнае, некаторыя з гэтых формаў мусова былі нехарошымі й непрыемнымі. Гэтыя формы забараняліся, выцясьняліся і не віталіся, часткова таму, што, як і большасьць формаў фантазіі, яны выклікаюць сорам, які сам па сабе ёсьць формай цэнзуры.

Увогуле, гаварыць - значыць усьведамляць цэнзуру. Першая перашкода на шляху пісьменьнікаў-навічкоў, калі яны расчахляюць свае пёры, - гэта блякіроўка ў форме забароны. Перад іх унутраным зрокам паўстае твар маці, а разам зь ім - яшчэ некалькі важкіх аргумэнтаў на карысьць таго, каб не пісаць. Фройд, сам плённы пісьменьнік, выказваў гэта так: «Варта пісаньню, вынікам якога ёсьць выцісканьне вадкасьці з

трубкі на белы аркуш паперы, прызнаць значэньне полавага акту, як яго адразу спыняюць».

Менавіта, скажаце вы, «дазвол цэнзуры» на добрую мову і ёсьць тым супрацівам, які гарантуе якасьць таго, што прамаўляецца. Такім чынам, зьяўляюцца як мінімум два галасы - голас, якому трэба выгаварыцца, і голас ці галасы, якія пярэчаць, якія кажуць, што тыя словы настолькі ўзбуджальныя і забароненыя, што яны нічога ня вартыя. Гэта тое, што робіць любую спробу тварэньня карысным змаганьнем. Вартай увагі яе робіць іменна цяжкасьць, магчымасьць зьяўленьня блякіроўкі.

Мастацтва XX стагодзьдзя было зачараванае марамі й кашмарамі, гвалтам і сэксуальнасьцю настолькі, што магло б звацца мастацтвам жахлівых фантазіяў. У гэтых мастацкіх кашмарах можна бачыць расколы, глыбокія канфлікты, жахі, нянавісьці і шмат сьмерці. Гэтыя элемэнты могуць быць сабраныя ў адно - нейкім чынам злучаныя ў мастацкім творы, - але яны не заўжды сумяшчальныя. Аднак несумяшчальныя часткі могуць загучаць пры пэўнай форме асабістага выяўленьня; менавіта таму сучаснае мастацтва магло раніць і быць незразумелым і нават цяпер яшчэ можа, і менавіта таму любы новы твор мастацтва, калі ён каштоўны, абавязкова нас шакуе. Так адбываецца, бо яно разбурае маўчаньне, аб існаваньні якога мы нават ня ведалі.

Мастацтва, прынамсі, дорыць нам прыгажосьць у кампэнсацыю за сваё пасланьне. Але гэта не заўжды прыемная прыгажосьць, бо яна можа быць вусьцішным хараством, таксама як праўда пра сэксуальнасьць не заўжды заключаецца ў тым, наколькі добрая ці здаровая яна для нас, але бывае й гаворкай пра тое, якой сэксуальнасьць можа быць дрэннай ці балючай. Гаварэньне, слуханьне, быцьцё спазнаваным і пазнаньне іншых. Добра ўжо й тое, што мы жывём у прадстаўнічай дэмакратыі, хаця на долю кожнага прыпадае не зашмат. Гэта прынамсі адрозьнівае нас ад разнастайных фундамэнталізмаў. Мы можам галасаваць; мы спадзяёмся, што маем палітыкаў, якія могуць гаварыць ад нашага імя. Адна з прычынаў нашае пагарды да палітыкаў - мы падазраём, што яны гавораць дзеля сваіх уласных інтарэсаў, хаця сьцьвярджаюць, што гавораць ад

нашага імя. Нашыя словы, што мы перадаём праз нашых прадстаўнікоў, не дасягаюць сваёй мэты і ніколі не дасягнуць. Што і як бы мы ні казалі - усё адно. Глябалізацыя бачыцца ў тым ліку, напрыклад, як нешта падобнае да оруэлаўскага рэжыму, які дзяўбе адно і тое ж раз у раз з адзінай мэтаю - не дапусьціць, каб нейкія новыя словы, людзкія сумневы, патрэбы ці творчы патэнцыял праніклі ў сыстэму.

Такім чынам, тое, што ня могуць зрабіць за нас палітыкі, робяць творцы. Гаворачы ад сябе і сьвядома адмаўляючыся рэклямаваць што-кольвек, яны, тым ня менш, гавораць ад імя некаторых з нас, а таксама прымаюць на сябе наша пакараньне. Адсутнасьць іншых заўважных фігураў, кшталту сьвятароў ці лідэраў, дазваляе ідэалізаваць творцаў, а таксама культуру, носьбітамі якой яны зьяўляюцца.

Тым ня менш, каштоўнасьць чыіхсьці ўласных словаў, уласнай гісторыі і той формы, якую індывідуум надае гэтым словам і гэтай гісторыі, ня можа быць заменена нічым іншым. Сартр у сваіх аўтабіяграфічных «Словах» казаў: «Калі я пачаў пісаць, я стаў нараджацца зноў». У аўтэнтычнасьці і непаўторнасьці словаў асобнага чалавека, якімі б беднымі і няслушнымі яны ні здаваліся, ёсьць нешта, што робіць іх важнымі, што робіць іх збавеннымі. Калі вы хочаце сказаць камусьці, што вы кахаеце яе ці яго, ніхто іншы, апроч вас, за вас гэтага ня скажа.

Калі мае быць мноства, ці мультыкультуралізм, галасоў, асабліва калі яны выражаюць крайнія меркаваньні, тады магчымасьць спрэчак ці нязгоды ўзрастае. Вартасьць і рызыка рэальнага мультыкультуралізму ў тым, што мы адкрываем, што нашыя каштоўнасьці, у канчатковым рахунку, несумяшчальныя з каштоўнасьцямі іншых людзей. З гэтага пункту гледжаньня ўсё горшае. Больш унутранага і сацыяльнага тлуму і блытаніны, больш сумневаў адносна таго, якія пытаньні вырашаць, як і хто мусіць іх вырашаць. Калі сама ідэя праўды падпадае пад сумнеў, сама прырода закону зьмяняецца. Яна можа падацца ўмоўнай, напрыклад, хутчэй прагматычнай, чым боскай, ці прынамсі падпарадкаванай мадыфікацыі ці ўмяшаньню з боку чалавека, калі не кантролю зь ягонага боку.

Заўжды ёсьць дастаткова прычынаў, каб прамаўчаць, не даваць

волі ўласнаму языку, - вам гэта засьведчаць многія дысыдэнты, людзі мастацтва і дзеці. Гэта абразіць, гэта небясьпечна, гэта зачэпіць, запалохае, гэта амаральна, ад гэтага нехта будзе пакутаваць або нехта не пачуе.

Але ў словах, сказах і гісторыях добра тое, што іх выніковы эфэкт немагчыма пралічыць. У адрозьненьне ад гвалту, напрыклад, які заўжды ёсьць пасланьнем адназначным, гутарка - гэта свабодная форма, від экспэрымэнту. Гэта не апісаньне ўнутранага стану, але акт, від пэрформансу. Гэта хутчэй акторская імправізацыя - небясьпечная і непрадказальная, - чым прамаўленьне радкоў, зададзеных сцэнаром. «Думка жыве ў роце», як вызначыў Трыстан Цара. Ня тое каб мы патрабавалі лепшых адказаў, нам патрэбныя лепшыя пытаньні. Любое маўленьне - гэта запыт: спачатку - водгуку, каб упэўніцца ў наяўнасьці камунікацыі, а пасьля - адказу, большае колькасьці словаў - любові, іншымі словамі.

Мы можам ніколі не даведацца, што нашыя словы маглі б азначаць для нас ці для некага яшчэ, ці якім будзе сьвет, што яны ствараюць. Усё можа быць. Праблема маўчаньня ў тым, што мы дакладна ведаем, якім яно будзе.

Пераклаў з ангельскай Андрэй Скурко

[image]
эсэістыка • аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

Міларад Павіч
Пачатак і канец раману

Борхесу было цікава пабачыць твары першай сотні сваіх чытачоў. Мне цікава іншае. Ці гатовыя мы пабачыць твары ста апошніх чытачоў? Або менш патэтычна - твары апошняй сотні чытачоў раману?

Я даўно пачаў цікавіцца, дзе пачатак і канец раману. У якой ступені пачатак і канец раману - пачатак і канец чытаньня - абумоўленыя тым, што думае Ясьміна Міхайлавіч[1], тым, як мы чытаем і якая наша полавая прыналежнасьць? Ці абавязкова, каб раман меў заканчэньне? І што такое насамрэч канец нейкага раману, нейкага літаратурнага твору? І колькі адзін раман можа мець пачаткаў і заканчэньняў?

Пэўныя адказы я знаходзіў, калі пісаў свае кнігі. Яны й сталіся сапраўднымі адказамі на гэтыя пытаньні. Я ўжо даўно зразумеў, што ўсе віды мастацтва падзяляюцца на «рэвэрсіўныя» й «нерэвэрсіўныя». Існуюць такія віды мастацтва, якія даюць магчымасьць іх карыстальніку (рэцыпіенту) падысьці да твору з розных бакоў ці нават абысьці яго, мяняючы кірунак агляду. Гэта - рэвэрсіўныя: архітэктура, скульптура, выяўленчае мастацтва. Ёсьць таксама іншыя, нерэвэрсіўныя віды мастацтва, як музыка й літаратура, што падобныя да вуліц з рухам у адным кірунку, па якіх трэба

МІЛАРАД ПАВІЧ (нар. у 1929 у Бялградзе) - сусьветна вядомы сэрбскі пісьменьнік. Апошняя публікацыя - зборнік «Страшныя любоўныя гісторыі» (Бялград, 2001). Асабістая вэб-старонка - www.khazars.com.

[1] Ясьміна Міхайлавіч - крытык,

крочыць ад пачатку да канца, ад нараджэньня да сьмерці. Я даўно імкнуўся зрабіць нерэвэрсіўную літаратуру равесьнай мастацтвам. Таму ў маіх раманах няма пачатку й канца ў клясычным разуменьні.

Прыкладам, «Хазарскі слоўнік» мае слоўнікавую структуру: гэта «раман-лексыкон на 100 000 слоў», і, у залежнасьці ад альфабэту, на розных мовах раман чытаецца па-рознаму.

Заўвага перакладніцы. Я ўжыла ў творчасьць М. Павіча. - Заўвага перакладніцы.

Мой другі раман - «Краявід, намаляваны гарбатай» (яго можна параўнаць з крыжаванкай): калі чытаць яго вэртыкальна, то на першы плян выходзяць партрэты герояў кнігі. Калі гэтыя самыя разьдзелы чытаць гарызантальна («клясычным спосабам»), на першае месца выходзяць завязка й разьвязка сюжэту. Якія тут пачатак і канец раману? Перш за ўсё, раман канчаецца па-рознаму ў залежнасьці ад таго, трымае яго ў руках жанчына ці мужчына. Натуральна, пачатак і канец гэтага раману адрозьніваюцца і ў залежнасьці ад таго, як вы прачыталі твор - вэртыкальна ці гарызантальна.

Разам з раманам-слоўнікам і раманам-крыжаванкай я паспрабаваў вынайсьці яшчэ адзін спосаб перавесьці літаратурны твор у шэраг рэвэрсіўных відаў мастацтва. Гэта «Ўнутраны бок ветру» - раман-пярэварацень. У яго загаловак на двух бакох, і, як заўважыў мой сябра археоляг Драгаслаў Срэявіч, лепей за ўсё чытаць гэты раман паўтара разу. Ягонае заканчэньне - у сярэдзіне, там, дзе сустракаюцца гераіня й герой старажытнага грэцкага міту - Гера й Леандар. Калі вы пачняце чытаць у бок Леандра, пачатак будзе такі: «Будучыня мае адну вялікую перавагу: яна ніколі не бывае такой, якой ты яе сабе ўяўляеш». Калі вы распачняце чытаць раман у бок Геры, то прачытаеце іншае: «У першай палове свайго жыцьця жанчына нараджае, а ў другой - забівае ды хавае сябе або сваіх блізкіх...» Заканчэньне гэтага раману, прачытанага з боку Леандра, будзе такое: «Было пяць хвілін на першую, калі вежы ў жахлівым выбуху паляцелі ў паветра, разносячы агонь, у якім зьнікла цела Леандра». Калі возьмеце чытаць «Унутраны бок ветру» з боку Геры, атрымаецца такі канчатак: «Паводле слоў звар'яцелага паручніка, на трэці дзень увечары галава Геры крыкнула жахлівым, глыбокім і быццам мужчынскім голасам».

Мой чацьверты раман - «Апошняе каханьне ў Царградзе» - па сутнасьці, раман-таро, складзены з 22 частак, што адпавядаюць картам Вялікага аркана (Маёр Аркан). Як вядома, з дапамогай картаў таро можна прадказваць будучыню, а раман «Апошняе каханьне ў Царградзе» можна прачытаць паводле розных кодаў, як і самі карты. Іншымі словамі, гэты раман - інструкцыя для варажбы, якую можна выкарыстаць па-рознаму. Ён не прадказвае лёс сваім героям. Ён прадказвае лёс сваім чытачам, і чытач сам можа знайсьці свой лёс у кнізе. Падчас варажбы можна ўлічваць значэньне картаў і частак раману (якія маюць тыя самыя назвы ды нумары, што й асобныя карты), раман можна прачытаць без уліку картаў, а карты таро, што ідуць разам зь ім, - без уліку раману. А магчыма паводле дапаможніка для картаў таро, які ёсьць у зьмесьце, спачатку выкінуць карты на стол, а потым чытаць часткі раману ў тым парадку, у якім карты ляглі на талён"[2].

[2] У кожнай канкрэтнай групе падай, самае важнае, што я маю сказаць у дадзеным тэксьце.

Такім чынам, можна прыйсьці да высновы, што ў апошніх маіх раманах можа быць шмат выйсьцяў. Я паступова перастаю адчуваць розьніцу паміж домам і кнігай, дый гэта, бадай, паверхня, на якую здаюцца карты.

Заўвага перакладніцы

Ці гэта ўжо канец раману, ці мы жывём у пасьлягістарычны час? Ці гэта таксама й пасьляраманавы час? Ці мы ўжо прайшлі паўз мэту ды нават не заўважылі гэтага, і таму ўсе разам бяжым апошнюю дыстанцыю? Мяркую, што так нельга сказаць. Калі толькі нас не закране атамны катаклізм касьмічных памераў. Раней я сказаў бы, што мы бачым зьнікненьне аднаго з спосабаў чытаньня. У крызысе наш спосаб прачытаньня раману, а ня сам раман. Раман - вуліца з аднабаковым рухам - знаходзіцца ў крызысе. Крызыс закрануў яшчэ нешта. Гэта графічны выгляд раману. То бок у крызысе знаходзіцца кніга. Кампутарная літаратура падказвае нам: раман можа паводзіць сябе так, як паводзіць сябе думка, галінуючыся ўва ўсіх кірунках. Да таго ж раман мусіць быць інтэрактыўным.

Я спрабую зьмяніць спосаб чытаньня, павялічваючы ролю й адказнасьць чытача ў стварэньні раману (ня будзем забывацца, што ў сьвеце заўсёды існавала больш таленавітых чытачоў, чымся таленавітых пісьменьнікаў і таленавітых літаратурных

крытыкаў). Я спрабую перакінуць на іх адказнасьць за выбар завязкі й разьвязкі раману, дзе пачнецца, а дзе скончыцца чытаньне, і нават адказнасьць за лёс галоўных дзейных асобаў. Але каб зьмяніць спосаб прачытаньня, трэба зьмяніць і спосаб напісаньня. Таму гэтыя радкі ня трэба разумець толькі як размову пра форму раману. Гэта ў той самы час і размова пра ягоны зьмест. Рэч у тым, што зьмест любога раману, як на пракруставым ложы, дзьве тысячы гадоў разгортваўся паводле адной мадэлі. Мяркую, што больш так ня будзе. Кожны раман мусіць абраць сваю адмысловую форму, кожны аповед можа шукаць і знаходзіць свой адэкватны выгляд. Так працуе кампутар. Але, калі ня любіце кампутар, паглядзеце, як паводзіць сябе архітэктура.

Архітэктура мяняе лад жыцьця. І літаратурны твор, калі яго разумець як дом, можа зьмяніць лад жыцьця. А раман і ёсьць дом. Прынамсі, у цяперашні час.

З сэрбскай мовы зь невялікімі скаротамі пераклала Аксана Пісецкая

Альгерд Бахарэвіч
З вышыні

Сёньня адзін з тых рэдкіх вечароў, калі сям'я Яны адпачывае ад міжусобных войнаў і запарвае ў аляпаватым імбрычку гарбату перамір'я. Зусім блізка ад майго носу - туфлі Янінага бацькі, што пахнуць канфэрэнц-залямі. Пад тумбачкай я заўважаю квіток з пункту абмену валюты, россып цукрынак і кавалачак шкла.

- Марына дома? - шапчу я.

- Ідзём, - нецярпліва цягне яна мяне ў залю. - Няма, няма.

Я спыняюся на парозе й ціха вітаюся. У цэнтры пакою, у атачэньні кубкаў і вафляў, выгінаецца імбрычак. Галіна Іванаўна адказвае мне сваім заўсёдным падазроным тонам, але прадубляванае слова «добры» сьведчыць мне на карысьць. Міхаіл Самсонавіч, не паварочваючы галавы, кідае, як лекар у ваенкамаце: «Здароў!» Іхныя твары асьвятляе тэлевізар. На экране бляндын у белай кашулі цкуе аднаго паўголага мурына на другога, голас за кадрам дзіўна нагадвае голас натураліста Эда Джэнкінса.

- Джы Джы супраць гэтага, як яго, - паведамляе Міхаіл Самсонавіч. - Сядай, ня стой.

АЛЬГЕРД БАХАРЭВІЧ (нар. у 1975 у Менску) - малады пісьменьнік. Аўтар кніг «Практычны дапаможнік на руйнаваньні гарадоў» і «Натуральная афарбоўка» (выд-ва Логвінава). Ляўрэат прэміі «Гліняны Вялес».

- Ізноў пераключыў, - стогне Галіна Іванаўна й чамусьці хапаецца за шыю. - Міша, ну колькі можна, колькі можна. Давай сам - вафлі, гарбатка. Ад Яны не дачакаешся.

Міхаіл Самсонавіч моўчкі пераключае мурынаў на чачэнцаў у наручніках і адкідваецца на сьпінку канапы. Цяпер ён гэткі, якім ёсьць насамрэч, - няголены трыбух у клятчастай паранджы. Некалькі сэкундаў у вачох Галіны Іванаўны мільгацяць вечаровыя навіны, потым яна зацікаўлена нюхае паветра:

- Палёным пахне. Бяры яшчэ вафляў. Палёным пахне.

Міхаіл Самсонавіч разьдзімае ноздры, краем вока паглядаючы на жончын нос. Галіна Іванаўна паварочваецца да мяне, нібыта мой орган больш дасканалы:

- Табе ня пахне?

- Ну... - пачынаю я, і Галіна Іванаўна зноў заклапочана чапляецца за мужа:

- Можа, тэлевізар гарыць? Яна, схадзі на кухню, але ж я ўсё выключыла, газ выключыла…

Яна, падціснуўшы вусны, адпраўляецца на кухню, Міхаіл Самсонавіч - да тэлевізара. Усё ў парадку, трывога дарэмная. Запарка ў імбрычку яшчэ ёсьць. «Табе падалося, мам», - кажа з злой усьмешкаю Яна і паказвае, чаму сёньня ў кватэры пануе спакой. Перада мной - надзіва руды жлобінскі леў, над маркотнымі зялёнымі вачыма якога навісае цэпэлінаўская грыва. З рук Яны ён скача на калені бацькоў, усаджваецца паміж імі, закінуўшы лапу за лапу. Высьвятляецца, што Галіна Іванаўна прыцягнула яго з свайго дэка адмыслова для Яны. Калі мы пазнаёміліся, Янін пакой ужо быў заселены рознай плюшавай набрыдзьдзю. Бяспашпартныя жывёлы атабарыліся нават пад ложкам. Мілае племя, што звыклася з грымотамі наверсе, якія час ад часу ладзілі мы зь Янай, забыўшы пра ўсё на сьвеце.

- Як гэта яго зрабілі рудым, - усьміхаецца Яна, кладучы назад

надкусаную вафлю.- Жлобінскія львы звычайна сінія, нібы шклоачышчальнік, або якія-небудзь аранжава-гнедыя. Ну як табе?

- Супэр, - кажу я, задуменна гледзячы на льва, якога Яна толькі што прызначыла маім супернікам. Цешыцца трэба, што гэта леў, а ня хто-небудзь чалавекападобны. - Ён нагадвае, ведаеш, каго-небудзь зь «Пінк флойд» або з «Дып пёрпл».

Галіна Іванаўна хоча нешта спытаць, але замест гэтага глытае астылую гарбату. «Чаму яны штовечар сядзяць дома, а ня сходзяць на шпацыр, у госьці, у тэатар?» - думаем мы зь Янаю й чакаем нагоды, каб уцячы. На дварэ цямнее. Мы хрумстаем вафлямі й назіраем за накаўтаваным Джы Джы.

Я цудоўна памятаю той дзень - каламутны, цяжкі, як пажарны шлянг, - калі ўпершыню ўвайшоў сюды. Я памятаю гэты стол, што стаяў тады ля акна, і завялую штучную кветку на ружовым абрусе. Пад кветкай асадка бяз стрыжня ўказвала вастрыём на фатаграфію Марыны з бацькамі, засунутую да поясу пад шкло буфэта. Яніна сястра пераводзіла мой позірк на канапу з талеркай, поўнай семкавага шалупіньня. Шалупіньне нагадвала попел. Галіна Іванаўна, цяжка дыхаючы, паглядала на мяне зьнізу ўбок. Гэта толькі ўзмацніла адчуваньне, нібыта перад маім прыходам тут сьпешна палілі нейкія важныя паперы. Цэлая чарада ўмоўных знакаў. Праз паўгадзіны Яна поўзала пад раскладзенай канапай, на якой яе калісьці зачалі, а я ганяў пыл з куту ў кут. «Так, прыбярэце тут, бацька тэлефанаваў, што а сёмай будзе!» - першая фраза, якую я пачуў ад Галіны Іванаўны, гучала менавіта так.

Мы прагна цалаваліся ў вітальні пад інквізытарскія пахі з кухні, і Яна ледзь не адкусіла мне язык, калі над самымі нашымі вушамі заныў званок, непрыемны, як сыгнал аўтаномнага пажарнага паведамляльніка. На парозе зьявіўся маладжавы чалавек, сунуў мне руку, а Яне - плашч. «О, прыбралі, малайцы», - сказаў ён кісла, дабраўшыся да залі. Я памятаю стол на кухні, фасолі, што застравалі ў горле, зялёнае супавае мяса ў руцэ Міхаіла Самсонавіча. «Якую мову? Грузінскую?» - перапытвае Галіна Іванаўна, употай правяраючы на расавую чысьціню мой профіль. «Адукацыя вышэйшая, гэта

вельмі добра, - з палёгкай уздыхае Міхаіл Самсонавіч. - Гэта ў наш час галоўнае». «А бацькі чым...» - устаўляе нарэшце даўно падрыхтаванае пытаньне Галіна Іванаўна й торгае на сябе край настольніка, каб паглядзець, чым займаюцца нашы зь Янай рукі й ногі. «Ой, прабачце, мне падалося, гэта зноў тая мыш! Яна табе не распавядала? Мыша, ты знайшоў мішалоўку? Я ж прасіла, прасіла!»

«Цікава, як ты пазнаёміўся з сваёй дзяўчынай?» - спытала ўчора за кавай Паліна Віктараўна з катэдры польскай мовы, саракагадовая самотніца, якая мае да мяне невытлумачальную сымпатыю. Аднойчы паня Паліна наткнулася на нас у адным з гандлёвых цэнтраў і з той пары ўзгадвае Яну пры кожнай сустрэчы. Яна не падазрае, што мая дзяўчына некалькі месяцаў таму здавала іспыт па філязофіі валасатаму дацэнту з джынсавымі нагамі, у якога Паліна Віктараўна закаханая. Як пазнаёміўся? Я паглядзеў у ейны кубак і прыкінуў, якога аповеду хопіць на такую колькасьць кавы. Складваць сусьвет гэткім чынам, каб ён зьмяшчаўся ў двух-трох поліэтыленавых сказах, я ня ўмею. Кавы ў кубку хапіла на кароткую гісторыю, дзе праўды было роўна столькі, каб не пакрыўдзіліся мае знаёмыя прыамурскія памежнікі, чэмпіёны Далёкага Ўсходу па стральбе з лука, а хлусьні - каб пані Паліна не сышла да студэнтаў расчараванай.

Першая наша сустрэча адбылася на галоўным праспэкце: я, высакамерна пасмоктваючы кубінскую соску, еду, закінуўшы ножкі адна на адну, зь мядзьведзем-целаахоўнікам на каленях, у ня вельмі зручным аднамесным экіпажы; Яна, на твары якой сьвецяцца два чыстыя і шчырыя, нібы адбіткі неба ў ранішнім возеры, бясконца зьдзіўленыя «о!», пракручваецца на руках у бацькі і праводзіць мяне позіркам. Сустрэча другая: кавярня, адна з тых, што называюцца імёнамі тых жывёлаў, зь якіх робяць дзіцячыя мясныя пюрэ; на гэты раз ужо я, хлопчык зь непрапарцыйна вялізным ілбом, дзе мала засталося сьпець будучым прышчам, вуграм і фурункулам, задуменна капаюся ў суфле, кідаючы раз-пораз пагляды на такую, такую... як фэя - казалі ў нашых фільмах, на вастраносую прыгажуню, якая зацікаўлена дасьледуе зьмесьціва сваіх ноздраў. Наверсе, у недасяжных вышынях, дзе жывуць адно самотныя шатлы й

саюзы-апалёны, нас цярпліва чакаюць дарослыя. Трэцяя сустрэча. Я паблытаў тралейбусы, і мяне заносіць у яе раён; пакуль я распытваю, як даехаць дахаты, за нейкі мэтар ад мяне Яна, перад якой расступаюцца прыцемкі, тасуе мае сьляды на сьнезе. Наступным разам мы спатыкаемся ўва ўнівэрмагу, я шукаю падарунак для маці, яна - для сястры. Нас прыбівае да берагу аддзелу парфумэрыі, і нехта на прозьвішча Канюкова, з прычоскай а-ля Сід Вішэс і пахам рыбы (абяцаю, што яна больш ня зьявіцца ў гэтым аповедзе), засланяе нас адно ад другога. Урэшце я сыходжу, так і не наважыўшыся залезьці ў тубік выключна жаночай чаргі, - ты набываеш нешта латыскае й рушыш дадому, думаючы па дарозе зусім не пра мяне. Праз год нас затоўкваюць у адзін вагон мэтро, і перад канцавым прыпынкам я нарэшце магу ўзяцца за поручань - ты адторгваеш руку без пальчаткі, ледзь прыкметна крывішся, я не прашу прабачэньня (Punk 's not dead і ўсё такое). Ты едзеш да стрыечнага брата й думаеш не пра мяне, я еду да сябра піць другі раз у жыцьці гарэлку й думаю пра сэкс. Той год наогул быў багаты на сустрэчы. Праз два месяцы й два дні мы ўпершыню размаўлялі. Ты стаяла ля «Музыкі» й чакала таго, пра каго думала, я йшоў па чыстыя касэты. «Не падкажаце, каторая гадзіна?» - спыталася ты, не адводзячы вачэй. Да нашага знаёмства заставалася чатыры гады. Потым мы зноў прайшлі адно міма аднога на тым самым участку праспэкту, дзе спаткаліся ўпершыню. Я з захапленьнем сачыў за даўжэзнымі худымі нагамі, што крочылі насустрач. У мяне тады быў флюс, памятаеш, у цябе - голыя плечы зь нікім не цалаванымі пакуль прышчыкамі. Маленькі, маленькі, чэзлы, дыстрафічны горад, паўдохлая сталіца. Мала кавярняў, надта доўгія й простыя вуліцы, небагата крамаў, неглыбокае мэтро. Час, памножаны на такія адлегласьці, рана ці позна дасьць у выніку сустрэчу. Я сядзеў з Максам на лаўцы, ты йшла побач. Потым былі пустыя і таму нейкія надзвычай імклівыя гады. Я стаяў на вакзале, было сямнаццатага траўня, ня памятаю ўжо, што я там рабіў, мусіць, паліў ля праходу да касаў у вялікай кампаніі прыемна незнаёмых людзей. На прыступках паказалася жанчына, што валакла за сабой гіганцкую валізу. «Да мяне», - нібыта шапнуў нехта за сьпінай. «Ня можа быць», - падумалася лянотна. «Пасьцеражыце, малады чалавек, - жаласьліва сказаў гэты добры, як высьветлілася, анёл у

панамцы. - Зьбегаю да раскладу». Выхаваньне не дазволіла мне сысьці ні праз дваццаць, ні праз трыццаць хвілінаў. Урэшце я прыняў вельмі, як мне падавалася, правільнае рашэньне - зірнуць, што ў валізе: калі нешта каштоўнае, то здаць у камэру знаходак, калі ж нейкая драбяза - кінуць і ўратавацца ад адказнасьці ўцёкамі ў блізкае мэтро. Я асьцярожна тарганўў маланку й тут жа закрыў валізу. У валізе валялася зброя - я ўжо бачыў усе гэтыя аўтаматы, гранаты ды іншыя рабрыстыя штучкі, калі марнаваў здароўе на вайсковых зборах. Пасьля дзьвюх нэрвова выпаленых цыгарэтаў я наважыўся пайсьці да вакзальных мянтоў. Але да гэтага не дайшло. Цягнучы валізу і баючыся, што мяне апярэдзіць патруль, я вочы ў вочы сутыкнуўся з уладальніцай зброі. Праўда, яна ўжо пасьпела зьняць панамку, апрануць саламяны капялюшык і набыць марожанае, што ў ейных руках глядзелася няйнакш гранатаю. Нарэшце я трапіў у цесны вакзальны пастарунак, дзе мае тлумачэньні былі спыненыя дружным рогатам вельмі добразычлівых вусатых міліцыянтаў. «Вас здымала схаванай камэрай перадача «Хіханькі ды хаханькі»!» - паведаміла мне з-за іхных сініх плячэй дзелавітая дзяўчына ў скуры ды срэбры. Яну прывялі празь пяць хвілінаў - такую неверагодна юную. Мы атрымалі па бэйсболцы ды яшчэ, здаецца, па маечцы. Яне яны аказаліся завялікія, мне - замалыя, і цяпер Яніны бацькі езьдзяць у іх на лецішча.

У вагоне нас прыціснула адно да аднаго шчыльней, чым ёй хацелася, і Яе Раздражненьне дазволіла мне праводзіць яе да дому. Па дарозе мы абмяняліся імёнамі: я адразу зьмясьціў ейнае куды трэба, Яна ж маё сунула ў аддзяленьне для візытак. На рагу вуліцы мы высьветлілі, што сьвет крыху цясьнейшы, чым мы думалі: я канчаў унівэрсытэт, яна ўзімку брала ўдзел у студэнцкай оргіі пад назваю «Мэдыюм». Ля пад'езду мы наблізіліся, ужо дакладна ведаючы, што абое ненавідзім рабскі гумар, мяшчанскі сьветапогляд, папсу, сабакаловаў і саветыкусаў. Час давёў, што ненавідзім мы іх зусім рознымі нянавісьцямі.

Гэтае здарэньне на вакзале сталася адным з самых балючых прыніжэньняў пражытага мной жыцьця («Шчасьлівы, - сказала мне на гэта Яна. - Значыць, ты яшчэ ня ведаеш, што такое

сапраўднае прыніжэньне»). Ня ведаю, як Янка, а я нікому не распавядаў пра гэта. Праз колькі дзён мы ўжо разам жавалі бульбяную салату ўва ўнівэрсытэцкай сталоўцы, назаўтра выправіліся на гадзінны шпацыр па горадзе, які завяршыўся ажно апоўначы на цёмнай пляцоўцы пры Яніных дзьвярох, па другі бок якіх думала ўжо беспакойную мацярынскую думу Галіна Іванаўна. Пару тыдняў мы ратаваліся ад дажджоў у выпадковых пад'ездах, падобных да грамадзкіх прыбіральняў, убіралі ў сябе пыл усіх навакольных лавачак, цені ўсіх паркавых дрэваў - выконвалі банальны рытуал мільярдаў закаханых, каб пасьля аднаго вечару ў мяне дома пачаць пакрысе зьдзяйсьняць рытуал раскаханых. Але тады нічога падобнага не наведвала маю галаву - нерухомае цела майго героя было перанесенае бліжэй да шуфляды зь Янінай гераіняй. Напачатку ёй страшэнна падабаліся дзьве рэчы: тое, што яе ймя ў альфабэтным парадку апераджае маё, і каханьне ля адчыненых вокнаў, калі яна, абапіраючыся на падваконьне, высоўвалася на двор і лавіла звар'яцелымі, невідушчымі, а хутчэй папросту ўзьнесенымі на больш высокі ўзровень вачыма разнастайныя дробязі - сабакаў, вусеняў, вераб'ёў, дымок з форткі, малога зь мікімаўсавымі вушамі, гіру й гантэлі на бальконе дому насупраць, алькаша ў позе гарніста каля тэніснага століка... Я ціха разьмяшчаўся ззаду, і наколькі нерухомай была мая верхняя частка, настолькі ж няўрымсьлівай - ніжняя. Яна, Янок, Янка. У дзень вызваленьня нашай радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў я быў пазнаёмлены зь яе бацькамі. Праз год я сяджу ў залі яе кватэры, гляджу тэлевізар, хрумстаю вафлямі, спрабую думаць зь Янаю ўва ўнісон - гэта ўсе мае дасягненьні. Дзякуй за ўвагу.

Апошняя вафля дастаецца Галіне Іванаўне. Яніна маці шумна грызе сваю долю здабычы, сёрбае гарбату, выклікаючы на лоб Міхаіла Самсонавіча зграю зморшчынак. Наша размова пакрысе спыняецца; яшчэ некалькі пясчынак - і гадзіньнік можна пераварочваць. Толькі я адзін заўважаю цяпер нецярплівыя падрыгваньні таго нэрвовага стрыжня, што засеў у Яне й прымушае яе напружана сьціскаць падлакотнікі фатэля: Яна ўжо даўно чакае зручнага моманту, каб пайсьці адсюль, каб, узяўшы мяне за руку, вярнуцца ў свой пакой, на сваю выспу. Крадком я паглядваю на бацькоў: Міхаіл Самсонавіч

змрочна глядзіць некуды паміж фіранкай і шафай, на ягонае плячо паклаў агністую галаву задрамалы леў, Галіна Іванаўна калупае зубачысткай у роце. Экран тэлевізара фарбуе пакой у кіслотныя, нездарова-зыркія колеры. Мы ўключаем тэлевізар з той жа прычыны, зь якой першабытны чалавек разводзіў уночы вогнішча. Экран разгараецца - і абараняе нас усю нашую жыцьцёвую ноч. Перад яго рэклямай мы бясьсільныя. Уявім сабе рэклямнага агента, распаўсюдніка касмэтыкі, ідэоляга мыла, цэрбэра-цэптэра, агітатара за пральны парашок - нават тройчы паслаўшы яго па-расейску, мы ўбачым перад сабой непрыстойна ветлівую ўсьмешку, пачуем найцярплівейшы ўздых і новае казаньне: мы самі бяжым ад свайго шчасьця. Тэлевізійная рэкляма - гэта як словы любові, гэта як вобраз каханьня, бо яе сэнс толькі ў яе паўтарэньні.

Міхаіл Самсонавіч вырашае павандраваць па каналах. Мы зь Янай цярпліва чакаем, бо, па-першае, намі кіруе наскрозь фальшывае, але ўсеўладнае пачуцьцё віны перад бацькамі - трэба ж прысьвяціць ім хаця б некалькі гадзінаў на тыдзень, а па-другое, я ніяк не магу дапіць гарбату. Я не хачу пакрыўдзіць Галіну Іванаўну... пакрыўдзіць галіну іванаўну... пакрыўдзіць гадзіну і ў ванну... Нельга, нельга з такімі думкамі станавіцца нечым зяцем. Я люблю Галіну Іванаўну... люблю галіну іванаўну. Міхаіл Самсонавіч шпацыруе па каналах, закасаўшы нагавіцы, зьняўшы тапачкі. І тут адбываецца неймавернае: ён натыкаецца на «Вышыню».

Гэты ісьляндзкі фільм зь першых жа хвілінаў захоплівае Яну. Камэра, што на працягу сарака хвілінаў ляціць над акіянам, над неспасьцігальна халоднай, касьмічна агромністай масай чорнай вады зь сівымі скронямі забойцы. Яна кусае вусны. Яе цела нарэшце разьняволілася, і толькі пальцы пабялелі. Здаецца, што Галіна Іванаўна ды Міхаіл Самсонавіч таксама трапілі пад узьдзеяньне гэтай чароўнасьці, што струменіць з экрану, - прынамсі, іх зусім не чуваць. Камэра імкне над акіянам, наверсе адно аблокі. Памеры экрану яшчэ больш узмацняюць для гледача пачуцьцё бяскрайнасьці - так і чакаеш, што зараз з-за межаў аб'ектыву абрынуцца на цябе тысячы, тысячы кілямэтраў вады. Музыку - тую музыку, якую мае студэнты здольныя ўспрымаць хіба ў кактэйлі зь якімі-небудзь

ды-джэямі, - часам трохі заглушае шум самалётных вінтоў. Суворыя птахі колеру пены, сонца, якое зрэдку сьлізгане на паверхні вады, прыгладзіўшы на хвілю хвалі; дзіўнае зеленаватае сьвячэньне. Мы сядзім у поўным маўчаньні, і я нават некаторы час веру, што бацькі Яны адчуваюць тое ж, што мы, што яны таксама лятуць на цяжкіх крылах праз акіянскае паветра. Я кладу далонь на цёплыя пальцы Яны, бо мне хочацца быць бліжэй, яна раздражнёна выторгвае руку. Я ня крыўджуся. Фільм працягваецца. Мне складана сказаць, дарэчы, колькі хвілінаў ён ужо йдзе, як доўга мы сядзім тут у маўчаньні. Адчуваньне часу страчанае. Магчыма, фільм толькі пачаўся, магчыма, праз імгненьне тытры зруйнуюць усю чароўнасьць. У «Вышыні» не гучыць ніводнага чалавечага слова.

- Усім прывітаньне! - націск на «ы». У пакоі зьяўляецца Марына, зграбна пераступаючы шлягбаўм маіх некультурна выцягнутых ног. Да майго застылага твару дакранаецца водар яе шыкоўнай парфумы, які палохае мяне сваёй прыцягальнасьцю. Бацькі заварушыліся. Леў праваліўся кудысьці за сьпіну Міхаіла Самсонавіча.

- А мы тут задрамалі крышку, задрамалі, - праз саладжавы позех выціскае Галіна Іванаўна. Міхаіл Самсонавіч выдае адразу некалькі пазяханьняў. Марына не зьвяртае на іх увагі - яна вырывае з рук Міхаіла Самсонавіча пульт і пачынае разьюшана мяць яго доўгім пальцам.

- Пасьпела, пасьпела! - крычыць яна й плюхаецца паміж бацькамі. - Глядзіце!

Марына ды Яна зусім непадобныя. Калі нехта бачыць іх разам на вуліцы, то падумае, што яны проста сяброўкі.

- Зараз мяне пакажуць, - Марына нахіляецца наперад, абхапіўшы рукамі круглыя калені. На экране цалуюцца двое мужчын: стары ў сінім пінжаку й малады, які роспачна махае нейкай чырвонай кніжачкай. Міхаіл Самсонавіч няўцямна глядзіць на жонку. Я ледзь стрымліваюся, каб не засьмяяцца. Пацалунак адбываецца на сцэне, на заслоне наклееныя літары «Горка». Справа ад закаханай парачкі радасна пляскае ў ладкі

хлопец з пафарбаванымі валасамі у маечцы юнісэкс. Вясельле савецкіх геяў.

- Што гэта за парнуха? - пытаецца Яна, падыходзіць да канапы й забірае лява.

- Заткніся, малая, - бурчыць Марына і адсоўвае Яну да мяне. - Гэта наш Горкаўскі райком, мы ўручаем членскія білеты новым... новым членам... ды пакажы ж мяне...

Цяпер ужо й бацькі сьвідруюць тэлевізар вачыма. На сцэну падымаецца юнак, спыняецца на прыступках, нерашуча чухае яйцы, хлопец з пафарбаванымі валасамі хапае яго за пальцы й з усьмешкай цягне да сябе, не раўнуючы ратавальнік на вучэньнях. Дзед у сінім пінжаку задаволена аблізвае губы й бярэ са стала новую кніжачку.

- Гэта наш першы сакратар, - нецярпліва мармыча Марына. - Вось гэты, у майцы... Валодзька Ракіцін... А гэта вэтэран... Сьмірноў... ды пакажыце ж прэзыдыюм, казлы...

Бацькі з павагай заключаюць Марыну ў абдымкі сваіх ганарлівых поглядаў. Я пакорліва сузіраю экран. Трансьляцыя ўручэньня (натуральна, у запісе) йдзе на гарадзкім тэлеканале ГТВ. Сьвет, які нам паказвае ГТВ, мусіць, такі, якім яго бачаць хранічныя алькаголікі на пятнаццаты дзень запою: акварыюм, напоўнены брагай, сярод якой плаваюць цяжкаадрозныя фігуры, прадметы, рэчы.

- Ды вазьміце ж управа, - Марына ледзь ня плача. - Вазьміце ўправа.

Нарэшце апэратар скараецца. Мы бачым Марыну за высокім сталом, пад яе лакцямі круцяць шыямі некалькі меншых марынаў. Намесьнік першага сакратара моладзевага Саюзу. Галіна Іванаўна кідаецца да тэлефона. «Віталік? Віталік, скажы сваім, хай пераключаюць хутчэй на гэтэвэ, там нашу Марынку паказваюць!»

- А зараз я прамову буду гаварыць, - адкідаецца на сьпінку канапы Марына, упэўненая, што ўжо апэратару ня будзе куды

падзецца. І праўда, Марыну бяруць буйным плянам...

Наступіўшы мне на нагу, Яна вырывае ў Марыны пульт, вокамгненна ўсаджваецца на сваё месца і, як нічога і не было, утароплiваецца ў экран. «Вышыня» ўжо скончылася - па тэлевізары спрэс навіны. Яна пасьпявае зрабіць некалькі колаў па тэлевізійных мэрыдыянах, пакуль Марына ротам заглынае экраннае сьвятло.

- Аддай пульт, сучка!

Пульт ляціць Марыне ў сківіцу. Марына парыруе кідок, пульт ляціць на Міхаіла Самсонавіча, той спрабуе злавіць, але няўдала. Марына набірае поўны рот самых сьмярдзючых словаў. Міхаіл Самсонавіч мітусьліва шарыць пад нагамі ў дачкі. Але ўжо позна, і ГТВ ужо паказавае адзін з тых фільмаў, прапісаных нам раз на дзень.

Мы ратуемся ў Яніным пакоі. Яна грукае дзьвярамі, і, як толькі сьціхае рэха гэтага стрэлу, мы чуем зь вітальні лаянку - тыя словы, якія ў нашай краіне вымавіць можа кожны, а вось прачытаць - не. Хто крычыць, сказаць цяжка, адно можна сьцьвярджаць з упэўненасьцю: гэта ня голас Міхаіла Самсонавіча. Той цяпер цішком глядзіць спартовыя навіны й цешыцца, што жонка й старэйшая дачка зачыняцца зараз на кухні й дадуць пазаўзець за ўлюбёны «Рэал». Лаянка гучыць ізноў, паўтараючыся слова ў слова. Моцныя, моцныя, сталёвыя жанчыны: ні сьлёзаў, ні гістэрыкаў, ніякіх віскаў - суцэльны мат. Сьлёзы будуць потым, гідкія, нежывыя, абавязковыя. Яну ўзгадваюць яшчэ раз, і яшчэ. Яна пачуваецца рознаскаляльным назоўнікам.

Нарэшце Яна адварочваецца ад дзьвярэй. Я асьцярожна прысаджваюся на край ложка. Яна выпускае льва на даўно ня чышчаны дыван - мне на ім знаёмая кожная крошка, кожная плямка. Я аўтар паловы зь іх. Дыван у Яніным пакоі - вялікая мапа сьвету. Мы ганарымся ёй так, як толькі калекцыянэр жывапісу можа ганарыцца арыгіналам Матыса. Таму Яна дывана і ня чысьціць - такое мапы ня мае ніхто. Паміж Афрыкай і Лацінскай Амэрыкай у нас Атлянтыда, абрысы якой праступілі на дыване пасьля таго, як падчас нашага каханьня

на блакіт акіяну абрынуліся паўкеліха чырвонай «Фецяскі». Наша рэліквія, наша мапа, наша Атлянтыда.

Леў з расчараваньнем аглядвае сваіх пухнатых васалаў, што павылазілі з шчылін і сутарэньняў, здымаючы капелюшы пры выглядзе новага фаварыта гаспадыні. З такім войскам... Яна падыходзіць да акна, прытуляецца лбом да нагрэтага за дзень шкла, потым раптоўным, шырокім, на мяжы вывіху рухам адсоўвае фіранкі, адчыняе высокую аканіцу, разгінае вострыя плечы. Нашы цені вісяць па-над клюмбаю. Як у мёртвае возера, у пакой уліваецца зусім астылая вуліца. Яна мякка адводзіць маю руку й забіраецца на ложак.

- Дай мне коўдру, - яе рука імгненьне пырхае ў паветры, і я наступаю льву на хвост. Яна здымае шкарпэткі й захінаецца ледзьве не з галавой. Паразважыўшы, я асцярожна спрабую прытуліцца побач. Яна не адразу пасьпявае зрэагаваць, і мне перападае сэкунда такой асалоды, за якую не шкада заплаціць і некалькімі гадамі жыцьця. Усяго імгненьне я з балючай вастрынёй уяўляю нас галоднай бязьдзетнай сям'ёй, уяўляю, як мы здымаем пакой у мансардзе й штораніцы засынаем вось так, пад адной коўдрай, шчасьлівыя, нягледзячы ні на што - разам. Усяго імгненьне. Калі яно сканчаецца, я ўскокваю з ложка, уджалены Яніным локцем.

- Ты што сабе дазваляеш? Ахранеў? - задышліва шэпча Яна, спалохана пазіраючы на дзьверы і чамусьці папраўляючы майткі.- Хто ты такі? А калі нехта зойдзе, калі бацька зойдзе, а мы тут... Мазгі маеш?

Я саджуся на самы край, каб падкрэсьліць сваю крыўду. «Паляжаць ня дасьць», - бурчыць Яна і апускае ногі на падлогу.

- Чаму шэптам? - кажу я наўмысна гучна, быццам на мне залатыя навушнікі.- Чаго ты так баішся, Янок?

Атрымліваецца надзвычай ненатуральна. Яна з шкадаваньнем вывучае мае дэманстратыўна танаваныя вочы, ізноў азіраецца на дзьверы й прамаўляе ўжо нармальным голасам:

- А ты не баішся. Ведама ж, табе ўсё адно. Ну дык ідзі, раскажы

бацьку, што са мной сьпіш, у якіх позах, папрасі ў яго грошай на прэзэрватывы, а лепей трахні мяне на вачах ува ўсіх.

Я сьціскаю зубы так, што хрумсьцяць плёмбы.

- Ты б пра мяне падумаў, - кажа Яна крыху больш лагодна. - Бацька мяне забіў бы, калі б такое ўбачыў. Хто ты такі?

- Хто я такі? - старая катрынка ўва мне ўсё-ткі запілікала. - Вось ты мне, Янка, і адкажы.

- Фу, я пачуваюся насоўкай, - зморшчваецца Яна. - Ізноў завёў... Ну колькі можна. Сам вінаваты, што ня муж, не жаніх, ня бой... Хто ж тады я для цябе? Вагіна? Хочаш нешта зьмяніць - зрабі ўчынак. Мужчынскі!

Натуральна, вымавіць слова «каханьне» я ня здольны. Яна, я ў гэтым пэўны, таксама. Мяркую, пачынаючы з нашага пакаленьня слова «каханьне» будзе ўсё больш трывала замацоўвацца сярод табуяванай лексыкі. Вызваліўшы, дарэчы, месца з штодзённага лексыкону для іншых, раней вузкаспэцыяльных словаў.

- Я ўжо не дзіцё, - заводжу я наноў, і мяне расьпірае ад агіды да самога сябе. - Чаму мы ня можам стварыць сям'ю? Чаму мы ня можам?..

- Ты сам разумееш чаму, - адказвае яна маркотна, потым падсоўваецца бліжэй і кладзе галаву на маё плячо. Яе набліжэньне выклікае ў мяне прыступ бурлівага раскаяньня. - Адкажы, ну хіба табе дрэнна са мной? Чым цябе не задавальняе тое... тое, што ёсьць? Хіба не галоўнае, што мы разам? Калі не лічыць гэтых (яна хітае галавой на дзьверы), што нам замінае жыць так, каб атрымліваць задавальненьне...

- Сама разумееш чым, - рохкаю я, зрэшты, ужо падатлівы, як дзіцячы канструктар. Яніна рука, сымбіёз коткі й кобры, прасьлізгвае паміж маіх ног. Янка ціха сіпіць, схіляе галаву, і я зь зьдзіўленьнем усьведамляю, што трымаю яе цёплае цела ў зусім не сяброўскіх абдымках. Крыкі за дзьвярыма даўно змоўклі, у залі чутная толькі эмацыянальная гутарка Міхаіла

Самсонавіча з паджылым хрыпатым тэлекамэнтатарам. У нашым пакоі - тэатар ценяў, які ладзяць два бясшумныя матылі. Я лаўлю паветра, што выдыхае Яна.

- Скажы «каханьне», - прашу я невядома чаму.

- Што? - яна санліва прыпадымае галаву.

- Скажы «каханьне». Скажы - «каханьне».

Яна выпростваецца.

- Навошта?

- Прашу цябе, калі ласка, скажы.

Дабрадушны сьмех скажае яе твар настолькі, што мне становіцца страшна. Але тут жа насланьнё зьнікае, быццам і не было.

- Love, - вымаўляе яна, зрабіўшы галівудзкія вочы. - Amour.

- Не, - я праглынаю сталовую лыжку сьліны. - Скажы «каханьне».

- Любовь, - кідае Яна. - Нечаянно нагрянет.

Я валю яе на сьпіну й хапаю за шыю. Пальцы быццам адно гэтага й чакалі. Я заплюшчваю вочы, і ў маёй сьвядомасьці рыскі-літары К, А, Х ператвараюць сваю бяскрыўдную вэртыкальнасьць у мадыфікацыі ўкрыжаваньня.

- Што ты казала пазаўчора? - я адпускаю Яну. Яна, заказытаная, плача ад сьмеху. - Пра тэст гэты, пяць якасьцяў...

- Гэта не зусім тэст. Гэта практыкаваньне такое... - Янка садзіцца. - Давай зладзім.

Яна знаходзіць дзьве асадкі й пазбаўляе тоўсты сшытак двух лістоў. Мы садзімся сьпінамі да сьцяны. За дзьвярыма перакатваюцца раздражнёныя крокі. Іх суправаджае няспынны прыцішаны стогн. Выснова тут магчымая адна: там Галіна

Іванаўна.

- Сутнасьць такая, - Янка гаворыць нягучна, але й ня шэптам. - Усё вельмі лёгка. За пяць хвілінаў ты запісваеш у слупок пяць якасьцяў майго характару, якія табе даспадобы, і пяць - якія не падабаюцца. Я адпаведна...

- Усё зразумела, не дурны, - адмахваюся я, кідаю позірк на гадзіньнік, прыцэльваюся асадкай. - Раз, два, тры, час пайшоў.

Адначасова з часам у пакой завітвае Марына. Выраз яе твару такі перабольшана прыхільны, што мы зь Янаю сынхронна закрываем вочы лісткамі й пачынаем нешта крэмзаць. Гэтае крэмзаньне - таксама псыхалягічнае практыкаваньне. Што рухае рукой чалавека ў такія хвіліны, якая сувязь між вынікам гэтага крэмзаньня і, напрыклад, эмоцыямі? Патлумачыць штрыхоўку й перавагу цёмнага колеру ў такіх малюнках змрочнымі думкамі - спрошчаны погляд на рэчы. Я, да прыкладу, выкрэмзваю ў дадзены момант нешта накшталт пляну эвакуацыі таямнічага будынку ў выпадку пажару.

- У марскі бой рэжацеся? - добразычліва пасьміхаецца Марына. Яна кожным рухам дэманструе сястрынскую любоў, не забываючыся, аднак, палюбавацца й на сябе ў загадкава-люстранай цёмнай паверхні шафы. - Гэй, рабяткі!

Шашаль нянавісьці пачаў тачыць паперу перад тварам Яны, яшчэ калі дзьверы толькі адчыняліся (пагрукаць Марыне і ў галаву не прыйшло). Я малюю зацеклай рукой пераходы й калідоры, лесьвіцы й падвальныя памяшканьні, будуары й лазенкі - нагрувашчаньне простых ліній.

- Янка, ды што ты як дзіця, - аблізваецца Марына. - Давай мірыцца, ладна табе. А, малая?

Яна павольна адсоўвае ад твару лісток і, гледзячы на сястру невідушчымі вачыма, грызе асадку. Я раблю па намаляванай схеме экскурсію для стрэлак.

- Малая, ну нельга ж так. Маці вунь, сэрца ў яе забалела. А я на цябе не злуюся. Зусім. А, малая?

Яна задуменна глядзіць на мяне, пераводзіць позірк на Марыну - усё той жа позірк, на ўсё тую ж румяную, добразычліва-ўсьмешлівую, змайстраваную з надзьмутых паветраных балёнчыкаў сястру.

- Ты мне замінаеш, Марына.

- Я?

- Ты мне жыць замінаеш. Выйдзі адсюль, калі ласка.

Марына пасьміхаецца яшчэ шырэй, я з страхам назіраю за яе ротам, гатовым разарвацца ад усьмешкі. Марына падымаецца, робіць крок у нашым кірунку, кідае погляд на мяне й паволі, не здымаючы ўсьмешкі, бокам рухаецца да дзьвярэй.

- Сучка малая, каб цябе трактарам трахнулі, - расьцягвае вусны Марына, і для яе, мы бачым, гэта балючы працэс, бо ўсьмешка, цяпер больш падобная на пірожнае, скоўвае Марынін прыгожы рот. - Я цябе ненавіджу, підарка трахнутая. Я цябе калі-небудзь задушу.

Марына выходзіць, а яе рот усё яшчэ мроіцца нам некалькі маўклівых хвілінаў. «Навучыў на сваю галаву», - слаба пасьміхаюся я.

- Засёк час? - мой слых скланае голас Яны. - Пачалі.

Па праўдзе кажучы, у нас ня вельмі раўнапраўнае становішча: калі ад мяне гэтае «практыкаваньне» патрабуе разабрацца ўва ўласных пачуцьцях і, што яшчэ складаней, даць ім імёны, то Яна, ведаючы ўмовы загадзя, даўно магла выканаць яго ў галаве. Але я не кажу пра гэта ані слова, моўчкі пасопваю й кручу асадку, баючыся парушыць тое суладзьдзе, тое шчасьлівае нетрывалае сугучча нашых зь Янаю сьвядомасьцяў, якое нам міжволі падаравала Марына. Я думаю і ўдаю, што думаю, выдумваю й перадумваю, і сёе-тое нават натую, але на патрэбную пяцёрку нашкрэбсьці ніяк не магу. Асабліва бянтэжыць мяне гэтае праклятае «Не падабаецца». Як я й чакаў, Яна запісвае свае вынікі амаль не адрываючы рукі й потым цярпліва назірае за маімі намогамі. Пяць хвілінаў мінаюць

фантастычна хутка, і я перадаю лісток Яне.

На гэты раз у дзьверы грукаюць. Галава Міхаіла Самсонавіча дазваляе нам, натхнёным нядаўняй перамогай, уздыхнуць з палёгкай.

- Янка, цябе да тэлефона, - кажа ён ласкава й, сьмешна выгнуўшыся, прапускае яе ў вітальню. Я хаваю лісток між каленяў. Міхаіл Самсонавіч праходзіць у пакой, нерашуча падступаецца да акна, зачыняе яго, аглядваецца на мяне, уздыхае, ізноў адчыняе. Я шукаю словы, якія пасуюць, ён - якія забіваюць. У выніку мы загаворваем адначасова:

- Міхаіл Самсонавіч...

- А «Рэал» выйграў...

Больш мы сказаць нічога ня здольныя. Мне надзвычай няўтульна ад неабходнасьці церціся аб калючую шчаку душы Міхаіла Самсонавіча, які дробна хітае галавой, мармыча нешта пад нос, нібы пераконваючы кагосьці, і толькі вяртаньне Яны вымушае яго сьпешна сысьці.

- Хто званіў? - пытаюся я як мага больш легкадумна.

- Ды так, - кідае Яна.

- А ўсё-ткі, хто?

- Неістотна.

- Я... Ты мусіш мне сказаць, хто гэта быў.

- А хто ты для мяне, каб я рабіла справаздачы?

- Значыць, я ніхто? Я для цябе ніхто?

- Як ты мяне закатаваў... Едзь дахаты, добра? Ужо палова на дванаццатую.

Я вырашаю адступіць. Дараваньня даводзіцца прасіць у сьпіны, затым у шыі, у вуха, апошняя інстанцыя - халаднаватыя Яніны

вусны - выносяць апраўдальны вэрдыкт. Прынамсі, разьвітаемся мы сёньня тымі, якімі сустрэліся.

- Я ня буду праводзіць да дзьвярэй, добра? - пазяхае Яна, дае мне на дарогу трошкі сваёй сьліны, паварочваецца да сьцяны й выключае сьвятло. Каля прыбіральні я натыкаюся на Галіну Іванаўну.

- Малады чалавек, дахаты не пара? - халодна кажа яна, ня гледзячы на мяне, і зьнікае ў залі, прычыніўшы за сабой дзьверы. Я глыбока ўдыхаю пах Галіны Іванаўны - ні з чым не параўнальны пах паджылага хворага чалавека, які зьбіраецца класьціся спаць, не пачысьціўшы зубоў.

Вольга Гурская Хмарка-дурніца. Раман на адну ноч у дванаццаці частках і слухаўках на адно вуха

Прафесару К. прысвячаецца

НОВАНАРОДЖАНАЯ
Тук-тук.

Прывітанне.

Хочаш, я раскажу табе казку?

Аднойчы пасля вясны пачалося лета. У ім было тры месяцы, трынаццаць тыдняў і дзевяноста два дні, і сярод гэтых дзён быў адзін-адзіны, калі паветра пахла вясёлкай, шакаладным марозівам і прадчуваннем суніц. Гэта быў самы незвычайны з усіх незвычайных дзён. У аркушы паперы, які ляцеў па смеццеправодзе з шостага паверху дому нумар восем па Лясной вуліцы, было пазначана, што чатырыста шаснаццаць год таму ў Нясвіжскай друкарні быў выдадзены «Катэхізіс», трыццаць пяць год таму запатэнтавалі шарыкавую асадку, а

дваццаць два гады таму адкрылі Заслаўскае вадасховішча. У гэты самы дзень дзядзька Хведар з вёскі Малыя Жаберычы злавіў у мясцовай сажалцы надзіва вялікага шчупака, кірпатая і рудая студэнтка-першакурсніца інстытуту замежных моў здала на выдатна нямецкую фанетыку, а сумны слонік з узбярэжжа Нілу навучыўся пляскаць вушамі. У гэты самы дзень нарадзілася зусім яшчэ маленькая дзяўчынка з гарэхавым позіркам. Праз колькі часу яна даведалася, што ў яе таксама ёсць імя - Вольга. Вільготная вольнасць, воля, льга воліць, валіць і вальчыць, вольха, волкасць, даволі, адвольна…

- Адчуваеш сябе wohl, га?

- Як заўсёды.

Дзяўчынка паступова расла, гуляла ў лялькі і з хлопцамі па местачковых вуліцах, заўсёды была выдатніцай, скончыла школу з залатым медалём і ўніверсітэт з чырвоным дыпломам, любіла мноства розных рэчаў (арэлі, бадзянне па вуліцах, барадатых мужыкоў, вецер, восень, арэхі, джынсы, дождж, зоркі, каву, катоў, кветкі, ліставанне, мора, неба, пацалункі, піва, захад сонца, сыр, цемру, цягнікі, чорна-белае кіно, яблыкі), выйшла замуж, назвала дачку Веранікай.

Калі б мяне, як яе, звалі Вольгай, я б таксама была прыгожай, разумнай і шчаслівай. Але мяне завуць іншым імем.

ДНІ ПЕРАД ТВАІМ З'ЯЎЛЕННЕМ
(самарыс дагары нагамі) Не нарадзілася ані 25 чэрвеня 1926-га года, ані 21 траўня
1972-га.
Не была дачкой капітана далёкага плавання і прымы-балерыны тэатру Ла Скала.
Не скончыла Гейдэльбергскага ўніверсітэту.
Не выйграла кубку Ўімблдону.
Не вынайшла электрычнасці і лекаў супраць менінгіту.
Не напісала казак пра Мумі-Троляў.
Не хацела назваць сябе Гантэнбайнам.
Не бачыла на ўласныя вочы раз'юшанага кенгуру.
Не выйшла замуж за прынца Эфіопіі.

Не…

НІЯКІХ НЕЧАКАНАСЦЕЙ

Бывае так, што здаецца - нічога няма і няма аніякай розніцы ў тым, хто чым займаецца, і тады я магу рабіць тое, што захачу. Апранаюся ў чорнае, фарбую вусны чырвонай шмінкай, бяру заплечнік, выходжу з кватэры, ігнарую аўтобусы і тралейбусы, іду наперад. Я ведаю, што на мосце цераз Свіслач, там, дзе дрэвы сустракаюцца са шматпавярховікамі і разам з месяцам люструюцца ў мутнай вадзе, я сустрэну яго. Мы незнаёмыя і з гэтае прычыны не дамаўляліся пра сустрэчу, але ён прыйдзе абавязкова, на змярканні, нечакана і незаўважна. Мы ветліва павітаемся, я пачну патанаць у яго сініх вачах, ён выцягне мяне адтуль за руку ў чорнай скураной пальчатцы. Мы купім піва, пагутарым, а потым пойдзем да яго. Нашы пляшкі хутка апусцеюць, але ісці ў краму будзе лянота, тым больш што ўсё зачынена, я буду перабіраць пальцамі яго валасы, ён павольна правядзе далонню па маім калене, пасінелым ад начнога ветру, які будзе дзьмуць з незацепленага на зіму акна. Я буду чытаць яму свае вершы. Ён пачне шукаць піва, якога даўно ўжо няма, і таму нам давядзецца зноў перабіраць пальцамі валасы, праводзіць далонню па калене, чытаць вершы ўсмяглымі вуснамі і…

Прыйшоў хлопец і аказаўся Хацяновічам.

ПАРАЛЕЛЬНЫ СУСВЕТ

Жыў-быў у адным беларускім правінцыйным горадзе Хацяновіч. Калісьці ён там нарадзіўся, хадзіў у дзіцячы садок, вучыўся ў адзінаццаці розных класах, а потым махнуў рукой, плюнуў цераз левае плячо, сказаў: «Ат! Халера яго бяры!» - і паехаў на цягніку № 675 у Менск, каб хоць штосьці ў гэтым жыцці прачытаць, пачуць і даведацца. Там ён пяць год запар ляжаў у інтэрнаце на ложку, паліў, піў гарэлку і іншую брыдоту ды разважаў пра розныя канцэптуальныя праблемы, як, напрыклад: ці ўплывае рэклама піва «Дызель» на патэнцыю мужыка і патэнцыял чалавецтва або што здарыцца з мясцовым прусаком па мянушцы Жу, калі яго вынесці на вуліцу пры

марозе ў 30 градусаў. У прамежках паміж гэтымі вельмі важнымі заняткамі Хацяновіч прыкладаў намаганні да вывучэння самых розных прадметаў: гісторыі антычнай літаратуры, філасофіі, французскай мовы і каленак выпадковых суседак па лекцыйнай аўдыторыі. Часам выпадковыя суседкі ператвараліся ў такіх жа выпадковых знаёмак, з якімі Хацяновіч трымаўся за рукі падчас бадзянняў па сонным Менску ў пошуках месца, дзе ўсё было б крыху інакш, чым цяпер. Праз тыдзень ён ледзьве пазнаваў іх пры сустрэчы ў калідоры інтэрнату. Гэта абсалютна не перашкаджала дзяўчатам нагадваць пра сваё існаванне дасыланнем вершаў на шматках клятчастай паперы. Кшталту:

Я - гэта не я а здань
якая блукае па
вулках старых гарадоў
збірае жоўтае лісце
слухае вецер
глядзіць у неба і
гуляе ў дзіўныя гульні.
Здань табе шле прывітанне.
Ты смяешся? дурань.

Хацяновіч пасля такіх вершаў сапраўды доўга смяяўся, але дурнем сябе не лічыў, мяркуючы, што лепш паводзіць сябе так, каб яны лічылі, што ты дурань, і не канцэнтраваць сваю ўвагу на думцы, якія яны дурніцы (паколькі вырашылі, што ён дурань), таму што гэта няветліва - думаць, што яны дурніцы.

Але ж гэта ўсё было даўно і няпраўда.

Сёння, у гэты недарэчны вечар, Хацяновіч цягаўся па вулках з нізкай абаранкаў і ўглядаўся праз дзірачкі ў іх у стрэчных дзяўчат, спадзеючыся на чарговую прыгоду. Раптам у дзірачку трапіў знаёмы твар.

ТАНГА, ПАКУЛЬ ЯНЫ НЕ ПАКРЫЎДЗЯЦЦА

Добры вечар.
Вечар як вечар. А што?
Як ты сябе адчуваеш?
Усмешка: Я адчуваю сябе.
Даўно не бачыліся.
Вечнасць…

Паколькі «Гінесу» няма нідзе паблізу, даводзіцца грузіць заплечнік «Старажытным». Мы ідзём да цябе, здымаем палітоны і абутак, разліваем піва па келіхах, уключаем музыку. Мы маўчым на розных мовах.

Я хачу каб побач быў хто-небудзь іначай я выбухну
лётаючы па гэтай прасторы перад птушкамі
птушкамі птушкамі
Ты мяне хочаш? Халера, дык прыходзь і адшукай мяне
я буду чакаць узяўшы зброю і пакунак сэндвічаў
і нічога больш нічога нічога
Ты мяне хочаш? Прыходзь і выламай дзверы
Ты мяне хочаш? Халера, дык прыходзь і выламай дзверы
Я гатовы, я гатовы, я гатовы, я гатовы

raindown raindown come and raindown on me
from a great height, from a great haaaeeeeiii
haaaaeeeeeiiii

ЗАПАВОЛЕНЫ РУХ
Каб з'явілася хоць што-небудзь замест гэтай гнятлівай пустэчы, падыходжу да кніжнай паліцы. Я заўсёды гэта раблю ў чужой кватэры. Я люблю варажыць па кніжках: выпадкова вырываць з тэкстаў словы і тое, што больш за іх, і прымацоўваць, прышываць, прыклейваць скотчам гэтае раптоўна выдранае да свайго ўласнага жыцця. Часам ад гэтага смешна. Вось і ў цябе сама ў далонь просіцца тонкая чорная кніжка…

Што ж мы робім адно з адным! Замест таго каб абняцца, мы забіваем у сабе жаданне абняцца, мы стаім на месцы і нішчым гэтую бедную пяшчоту, каб яна ўжо больш ніколі не прачнулася ў нас, мы прыбіваем яе да падлогі, мы вар'яцеем ад

яе, але яшчэ хвіліна - і яна мусіць памерці, і тады мы падыдзем адно да аднога і абдымемся, без усялякага жадання гэта рабіць; не, яна яшчэ трапечацца ў нас, гэтая ластаўка, безабароннае жаданне ў кожным з нас, і мы, як два пні, стаім на месцы, не робячы кроку насустрач адно аднаму, каб прытуліцца адно да аднаго, і гэта вельмі страшна - так стаяць на адлегласці ў адзін метр.

МІЛОСНАЯ ПЕСНЯ З УЗГОРКАМІ І ПАДЗЯМІ

Я не заўважыла, як мы апынуліся на адной канапе, вопратка складзеная на крэслах, мы ляжым пад адной коўдрай, з воўны, са страхаў і забабонаў, удваіх, але халодна, прыціскаюся да твайго пляча, аб якім марыла з таго часу, як сябе памятаю, маўчым, нязнятая бялізна ахоўвае рэшткі межаў, я ўздрыгваю ад нечаканасці, калі ты пачынаеш штосьці казаць, здаецца, пра дождж, які мог бы цяпер ісці за акном, але не йдзе, не, гэта проста так падобна вуркоча вада ў лазенцы, твой голас супакойвае, прытуляюся да твайго пляча, раптам уздрыгваю, калі твае вусны пачынаюць штосьці распавядаць маёй далоні, пужаюся, што я раблю? зараз устану, апрануся, яшчэ ходзяць аўтобусы, яшчэ можна… але ты цалуеш мяне, усярэдзіне займаецца і шырыцца штосьці падобнае да летняга сонца, пайшло ўсё на фіг, жыццё - рэч даволі кароткая і трэба паспець нарабіць у ім як мага больш глупстваў, ты цалуеш мяне, мне здаецца, што за акном ідзе дождж, напружанне залівае кожную клетку: што ты думаеш пра мяне? навошта табе - я? але ты цалуеш мяне, бялізна ўжо даўно на падлозе, і, можа быць, у якім-небудзь іншым жыцці я выйду за цябе замуж, нараджу дачку, ты будзеш добрым бацькам, але - не для маіх дзяцей, а можа быць, у якім-небудзь іншым жыцці мы ўвогуле незнаёмыя, але мы тут і цяпер, на вуліцы няма дажджу, хаця здаецца, што ёсць, у тваіх руках так цёпла, і ты цалуеш мяне, ох, гэтая хвіліна, усё аддала б дзеля яе, хай не будзе канца ў гэтай ночы, пабудзь, ноч, пабудзь яшчэ, не ідзі, але да раніцы засталося ўжо некалькі гадзін, мы паспеем заснуць і прачнуцца, потым ты будзеш паіць мяне кавай і я ўздрыгну ад нечаканасці, калі ты запытаешся: чаго ты плакала? - але я табе не скажу, не, яшчэ не скажу, як не сказала раней, і, можа быць, пазней не скажу

таксама, словы ўжо нічога не могуць змяніць паміж намі, у гэтым колазвароце нясказанага, няспетага і нязробленага.

Мне здаецца, я сплю. Бо ты. Цалуеш. Мяне.

ЦІ ТЫ КАХАЕШ МЯНЕ?
Дзесяць літар. Тры словы. Проста? Банальна? Надакучыла? Але чамусьці кожны марыць пачуць менавіта іх, сказаць менавіта іх, праспяваць менавіта іх, намаляваць на запыленым шкле аўтобуса менавіта іх.

Я кахаю цябе. Я кахаю. Як aha you.

- Алё?
- Мне трэба нешта табе сказаць…
Я завагаўся. Яна чакала.
- Мне здаецца… Я кахаю цябе.
Маўчанне. Потым яна адказала вельмі ціха:
- Ідзі ты… ведаеш куды!.. - і павесіла слухаўку.
Я не пакрыўдзіўся. І нават не здзівіўся.

Праз хвіліну яна ціха спыталася:
- Вы мяне не кахаеце?
І тут ён усё сапсаваў!
- Я гэтага не к-казаў. Вы… вы пазбавілі мяне д-душэўнай раўнавагі, - залапатаў ён, заікаючыся больш, чым звычайна. - Я не д-думаў, што такое яшчэ можа са мной адбыцца, але з-здаецца, адбылося…
- Дык вы мяне кахаеце? Кахаеце? - дапытвалася яна. - Калі так, усё астатняе неістотна. Калі не - тым больш. Адно слова, толькі адно слова. Ну?
- Так, я кахаю в-вас.

Адчуваючы праз футра цеплыню і акругласць яе рукі, ён шэптам сказаў:
- Вельмі кахаю вас.
- Вы прыдумалі гэта, - яшчэ цішэй сказала яна.

- Не, - амаль бязгучна запярэчыў ён. - Ведаеце, усё адно вочы мае і мае вершы нікому не патрэбны, калі няма вас.
І гэта было сказана так упэўнена, што яна змоўкла. Потым сказала чамусьці:
- Ведаеце, чаго не хапае на гэтых сініх дрэвах?
- Ведаю. Снегіра. Чырвонай іскры.
- Так.

- Ужо можна апранацца.
- Але ж ты мяне не кахаеш, - сказала яна.
- Не ляжаць жа праз гэта ўвесь час у ложку.
- Тады, канечне, можна апранацца.
- Але ж ты мяне таксама не кахаеш, - сказаў ён.

ЖОЎТАЕ
У жоўтым восеньскім горадзе, на вуліцы Жоўтай, стаяў жоўты шматпавярховік № 8. На сёмым паверсе месцілася жоўтая кватэра з жоўтымі сценамі, аранжавымі фіранкамі і рудымі прусакамі ў шчылінах. На канапе, засланай жоўтай прасціной, спаў хлопец, і валасы ягоныя здаваліся ў ранішніх промнях жоўтымі. Месца побач з ім пакідала ўражанне, што на ім толькі што хтосьці ляжаў. Толькі на ім нікога не было. Гэтая Хтосьці сышла. І там, куды яна пайшла, была вясна. Размаўлялі птушкі. І адна птушка запыталася ў яе: «П'юці ф'ют?»

НЕ ПАНІКУЙ
Цыдулка, пакінутая на падушцы
Хацяновіч, я ўсведамляю і прызнаю, што з прычыны майго неўрозу на глебе нерэалізаванасці глыбінных памкненняў падсвядомасці гэтай ноччу я, знаходзячыся ў стане перманентнай самарэфлексіі ў дачыненні дыскурсу тэорыі адноснасці і прыцягнення полавых супрацьлегласцей, цалкам выпадкова і з дапамогай алкагольных напояў справакавала непрадказальныя дзеянні ў дачыненні да кантэкстуальна прысутных. Не бойся, больш такое не паўторыцца.

ДА ХУТКАГА

А гэта, аказваецца, весела: ісці па яшчэ сонных вуліцах з пустым заплечнікам. Няважна куды. Мае значэнне толькі тое, адкуль. Адтуль, ад утульнасці, ад цюльпанаў, якія ты мог мне падарыць, ад ценяў хаценняў, ад Хаця, ад цябе. Можна было б, канечне, не сыходзіць. І спытаць цябе раніцай: «Ты кахаеш мяне?» (Варыянты адказу: «Так», «Не», «Хутчэй не, чым так», «Хутчэй так, чым не», «Цяжка сказаць».) І ты б выбраў другі варыянт. А паколькі мы не ў якой-небудзь аповесці пра каханне, дзе шмат сексу ды пакутаў і дзе ўсё заканчваецца сур'ёзнай жыццёвай драмай, то і не сустрэліся б мы з табой пасля шасцігадовага расстання ў псіхіятрычнай лякарні, каб пад уздзеяннем адноўленага пачуцця зірнуць адно на аднога і на свет іншымі вачыма. Дык навошта?

БЯСКОНЦА

Дзесьці высока-высока ў небе, на скрыжаванні маланак і вясёлак, жыла Хмарка-дурніца. Звычайна думаюць, што дурных хмарак не бывае, што хмарка не можа быць дурной, таму што яна - нішто. Але разам з тым яна ёсць усім. Таму што ўсё, што ў табе, ты можаш убачыць у хмарах. Адно што гэтага ніхто не робіць. Але, калі легчы на траву і ўгледзецца ў неба, можна ўбачыць там адну з хмарак, якая, хоць і не дурная, але паводзіць сябе, быццам дурная. Самае дзіўнае, што яна можа расказаць табе гісторыю, у якой будзе 2239 словаў, 11961 друкаваны знак, некалькі простых і ўскосных цытат, выдраных з кантэкстаў і дыскурсаў, некалькі схаваных улюбёных мелодый, а таксама гісторыя таго, што магло б быць каханнем. Яшчэ там будзе сюжэт, просты і банальны. Хлопец і дзяўчына (умоўна Хмарка назвала іх Хаця-новіч і Ня-Вольга), даўно знаёмыя, але якія абсалютна не ведаюць адно аднаго, сустракаюцца аднойчы ўвечары. Крыху пагаманіўшы, яны ідуць да яго, п'юць піва і слухаюць музыку. Нечакана іх ахоплівае жаданне кахання. Паўстае пытанне, ці магчымае яно паміж імі. Пацалаваўшыся і зразумеўшы, што і такі варыянт цалкам магчымы, яны кахаюцца. У працэсе высвятляецца, што яна яго ўсё ж такі даўно кахае, а ён яе - не, і рабіць гэтага не збіраецца. Каб пазбегнуць пакутлівых размоў і высвятленняў, яна раніцай сыходзіць, пакінуўшы яму цыдулку. На гэтым гісторыя

канчаецца. Расказаўшы табе яе, Хмарка засмяецца і паматляе ножкамі, ад чаго ў горадзе, дзе ўсё гэта адбывалася, пачне ісці дождж у невядомым напрамку. Зрэшты, усё не так і сумна. Бо ўсё мае сваё заканчэнне. Усё. Але пасля таго як усё скончылася, пачынаецца ўсё астатняе.

Во як.

Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

МАРЫЯ ВАЙЦЯШОНАК пісьменьніца. У 2002-м выдала кнігу прозы «Сад нявіннасьці».

Марыя Вайцяшонак Партрэт невядомай.

Шукаю таго, кім быў
да пачатку часоў.

Ейтс
Цяпер, як на тое, мне часьцей стала трапляцца на вочы суседка. Выводзіць пагуляць сабаку. Ідзе - рукі ў рукавы, дзіцячымі крокамі, твар нерухомы; ідзе да копанкі ў сквэры. Робіць круг каля мёртвай вады і вяртаецца. Рукі - як счэпленыя жывасільлем, толькі што не за сьпінай, быццам зьняволена ў гэты дом, зьняволена ў адзіноту. І толькі аднойчы на відніцы, выпадкова зірнуўшы ў акно... яшчэ нідзе анікога, туман белым разьвінутым прасьцірадлам - і жанчына. Да яе шалёнымі ад радасьці скокамі бег бадзялы белы сабака (ён тут даўно), крычаў чалавечым голасам нямка: а-ы, а-а-ы! Ён прабіваўся праз тоўшчу ейнага няшчасьця, смутку. Два целы ў тумановай плыні пластаваліся адно каля другога, гуляючы. Яна карміла яго, лашчыла, прыгожа ўскідвала рукі, завязваючы ў вузел валасы, і ішла разам зь ім да мёртвай вады.

Да мёртвай вады, якая стаяла ў маім пакоі ў вялікім люстэрку.

Завесіць чорным, як у час пахаваньня, справіць, пабыўшы, гадавіну, успомніць таго, хто адышоў у іншы сьвет. А потым на

адным разе перавярнуць настольнік найніцу і зайграць на гармоніку: маўляў, жыцьцё працягваецца.

Але ў маім доме не хаўтуры, а здрада. Сышлі сябры, голасна перагаворваючыся, гледзячы ў твар, сьмеючыся, як сыходзяць розныя жывыя істоты са зжытага месца, з голай зямлі. Яшчэ быццам чуваць іхныя галасы ў пакоях, яшчэ бачу позіркі іхныя цераз плячо, крокі... Нехта затрымаўся, не, вярнуўся за парасонам. Стукнуў вецер у акно, зашапацела дрэва - зманлівыя гукі спагады. Яшчэ тэлефануюць, нешта абяцаючы, гуляюць словамі, як бывае ў гаворцы выпадковых сувязяў. Яшчэ быццам і кава не астыла на стале. «Людзей добрых няма, людзі па масьці скрозь благія! Гэта за савецкім часам нас усё запэўнівалі, што людзі харошыя, а як аказалася... Я і дзіцяці свайму так тлумачу, каб не спадзявалася ні на кога...» - раз-пораз успамінаецца сустрэча з суседкай па пляцоўцы. Бы каменем цераз плот, калі ты ідзеш па вуліцы, расхрыстаны даверам. Каменем і па малой, пасьля чаго і на вочы ейнай дачцы трапіць вусьцішна, бы й ты сама на ейную дарогу зьверам зь цёмнага лесу выйшла.

У доме кожная рэч шукае сабе суразмоўцу. А на вуліцы, дзе чужыя твары, вокны, зьдзіцянелае пачуцьцё, што нехта вялікі, дужы выпусьціў тваю руку ў цесным натоўпе і зьнік. Не закрычаць, не паклікаць, бы ў трывожным сьне, не перавярнуцца на другі бок, каб ня сьніліся жахі, - не перайначыцца на другое жыцьцё. Нехта малазнаёмы, як з натоўпу ўсё роўна, раіў: паплач! Сьлёз не было, вочы мялелі, высьмягалі, балюча было глядзець на сонца. Схадзі ў тэатар! У тэатар?! Мяне спачатку трэба адцягнуць ад прорвы, выратуе хіба толькі нечы чысты зрух, без рэпэтыцыі і проб. Але...

У горадзе дождж, першы, веснавы. Дождж ціхі, шэптам, шэпт скрозь, каля ног, да самай зямлі, блізенька, унікліва, незаўважны для чалавека - ні на твары, ні на адзеньні, - толькі быццам дазволена табе выпадкова пачуць шчырую гаворку паміж небам і зямлёй. А можа, да тых, хто пакінуў сьвет? Здалёк заўважаю незнаёмую жанчыну. Рухалася, як па ветры, сарваная зь месца. Яе лёгка было заўважыць у натоўпе: мне цяпер знаёмая гэтая лёгкасьць у нагах, калі зямля цябе не

трымае, бо зямля для радасьці. Збочваю, іду насустрач, быццам і тая таксама ішла да мяне. Мне мусова бачыць ейны твар - твар згубленага чалавека, амаль самагубцы. Пакінуць сьвет?! Але каму? На каго? Ужо і дзяўчо суседчына жыве недаверкам, папярэджанае маткай - людзей добрых няма. Адняла надзею на лепшае, бы сілай адарвала ад грудзей маё кволае немаўля. І хто я цяпер сама, не захінёная, не абароненая сяброўствам, любоўю? Маё імя?!

Пакінуць сьвет... Па мне, каталічцы, паставяць крыж ці камень з надпісам. Сумны мурог з суседняга кладаўя спаўзе на вочы. Каго папярэдзіць, што мне б дарала зусім інакшае? На этрускіх помніках з абпаленай гліны ў Вальтэры жанчына часьцей трымае ў руках вэер. «Сьмерць і бесклапотнасьць, легкадумства, выкшталцонасьць - сьмерць і гэты подых ветру, які раптам асьвяжае ўжо сьпячыя, нетутэйшыя твары» (Філіп Жакатэ). Перайсьці ў другі сьвет нязмушана, без адчаю, іншы раз наведвацца па кладцы, зробленай на прыкладзіны, каб яшчэ і яшчэ пакаштаваць цудоўнага віна, пакінутага на Дзяды на стале сябрамі.

У доме анікога, акрамя сабакі, як у той жанчыны, што ходзіць удваіх на выгул да мёртвай вады. Толькі іншы раз выпадкова натыкаюся на позірк - італьянец Лярэнца Коста, «Жаночы партрэт», XV стагодзьдзе, Сярэднявечча. Я часта адчувала прысутнасьць у пакоі багатай дамы без імя, з палымянымі валасамі, у тэракотавай сукні. Густа напудраны твар, шыя, плечы, толькі жывыя, рухомыя вочы, якія, пэўна, сьвяціліся і ў цемры. Рудзь прабівалася праз пудру сьвячэньнем сьвечкі. Фонам - густы морак каменных скляпеньняў, холад улоньня і на ейным твары, прыгажосьць быццам не разьвіхалася бяз сонечнага сьвятла - цяжка было вызначыць ейны век. Яна доўга звыкалася са мной. Варта было падысьці, пачаць разглядаць - жанчына пужалася, пацеркі на шыі зрушваліся, беглі адна за адной, яна часта дыхала ад хваляваньня. Скулы цямнелі, калі я доўга бавілася ў ейным пакоі. Палохалася, калі я дакраналася да другога чалавека, калі мяне хто запэўніваў у дружбе ці любові, калі хто цалаваў рукі, разьвітваючыся. І толькі калі лашчыла сабаку, быццам супакойвалася. Яна ня мела даверу да людзей. Хацела мяне папярэдзіць?!

Мы не супадалі, але я не схавала партрэту з вачэй зь невядомай мне сувязі зь ім ці проста ўлічваючы мастацкую вартасьць італьянскага майстра.

А цяпер нас было двое, недаверкаў, мы амаль не сустракаліся поглядамі, як два злачынцы. Два жаночыя партрэты, без імён і бяз вэеру, вядома. Мёртвая ціша, і подых ветру не даходзіў, не асьвяжаў нашых нетутэйшых твараў.

Ня памятаецца, каб пазванілі, каб я адамкнула дзьверы, а на парозе стаяла маладая жанчына, зь ёй мы выпадкова сустракаліся на выставах, амаль незнаёмая. Стаіць азіраецца, як на прыпынку, быццам упэўніцца ёй трэба, ці туды трапіла. Здарожыўшыся, бы ішла пехатой, аслабаніла рукі ад вандзэлкаў. Толькі што ў барэце, а так дарала б зараз ёй хустку тугую разьвязаць на галаве, спусьціць рагі, каб трохі ачахнуць, аж пара выдаецца, ідзе і ветрыкам вясновым заносіць, як ад першай пралескі ў лесе. Нахілілася, выкладае з сумкі проста мне ў рукі, ні хвіліны ня бавячыся, адразу ў парозе, быццам толькі з гэтым і прыйшла і найпільнейшым: саланіну, какоркі крамныя, але рыхтык такія, што рабіла калісьці ў вёсцы суседка Гірына. Тлустыя, пахнючыя, уетыя, тыя, што на сьвята, рукамі качаныя, на вока пасыпаныя буйным цукрам, дзе болей, дзе меней, тыя, што даваліся ў рукі, таксама ў парозе, калі ў хату, адумысла прычыну ганяючы, зайдзішся, пачуўшы пах з коміну. Сморгнеш, атрымаўшы, за дзьверы коткай, бы сьцягнуўшы са стала. «Пачакай! На яшчэ малака!» - чую наўздагон. Мяне не затрымаць, - я лячу ў сьвет, несучы навуку нашай вёскі: лёгка папрасіць, лёгка ўзяць, лёгка аддаць. Стаю, як тады, ля парогу, прымаю ў рукі арэхі, яшчэ нешта, і яшчэ, поўны ахапак, прымаю надзіва моўчкі, скупа, прагна, - нічога ўзамен, хай сабе і на словах, каб нічога ня збавіць сваімі падзякамі, не застацца вінаватаю.

Быццам яно і не табе, а на ахвярнік.

Вуліцы за вокнамі неспадзявана занесены ў красавіку, пэўна, апошнім сёлетнім сьнегам. Толькі во адзіныя крокі на дарозе - сьляды маёй госьці, праз увесь горад, ад ейнага дому да майго.

Прыходзіць неўзабаве і другі раз, распранаецца і складае

адзежу ў парозе, як мокрую барму пасьля дажджу, каля ног, на падлогу. Прыносіць нізку сухіх белых грыбоў, сабраных ейнай бабуляй у вёсцы, і слоік поліўкі з бобам, маўляў, Вялікі пост, якраз перад Вялікаднем, абавязкова трэба пакаштаваць. Сьвечкі ў поліўцы не стаялі, запраўленая толькі грыбамі, падманны пах посьніцы, нішчымніцы. Трэба хоць лыжку памачыць у гэтае варыва, дапільнаваўшыся чаргі каля міскі сярод старэйшых, і ты ўжо выратаваны, табе даруюцца дзіцячыя грахі.

Хутка і пайшла, у пакоях застаўся грыбны пах вясковай хаты - дух блізкай зямлі, дух блізкага старога чалавека, каля якога ты сядзіш, расьцеш на адной грыбніцы. Асабліва ў кутку на кухні - як пад ялінай усё роўна. Госьця акурвала мяне даўнейшымі пахамі, як дымам, травой пералёту ад пужаньня, давала мне знакі, якімі было пазначана маё племя, племя вясёлых, дужых, шчырых людзей. Сустрэўшы сьвежага чалавека, упадабаўшы яго, мне заўсёды карціць запытацца: а ці сьпяваеш ты?

Я шукаю голас пеўчага чалавека, бы падбіраю ў касьцельны хор, - у нас у вёсцы сьпявалі ўсе.

Зьвесткі адтуль, з нашай вёскі, быццам ішлі з дня ў дзень, з кожным прыходам госьці. Мяне разварочвала тварам проці здрад, згуб, як проці ветру. Вярталася памяць. Сьніліся сны: то жыта ля дарогі, па якой хадзіла ў школу, то трава высокая, то чорная ральля, сырая, бы гэта ў маім доме паслана мне, не паслана нанач. І нават вясновы ручай зь белай глінкай на дне, ён зьнікаў улетку, але яшчэ бег, цёк праз маю памяць. І імя ягонае сярод імён маіх памерлых ужо аднавяскоўцаў. Бачыцца ў снох усё ясна, да драбніц, пэўна, каб хто ў тую каторую ноч запазьніўся ў нашым полі, убачыў бы мяне, мой прывід. Днём таксама ўвачавідкі наматваю шоўк ручая на цэўку, тужэй і тужэй, і апынаюся ўмомант там, дзе ён пачынаўся. То раптам паўтараю бабулін жэст, маміну грымасу, бы адчуваю іхны дотык да сябе.

Гэта ўжо дзённыя сны.

А ці сьпяваеш ты? - пытаюся ў госьці другім разам. Не, адказвае. Яна амаль і не размаўляе. Сядзіць насупраць, заўсёды адна і тая ж поза, вочы прыспушчаныя, маўчыць, бы прыходзіць

да мяне на сэанс натуршчыцай. Аніякай касмэтыкі, толькі вось нетутэйшы міндалепадобны разрэз павек, як змаляваны ад некага. Сустрэнеш такую жанчыну на вуліцы - і нязмушана затрымаеш яе за плячо, каб падзівіцца, як спыняе нас іншы раз вышэйшая сіла, даруючы ясны зрок - здольнасьць убачыць цуд. Павярнуць да сябе за плячо або самому зайсьці з аднаго боку, з другога, каб не адсьвечвала, як у музэі. Апранута ў нешта выпадковае, зусім не да твару, быццам і не сваё.

Пойдзем, кажа, да касьцёлу на ўсяночную, булкі пасьвенцім. Я маўчу... Бо ў нас было во як: вёска чакала дзевак з усяночнай, каб пранашчыцца сьвянцонай сольлю. Раз-пораз выходзілі з хаты, паглядалі ў той канец, адкуль вяртаюцца з храму. Нарэшце паказаліся, ідуць, лепей будзе сказаць, узыходзяць з-за пагорку, зь дзясятак кілямэтраў пехатой, хто і босы, ідуць не сьпяшаючыся, натоўпам, пагорак падымае іх на плечы вышэй і вышэй. Сьціхае сьмех, гаворка. Разьвіхнуўшы натоўп у радок, ідуць ужо моўчкі, каб урачыста данесьці тую радасную навіну ўваскрашэньня.

Сама я састарэла ў гэтым горадзе ў вечных звадах - і ў дзеўкі ня ўбралася, і ў бабы. І буду да скону выходзіць і глядзець, адкуль вяртаюцца з храму мае аднавяскоўцы.

У каго паміж Богам і чалавекам поп ці ксёндз, у мяне - мая вёска.

Тэлефануе, вымаўляе маё імя з акцэнтам, бы перакладае зь іншай мовы: «р» з хуткім пераскокам, як цераз раптоўную перашкоду на дарозе. Прыходзіць на Вялікдзень са сьвянцонай сольлю, прыходзіць з дня ў дзень, ідзе, падымаецца з-за пагорку маіх згуб, майго недаверу. Адкуль, праз каго ёй наказалі і хто ён, каб так дакладна ведаць, што я ў небясьпецы? І чым, як мяне ратаваць? Мы амаль незнаёмыя. І яна намнога маладзейшая за ўвесь гэты брыдкі сьвет?! «Ты быццам пасланая некім...» - вымаўляю на згад. «Мы ўсе адно аднаму пасланыя...» - адказвае прарочыцай.

Сядзіць насупраць, вочы вузка да скроняў абведзеныя сном няведаньня. Так цнатліва, не міргаючы, глядзяць на мяне здалёк мае вясковыя бабы. Так глядзяць з абразоў мадонны

італьянца Пётры Лярэнцэці, у якога позірк сьвятых, анёлаў і позірк чалавека маюць аднолькавы сэнс. І нават маленькі Хрыстос на адным зь ягоных абразоў адхінае покрыў на галаве маці, каб пацешыцца зь ейнай прыгажосьці. А ты тут жывеш, выкрабляючыся, губіш сваю прыроду на іхных вачох - забываешся на іхнюю ахоўную пасаду.

Яшчэ пільней разглядаю сваю госьцю, сьпяшаюся, бы яна сапраўды прыйшла да мяне на сэанс, і можа, на апошні. Пярсьцёнак на ейнай руцэ... іянічны стыль... дзе я яго ўжо бачыла? Быццам ён увесь час навідавоку… на туалетным століку ці на паліцы ў ванным пакоі, з маёй рукі?!

Я застаюся жыць. Мне вяртаецца імя. Жыць спачатку. Хаджу па доме, быццам атрымала спадчыну, разглядаюся, адчуваю нанова свой лад, па каслаўках усё бяру ў рукі, перакладаю, сумна цешуся. Шчыльнае цёплае гняздо, складзенае зь веры ў маіх сяброў, умацаванае на доўгае жыцьцё, упрыгожанае найлепшымі спадзяваньнямі, якія яны калісьці абуджалі. Цяпер яно да скону будзе перавіта маім даверам, няўцямным, але гэтага дастаткова.

Раптам заўважаю... Пярсьцёнак маёй госьці... на руцэ дамы ў тэракотавай сукні?!

Мы ўсе адзін аднаму пасланыя некім. Нават калі гэта проста «Жаночы партрэт» у раме. І без імя.
[image]
[image]

Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ (нар. у 1977) - пісьменьнік, эсэіст. Летась апублікаваў у «ARCHE» крытыку «Штурханьне ўбок», п'есу «Начныя праспэкты» і мініятуру «Міты поўначы Магілёва». Жыве і працуе ў Магілёве.

Аляксей Бацюкоў
Двое
Сцэнар відэафільму

Мы двое, як доўга...
У. Уітмэн

Ноч. Спачывальня.

На экране - твары жанчыны і мужчыны, яны ляжаць на ложку. Жанчына на пярэднім пляне, ляжыць на сьпіне з заплюшчанымі вачыма, мужчына на баку, павернуты ў фас, сьпіць з разяўленым ротам і выдыхае паветра на жанчыну. Жанчына часам расплюшчвае вочы і азіраецца на мужчыну.

Ж а н ч ы н а. Не магу заснуць. І так штоночы. Ён дыхае на мяне. Часам становіцца жахліва. Хай бы ўжо неяк проста дыхаў. А то паглядзіце. *(Адварочваецца ад мужчыны, але сутыкаецца з тым жа тварам зь іншага боку.)* Госпадзі! Ну што гэта такое! *(Хаваецца пад коўдру, пэўны час валтузіцца, затым на месцы, дзе была яе галава, вылазяць ногі. Экран пераносіцца на яе твар у фас, яна ляжыць на сьпіне і з палёгкай уздыхае, заплюшчвае вочы.)* Ужо цяпер я пасплю. Я прысьню што-небудзь, як па тэлевізары. Пра рэкляму. *(Паўза. Нечакана чуецца блізкі прысьвіст і сіпеньне. Жанчына расплюшчвае вочы і глядзіць убок.*

Там той жа твар мужчыны, ён дыхае на яе. Жанчына заплюшчвае вочы і адварочваецца ў іншы бок. На экране адзін вялікі твар мужчыны з разяўленым ротам.) М-м-м! *(Жанчына сьпіхвае мужчыну на падлогу і развальваецца на ўвесь ложак, зьвесіўшы па краёх рукі і ногі.)*

Выява мужчыны, які ляжыць на падлозе, пакрысе расплюшчвае вочы і аглядае сябе. Пэўны час глядзіць на руку жанчыны, што зьвісае з ложка. Заплюшчвае, расплюшчвае вочы.

М у ж ч ы н а. Ну што вы на гэта скажаце? *(Узьнімаецца, садзіцца на край ложка, трэ вочы.)* Куды яна падзелася? *(Шукае рукой побач з сабой.)* Толькі што тут была. *(Прыўзьнімае край коўдры, зазірае глыбей, паўзе пад коўдрай да іншага краю ложка. Там з-пад коўдры вытыркаецца яго галава і азіраецца.)* Я магу прысягнуць. *(Кладзецца спаць, заплюшчвае вочы, разяўляе рот, шумна дыхае перад сабой.)*

Экран пэўны час паказвае профіль мужчыны, затым паволі ссоўваецца ўбок і паказвае побач зь ім профіль жанчыны. Яна з расплюшчанымі вачыма і падціснутымі вуснамі.

Ж а н ч ы н а. Калі ўжо ты надыхаешся... Так, каб заткнуцца. Ну што табе трэба ад мяне? Божачкі ж вы мае. Я табе гэта ніколі не забуду. Дзякуй, дзякуй за ўсё. *(Накрывае свой твар падушкай.)*

Экран вяртаецца на профіль мужчыны. Той расплюшчвае вочы, глядзіць перад сабой, на падушку перад яго тварам. Падымае рукой падушку, там нікога няма. Кладзе падушку назад, заплюшчвае вочы.

Раніца.

Жанчына ў начной кашулі йдзе па калідоры, уключае сьвятло ў ванным пакоі, заходзіць унутр, пляскае сабе вадой на твар, затым зачыняе дзьверы.

Мужчына ў халаце йдзе па калідоры, заўважае, што ўключанае сьвятло ў ванным пакоі, зазірае туды, нікога не знаходзіць,

выключае сьвятло і йдзе на кухню.

Жанчына палошча рот, калі ў яе гасьне сьвятло. Яна гучна выплёўвае ваду, выходзіць, запальвае сабе сьвятло і далей чысьціць зубы.

Мужчына выходзіць з кухні, ізноў заўважае ўключанае ў ваньне сьвятло, зазірае туды і выключае сьвятло. Калі ён сыходзіць у пакой, чуецца, як у ваннай жанчына гучна выплёўвае ваду. Праз сэкунду жанчына выглядае з ваннай, у яе на вуснах пена ад зубной пасты. Яна штосілы б'е па выключальніку ўсёй далоняй, нешта бубніць і хаваецца ў ваньне.

Мужчына зноўку праходзіць па калідоры, спыняецца перад выключальнікам. Аглядаецца, выключае сьвятло і йдзе на кухню.

З ваннай нясьпешна выходзіць жанчына з падціснутымі вуснамі.

Ж а н ч ы н а (скрозь зубы). Сука. *(Ідзе ў залю.)*

Мужчына заходзіць у ванны пакой, уключыўшы сьвятло, і зачыняецца там.

Зьяўляецца жанчына, апранутая ўжо ў сукенку, і слухае пад дзьвярыма. Калі даносіцца, як мужчына ўключае душ, яна крыху чакае, потым ідзе ў туалет і перакрывае там кран з гарачай вадой. Мужчына ў ванным пакоі крычыць і лаецца. Жанчына здымае з абодвух кранаў у туалеце вэнтылі, кладзе іх у кішэню і йдзе на кухню.

Кухня.

Сьпіна мужчыны, ён нешта смажыць.

М у ж ч ы н а. Як мне надакучыла гэтая бульба. Праўда, з сольлю яшчэ можна было б пацярпець. Трэба набыць соль. Яйкі я ўсё роўна забуду. Альбо іх ужо ўсе купяць. Як заўсёды. І кетчуп скончыўся.

Мужчына ссоўваецца ўбок - чуецца грукат пустых бутэлек, - лаецца, садзіцца за стол, ставіць перад сабой патэльню са смажанай бульбай. Адчыняе нажом мясныя кансэрвы, нож адкладае на іншы бок стала. На экране пэўны час толькі нож, чуецца, як відэлец шкрабе па талерцы, затым - як сіпіць нейкая смажаніна. Рука жанчыны бярэ нож, цяпер на кухні адна жанчына. Яна варушыць у патэльні на плітцы яечню, соліць яе і палівае кетчупам. Затым сядае есьці. Сьнедае, выцірае вусны ручніком. Глядзіць у патэльню. Там яшчэ два яйкі.

Ж а н ч ы н а. Што я зноў, як дурніца, поўную патэльню набухала. *(Удыхае водар яечні. Задумліва шчыпае сябе за жывот, глядзіць на яечню.)* Усё, хопіць. *(Адносіць патэльню да сьметніцы, чапляе рэшткі яечні відэльцам, але, перад тым як выкінуць, крыху адкусвае.)*

Жанчына сыходзіць, на экране пэўны час адна сьметніца. Туды падае бляшанка з-пад кансэрваў, паказваецца рука мужчыны, той трасе ёю над сьметніцай. Далей экран кіруе за мужчынам. Ён ідзе ў іншы пакой, апранаецца, выходзіць у калідор, апранае плашч і боты, адчыняе дзьверы, за якімі аказваецца такі самы пакой. Мужчына заходзіць, распранаецца, пакідаючы плашч на тумбе ў калідоры, а боты - проста пасярод пакою, і йдзе ў залю. Там садзіцца на ложак і чытае газэту. За акном вечар. Мужчына ўключае тэлевізар, там на экране бегаюць вялікія і маленькія літары, выявы пісталетаў, акрываўленых людзей, голыя жанчыны, грошы, шпрыцы, прэзэрватывы і надпісы «Stop AIDS», затым сэрыя выбухаў - і экран тэлевізара гасьне. Мужчына пэўны час яшчэ глядзіць туды, затым паварочвае галаву ўбок і бачыць, што з-за шафы тырчыць нага жанчыны. Мужчына падыходзіць, прысядае на калені, горача цалуе і лашчыць нагу, цягне на сябе. Гэта аказваецца штучная пластыкавая нага, мужчына кідае яе на падлогу і йдзе на ложак. Глядзіць у бок шафы. Там ізноў вытыркаецца нага жанчыны, у кадры толькі яна. Нага выгінаецца, затым зьяўляюцца рукі, яны здымаюць панчохі. Зьяўляецца другая нага і ўся жанчына. Жанчына выходзіць з-за шафы, папраўляе на сабе халат, ходзіць па пакоі, прыбірае.

Ж а н ч ы н а. Што за дзень?.. Трэба было хоць кветак сабе

купіць, а то так і здохнеш тут бяз кветак. Я ня бачыла іх ужо год! *(Выходзіць у калідор, папраўляе на падлозе боты мужчыны, ягоны плашч вешае на вешалку, гладзіць яго рукой, нюхае. Ідзе на кухню.)* Павячэраю і пайду да Люды. Не, не пайду. Пайду куплю сабе кветкі і запрашу сябе ў кавярню. Нажаруся гарэлкі і падчаплю якога мужыка. Значыць, там і павячэраю. *(Накідвае свой плашч, абувае чаравікі і сыходзіць, зачыніўшы за сабой дзьверы.)*

У калідоры перад дзьвярыма зьяўляецца мужчына, ён апранае плашч, боты, пералічвае грошы ў гаманцы, прыгладжваецца перад люстэркам, вышчыпвае валасы з носу, пырскае дэзадарантам пад пахі, сыходзіць.

Начная гарадзкая вуліца.

На экране пустая дарога на фоне вялікага цёмнага дому. Зьяўляюцца маленькія постаці мужчыны і жанчыны, яны ідуць з двух процілеглых бакоў адно насустрач аднаму, перасякаюцца, аддаляюцца, мужчына азіраецца на жанчыну, затым абое зьнікаюць за краямі экрану. У доме пакрысе гаснуць вокны, з таго боку, у якім зьнік, зьяўляецца мужчына, ён ідзе няўпэўнена, часам спатыкаецца і прытрымліваецца рукой за ліхтар. Жанчына зьяўляецца са свайго боку, паліто на ёй расшпіленае, яна махае сумачкай, з сумачкі тырчаць кветкі. Яны перасякаюцца, прамінаюць адно аднаго. Мужчына аглядаецца, спрабуе нешта сказаць жанчыне, падымае руку, але потым махае ёю і йдзе ў свой бок. Усе вокны ў доме і ліхтары пры дарозе гаснуць.

Спачывальня. Ноч.

Жанчына засьцілае прасьціну на ложку, кладзе падушку, адварочваецца за коўдрай, паварочваецца зноў да ложка і бачыць ужо дзьве падушкі, прычым каля сьцяны, большая, аказваецца прымятай, нібыта на ёй ляжалі. Пэўны час жанчына глядзіць на ложак, затым разам з коўдрай садзіцца на край ложка. Выцірае вочы краем коўдры, кідае коўдру ў кут, распранаецца, падыходзіць да акна і рэзка адхінае фіранкі. З выклікам глядзіць на начны горад. Празь нейкі час

прыкрываецца рукамі і адыходзіць.

Паўза.

З-за фіранкі нясьпешна выходзіць мужчына, нібыта доўга глядзеў у акно і стаміўся глядзець. Ён ходзіць па кватэры, з пакою ў пакой, ціха і няўпэўнена, затым вяртаецца ў спачывальню, кладзецца ў ложак і ляжыць, гледзячы ўбок. З-за шафы паказваецца нага жанчыны, але мужчына пазірае на яе абыякава. Потым у люстэрку ў калідоры паказваецца аголенае жаночае цела, чуецца сьмех. Мужчына глядзіць перад сабой, ніяк не рэагуючы, затым адварочваецца да сьцяны.

Асьвятленьне гасьне.

Горад прыгожых і таленавітых
Чытанка для дзетак

У адным маленькім, але вельмі прыгожым горадзе, разложаным на высокім вольным беразе агромністае ракі, жыў скрыпач. Гэта быў старэнькі, сівы, нават белы дзядок з дому на самым абрыве. Ён граў так прыгожа, як пяе салоўка, і яшчэ прыгажэй. Доўга-доўга, ад самае раніцы і да вечару, музыка лілася з вокнаў яго дому і прымушала людзей, што праходзілі міма, спыняцца і замілавана слухаць. Скрыпача любілі ўсе, людзі адчувалі, што ня могуць і дзень пачаць як трэба, калі не паслухаюць яго цудоўную музыку.

І толькі адзін чалавек не разумеў яе прыгажосьці. Гэта быў таленавіты і вядомы мастак з дому насупраць. Ён пісаў карціны і міжволі думаў, чуючы скрыпку: «І што тут прыгожага? Самая звычайная скрыпка». Ягоныя карціны ніяк не цярпелі ад таго, што мастак не разумеў гэтае асаблівае прыгажосьці музыкі. Наадварот, яны заўсёды адрозьніваліся такім буяньнем фарбаў, што ўсё намаляванае выглядала як жывое.

Аднойчы на сьвята гораду мастак выставіў усе свае карціны на галоўнае плошчы. Было вельмі весела, людзі стоўпіліся каля іх,

адпіхваючы адзін аднаго і ўсхваляючы мастака. Толькі адна маленькая дзяўчынка хадзіла побач і няўцямна пацiскала плячыма: «Што ўжо такога асаблівага ў гэтых карцінах? Па-мойму, яны самыя звычайныя».

Гэтая дзяўчынка была вельмі прыгожай, самай прыгожай дзяўчынкай у горадзе. І ўсе дарослыя, і ўсе іншыя дзеці захапляліся ёю, яе дзіўнымі валасамі і агромністымі блакітнымі вачыма, такою яна была прыгожай. Толькі адзін хлопчык зь ейнае клясы лічыў яе самай звычайнай. Сам жа ён вучыўся лепш за ўсіх дзетак у горадзе, і ўсе настаўнікі і настаўніцы ставілі яму самыя высокія адзнакі за яго веды.

Усе, апроч адной настаўніцы, - яна лічыла, што веды ў яго самыя звычайныя. Гэтая настаўніца ў вольны час выпякала самыя смачныя ў горадзе пірагі. Усе суседзі: і блізкія, і далёкія - вельмі любілі імі паласавацца, але не любіў іх толькі яе муж, бо лічыў іх самымі звычайнымі.

Ён быў найлепшым у горадзе доктарам. Да яго на лячэньне імкнуліся прыйсьці ўсе ў горадзе, апроч начальніка міліцыі, бо той сумняваўся, што доктар гэты незвычайны. «Наадварот, - думаў начальнік, - ён самы звычайны доктар».

Начальнік жа вельмі добра сьпяваў і меў самы цудоўны голас, якога не любіў толькі адзін артыст.

Артыст меў самыя прыгожыя вусы, і толькі рэжысэр яго тэатру лічыў іх даволі звычайнымі.

Рэжысэр лепш за ўсіх ставіў п'есы ў тэатры, аднак яны былі нецікавыя аднаму гледачу...

І так па ўсім горадзе - кожны жыхар умеў нешта рабіць лепш за ўсіх.

Толькі адзін маленькі хлопчык быў самым звычайным хлопчыкам. Ён заўсёды сядзеў на лаўцы, глядзеў на мінакоў і думаў: «І чаму гэта яны так захапляюцца адзін адным? Па-мойму, усе яны самыя звычайныя. Вось іншая справа я. *У мяне - самая цудоўная матуля!»*

[image]
[image]

№ 1 (30) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

Тацяна Барысік Кропелькі

Маладым змагарам за ўраджай прысьвячаецца.

– Ну, унучка, адпачыла з дарогі, то падымайся, трэба жукоў пырскаць, - нечакана пабудзіў мяне бабулін голас.

Утаропіўшыся, гляджу на сонечны праменьчык, што прабіваецца праз шчыліну аканіцы, і прыгадваю: маці сёньня, выпраўляючы мяне ў вёску, казала тое самае.

Упершыню ў сваім шаснаццацігадовым жыцьці жукоў труціць - справа адказная!

Падхопліваюся, апранаю спартовыя нагавіцы, латаную дзедаву кашулю, павязваю хустку жоўтую зь сіняватымі плямамі ад чарніцаў. Узуваю ногі ў бацькавы гумовікі сорак другога памеру. Цяжка на нагах валачыць. Але нічога ня зробіш, іншых нямашака.

Так, пальчаткі, атрута, хаця б нічога не забыцца.

На сотках мяне чакае знаёмая цынкавая выварка з вадою. Аб край разьбіваю ампулы. Цяпер яны плывуць па вадзе, нібы самалёцікі ў небе, пакідаючы за сабою бялюткія сьляды. Перамешваю ваду трэскаю, і ў выварцы ўтвараецца маленечкі

ТАЦЯНА БАРЫСІК жыве ў Магілеве, паводле адукацыі сацыяльны пэдагог. Робіць вучаніцай апаратчыцы ў сыстэме камунальнай гаспадаркі. Выдала кнігу вершаў «Гаркну ў бліскучы мацюгальнік» (самвыдат, 2003).

атрутны вір.

Іржавая даёнка налітая да паловы, на тры баразны павінна хапіць. Адшукваю леташнюю, аблытаную павуцьцём, бярозавую мяцёлку і, куляючыся качанём, крочу па роднай зямельцы. Клятая даёнка рэжа руку, часам вадкасьць булькае і пляскае мне на боты. Рухамі старажытнага сейбіта з падручніка гісторыі я раскідваю па навакольлі пырскі казюрчынай сьмерці. Усё макрэйшымі робяцца картаплянік ды калашыны нагавіцаў. Вясёлкавым зьзяньнем пераліваюцца на зялёных лісьціках атрутныя кроплі. Мае ворагі - чырвоныя, паласатыя - сьпелымі ягадкамі падаюць долу.

От бляха! У вока трапіла гадасьць гэтая! Пячэ няможна! Хуценька лячу дахаты. Ратуюся халоднай вадзіцай. На стале ляжаць сонечныя акуляры. Ну ўсё, у акулярах мне нічога ня страшна. Зараз я вам, паганцы, пакажу! Ізноў да змаганьня! Ня можа таго быць, каб я не перамагла...

На дзясятай баразьне ўжо не куляюся, а цягнуся. Ледзьве падымаю ногі й даёнку. Боты ўдвая цяжэйшымі зрабіліся, сьпіну ломіць, рука сама сабой калоціцца дробненька. Два камары адначасова за шыю й лоб укусілі. Не пачухаешся аніяк, на пальчатках атруты ўсё болей.

Астатнія барозны амаль прапаўзаю. На дварэ зьвечарэла. Хмара невядома адкуль насунулася. Хаця б ня дождж, а то ўся работа кату пад хвост...

Рэшткі вадкасьці выліваю на калгаснае жыта, так дарослыя заўсёды рабілі, каб нашыя куры не патруціліся. Гонарам поўніцца душа. Няхай сабе ногі, рукі мокрыя, брудныя, але затое зрабіла, ня горай як у людзей. Не зьядуць жукі бабінае картоплі.

Тэпаю на вуліцу, сядаю на лаўку.

– Ты што, малая, ідзі мыцца! Скідай адзёжу етую к такой матары. І сто грамаў выпей. А то назаўтра не падымешся. Мы вунака празь етае пырсканьне два дні качаліся і рыгалі! - вучыць жыцьцю суседка.

Мыюся на двары вадою з ночваў. Гаючыя струменьчыкі бягуць па стомленых нагах, плячах. Укруціўшыся ў вялізны мультановы халат, увальваюся ў хату. На гадзіньніку палова на адзінаццатую.

– А маё ты дзіця, намучылася, - гэта ўжо бабуля спачувае.

Сядаю да стала. Наліваю чарку, каб ураньні здаровенькай прачнуцца. Заядаю разьлезлаю макаронаю. Над вухам спуджаная муха бзыкае. Шчокі расчырванеліся. Па тэлевізары кіно пра гішпанскую прынцэсу паказваюць. Знадворку, вось паскудзтва, дождж пачынаецца. Па даху, па сьлівах ужо на ўсю моц лупіць.

Марныя пакуты мае. Навошта рвалася, дурніца! Каб яны павыдахлі ўсе - і жукі, і прынцэсы! Заплакаць ня маю моцы, млявасьць і сон апаноўваюць мяне. Шэры начны матылёк упарта б'ецца аб шыбу. На дне чаркі высыхаюць рэшткі самагону, апошнія кроплі майго дзяцінства.
[image]
[image]

№ 1 (30) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2004/10/21**
[image]

Андрэй Захаранка Хоку

АНДРЭЙ ЗАХАРАНКА нарадзіўся 8 лютага 1974 году ў Новасібірску. У 1996 годзе скончыў геаграфічны факультэт БДУ, а ў 1999-м - асьпірантуру пры ім. У 2000 годзе апублікаваў у "ARCHE апавяданьне "Кроніка аднае аблогі".

ЦЭРКАЎКА
НА
МОГІЛКАХ

Бітага звона
Важкі, іржавы язык
Вецер гайдае.

Пяе салоўка
Над могілкамі ўсьцяж.
Чаму так гучна?

Вецер у лесе.
Нібыта шоргае дождж.
Вочы заплюшчу.

Ў сэрцы збалелым
Колішняй радасьці сьлед
Ці адшукаю?

Цэрква старая.
Могілкі. За крыжамі -

Вёскі ускраек.

Дзедава хата.
Стрэла мяне пустая
Лава ля плоту.

Дужае вецер.
Зьела палову неба
Шэрая хмара.

ЛЕТНЯЯ
НОЧ

Даўнейшы хутар.
Ля сажалкі на ўзьлеску
Адзін падмурак.

РАЗГЛЯДАЮЧЫ
СТАРЫЯ
ФАТАГРАФІІ

Сэрца заныла.
Твар яе любы йзноў
Раптам убачыў.

ПАСЬЛЯ
ДАЖДЖУ

Торгае вецер
Важкае лісьце дарма.
Дрэвы замёрлі.

ГРАФСКАЯ
ПУШЧА
НАД
НЁМАНАМ

Гронкі парэчак.
Вільгацьцю дыхае дол.
Цьмяныя шаты.

МРОЯ

Ліпеньскі вечар.
Сёньня прыдумаю я
Ейныя вусны.

ЛЕТНІ
ТУМАН

Абярнула ноч
На вільготны дол
Малака гладыш.

ЛІПЕНЬСКАЯ
НОЧ

Ясная поўня.
Ценю уласнаму я
Хоку чытаю.

СТАРАЯ
БЯРОЗА ЛЯ
ТОКУ

Шэпча лістота.
Туліцца поўня ў яе
Сьветлыя шаты.

Сьціску ў далоні
Горкі тутэйшы палын.
Сьлёзы расстаньня.

Конік сакоча.

У срэбнай паўцемры адзін.
Месяц узьняўся.

Бараўцы-Менск, 1999-2003
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (30) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

Роза Аўсьлендэр Жыць духам

Гансу Бэндэру

ад цябе да рэчаў і людзей
ад паветра і да твайго духу
ідуць нябачныя масты

яны гавораць з кветкамі
як з людзьмі,
якіх ты кахаеш

яны жывуць духам
калі красуюць кветкі,
вырашчаныя чалавекам

ЗАГУБА

мае імёны
загубіліся ў цемры

у гэты мглісты дзень
збіраю я
слёзы продкаў

РОЗА АЎСЛЕНДЭР
Аўсьлендэр (сапраўднае імя Разалія Бэатрычэ «Рут» Шэрцэр) нарадзілася 11 траўня ў Чарнаўцах. Вывучала літаратуру й філязофію ў тамтэйшым унівэрсытэце. З 1941 і да 1944 - вязень чарнаўцоўскага гета. З 1946 году на эміграцыі ў ЗША, Аўстрыі, Нямеччыне. Памерла 3 студзеня 1988 году ў Дусэльдорфе.

і імі пішу
на Сцяне Плачу

шукаю я імёны
што не належаць мне
ім належу я

шукаю я
дзень уваскрэшання
загубленага Храму

Адна з найбольш таленавітых нямецкамоўных паэтак XX стагодзьдзя.

СУЎДЗЕЛ

састарыцца
з новымі думкамі

з думкамі старымі
маладым застацца

суўдзел
у несмяротным жыцці
у несмяротнай смерці

ТЫ І Я

кажу
«ты» і «я»
гэта свет

«ён» - гэта «я»
як ты і я

красуе як мы
і памрэ як мы

і саступіць месца
іншым сусветам

ПЕРАМЕНА

мы вярнуліся дадому
без руж
яны засталіся на чужыне

на месцы нашага саду
выкапаныя могілкі

нічога не засталося на ранейшым месцы
усё перамянілася

мы сталі калючкамі
у чужых вачах

ШАГАЛ

на даху ночы
ён сціскае
скрыпку

бы лунатык
пераскоквае між дамамі
плыве
над стрэхамі

выглядае
блакітную карову

кветкі
найпяшчотнейшае шчасце

балконы аблокаў
жаніх у палёце
кахае нявесту

НЕ ЗАБЫЦЬ

сёння зноў

мяне верш
прысніў

я
радавалася жыццю
захаплялася краявідам
седзячы перад акном

і забылася
свой верш запісаць
забылася

але ж ён мяне
не забыўся
вярнуўся
ўпісаў сябе сам
у мае словы

СЕКУНДА

як доўга
можна чакаць

адну секунду
цэлую вечнасць

апошняя
і ёсць Часам

ЧАЛАВЕК З НАЖОМ

голуб б'ецца ў акно
каля мяне
чалавек з нажом
я яго не ўпускаю
употайкі
сыплю яму зярняты

на кухні каляхуе
кіпень у каструлі
соль льецца з маіх вачэй
на цыбулю
зярняты зялёнага перцу
тонуць у крыві таматаў

матчын дух
падымае накрыўку каструлі

ён адляціць назад у свой лёс
чалавек з нажом
праследавацьме голуба

ён прынёс мне яго
акрываўленага

ЛІСТ

вось зляцеў лісток
з светлымі жылкамі

вятрыска выпісвае
яго профіль
у паветры

ён вылучаецца
сярод безлічы сваіх сваякоў
лёгкім згінам
сцябла

я бачу
яго дрыготкі сілуэт
на траве

ліст прыносіць
мне нейкую вестку
я тлумачу яе як знак
повязі нашай

з здзіўленнем адзначаю
рудую плямку
на функціі ягонай
але выгін чароўны
усё яшчэ зялёны

зялёны лісточак будзе жыць
у белым маім аркушыку

НЕ ВЕДАЮ

чаму дагэтуль я жывая
я не ведаю
як не ведаю, чаму
яшчэ б'ецца маё сэрца
калі яно спыніцца
змоўкне цурчанне фантану
перад маім акном
знікне бліскучае зеляніва таполяў
сціхнуць звягі сабак і нядзельныя званы
і бязладныя крыкі драздоў
і крывавая спрэчка братоў
і боль у зубах
што аддае у мазгі
о, мая зняверaная душа
чаму і для чаго

я не ведаю
дай мне бог
нічога не ведаць

САДАГОРСКІ ХАСІД

васьмідзесяцігадовы старац
сівая барада
моліцца на грудзях

налётаўшыся на свеце
на ягоным каптане
адпачывалі анёлы
карона суботы
штраймл
была яго адзіным уборам

павекі прыкрыты
яго позірк засцілае імгла
жыве ў бажніцы

у панядзелак і чацвер пасціць
каб плоць была лёгкай
сілкуецца хвалой госпаду
і пагойдваецца ў рытм
біблійных малітваў і іншых
святых словаў

мала словаў
тагабочны свет нельга ні ўхапіць
ні памацаць з задняй думкай
з'явы - гэта здані
Тварцу (няхай не будзе памянёнае яго імя марна!)
служыць твой дух

у сувой Торы
загорнута святло і песня
гаворыць гісторыя народу

зірні
во яна
у шытай золатам аксамітнай апранасе
у кароне
цалуй яе
цягні да яе рукі
танчы з ёю
у гонар Госпада Бога

танчыць Садагорскі хасід

разам з іншымі хасідамі

ДАРЭМНА

Дон Кіхот
сябра мой
апавядзе вам
што нам давялося перажыць
змагаючыся з ветракамі
што малолі пясок

мука засталася
у замкнёных каморах

птушкі шчабечуць
віць-віць-віць

ЗОРЫ

за якім сталом
зоры
прымаюць прычасце?

цягнуць
свае рукі-промні
што імчацца у прасторы
што не дае ім упасці?

яны не ведаюць
уласных імёнаў
і не пытаюцца
адкуль іх святло
і навошта яго выпраменьваць

яны складаюцца
ў час
які ёсць казкай,
народжанай рухам

КАРОНА

жыццё
гуляецца са мною

яно падаравала мне
карону
я дакупіла да яе
каралеўства
слоў

яны ўладараць
маім духам

ЦЯЖКАЕ ПЫТАННЕ

адыходзім у ноч
разам з днём

ляцім да зораў
яны пытаюцца
чаму яны такія малыя
а мы такія вялікія
што не можам сесці
у іх карэту

а мы бачым
толькі сполахі
у акне

ВЕНЕЦЫЯ

залатое смецце
мазаіка з палацаў і хваляў

плошча Святога Марка:
чатырохкутнік, абстаўлены будынкамі-
блізнятамі,

купаецца ў галубінай пене

усе гандолы не адчуюць
несапраўднасці твайго цела
усе гандолы не ўловяць
тваёй тугі, схаванай пад саладжавай
песняй

пазыч мне свой крышталёвы звон
навучы лаціне сваіх чароўных вулак
падаруй мне прамень
*Тынтарэтавай зоркі**

скронь у скронь
з серабрыстым месяцам
чоўны лятуць
у лабірынт каналаў

ТЫ ЯШЧЭ
ТУТ

выкінь свой страх
у паветра

хутка
выйдзе твой час
хутка
нябёсы
зарастуць травой
твае мары
знікнуць у небыцці

яшчэ
пахне гваздзік
пяе дрозд
ты яшчэ здольны кахаць
і дарыць словы
ты яшчэ тут

* Тынтарэта (сапраўдн. Якоп Рабусці (1518-1594) - венецыянскі мастак).

будзь тым, кім ты ёсць
аддай усё, што ты маеш

ЧАС

час прыходзіць
стаіць на месцы
прамінае і застаецца

гуляе з табой у жмуркі
ўночы срэбнаю птушкай
хаваецца
ў тваім сне

падаюць заранкі
месяц
з'яўляецца і знікае
разам з часам
што прамінае і застаецца

АДЫСЕЙ

мой няўквечаны кветкамі лёс
прычальвае да салёных хваляў

дай мне акр мора
я буду баразніць яго
на сваім караблі

вандраваць,
каб не быць там
дзе я ёсць
каб быць НІКІМ
ценем у падводным царстве ценяў
тчэ мая маці саван -
чорную пялюшку

ці кахаю Пенелопу?
не

Цырцэю?
не
Наўсікаю?
не
мне падабалася
рука, што сціскае курок
мая праклятая зухаватасць

я шукаю трывожную
душу вады
яна памажа мяне соллю

Каліпса
атрута тваёй праўды

АСЛУПЯНЕЛАСЦЬ

ува мне старчма
стаіць саляны слуп

я - слуп
што няспынна
верціцца

праўда - гэта
ружовая Гамора
цярновая песня

я ведаю месца
далікатнага слова
якое хаваецца ад
позіркаў

Эўрыдыка
спыніся
мы сустрэнемся з табою
на раздарожжы
ценяў

ЦЯРПЕННЕ

цярпенне даўжынёй у тысячы гадоў

мы жывём у бамбасховішчы
чыё выйсце парасло
быльнягом

раз толькі ў год
на імгненне
адкрываецца люк вачэй
і яны бачаць
прарочы бліск на ўсходзе

ноч даўжынёй у тысячы гадоў
скіпетр каралевы -
гэта бомба

пад гарамі
побач з мільёнамі гномаў
Беласнежка чакае
Дон Кіхота
рабін чакае
невымоўнага слова
каб даць бласлаўленне

цярпенне даўжынёй у тысячы гадоў

ЗГОДА

тысячамі словаў
гаворыш ты
мой брат па мове

але для паразумення
часам досыць
аднаго слова

твой і мой аднарог

зялёныя думкі

КАЗКА

чалавек вандруе
з краіны ў краіну
з гораду ў горад

ён шукае мясціну
без сварак і нянавісці

чалавек вандруе
нястомна
па ўсім свеце
ён шукае

казку

Пераклаў Зміцер Магілеўцаў паводле: Rose Ausländer. Im Atemhaus wohnen. Fischer Taschenbuch Verlag, 1981.

Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

ВІКТАР КОРБУТ
культурны аглядальнік газэты «Советская Белоруссия».

Віктар Корбут
Вечнае змаганне за містыфікацыі

Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI - першая палова XVIII ст. / Падрыхт. А. Богдан, А. Бразгуноў, С. Гаранін, Л. Гедзімін, Л. Ляўшун, В. Чамярыцкі. Навук. рэд. В. Чамярыцкі. Менск: Беларуская навука, 2003.

У канцы 2002 г. выйшла кніга, прысвечаная фальсіфікацыям славянскага фальклору[1]. На думку яе аўтараў, значная, калі не пераважная частка з 52 апісаных П. Шпілеўскім у сваіх «Беларускіх народных паданнях» багоў і духаў - плён яго фантазіі, а сам твор нельга разглядаць як вартую даверу крыніцу. На іх думку, Шпілеўскі фантазіяваў, дапаўняў рэальныя сведчанні прыдуманымі звесткамі. Ён не аддзяляў рэальных фактаў ад сваіх інтэрпрэтацыяў, якія часам былі ўгрунтаваныя на памылках і недарэчнасцях. Ён знаходзіў багоў у няправільна вытлумачаных прымаўках, песнях і формулах праклёнаў, атаесамляючы персанажаў беларускай дэманалогіі (рэальных і прыдуманых) з даўнімі славянскімі і антычнымі багамі.

Гэтая выснова вельмі важная, бо дагэтуль у нас многія перакананыя, што запісы Шпілеўскага адлюстроўваюць рэальныя міфалагічныя ўяўленні беларусаў XIX стагоддзя. Між тым, адразу ж пасля іх публікацыі некаторыя даследнікі

[1] Рукописи, которых не было: Подделки в области славянского фольклора // Изд. подгот. А.

выказвалі сур'ёзныя сумневы ў іх дакладнасці. Шпілеўскі таксама сцвярджаў, што хрысціянскі святы Георгі Пераможца, гэта ўвасабленне бога Ярылы (ці існаваў такі бог у міфалогіі беларусаў, дагэтуль няма пэўнасці). Адсюль, дарэчы, паходзіць і такая пашыраная ў нас думка (на жаль, памылковая, хаця яна ўжо паспела трапіць і ў навуковую літаратуру) пра сувязь Ярылы з вобразам конніка на гербе «Пагоня». Паходжанне гербу Літоўскай дзяржавы трэба, з аднаго боку, звязваць з міфалагічным сюжэтам пра змаганне Перуна і Вялеса, а з другога - з уплывамі заходнееўрапейскіх краін і Русі, у геральдычных традыцыях якіх выява вершніка сімвалізавала валадара (князя).

Расійскія навукоўцы размеркавалі персанажаў міфічнага свету паводле Шпілеўскага на тры групы: рэальныя, часткова рэальныя, але надзеленыя неўласцівымі ім рысамі, і выдуманыя. Высветлілася, што найменні каляндарных перыядаў і калектыўных дзеяў (*талака, каляда, шчадрэц, купала*) сталі багамі, а характарыстыкі чалавека (*жэўжык, разамара, клікун, злыдзень, ныдзень*) і назвы розных з'яваў (*жыж(а), зюзя, знічка*) ператварыліся ў божышчаў і духаў. Сёе-тое было пазычана ад міфатворцаў-папярэднікаў (*Чур-бог, Ляля, Лада*), нешта прыдумана (*Кумяльган, Бордзя, Любмел*, а гэтаксама, відаць, *Цёця, Жыцень* і г. д.).

Наша акадэмічная навука таксама прызнае творы, сумневы наконт аўтэнтычнасці якіх выказваліся неаднаразова, напрыклад «Слова пра паход Ігараў» і паданне пра трох віленскіх мучанікаў. Гэтыя два творы ўвайшлі ў кнігу на роўных правах з бясспрэчнымі аўтэнтыкамі.

Ультрапатрыятычнае «Слова пра паход Ігараў» дагэтуль грае на карысць пэўных палітычных праграм ва Ўсходняй Еўропе. Яго выкарыстоўваюць для пацвярджэння нейкіх гістарычных правоў нацыі не толькі ў Расіі, але ва Ўкраіне і нават у Беларусі. Улучэнне гэтага літаратурнага помніка ў анталогію пры замоўчванні факту яго спрэчнай аўтэнтычнасці не можа не турбаваць. Расійскі археограф А. Зімін у дыскусіі *pro et contra* аўтэнтычнасці «Слова» выявіў шэраг сведчанняў супраць яе, між іншага - значную колькасць словаў украінскага,

беларускага і польскага паходжання, што нядзіўна, калі ўлічыць, што аўтарам паэмы мог быць выхадзец з Беларусі Іван (Яіль) Быкоўскі, які, калі верыць Зіміну, напісаў яе па 1767 г.

Шмат пытанняў выклікае публікацыя ў Анталогіі легенды пра трох віленскіх мучанікаў. Даследнікі, якія вывучалі праблему генезы гэтай легенды[2], зазначалі, што крыніцы, якія паходзяць з Вялікага Княства Літоўскага, не захавалі звестак пра мучаніцтва за праваслаўную веру ў Вільні літвінаў або русінаў. Першая згадка пра мучанікаў з'яўляецца ў маскоўскіх летапісах другой паловы XV - пачатку XVI стагоддзя, што па часе супадае з актыўным ваенна-палітычным процістаяннем Літвы і Масквы, на якое маскоўская гістарыяграфія адрэагавала складаннем легендаў пра нізкае паходжанне дынастыі Гедымінавічаў і аспрэчваннем правоў Вільні на рускія (праваслаўныя) землі.

Паводле маскоўскай легенды, замардаваныя мучанікі былі пахаваныя ў царкве св. Мікалая. Але гэткай бажніцы ў Вільні ці Альгердам не было. Няма звестак пра літоўскіх мучанікаў і ў наўгародскіх ды пскоўскіх крыніцах, якія не маглі абмінуць такой важнай падзеі, як забойства хрысціянаў у суседняй паганскай краіне. У 1547 г. у Маскве віленскія мучанікі былі далучаныя да ліку святых. Менавіта з Масквы іх культ у час уніі трапляе ў Літву. На пачатку XIX стагоддзя ўжо спачыну мучанікаў сталі ўважаць праваслаўную царкву Духа, дзе нібыта былі знойдзеныя іх целы. Нарэшце, у выніку задумы пецярбургскіх ідэолагаў, культ трох праваслаўных віленскіх мучанікаў мусіў скласці канкурэнцыю культу каталіцкай Маткі Боскай Вастрабрамскай. Палітыка, як вядома, у гэтай гісторыі няўхільна ішла следам за рэлігіяй, і ніякае напарадзе яе. З якою мэтаю ўкладальнікі змясцілі тэкст, створаны ў Маскве на выдуманы сюжэт і выстаўленне ў апісанне рэальных падзеяў з беларускай гісторыі, невядома. Мабыць, ім любая ідэя пра «даўнюю беларускую прыналежнасць» Вільні.

Нягледзячы на сваю фундаментальнасць, Анталогія не дае поўнага ўяўлення пра літаратурны працэс на землях Беларусі ў XI - першай палове XVIII стагоддзя. Таму варта падрабязней спыніцца на хібах зборніка. Міхалон Літвін з яго анты-рускаю

[2] Chodynicki K. Wilno i Moskwa w latach 1655-1661. Kraków 1927. Rok Ruski. Zeszyt 13. S. 1-35 (41-45); Zajączkowski F. Z dziejów kultu świętych wileńskich // Ateneum Wileńskie. 1927. Rok IV. Zeszyt 3. S. 1-27 (1-7).

накіраванасцю ў Анталогію не ўвайшоў. Але ці чужы нам ідэі, сённяшнім беларусам, і ці ягоная творчасць частка нашай супольнай з сучаснымі літоўцамі спадчыны? З іншага боку, наколькі блізкія ўсім беларусам ідэі, выкладзеныя ў творчасці праваслаўных (пераважна ўкраінскіх з паходжання) пісьменнікаў канца XVI - XVII стагоддзяў, чые працы ў неабмежаванай колькасці даюцца ў Анталогіі, нярэдка пафаснымі прадмовамі?

Можна было б увесці і тэрмін «беларуска-літоўскія пісьменнікі», да якіх залічыць, прыкладам, Самуэля Даўгірда (Dovgird, Dowgird, Daugirdas) - аўтара некалькіх паэмаў на тэмы тутэйшай і біблійнай гісторыі. Адна з Даўгірдавых паэмаў у арыгінале па-польску («Genealogia, albo Krótkie opisanie Wielkich Książąt Litewskich i ich wielkich a mężnych spraw woiennych… przez Samvela Dovgirda z Pogowia») і ў перакладзе на літоўскую мову нядаўна была выдадзеная паводле апублікаванага ў Любчы ў 1626 г. арыгіналу[3].

Напісанае на т. зв. старажытнарускай мове даецца ў арыгінале з тлумачэннем незразумелых словаў, польска- і лацінскамоўныя творы - у перакладзе. Калі дыярыюш Еўлашоўскага друкуецца польска-рускаю (старабеларускаю) «трасянкаю» і даюцца беларускамоўныя тлумачэнні цяжкіх кавалкаў, дык чаму тое ж не зроблена і ў дачыненні да даўнейшых тэкстаў, напісаных «старажытнарускаю мовай», зроблена толькі фрагментарна? Мова Т. Еўлашоўскага шмат у чым бліжэйшая да тагачаснай польшчыны, чым да рушчыны. Чаму тады проста не даць паралельна, у арыгінале і ў перакладзе, польска- ды лацінскамоўныя творы «дайнай беларускай літаратуры»? Ці асноўным крытэрам перакладання/неперакладання таго ці іншага твору выступала пасаўленасць графіка арыгіналу? Ці ўспаміны Т. Еўлашоўскага, напісаныя кірыліцай, для ўкладальнікаў больш свойскія за даўнейшыя перакладзе ўрыўкі з Мацея Стрыйкоўскага? За недакладнасцю трэба прызнаць ужыванне ў тэксце перакладу «Пруссіны» замест Я. Вісліцкага сучаснага этноніму «беларусіны» замест тагачаснага (этна)канфесіёніму «русіны». Нельга апраўдаць і гэткіх вольнасцяў, як замена панятку «рускі» словам «славянскі», якое робіць Рыгор Барадулін у перакладзе

Chodynicki K. Legenda o męczeństwie czternastu franciszkanów w Wilnie // Ateneum Wileńskie. 1927. Rok IV. Zeszyt 12. S. 1-26 (53-78).

[3] Можна назваць толькі тых, чыя прозвішчы ці назвы ўласныя ў арыгінале і перакладзе Я. Дыярыюш Міхалапанна Сапегавіча, напісаныя ў Яндукасцінам (Яны нашы) Я. Дыярыюш ХУІІ ст. і Дзённікі Міхала

«Labiryntu, abo Drogi zawikłanej» Тамаша Яўлевіча. Галубовіча як гістарычная крыніца = Diariusz z XIX st.: Dzienniki Michała Hałubowicza jako źródło historyczne. Менск, 2003).

Асобнай гутаркі вымагае перадрук фрагментаў «Песні пра зубра» Міколы Гусоўскага ў перакладзе Язэпа Семяжона. Раней ужо гаварылася, што ў ім не толькі няправільна інтэрпрэтуюцца некаторыя фрагменты паэмы, але і хутькасць радкоў перакладу на 475 большая, чым у арыгінале, а сам пераклад зроблены не з арыгіналу, а з рускага перакладу. Маючы сёння дакладнейшыя пераклады Ўладзіміра Шатона і Наталлі Арсенневай, можна было б зрабіць лепшы выбар.

Каментатары Анталогіі паказалі сябе не надта дасведчанымі спецыялістамі. Прыкладам, слова «велдомого» (р. скл.) - дарэчы, балтызм - з г. зв. «Прамовы Мялешкі» не можа быць вытлумачанае як *«добра вядомага»*, асабліва зважаючы на змест фрагменту «Прамовы»:*«Не толка ў Смаленску, але і ў Мазыру ўвесь павет а том даўно радзіў, каго бы мудрага на той з'езд к той сентэнцыі выправіці мяне вялдомага да вашай міласці паслалі»*. Гістарычны слоўнік беларускай мовы тлумачыць слова велдомый як 'прыгонны'. Слова *эпикграма* , дзе спалучэнне *кг* адлюстроўвала выбухны гук [g], цяперашнім беларускім правапісам мусіла было б перадавацца як *эпіграма*. Напісанне *эпікграма* ў Анталогіі памылковае.

Не маюць каментатары рацыі і тады, калі пішуць, што зямля Жамойць - гэта адзін з *«галоўных субэтнасаў летувісаў»* і што гэтая тэрыторыя *«ўвайшла ў склад ВКЛ у 1422 г.»*. Межы Жамойцкага староства ў складзе Вялікага Княства Літоўскага, *племянной тэрыторыі* жамойтаў (на захадзе суседзілі з куршамі, якія закрывалі выхад да мора, на ўсходзе - з літвою),*этнаграфічнай вобласці* Жамойць і жамойцкага *дыялекту* літоўскай мовы не супадаюць, у чым няцяжка пераканацца, зірнуўшы на адпаведныя карты. Жамойты, куршы, паўднёвыя зэмгалы, сэлы, а гэтаксама ятвягі ды іншыя плямёны разам з летапіснаю літвою былі продкамі сучасных літоўцаў, гэтаксама як продкамі сучасных беларусаў былі, апрача крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў ды іншых, тыя ж ятвягі і літва. Абшар Жамойці ад пачатку быў складоваю часткаю Літоўскага гаспадарства, з яе паходзіла значная частка літоўскага набілітэту, у тым ліку, магчыма, вялікія князі Віцень

і Гедымін.

Паводле Мельнаўскай дамовы 1422 г. Жамойць не ўвайшла ў склад Літоўскай дзяржавы, а ад сваіх прэтэнзіяў на гэтую зямлю канчаткова адмовіліся крыжакі. Жамойць давала Літве выхад да Балтыкі, а Тэўтонскаму і Лівонскаму ордэнам - каб гэтая зямля была канчаткова паняволеная - забяспечвала б марскую блакаду Літвы ды ўсё, што з таго вынікала. Жамойць складае траціну сучаснай Літоўскай Рэспублікі і чвэртку тэрыторыі этнаграфічнай Літвы.

І яшчэ пару зацемак наконт зместу Анталогіі. Публікацыя трэцяй рэдакцыі (1588 г.) Літоўскага Статуту, помніка права і мовы, больш дарэчна выглядала б у зборы помнікаў даўняй беларускай мовы. Тое ж трэба сказаць і пра іншыя помнікі дзелавога пісьменства, змешчаныя ў Анталогіі, гэткія, як граматы, напісаныя ў XIII стагоддзі ў Рызе, Смаленску, Віцебску, грамата Менску на Магдэбургскае права, надпіс з крыжа св. Еўфрасінні Полацкай і да т. п. Выклікае здзіўленне змяшчэнне ў Анталогіі твораў жыційнай і тэалагічнай літаратуры, што паўсталі пераважна на поўдні Русі і не маюць тэрытарыяльнай і тэматычнай сувязі з Беларуссю («Казанне» чарнарызца Храбра, «Слова пра закон і ласку» Іларыёна, «Сказанне пра Барыса і Глеба» і г. д.). Два тэксты балгарына Грыгора Цамблака («Слово похвальное Евфимию Тырновскому», «Слово на воздвижение честного креста»), які ў 1415-1419/20 гадах быў літоўскім мітрапалітам, не звязаныя з «даўняй беларускай літаратурай», ізноў жа, ні тэматыкай (тутэйшыя рэаліі ў творы не закранаюцца), ні тэрыторыяй.

Каб зрабіцца сапраўды акадэмічнаю, новая анталогія павінна змясціць тэксты даўняй літаратуры Беларусі арыгінальнаю моваю ды правапісам і паралельна ў перакладзе. Пакуль жа недакладнасць перакладаў і непаслядоўная транслітарацыя выклікаюць пытанні бадай да кожнага са змешчаных у кнізе тэкстаў. На жаль, гэта змяншае яе навуковае значэнне.

[image]
[image]

№ 1 (30) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/10/21
[image]

АНАТОЛЬ ТРАФІМЧЫК

Анатоль Трафімчык

Нялішняя кніга

(нар. у 1970 у вёсцы Валасты Крупскага раёна) - філёлаг паводле адукацыі і гісторык паводле паклікання. Скончыў філфак Беларускага ўніверсытэту (1998).

Дасьледуе адукацыйную сыстэму Беларусі ў часе другой сусьветнай вайны. Апошняя кніжка - паэтычны зборнік «Пасьведчаньне аб нарадзінах» (Менск, 1999).

Шмат пішчыраваў на гэтай ніве Міхал Гнатоўскі (гл. Праца Войцеха Сляшыньскага - гэта ўжо далека не першы важкі плён дасьледаванняў пауночна-ўсходняга рэгіёну II Рэчы Паспалітай пасьля анексіі яго Савецкім Саюзам і да нападу на яго Германіі1. У адрозненне ад беларускіх гісторыкаў, якіх, як заўважыў Яўген Мірановіч, «як бы праблемы фармавання польскай улады менш цікавяць»2, польскія навукоўцы за апошняе дзесяцігоддзе зрабілі некалькі крокаў наперад, праліваючы святло на шматлікія цьмяныя ці проста пакінутыя без увагі месцы гісторыі другой сусьветнай вайны, якіх хопіць для дасьледавання не толькі ім, але і ўсім дасьледнікам краін-суседак3.

У цэлым дасьледаванне Сляшыньскага і працы згаданых у зносцы польскіх гісторыкаў стварающь добрае ўражанне. Перш за ўсё хочацца адзначыць дасьледніцкую раскаванасьць, бо ў параўнанні з імі беларуская гістарыяграфія, нават сучасная, выглядае закамплексаванай. Відаць, цяжар савецкай школы і ў сваёй краіне, і за яе межамі скінуць з сябе не так лягка.

Прадметам дасьледавання савецкай акупацыі на Беласточчыне ў

Sławski W. Okupacja sowiecka na Białostocczyźnie w latach 1939 - 1941. Propaganda i indoktrynacja. - Białystok: Agencja Wydawnicza Bernkowski, Białostockie Towarzystwo Naukowe, 2001.

Gnatowski M. W radzieckich okowach. Studium o agresji 17 września 1939 r. radzieckiej polityce w regionie łomżyńskim w latach 1939 - 1941. - Łomża: Łomżyńskie Towarzystwo Naukowe im Wagow, 1997; Gnatowski M. Nieporkorna Białostocczyzna. Opor społeczny i polskie podziemnie niepodległościowe w regionie białostockim w latach 1939-1941 w radzieckich źródłach. - Białystok, 2001); да актыўных аўтараў гэтага напрамку належаць Ежы Тумаш, Ежы Сэрвацкі, Ежы Кшыштаф Кавалеўскі, Ежы Рамэр,

Сляшыньскага з'яўляецца прапаганда і індактрынацыя. Даследнік выяўляе, што ўніфікацыя тэрыторый (шляхам іх неадкладнай саветызацыі) - галоўная мэта і лейтматыў тагачасных дзеянняў савецкай улады - адбывалася не інакш як праз прапаганду савецкага ладу і камуністычную індактрынацыю ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, не выключаючы інтымнай. Шырокая тэматыка і праблематыка рэпрэзентуецца чытачу ў святле абазначанага ракурсу, які ёсць ці не найлепшым пунктам для назірання і аналізу, створаным самой гісторыяй. Крытычны разбор саветызацыі і індактрынацыі (чытай - замбавання) як грамадства ў цэлым, так і асобы ў прыватнасці, пачынаючы з самых ранніх гадоў, дэмаскуе сутнасць сталінскай таталітарнай сістэмы, якая не толькі пазбавіла чалавека падставовых дэмакратычных свабод, але і імкнулася настроіць нават яго мысленне на капыл камуністычнай ідэалогіі.

Абазначаючы тэрыторыю, анексаваную Савецкім Саюзам, Сляшыньскі нібыта хоча задаволіць два супрацьлеглыя бакі (с. 14), адзін з якіх называе тыя землі «паўночна-ўсходнімі крэсамі» (такой дэфініцыі прытрымліваецца большасць гісторыкаў сённяшняй Польшчы), а другі - «Заходняй Беларуссю» (так называлі тую тэрыторыю за Саветамі і гэтай назвай карыстаюцца, як правіла, цяпер у Беларусі - як бачым, нялёгка пазбавіцца гэтага камінтэрнаўскага цэтліка праз адсутнасць зручнейшага азначэння). Але ж трэба ўсведамляць, што, па-першае, гэта метадалагічная супярэчнасць паміж дэфініцыямі, а па-другое, некарэктнае з гледзішча навукі выкарыстанне назваў прыводзіць да іх яшчэ большага замацавання ў навуцы і адсюль - у грамадскай свядомасці. Але, думаецца, дапушчальна карыстацца абедзвюма назвамі пры падачы дадзеных з гледзішча адпаведнага боку: напрыклад, палякі на працягу ўсёй сусветнай вайны ўспрымалі рэгіён не іначай як «крэсы», хоць яны ўжо фактычна імі не былі ні пры савецкай, ні пры германскай акупацыі, а вось Народны сход праводзіўся як акцыя *Заходняй Беларусі*.

Кніга Сляшыньскага складаецца з трох частак. Але першая з іх, «Aneksja i polityczno-prawna sowietyzacja Białostocczyzny», змяшчае раздзелы, якія трохі «выпісваюцца» з яе кантэксту

(відаць, іх было зручней і карэктней дапасаваць менавіта сюды). Напрыклад, апошні раздзел першай часткі прысвечаны не зусім прывычнай для нашай гістарыяграфіі тэме - вобразу савецкага чалавека ў вачах польскага насельніцтва. І хоць аўтар робіць агаворку аб цяжкасцях, з якімі ён сутыкнуўся пры рэканструкцыі непрывабнага іміджу «ўсходнікаў», трэба адзначыць, што ўспрыманне іх як ворагаў было характэрнае для насельніцтва ад Палесся да Віленшчыны. Наагул жа механізм анексіі і палітычна-прававой саветызацыі раскрываецца падчас зменаў у сацыяльна-палітычным і эканамічным жыцці як грамадства ў цэлым, так і яго асобных частак - пачынаючы ад пакту «Молатава-Рыбентропа» да трэціх і апошніх выбараў (у мясцовыя Саветы).

Другая і трэцяя часткі прысвечаны аналізу шляхоў і сродкаў саветызацыі і індактрынацыі. За кароткі час сталінская таталітарная сістэма апанавала не толькі СМІ (газеты і радыё), але і мастацтва (кінематаграфія і літаратура). Але змястоўную характарыстыку «савецкай мовы» будзе ў навіну прачытаць толькі тым, хто незнаёмы з «Незаменимым пособием для сочинения юбилейных статей, табельных фельетонов, а также парадных стихотворений, од и тропарей» знакамітага як мінімум на постсавецкай прасторы Астапа Бендэра з «Залатога цяляці» І. Ільфа і Я. Пятрова (раздзел «Потный вал вдохновения»). Яе адрозненне ад дапаможніка Астапа, шчыра кажучы, заключаецца толькі ў яе квазінавуковым падыходзе, у канцэптуальным жа плане ўзнікаюць відавочныя паралелі.

Інфармацыя ў кнізе падмацаваная важкай базай крыніцаў. Значная іх доля паходзіць з 14 архіваў, адкуль чэрпалася савецкая дакументацыя таго часу і занатаваныя пазней успаміны. Такога ж кшталту інфармацыя бралася ў апублікаваных зборніках дакументаў (34 пазіцыі) і ўспамінаў (36 пазіцый). З 35 назваў складаецца спіс перыёдыкі ў асноўным тагачаснай Беласточчыны, што пры пастаўленым даследніцкім аспекце набывае адно з ключавых значэнняў. А спіс апрацаванай гістарыяграфіі наагул уражвае. Аднак аўтар грэбуе савецкай гістарыяграфіяй. А шкада. Пры крытычным падыходзе ў гэткіх публікацыях можна знайсці нямала карыснай інфармацыі.

Сляшыньскі імкнуўся да сістэматызацыі дадзеных, што вылілася ў рэпрэзентацыі чытачу 33 табліц і дзвюх схем. Аднак вартасць многіх з іх нівелюецца «непрывязанасцю» да тэксту. Напрыклад, табліца 27 паведамляе пра колькасць *атрыманых* падручнікаў па школьных прадметах, але характарыстыка гэтых лічбаў не прыводзіцца, таму цяжка меркаваць і пра іх значэнне. Каб жа тут былі змешчаныя дадзеныя пра колькасць *неабходных* падручнікаў (а такая інфармацыя прысутнічае ў знаёмых аўтару архіўных фондах[4]), то яны нашмат канструктыўней расказалі б пра вострую праблему ў навучальных дапаможніках, што існавала ў той час.

Не віна, а бяда сённяшніх і польскіх, і беларускіх гісторыкаў заключаецца яшчэ ў «карэктарскай хваробе» выданняў (вось дзе савецкая гістарыяграфія дала б фору!). Цяпер пайшоў перыяд, калі памылкі становяцца амаль правілам!

Прыемным і арыгінальным сюрпрызам (вартым для пераймання даследнікам найноўшай гісторыі) аказаліся відэа- і аўдыёматэрыялы, змешчаныя ў фармаце «MP3» на кружэлцы для камп'ютэра: урывак з савецкай кінахронікі часоў восені 1939 году і гуказапісы з Народнага сходу, успаміны і сённяшнія меркаванні пра тыя падзеі. Але з улікам якраз факту выкарыстання не толькі тэхнікі Гутэнберга, але і машын Біла Гейтса, думаецца, што 145 фатаздымкаў, якія ў большасці былі ўжо некалі ўведзеныя ў навуковы абарот, у тым ліку і самім Сляшыньскім[5], можна было змясціць на тым жа кампакт-дыску, а не загрувашчваць імі друкаванае выданне.

Міжволі прыходжу да высновы, што стыль, метадалогія, кшталт інтэрпрэтацыі і рэпрэзентацыі даследавання Сляшыньскага скіраваныя на стварэнне пэўнага кірунку рэцэпцыі чытача. З аднаго боку, гэта вельмі і вельмі няблага, бо гэтая навуковая праца, якую можна было б зрабіць нуднай, чытаецца ў ахвоту. Але такі падыход вымушае аўтара, калі перафразаваць вядомую прымаўку, трымаць пяро востра, бо ёсць рызыка звільнуць на шлях белетрызацыі, што недапушчальна для навуковага тэксту. Такі падыход абумоўлівае пэўную ступень эмацыянальнасці тэксту. А гэта таксама небяспечна, бо пад пагрозу ставіцца навуковая карэктнасць на карысць

публіцыстычнасці. Гэта разумее і сам аўтар, калі кажа, што сярод інтэрв'юяваных былі ў асноўным людзі, пакрыўджаныя савецкай уладай, таму ад чытача ў тых месцах патрабуецца асцярожнасць і аналітычная крытычнасць. А вось некалькі вершаў, якія адлюстроўваюць рэакцыю настаўнікаў на курсавыя мерапрыемствы, думаецца, варта было б змясціць у якім-небудзь дадатку, а не ўкліньваць у навуковы тэкст. Тое ж можна парадзіць адносна прыведзенай у 4-м раздзеле першай часткі дакументацыі з Народнага сходу, а таксама спісаў перайменаваных вуліц трох гарадоў Беласточчыны, асабовага складу павятовых камітэтаў, спісу пісьменнікаў. На некаторыя перагібы, неасцярожнасці ці неабавязковасці ўказвае таксама Я. Мірановіч у сваёй рэцэнзіі[6].

З свайго боку хацелася б адзначыць як у Сляшыньскага, так і ў многіх іншых польскіх гісторыкаў тэндэнцыю бачыць у дзеяннях бальшавіцкай улады дыскрымінацыю палякаў і фаварызацыю беларусаў, як нацыі «гаспадароў» далучанай зямлі, ды яўрэяў, бо, маўляў, сама тая ўлада была ледзьве не яўрэйскай. Відавочна, дыскрымінацыя прысутнічала ў палітыцы саветызацыі. Аднак, думаецца, мела яна не нацыянальны характар. Рэпрэсіям, дэпартацыям, нейкім абмежаванням у першую чаргу людзі паддаваліся па сацыяльным крытэрам: у асноўным гэта інтэлігенцыя, «кулакі», а прыезджыя з захаду Польшчы для каланізацыі зямель у якасці адміністрацыйнага апарату - дык татальна[7]. Сярод названых катэгорый жа пераважалі менавіта палякі, таму і стварылася такое ўражанне, а затым і стэрэатып у польскіх навукоўцаў. З іхняга гледзішча фармальна ён так, але ў рэчаіснасці беларусы (дасюль ім. ВАРБ), ...

4 Гл. Narodowe zasoby archiwalne, archiwa państwowe Białorusi (далей — NAPB), fl. 4, cent. 27, d. 241, k. 7; d. 247, k. 28.

5 Sierakowski W. Białystok w dziejach Białorusi // Przegląd Białostocki. - Białystok, 2000. № 1. S. 7.

6 Гл. Białoruskie Zeszyty Historyczne, 2. Białystok, 2002. № 18. S. 1.

7 Адзначым добрае ўладанне беларускай мовай Мікалаем Вацлавічам Мадагічным, які ў гэты час займаў пасаду першага сакратара Беласточчыны, а потым — старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, дэлегатам ад Беларускай акругі ў Маскву, Ленінград, Кіеў, Мінск, Вільню, Коўна, Рыгу, Таліна, Львоў, Ужгарод, Ялту, Сімферопль, Севастопаль, Одэсу, Кішынёў, Ташкент, Самарканд, Фрунзе, Алма-Ату, Ашхабад, Баку, Ерэван, Тбілісі, Сухумі, Сталінабад, Новасібірск, Хабараўск, Іркуцк, Чыту, Улан-Удэ, Якуцк, Магадан, Петразаводск, Архангельск, Мурманск, Комі АССР, Калінінград, Смаленск, Брэст, Гомель, Віцебск, Магілёў, Мінск, Гродна, Баранавічы, Пінск, Полацк, Наваградак, Маладзечна, Слуцк, Мазыр, Рэчыцу, Жлобін, Бабруйск, Оршу, Лепель

метады, фонды, воп. 27, спр. 256, арк. 262; Гарадзенскі архіў гістарычных дакументаў, фонд 1, воп. 1, спр. 1195, арк. 1, 399, 480.

8 Sienkiewicz W. Kształtowanie się świadomości narodowej ludności wyższego szczebla w Białymstoku i okolicy w latach 1939-1941. Instytut pedagogiczny w Białymstoku i Instytut nauczycielski w Grodnie // Białostocki kwartalnik historyczny. 2000. № 1.

9 Śleszyński P. Kształtowanie się świadomości narodowej ludności wyższego szczebla w Białymstoku i okolicy w latach 1939-1941. Instytut pedagogiczny w Białymstoku i Instytut nauczycielski w Grodnie // Białostocki kwartalnik historyczny. 2000. № 1.

10 Гл. напрыклад: Стажемоўш І. Введение // Zachodnia Białoruś. 17.IX.1939 – 22.VI.1941. T. 1. Wydarzenia i losy ludzkie. Rok 1939. Warszawa, 1998.

11 Сучасныя украінскія гісторыкі, прызнаючы «вялікую метады» «далучэння заходніх часткі украінскіх зямель да Вялікай Украіны», слушна заўважаюць, што адзінанне «было найважнейшым крокам у фармаванні украінскай саборнасці» (Верстюк В. Ф., Гарань О. М., Гуржій О. І. та ін. Історія України: нове бачання. / Під ред. Смолія В. А. – Київ: Альтернативи, 2000.). Хоць можна казаць пра такое ж значэнне іх падзей і для Беларусі.

12 Михнюк В. П. Социалистические преобразования в западных областях БССР (сентябрь 1939 – июнь 1941 гг.): (Историографический очерк). – Минск: Наука и техника, 1979.

Працы Сляшыньскага найвыразнейшым чынам яшчэ раз пацвердзілі, што ў гістарычнай навуцы Польшчы адсутнічае адзіны погляд на падзеі 1939 г. Наадварот, існуе некалькі розных поглядаў, якія часам узаемна выключаюць адзін аднаго. Гэта, безумоўна, добра, бо ў выніку ствараюцца ўмовы для дыскусіі, абмену думкамі, пошуку ісціны. Але на першым месцы была ленінска-сталінская дактрына распаўсюджвання рэвалюцыі. Гэтае абгрунтаванне адбывалася шляхам анексіі тэрыторый, а таксама далейшай іх гвалтоўнай савецызацыі. Для Крамля тая падзеі адзінаццатага верасня 1939 г. у Беларусі (і Украіне) зусім не былі нечым нечаканым, а таму ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[10]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[11]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[12]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[13]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[14]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[15]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[16]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[17]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[18]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[19]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[20]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[21]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[22]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[23]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[24]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[25]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[26]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[27]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[28]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[29]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[30]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[31]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[32]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[33]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[34]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[35]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[36]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[37]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[38]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[39]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[40]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[41]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[42]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[43]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[44]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[45]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[46]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[47]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[48]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[49]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[50]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[51]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[52]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[53]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[54]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расіі. Гэта ўспрыманне было ўласціва і ў Польшчы. Таму ў Беларусі, як і ў Польшчы, ніякага «вызвалення» ці «ўз'яднання» не адбылося. Таму і ў Беларусі з вялікімі агаворкамі адносна першапачатковага, не тэрытарыяльнага разумення і абазначэння[55]: 1) Савецкі Саюз захапіў землі, што належалі Польшчы. Заходняя Беларусь і гэта не правакавала ніякіх пратэстаў, ні ў якой з бакоў. Гэтая тэапалітычная дэфініцыя рэзка супярэчыць 2) і ў той жа час Вялікая Айчынная вайна, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 г. нападам Германіі на СССР, была ўспрынята ў Беларусі як вайна супраць фашызму, а не супраць Расі

падзеі вылучаліся на агульным фоне так званай Заходняй Беларусі). На чарзе - астатнія паўночна-ўсходнія землі II Рэчы Паспалітай. Але каб даследаванні па іх сінтэзаваць, трэба спярша стварыць адпаведны гістарыяграфічны дыскурс. Дык няўжо будзем чакаць, пакуль гэтую справу зробяць за нас і пра нас нашы суседзі?

Згаданае напачатку багацце польскай гістарыяграфіі, прысвечанай перыяду другой сусветнай вайны, не выпадковае: гісторыю як навуку з поўным правам можна назваць памяццю народу і развіццё ці яго адсутнасць стасоўна да гістарычнай навукі сведчыць пра тое, на якім культурным узроўні знаходзіцца краіна і яе народ. У кнізе Сляшыньскага нярэдка паўтараюцца вядомыя (нават іншы раз і для нашай гістарыяграфіі) ісціны. Аднак гэта не таўталогія, а стварэнне, пешчанне гістарыяграфічнага дыскурсу і сцвярджэнне гуманістычных прыярытэтаў для сённяшняй польскай нацыі і іх дзяржавы: XX стагоддзе стала небывала багатым на паваротныя ў жыцці Польшчы падзеі - падзеі, неадназначныя паводле ацэнак, але ў выніку краіна ўвайшла ў дэмакратычную еўрапейскую прастору без «шавіністычнай хваробы» першай паловы мінулага стагоддзя і без друзу «асаветнівання» другой яго паловы. І немалую ролю тут адыграла гістарычная навука як памяць польскага народу.

[image]

[image]

Сувязь з рэдакцыяй, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2004/10/21**
[image]